СЯРГЕЙ ПЛЯСКАЧ

# ДМБ-91:

## ЗЫЧУ ВЯРНУЦЦА ДАДОМУ




18+

Сяргей Пляскач

# ДМБ-91: зычу вярнуцца дадому

Раман

Мінск
«Галіяфы»
2021

УДК 821.161.3-31
ББК 84(4Беи)-44
П37

П37 ДМБ-91: зычу вярнуцца дадому / Сяргей Пляскач. – Мінск : Галіяфы, 2021. – 312 с.
ISBN 978-985-7209-77-4.

У рамане «ДМБ-91: зычу вярнуцца дадому» аўтар паказвае перыяд распаду савецкай імперыі. Галоўны герой Міхал Радзевіч трапляе ў войска, дзе сутыкаецца з поўным бяспраўем, дзедаўшчынай, крадзяжамі ды п'янствам. Неўзабаве яго асноўным клопатам становіцца праблема фізічнага выжывання.

**УДК 821.161.3-31**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-7209-77-4**
© Пляскач С., 2021
© Афармленне. ПВУП "Галіяфы", 2021

Тыя хлопцы, якія звольніліся з савецкага войска восенню 1991 года, аказаліся апошнімі дэмбелямі Савецкага Саюза: у снежні вялізная краіна знікла з мапы планеты. Яны сталі самымі важнымі сведкамі заняпаду, поўнай маральнай дэградацыі і разлажэння галоўнага стаўпа імперыі зла — яе некалі жахлівай, вялізнай арміі. Гэта гісторыя пра людзей, якія на ўсё жыццё атрымалі прышчэпку ад рэваншыстаў усіх масцей, што сёння спрабуюць пераканаць моладзь у тым, якой казачнай, справядлівай і моцнай краінай быў Савецкі Саюз і як добра жылося за жалезнай заслонай…

Сяргей Пляскач

# I

Ва ўсёй некалі вялізнай вёсцы Калюгі жылымі засталіся толькі чатыры хаты. Ды і з гэтых чатырох адно сяліба Радзевічаў выглядае па-сапраўднаму абжытай: за высакаватым зялёным плотам з металапрофілю хаваецца вялікі падворак, падзелены на дзве часткі: гаспадарчую і чыстую. На гаспадарчай шчыльна туляцца адзін да аднаго разнастайныя хлеўчукі, навесы, дрывотні, невялічкімі чародкамі мітусяцца хатнія птушкі. Чыстую палову двара пакрывае дыван бездакорна падстрыжанага газона, у цэнтры якога стаіць вялікая альтанка, а побач з ёю месціцца галоўная прыкмета сучаснасці — мангал. Сцежкі ад брамкі да ганка і да альтанкі замошчаныя бетоннай пліткай у атачэнні бардзюраў.

Але безумоўна галоўным аб'ектам на сялібе з'яўляецца дом: ультрасучасны двухузроўневы катэдж з ламаным дахам, пакрытым сапраўднай чырвонай керамічнай чарапіцай. Ніхто і не здагадваецца, што бялюткія роўныя муры сучаснай вілы хаваюць за сабою драўляную сялянскую хату, збудаваную ў трыццатыя гады мінулага стагоддзя Рыгорам Радзевічам, дзедам цяперашняга гаспадара сялібы Міхала. Калі перабудоўвалі дом, меркавалі старую хату проста разабраць, але трэба было недзе жыць. Таму вырашылі спачатку ўзвесці новыя сцены, зрабіць пару прыдатных для жытла пакояў, а ўжо потым разбіраць старую хату. За адно лета з пенаблокаў склалі новыя муры вакол дзедавай хаты, разабралі стары дах, але потым, пасля некалькіх сямейных нарадаў, вырашылі захаваць дзедаў зруб, проста ўпісаўшы яго ў сучасны інтэр'ер. І верх узяла зусім не сентыментальнасць, а цвярозы разлік: хата была складзеная з якаснага лесу (цяпер такі днём з агнём не знойдзеш), значыцца, цяпло будзе трымаць ідэальна.

Рыгор Радзевіч перасяліўся ў Калюгі бліжэй да райцэнтра з далёкай вёскі Лазы разам са сваёю вялікай сям'ёй — жонкай і пяццю дзеткамі. Было ў Рыгора тры сыны і дзве дачкі. Калі пачалася другая ў дваццатым стагоддзі вайна з немцамі, ужо немалады Рыгор пайшоў добраахвотнікам на фронт. Толькі і сказаў жонцы: «Другі раз я да іх у палон не хачу». Пайшоў і знік, прапаў без вестак. Давялося жонцы адной ставіць на ногі пяцёра дзяцей, без усялякай дапамогі з боку дзяржавы: муж жа без вестак прапаў, можа, перабег да фашыстаў. Гэта ж якую вычварэнскую логіку трэба было мець, каб хоць у думках дапусціць магчымасць таго, што чалавек, які два гады прабыў у нямецкім палоне падчас Першай сусветнай вайны, мае пяцёра дзяцей, без прымусу пайшоў на фронт, каб стаць здраднікам! Але, відаць, менавіта такая логіка і была ў пашане пры савецкай уладзе. Чаго толькі вартая адна заява правадыра: «У нас палонных няма, а ёсць здраднікі!»*

Дзеці выраслі і параз'ехаліся хто куды: адна дачка апынулася ў Гомелі, другая — у Мінску, старэйшы сын жыў у Маскве, сярэдні — у Віцебску. Толькі малодшы сын Рыгора і Ганны Пятрок жыў зусім побач у райцэнтры, бліжэй за ўсіх, працаваў кіроўцам на МТС — машынна-трактарнай станцыі, таму і наведваўся да маці пастаянна.

На святы ж у Калюгі імкнулася ўся вялізная радзіна Радзевічаў: дзеці, зяці, нявесткі, унукі. Як толькі месца хапала ў невялічкай Рыгоравай хатцы?

Улетку радавы маёнтак ператвараўся ў дзіцячы лагер працы і адпачынку: то маскоўскія, то гомельскія,

* «У нас палонных няма, а ёсць здраднікі!» — фраза Іосіфа Сталіна, якая прыраўняла ўсіх савецкіх палонных да здраднікаў.

то віцебскія, то мясцовыя, а то і ўсе разам унукі Ганны сушылі сена, палолі бульбу, пасвілі кароў, хадзілі ў грыбы і ягады, лавілі рыбу і купаліся ў рэчцы.

Калі выраслі ўнукі, Ганна адышла ў іншы свет, а хата ператварылася ў лецішча. Усё радзей і радзей прыязджалі Радзевічы ў Калюгі. Неўзабаве адзін за адным памерлі і трое старэйшых дзяцей Ганны і Рыгора.

Пятрок як мог падтрымліваў парадак на сялібе. Калі выйшаў на пенсію, на ўсё лета, аж да халадоў, перабіраўся з жонкаю Аленай з кватэры ў райцэнтры ў родную вёску. Іхныя чацвёра дзяцей таксама жылі ў вялікіх гарадах. Цяпер Пятрок з жонкаю даглядалі тут улетку сваіх унукаў. Ужо трэцяе пакаленне Радзевічаў расло з трывалым пачуццём прыцягнення да сялібы ў Калюгах як да радавога гнязда.

Меншы сын Петрака Міхал толькі на якіх дзесяцьпятнаццаць гадоў старэйшы за сваіх пляменнікаў, таму для іх дзядзька заўсёды быў хутчэй старэйшым братам, а пляменнікі для яго — малодшымі.

Міхал Радзевіч скончыў сталічны ўніверсітэт культуры і вярнуўся ў родны раён, каб працаваць загадчыкам сельскага клуба ў вёсцы Селішчы, цэнтральнай сядзібе калгаса «Перамога». Пазагадваў гады тры, а потым калгас паспяхова знік. Людзі з вёскі пачалі раз'язджацца хто куды. Закрылі школу, дзіцячы садок, потым і клуб.

Вырашылі і Міхал з жонкаю, што трэба з'язджаць. Алена рабіла фельчарам на мясцовым ФАПе. Зачыняць яго — абое без працы застануцца. А куды падацца? Дом з сабою не перавязеш! І самае крыўднае — не прадасі нават: цэлая вёска дамоў з забітымі вокнамі стаіць!

Міхалавы бацькі прапанавалі перабірацца ў іхную кватэру, а самі гатовыя былі жыць у Калюгах. Паразва-

жалі і вырашылі зрабіць наадварот: старыя застануцца жыць у горадзе, а маладзейшыя будуць абсталёўвацца ў Калюгах. Калюгі — не Селішчы: да райцэнтра нейкіх пяць кіламетраў, калі што якое — можна і пешшу прабегчы, да таго ж яшчэ два разы на дзень ходзіць аўтобус.

З таго часу і распачалося адраджэнне радавога гнязда Радзевічаў. Міхась болей не шукаў працу, стаў вольным гаспадаром: набыў пчол, купіў дзве каровы, развёў авечак. Наколькі, праўда, з такой гаспадаркай можна было заставацца вольным — загадка. Працаваў з цямна да цямна, але не без плёну.

Хутка купілі аўтамабіль. Алена цяпер не пільнавалася аўтобуса: раніцою адвозіла дзяцей у школу, а ўвечары на пару гадзін раней вярталася з працы.

Трохі назбіралі грошай, узялі крэдыт і ўсёй сваёю вялізнаю радзінай-талакою збудавалі новы дом.

Са стрыечных хтось наведваў Калюгі вельмі рэдка, а вось пляменнікі Міхала наязджалі ледзь не кожныя выходныя. Ім тут заўсёды былі радыя.

Часцей за іншых любілі бываць у дзядзькі карэнныя мінчукі Алесь і Андрэй. Трыццацігадовы Алесь Радзевіч, сын старэйшага Міхалава брата Паўла, чатыры гады таму ажаніўся, і ў іх з Верай было ўжо двое дзетак: дачка і сын. Кармілі Алесеву сям'ю два шапікі на рынку ў Ждановічах, а не ягоны ды жончын дыпломы гістфака і філфака БДУ.

Андрэй Юрэвіч — сын Міхалавай сястры — быў на два гады маладзейшы за Алеся і жаніцца пакуль не збіраўся: рабіў кар'еру ў слыннай на ўсю краіну IT-кампаніі.

Стрыечныя браты Алесь і Андрэй сябравалі з дзяцінства. Усе вакацыі бавілі разам час у Калюгах, а цяпер кожныя выходныя імкнуліся завітаць сюды. Калі з мін-

чукоў ехаў хто-небудзь яшчэ, дабіраліся на дзвюх машынах, калі не — на адной.

Не толькі прышчэпленая бацькамі ў дзяцінстве любоў да прадзедавай хаты цягнула хлопцаў у Калюгі, а і шчырыя сяброўскія стасункі з не нашмат старэйшым саракадвухгадовым дзядзькам, якога яны яшчэ змалку звалі не інакш, як Майкл.

Калі хлопцы яшчэ вучыліся ў школе, студэнт Майкл быў для іх завадатарам бясконцых вандровак па ваколіцах, іх персанальным сталкерам, які пераўтвараў варожы для гараджан свет дзікай прыроды ў зразумелае і прыцягальнае асяроддзе. Як ніхто іншы, дзядзька ўмеў заінтрыгаваць літаральна парай фраз, абудзіць інтарэс, прымусіць разважаць у самых нечаканых кірунках, перабіраць горы кніг на бібліятэчных паліцах ці на гарышчы прадзедавай хаты.

Алесь і сёння выдатна памятае, скуль з'явілася ягоная апантанасць гісторыяй. Неяк Майкл прывалок з лесу вялізны кош грыбоў. Адны баравікі ды падасінавікі!

— Ух ты! І дзе ж гэта знайшоў столькі?! — шчыра здзівіўся сямікласнік Алесь.

— Кантрабанда! — адказаў нешта няўцямнае дзядзька.

— У сэнсе?

— А, — махнуў Майкл рукой, — так, разоў пяць дзяржаўную мяжу давялося пераходзіць туды-сюды!

— Жартуеш? Да найбліжэйшай мяжы кіламетраў дзвесце, мабыць.

— Ад сілы два.

— І гэта да якой такой мяжы?

— Да былой!

— Паміж Польшчай і СССР? — усё меней разумеў Майкла Алесь. — Яна ж адразу за Мінскам была, мне бацька паказваў.

— Можна падумаць, яна ў нас адна была! Бяры кош і пайшлі!

Праз паўгадзіны хлопцы стаялі на краі глыбокага рова, які цягнуўся праз увесь лес, на колькі можна было бачыць з поўначы на поўдзень.

— Вось — дзяржаўная мяжа паміж Расійскай імперыяй і Рэччу Паспалітай, якая пралягла тут пасля першага падзелу нашага гаспадарства ў 1772 годзе, — тлумачыў Міхал...

Адна справа — запіс у падручніку, і зусім іншае — гэты рубец, што падзяліў некалі па жывому краіну, людзей, сем'і, народ. Ён нікуды не знік і праз амаль дзвесце пяцьдзясят гадоў уражвае сваёю пачварнай грунтоўнасцю.

Алесь быў агаломшаны такім дзіўным і блізкім перапляценнем мінулага і сучаснасці, перачытаў па падказцы Міхала ўсё, што знайшоў, Уладзіміра Караткевіча, затым Кастуся Тарасава, а потым дайшла чарга і да Міколы Ермаловіча.

Хутка на ўроках гісторыі настаўніца гаварыла пераважна з Алесем Радзевічам: для ўсіх астатніх іхныя дыялогі былі абсалютна незразумелымі, нібы яны наўмысна пераходзілі на кітайскую, каб схаваць нейкую таямніцу.

Крыху меншага пляменніка Андрэя ў дзяцінстве найперш захаплялі бясконцыя аповеды Майкла пра пярэваратняў, ведзьмакоў ды ваўкалакаў. Тады яшчэ ніхто і чуць не чуў пра Яна Баршчэўскага, а перакладу «Шляхціца Завальні» не існавала. Майкл жа кожны вечар адгукаўся на просьбы малых новай гісторыяй пра самых выкшталцоных нячысцікаў. Прычым усе падзеі мелі выразную прычэпку да вядомых дзецям мясцін:

— Хутар Баравічына памятаеце? — пытаўся дзядзька.

— Той, што пасярод лесу? — удакладнялі дзеці.

— Так. Дык вось, жыў там некалі адзін гаспадар…

І пайшло-паехала: ваўкі, сабакі, жабы, вужы, белыя вароны, Плачкі, чэрці, зачараваныя скарбы ды прададзеныя д'яблу душы.

— Адкуль ты ўсё гэта ведаеш? — не вытрымлівалі, пыталіся дзеці.

— Бабуля распавядала.

— Баба Каця?! — не верылі дзеці.

— Не, Ганна, мая бабуля, — смяяўся Майкл.

— Праўда?

— Праўда!

— А яна адкуль ведала?

— Ну, ёй, мабыць, яе бабуля расказвала.

— А як яе звалі?

— Каго?

— Ну, прабабуліну бабулю.

— Матруна Тарасаўна.

— Ого! Дык яе бацька быў, значыцца, Тарас.

— Відаць, што так.

— А кім ён быў? — цікаўнасць дзяцей толькі ўзрастала.

— Кавалём.

— Дык гэта ён рабіў зброю для рыцараў?

— Для рыцараў? Ён рабіў зброю для паўстанцаў… Зрэшты, іх таксама можна назваць рыцарамі: яны ж змагаліся за справядлівасць, баранілі слабейшых.

— Крута! — з боку дзяцей гэтае слова азначала найвышэйшае прызнанне і захапленне.

Тое дзіцячае захапленне дзядзькавымі гісторыямі нікуды не падзелася, нават калі хлопцы выраслі.

— Ты б запісваў, ці што? — раілі ўжо дарослыя хлопцы дзядзьку. — Забудзецца ж!

— Не забудзецца! Дагэтуль жа не забыў! Калі баіцеся, дык самі і пішыце!

Кожны раз, седзячы за бяседным сталом, Алесь і Андрэй чакалі, што вось-вось Майкл што-небудзь выдасць са сваіх скарбаў жыцця. Свядома ці падсвядома заахвочвалі-прыспешвалі дзядзьку распачаць чарговую гісторыю. І сваяк ніколі не падводзіў удзячных слухачоў.

Даўным-даўно ўжо гэта былі зусім не фальклорныя здабыткі пра міфічныя падзеі. Дзядзька апавядаў пра здарэнні з жыцця самых звычайных людзей, многіх з якіх хлопцы ведалі. Часам Міхал выдаваў штосьці з уласнага жыцця, і хлопцам заставалася толькі дзівіцца, чаму ён не распавядаў пра тую ці іншую падзею раней.

— Не было неяк нагоды, — проста тлумачыў дзядзька.

Нейкія гісторыі, пачутыя ад Майкла, нярэдка выклікалі сумненні ў праўдзівасці, але любое следства, якое ні ладзілі пляменнікі, заўсёды знаходзіла бясспрэчнае пацвярджэнне дзядзькавым словам.

— Вось так вось проста з лесу на самалёце ў сорак трэцім праз лінію фронту ў Маскву лятаў? І сам таварыш Сталін яму ў Крамлі ордэн чапляў?! — не вытрымаў Андрэй, каб даслухаць: занадта ўжо неверагоднымі паўставалі ваенныя прыгоды дзеда-партызана, які некалі жыў у суседняй хаце.

— Не, ну чым ты слухаеш? Хто казаў пра Сталіна? Калінін яму ордэн уручаў!

— У Маскве?! — не здаваўся пляменнік.

— Вось жа недаверак! Я ж пра што і кажу: з дзеда таго абцугамі слова было не выцягнеш, асабліва пра вайну. З ягоным унукам мы ў дзяцінстве сябравалі. Час

ад часу, натхнёныя фільмам якім ваенным ці сустрэчай са штатным ветэранам, чапляліся да дзеда Міколы, каб таксама распавёў што-небудзь пра вайну. А дзед быў геройскі: увесь пінжак ва ўзнагародах. Толькі плячыма пацісне на нашыя роспыты: навошта дзецям пра такую брыду, як вайна, ведаць? Аднойчы прыйшоў да мяне Віцёк, Міколаў унук, і кажа: «Ну мой дзед сёння і выдаў! Сказаў, што ў вайну ў Маскву лятаў! Лётчык хрэнаў! Маўчаў, маўчаў, а тут раскрыў рот і адразу паляцеў! Ён жа ў лесе ўсю вайну праседзеў! Усе ж ведаюць! Лепей ужо маўчаў бы і далей!»

— А! Дык гэта з гэтай нагоды Віцёк спіўся! — зразумеў дзядзьку па-свойму Андрэй.

— Не ведаю, як раней, а на гэтым тыдні ў яго цалкам здавальняльная прычына: дарма на дзеда крыўдзіўся, лятаў Мікола ў Маскву, нават некалькі разоў лятаў, не хлусіў.

— Падчас вайны?! — удакладніў-здзівіўся Андрэй.

— Толькі тады і пабываў у Маскве той. Пасля вайны нават у Мінск не выбраўся ні разу. Навошта?

Усе памаўчалі некалькі хвілін: маладзейшыя не зразумелі, да чаго Майкл распачаў гэтую гаворку, а сам апавядальнік нібы збіраўся з думкамі.

— Вось як бывае, — працягнуў пасля паўзы дзядзька. — Не паверылі, пакпілі з дзеда, а ён праўду казаў. І вось жа як дзіўна ў жыцці часам атрымоўваецца: гэта ж гадоў трыццаць мінула з таго часу, гадоў дваццаць як няма таго дзеда Міколы, і раптам самым нечаканым чынам усё пацвердзілася. Фантастыка! Хто б мог падумаць! Ды ўсе даўно забыліся пра тыя дзедавы словы, а тут такі паварот. Відаць, нехта там, наверсе, любіць усё ж парадак, каб раней ці пазней усё займала належнае месца...

Пару тыдняў таму быў я ў раёне. Іду па вуліцы і бачу: ля цэнтральнай бібліятэкі прадаюць кнігі. Падышоў бліжэй. Аказваецца, гэта фонды, як мне сказалі, з закрытых сельскіх бібліятэк. Прадаюць за капейкі: усё ж выгадней, чым на макулатуру здаць. Там я такіх фаліянтаў панаадкопваў на радасцях, што ледзь дадому давалок. Увесь збор твораў Караткевіча, першыя выданні Быкава і нават прыжыццёвае выданне Коласа! Уяўляеце! І вось сярод гэтай раскошы трапілася мне на вочы зусім непрыкметная шэрая кніжка ў мяккай вокладцы: Владимир Ильин, «Партизаны Бука». Я адразу сцяміў, што кніжка пра партызанку ў нашай мясцовасці. Гартануў, зірнуў анатацыю — так і ёсць, успаміны пра партызан брыгады Гудкова. Нам у дзяцінстве аж выць хацелася ад гэтага спалучэння — партызаны брыгады Гудкова: усе кішкі выелі гэтай гераічнай барацьбой савецкага народа! Як фашыстаў у вайну аж калаціла ад партызан з гэтай брыгады, так у паваенны час млосна ад іх рабілася піянерам…

А ў канцы кнігі нават некалькі фотаздымкаў надрукавана з пасляваенных святкаванняў юбілеяў вызвалення і перамогі ў райцэнтры. Угледзеўся — я ж практычна ўсіх людзей з тых фотакартак так ці інакш ведаў! Цяпер ніводнага з тых ветэранаў у жывых не засталося… Вядома ж, не купіць гэтую кніжку я не мог…

Узяўся чытаць — не мог адарвацца! Аказваецца, аўтар быў камісарам у адным атрадзе з брыгады Гудкова, якім камандаваў Мікалай Агапоненка. І ў кніжцы так падрабязна апісаная дзейнасць партызан, што большай дакладнасці і ўявіць немагчыма. Мала таго, што вытрымана храналогія падзеяў, дакладна апісваецца наша мясцовасць, суседнія раёны, дык самае каштоўнае — успаміны пра людзей, дзве трэці з якіх я памя-

таю, дзеці і ўнукі якіх жывуць у раёне і сёння. Зразумела — камісар ведаў шмат людзей… Ёсць там эпізод, у якім апісваецца, як аднойчы група падрыўнікоў, што вярталася з чыгункі, завітала ў Калюгі і пакінула параненага таварыша ў сям'і Радзевічаў! Так, у гэтым самым доме! А яшчэ там апісваецца, што на Лепельшчыне, каля Бягомля, была партызанская зона — вялізны абшар, які цалкам кантралявалі партызаны, там быў аэрадром, з якога мінімум тры разы малады партызан Мікола Ігнатовіч лятаў, як яны тады казалі, на вялікую зямлю, у Маскву! Хіба гэта не дзіўна?! Праз столькі гадоў знайшлося неабвержнае сведчанне, што дзед Мікола не тое што не хлусіў, а нават мінімум у тры разы зменшыў веліч падзеі…

У прадмове сказана, што кніжку тую доўга не хацелі друкаваць. І не дзіва: занадта, як для камісара, сумленнымі выявіліся ўспаміны Уладзіміра Ільіна: там і пра выпадкі марадзёрства партызан, і пра здраднікаў — колішніх партыйных кіраўнікоў, і пра сутычку з савецкімі НКВДэшнымі дыверсантамі, і пра тое, як не давяралі ў Маскве партызанам, не забяспечвалі на пачатку руху зброяй і боепрыпасамі, і пра апошнюю фашысцкую блакаду перад вызваленнем: нібы наўмысна прытрымалі наступленне Чырвонай арміі, каб акупанты зачысцілі тэрыторыю ад народных мсціўцаў!..

Не кніжка — скарб, індульгенцыя ўсяму пакаленню: не былі яны такімі ўжо ідэалагічна апантанымі і зусім не за крывавага правадыра Сталіна змагаліся, а на самай справе за Радзіму! Не было людзям куды падзецца! Кінулі іх пад акупантамі і абвесцілі ворагамі! Цэлымі сем'ямі сыходзілі ў партызаны, з малымі дзеткамі, каб выжыць! Нічога ў іх не было ва ўсім сусвеце, акрамя гэтага кавалка зямлі, за яго і трымаліся, як умелі…

Я з'ездзіў у горад, астатнія тры асобнікі купіў: няхай будзе. Адзін Віцьку даў. Можа, першую ў жыцці кніжку сусед да канца прачытаў…

— Думаеш, прачытаў? — засумняваўся Андрэй.

— Прачытаў, прачытаў: гадоў пяць на могілках не быў, а тут схапіў сякеру, граблі, прыбраў дзедаву магілу, нават агароджу пафарбаваў.

— Сапраўды, дзіўна: ваявалі-ваявалі з гэтымі немцамі, а цяпер усе імкнёмся да іх у Германію, — уключыў філосафа адмысловы камп'ютаршчык Андрэй.

— У сэнсе? — не зразумеў Майкл, што мае на ўвазе пляменнік.

— Багатыя яны, чэрці, перадавыя тэхналогіі ў іх і ўсё такое: найлепшыя ў свеце аўтамабілі і дарогі, электроніка, медыцына, цывілізацыя, адным словам. Вось таму і пнуцца нашыя туды: хто папрацаваць, хто на пастаяннае месца жыхарства, хто хоць у якасці турыста паглядзець на іхныя цуды і пазайздросціць.

— А ты ў якасці каго? — раптам звярнуўся да стрыечнага брата Алесь.

— Пакуль не ведаю, паглядзім, як атрымаецца, — адказаў Андрэй.

— Я нешта прапусціў? — пацікавіўся Майкл.

— Якраз сёння хацеў расказаць: мяне запрасілі на працу ў адну нямецкую кампанію.

— Самі немцы запрасілі?

— Ну, як самі — у іх выбар шырокі. Убачыў я іхную абвестку, даслаў сваё рэзюмэ. Яны мне — заданні. Выканаў. Нічога там звышнатуральнага не было. Цяпер вось падпісаў кантракт на год. Плацяць у два разы болей, чым у Мінску. Перспектывы росту і ўсё такое. Я мог бы і тут працаваць, на адлегласці, але чаму не скарыстацца магчымасцю, не пажыць годзік у Германіі?

— Усё вяртаецца на колы свае: прадзед пабыў некалі ў Германіі ў палоне, праўнук добраахвотна едзе здавацца, — кпіў Алесь. — Цікава, хто наступны?

— Я таксама быў у Германіі, — абсалютна спакойна зазначыў Майкл.

— Ты?! — у адзін голас выпалілі пляменнікі.

— Так.

— Калі ж гэта? — з прыкметным недаверам запытаўся Андрэй.

— Даўно. А калі больш дакладна — у ліпені тысяча дзевяцьсот дзевяноста першага года…

## II

Міхал Радзевіч гісторыяй цікавіўся заўсёды і быў найлепшым яе знаўцам сярод аднакласнікаў. Калі ж да ўлады прыйшоў Гарбачоў і ў краіне распачалася перабудова, мінулае цалкам паглынула свядомасць падлетка: кожны дзень газеты друкавалі такія не вядомыя раней факты, ад якіх зрывала дах: рэпрэсіі, катаванні, мільёны забітых, вынішчэнне сялянства, інтэлігенцыі, татальная русіфікацыя і фальсіфікацыі фактаў на карысць адзіна правільнай ідэалогіі. Чорнае пераўтваралася ў белае, а чырвань дзяржаўнага сцяга нагадвала цяпер не пра кроў змагароў за савецкую ўладу, а пра іх ні ў чым не вінаватых ахвяр.

На цэнтральным, як тады казалі, тэлебачанні з'явіўся бескампрамісны і зусім не савецкі «Взгляд». Абсалютная фантастыка: людзі пачалі добраахвотна глядзець беларускае тэлебачанне! Тут уладарыў «Крок».

Радзевіч жа чакаў — не мог дачакацца аўторка, каб паглядзець чарговы выпуск «Ліры». Тут разважалі пра мінулае беларусаў знакамітыя літаратары і гісторыкі.

Як высвятлялася, жыццё на абшарах Беларусі існавала задоўга да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі. Больш за тое — было гэтае жыццё, насуперак афіцыйнай версіі, якую аўтарытэтна прышчэпліваў вучням школьны падручнік, зусім не прымітыўным і беспрасветным.

Нібы перад Калумбам бераг новага мацерыка, паўставала перад Міхалам Радзевічам зусім іншая, невядомая радзіма! За яе не было сорамна, ёй хацелася ганарыцца! Рагвалод, Рагнеда, Усяслаў Чарадзей, Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Ягайла, Вітаўт, Скарына... БНР, Пагоня, бела-чырвона-белы сцяг! Як можна было не захапіцца гэтым скарбам!..

І мова, на якой некалі гаварылі каралі і былі напісаныя самыя грунтоўныя зводы законаў — Статуты Вялікага Княства Літоўскага, — толькі абсалютным ёлупнем цяпер характарызавалася як калгасная і неразвітая.

Маладыя, як апантаныя, цэлымі днямі слухалі і перапісвалі з касеты на касету Віктара Цоя і «Кино», Юрыя Шаўчука і «ДДТ», Барыса Грэбеншчыкова і «Аквариум»... Менш прасунутыя задавальняліся «Ласковым маем» ды «Миражом»...

«Голас Амерыкі» і «Радыё Свабода» яшчэ глушылі, але Міхась Радзевіч здолеў запісаць некалькі песень «Мроі», якія немаведама як прабіліся скрозь краты адмысловых антэн, што мусілі стрымліваць небяспечныя павевы з вольнага свету. Мабыць, ад гэтага моманту ўсё стала на свае месцы: вецер перамен канчаткова развеяў ідэалагічны туман, што нахабна засціў вочы, і хлопец нарэшце выразна ўбачыў шлях, здольны вывесці беларусаў з крывавай багны імперыі зла.

У кастрычніку тысяча дзевяцьсот восемдзесят восьмага ў Мінску адбылося гістарычнае святкаванне Дзя-

доў, рэха якога разнеслася па ўсім свеце: людзей збівалі і труцілі «черёмушкой» толькі за тое, што яны хацелі ўшанаваць сваіх продкаў!

У сакавіку восемдзесят дзявятага нейкі студэнт-мастак Алесь Пушкін нарэшце зрабіў тое, пра што даўно марылі свядомыя беларусы: перакрэсліў на плакаце каланіяльны бээсэсэраўскі сцяг і напісаў: «Досыць сацыялістычнай, адродзім народную Беларусь!».

Калі выпускныя экзамены за курс сярэдняй школы паспяхова былі здадзеныя, пытання, куды пайсці вучыцца далей, для Міхала Радзевіча не стаяла: толькі на гісторыка.

Экзамен па гісторыі ў Мінскім педагагічным інстытуце імя Максіма Горкага Радзевіч здаў на выдатна, а вось сачыненне з трэскам праваліў: нічога не паробіш, не натхнялі яго вобразы ні Макара Нагульнава, ні Сямёна Давыдава — герояў «Поднятой целины» Міхаіла Шолахава. Тым больш не было ніякага жадання быць падобным да кагосьці з іх асобна ці да «всех овчарок сразу».

Выразнай адмецінай замаячыла на даляглядзе перспектыва выканання ганаровага абавязку кожнага савецкага чалавека: служба ў войску.

Служыць імперыі, пра пачварную сутнасць якой Міхась Радзевіч ведаў аж занадта шмат, не было ніякага жадання. Відавочна не хацелі ісці ў войска і іншыя хлопцы, асабліва з нацыянальных ускраін краіны-монстра: кожны дзень прэса паведамляла ледзь не пра зрыў мабілізацыйнай кампаніі. Акрамя таго, што многія рэспублікі ўжо не бачылі сябе ні ў якім выглядзе ў складзе СССР і задумваліся пра перспектывы стварэння нацыянальнага войска, асноўнай прычынаю негатыўнага стаўлення да савецкай арміі стала выкрыццё распаўсюджанай у ёй ганебнай практыкі пазастатутных адносінаў ваенна-

служачых, якое атрымала назву «дзедаўшчына». Сотні савецкіх жаўнераў гінулі ў мірны час, пераўтвараліся ў маральных ды фізічных калек. Узнікла грамадская арганізацыя «Камітэт салдацкіх маці», якая распачала рашучую барацьбу з дзедаўшчынай. Афіцыйная ж улада пачала цкаваць жанчын за нібыта падрыў аўтарытэту самай непераможнай арміі ў свеце.

Касіць ад службы ў войску стала зусім не заганна, а тыя праўладныя крыкуны, што змагаліся з жанчынамі, якія толькі хацелі, каб іх дзеці вярнуліся з войска жывымі і здаровымі, былі сярод першых, хто даваў хабар ваенкомам і дактарам, каб пазбавіць сваіх сыноў ад выканання свяшчэннага абавязку.

Кожны дзень па тэлебачанні круцілі, як і ўсё савецкае, паказушныя рэпартажы пра ўзорны парадак і побыт вайскоўцаў: вось тут салдаты спяць, вось тут вучацца, гэта — прадмет асаблівага гонару — падсобная гаспадарка, дзе гадуюцца свінні, вырошчваюцца бульба і капуста, каб зрабіць рацыён больш разнастайным; вось так адбываюцца ў вольны час спартовыя святы, жаўнеры дэманструюць адмысловы спрыт і фізічную падрыхтоўку, тут дом культуры, дзе кожны можа рэалізаваць свой творчы патэнцыял. Як бачыце, месца дзедаўшчыне тут няма! Яе ўвогуле не існуе! Яна — плён нездаровай фантазіі істэрычных дамачак! Наслухаюцца маменькіх сынкоў усялякіх, якія не рыхтаваліся да войска, не могуць ні прабегчы, ні падцягнуцца — ведама, ім цяжэй, чым іншым, але ніхто іх тут не прыніжае, тут усе роўныя, усё ў строгай адпаведнасці з патрабаваннямі вайсковых статутаў! Мы ўсе савецкія людзі! Наша армія народная! Гэта ў іх там, на захадзе, сярод усялякіх наёмнікаў, дзе няма нашай перадавой маралі, магчымыя прыніжэнні, катаванні ды гвалт!

— Я прыйшоў у войска слабым і нямоглым, — на экране з'яўляўся чарговы выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі, — але клопат баявых таварышаў і камандзіраў зрабілі цуд! Цяпер я сапраўдны мужчына! Мама, ты можаш мной ганарыцца!..

Наіўны васямнаццацігадовы Міхал Радзевіч верыў у перамены да лепшага, але нават у думках не дапускаў, што імперыя рассыплецца так імкліва і хутка. Яму падалося, што прасцей адслужыць і займацца надалей рэалізацыяй сваіх планаў, чым марнаваць час у небяспечнай беганіне ад ваенкамата. Зманлівай падалася і перспектыва стаць сапраўдным мужчынам, моцным і дужым. А што да страху перад дзедаўшчынай — яго не было: служыў жа ў войску бацька, зусім нядаўна — старэйшыя браты, і ніколі ні пра што такое не згадвалі.

Пасля медкамісіі ў раёне Радзевіч трапіў у групу хлопцаў, якіх накіравалі на медагляд у абласны ваенкамат, што азначала, як казалі дасведчаныя людзі, службу дзесьці за мяжой.

— Буду акупантам! — не раз жартаваў Міхал, чакаючы апошнюю павестку.

На другі дзень пасля разбурэння Берлінскай сцяны* Радзевіч апынуўся ў Барысаве на рэспубліканскім прызыўным пункце: некалькі трохпавярховых ледзяных казармаў з драўлянай прыбіральняй на вуліцы і хранічна п'янымі салдатамі і афіцэрамі роты забеспячэння. Тут муры нікуды не падзеліся: увесь перыметр атачала цагляная двухметровая сцяна, пакрытая брудным шалупіннем ад жоўтай фарбы. За гэтай сцяной віравала жыццё, кожны дзень прыносіў перамены ды спадзяванні на леп-

* Берлінская сцяна была разбураная 9 лістапада 1989 года.

шае, а ўнутры перыметра панавала атмасфера занядбання і цвілі часоў застою. Як такое магчыма?

Калі пасля двух тыдняў каранціну навабранцаў самалётам з грамадзянскага аэрапорта «Мінск-2» пераправілі на паўднёвы захад Польшчы, Радзевіч хутка пераканаўся, што ў жыцці магчыма што заўгодна, і па большай частцы самае немагчымае.

Што ведаў ён тады, па сутнасці яшчэ савок саўком, пра Польшчу, акрамя таго, што «курица — не птица, Польша — не заграница», традыцыйных анекдотаў пра рускага, немца і паляка, у якіх апошнія два заўсёды паўставалі ёлупнямі-недарэкамі; пра тое, што больш за чатырыста тысяч савецкіх воінаў загінулі, вызваляючы Польшчу ад фашыстаў, а няўдзячныя палякі нахабна імкнуцца збегчы з сацыялістычнага лагера?

На шчасце, тое-сёе ведаў! Найперш — ён ніяк не атаясамліваў сябе з рускімі. Па-другое — жаданне збегчы з любога лагера ніяк не можа лічыцца заганаю, хутчэй наадварот — недарэчным выглядае жаданне ў ім заставацца. Па-трэцяе — Міхась ведаў пра армію Андэрса і Варшаўскае паўстанне, пра супраціў фашыстам войска польскага, у якім служылі тысячы беларусаў, у трыццаць дзявятым, і пра Катынь таксама ведаў! Ведаў ён і пра сумесную дзяржаву беларусаў і заходніх суседзяў — Рэч Паспалітую. А яшчэ дзясяткі ягоных знаёмых лічылі сябе палякамі, бо іх бабулькі маліліся ў касцёле, а ў Польшчы жылі сваякі, якія ўсё часцей і часцей наведвалі родных. Да таго ж Чэслава Немэна ці Марылю Радовіч ніхто не адмяняў. Пра мужнасць змагароў з «Салідарнасці» і Леха Валенсу таксама чуў...

А яшчэ польская мова мае столькі агульнага з беларускай, што іх носьбітам практычна зусім не патрэбныя перакладчыкі, каб зразумець адно аднаго!..

На савецкім ваенным аэрадроме, які савецкія тубыльцы назвалі Кшыва, нававбранцаў размясцілі ў надзіва цёплай казарме, з якой і пачалі забіраць па два-тры чалавекі ў розныя вайсковыя часткі. З'явіліся чарговыя купцы — так называлі афіцэраў, якія набіралі папаўненне ў свае фармаванні. Побач з Радзевічам апынуўся нейкі жаўнер з гэтак званых пастаяннікаў — тых, што служылі на перасыльным пункце.

— Цяпер маліцеся, духі, — пагрозліва прасіпеў той.

— Што? — не зразумеў Міхал.

— Гэта з дзікай дывізіі купцы, Борна-Сулінава. Пяхота. Амаль адны чуркі*. Калі не трапіш туды, можа і вернешся жывым дадому.

Радзевіч не трапіў. З мінскага рэйса акрамя Міхала ў казарме засталося яшчэ толькі чацвёра. Хлопцы адразу прыцішэлі і збіліся ў купку.

Знаёмым аказаўся толькі адзін зямляк: самы недарэчны і смешны ў кампаніі, Вацік Шпакоўскі.

Яшчэ дома, калі нававбранцы са сваякамі на аўтастанцыі чакалі рэйсавы аўтобус, на якім павінны былі ў суправаджэнні прапаршчыка дабірацца да абласнога ваенкамата, да Радзевіча і ягонага аднакласніка Ігара Яскевіча, які таксама не здолеў пазбегнуць службы, нейкая мажная вясковая кабета падвяла дробненькага, худзенькага падлетка з доўгім носам, вялізнымі сінімі вачыма і маленькімі смешна адтапыранымі вушкамі — ні даць ні ўзяць пчолка Мая:

— Хлопцы, прыгледзьце, калі ласка, за ім. Ён у мяне такі нягеглы. Ведама, без бацькі гадаваўся, нідзе ніколі не быў. Вы ж землякі, трымайцеся разам.

---

* У савецкім войску так называлі выхадцаў з Каўказа і Азіі. Каўказцы і азіяты, у сваю чаргу, называлі «чуркамі» ўсіх «рускіх».

Міхал у першае імгненне падумаў, што жанчына просіць прыгледзець у дарозе за малалетнім сынам, якога ўпершыню аднаго выпраўляе ў вялікі горад, а там яго, вядома ж, сустрэнуць сваякі: перадаць, так бы мовіць, з рук у рукі просіць. Але далейшыя матчыны павучанні, слёзы ды галашэнні адназначна засведчылі: хлопчык такі ж, як і яны, прызыўнік!

Ачмурэць! Відаць, сапраўды з камплектаваннем непераможнай быў поўны швах, раз заграбалі нават горкіх дзяцей! Натаўскія генералы палопаліся б ад смеху, калі б убачылі такую савецкую ваенную пагрозу! Войска нарэшце ператваралася, як некалі і дэкларавалі, у армію працоўных і сялян: можна не сумнявацца, што Вацік-Аліндарка ішоў служыць замест якога-небудзь добра ўкормленага сыночка спрытнага партнаменклатуршчыка.

У Вацiка большы давер выклікаў Ігар Яскевіч, ад якога ён не адставаў ні на крок пры любых перамяшчэннях, а калі ўзнікала пагроза адстаць ці згубіцца ў натоўпе, як маленькі, хапаў Ігара за рукаў.

Цяпер Ігар быў на шляху ў дзікую дывізію з перспектывай не вярнуцца жывым дадому, а перад Міхалам Радзевічам замаячыла незайздросная доля на два гады ператварыцца ў няньку для Вацлава Шпакоўскага…

Праз паўгадзіны асабістыя справы пяці беларусаў і тузіна рускіх і буратаў з Улан-Удэ трымаў у руках высокі паўнаваты капітан з чырвонымі пятліцамі і агульнавайсковымі эмблемамі.

— Віншую вас, таварышы салдаты! — урачыста выгукнуў адабранаму жывому тавару купец. — Вы накіроўваецеся ў школу ваенных повараў!

«Што?! Повараў! Як такое магчыма?! — абурыўся ў думках Радзевіч. — Я пайшоў у войска, каб стаць сапраўдным мужчынам: скакаць з самалёта з парашутам,

кіраваць танкам, вывучаць прыёмы рукапашнага бою, налева і направа шмаляць з калаша, бегаць марш-кідкі ў поўнай экіпіроўцы, а гэты тылавы пацук прапануе мне…»

Капітан нібы прачытаў Міхалавы думкі, тут жа спытаў:

— Хто не жадае быць поварам?

І загадаў услед:

— Выйсці са строю!

Не вагаючыся выйшлі двое: Радзевіч і нейкі хлопец з Бурацii.

— Так, таварышы салдаты, — цяпер голас капітана гучаў з пагардаю, — вы ў войску! І тут нікога не цікавіць, чаго вы хочаце: сказалі поварамі — значыцца, будзеце поварамі! Стаць у строй!

Гэта была катастрофа!

Калі пайшлі грузіцца да машыны, Міхал выразна адчуў, як нешта павісла на рукаве шыняля. Шпачок! Гэтага яшчэ не хапала для поўнага шчасця!

Дарогаю хлопцы разглядалі незнаёмыя дзіўныя мясціны, Радзевіч пачаў уголас чытаць надпісы на прыдарожных знаках, чым выклікаў сапраўдны фурор сярод прадстаўнікоў Бурацii:

— Як?! Ты разумееш! Ты можаш чытаць па-іхнаму?! — выгукнуў самы няўрымслівы, як для беларусаў, дык з надта экзатычнай знешнасцю — шчылінкі на месцы вачэй — ды імем хлопец Мунько.

— Мы ўсе можам, мы ж суседзі, — адказаў за ўсіх беларусаў навабранец з Рэчыцы Алег Чарняк.

— Явар! — паведаміў пасажырам назву чарговага паселішча Радзевіч.

— Шэпчацца дзесьці з калінаю? — імгненна падхапіў-спытаў Чарняк у Міхала.

— У сумнай даліне над ярам... — адказаў, як на водгук да таямнічага пароля, Радзевіч.

Цяпер не толькі бураты, а і землякі паглядзелі на хлопцаў, як на іншапланецян.

Нядоўга праехаўшы па брукаваных вулках відавочна старога места, машына спынілася перад шэрымі варотамі з вялізнымі чырвонымі зоркамі.

Школа.

## III

Ваенны гарадок, у якім месціліся школа ваенных повараў (вучэбка), батальён будаўнікоў (па-руску скарочана «стройбат») і рота рамонтнікаў, як не без гонару паведамілі навабранцам, пабудавалі яшчэ немцы, калі гэтая тэрыторыя належала Германіі. Калі тое было дакладна, ніхто не ўдакладняў. Ну добра, немцамі дык немцамі: якая розніца?

Дні тры, пакуль адбывалася камплектаванне вучэбкі, служба насіла абсалютна невыразны характар: прыбіралі тэрыторыю, глядзелі ў ленінскім пакоі навіны, снедалі, абедалі ды вячэралі — санаторый санаторыем.

Усіх беларусаў і буратаў накіравалі ў адзін трэці ўзвод, дзе ўжо прапісаліся чалавек пяць землякоў генсека* са Стаўрапольшчыны. Некаторыя з іх сцвярджалі, што жывуць ледзь не ў суседнім ад радавога гнязда Гарбачовых доме, нібы тут гэты факт надаваў ім большай вагі і значнасці.

І вось надышоў той снежаньскі дзень, калі казарма напоўнілася прыцішаным гулам, які засведчыў прысутнасць у ёй вялікай колькасці людзей. Было абвешчана пастраенне. На маленькім пляцы для разводаў, пакуль

* Скарачэнне ад «генеральный секретарь». Генеральны сакратар Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза з'яўляўся і першай асобай краіны.

не надта зграбна, на чале з камандзірамі ды іх намеснікамі пастроіліся тры ўзводы чалавек па трыццаць. Поўны інтэрнацыянал: з дзясятак рускіх, пяць беларусаў, чамусьці толькі адзін украінец, бураты, грузіны, абхазы, азербайджанцы, армяне, чачэнцы, узбекі, таджыкі ды кіргізы.

Прадставілі камандзіраў і растлумачылі, што на працягу месяца да прыняцця прысягі навабранцы мусяць прайсці курс агульнавайсковай падрыхтоўкі, ці працей — курс маладога байца. Затым павінна пачацца засваенне вайсковай спецыяльнасці.

Увечары перад адбоем адбылася першая агульная пераклічка: у доўгім калідоры казармы, насупраць сваіх кубрыкаў, выстраіліся тры ўзводы, і намеснікі камандзіраў зачытвалі прозвішчы курсантаў. Пачуўшы сваё, радавы павінен быў, згодна са статутам, гучна і выразна сказаць: «Я!» Калі чарга дайшла да Шпакоўскага — Вацік у адно імгненне стаў знакамітасцю на ўсю вучэбку: ягонае «Я!» прагучала выразна і гучна, толькі так працягла і танютка, нібы яго праспявала пяцігадовая дзяўчынка! Уся сотня вайскоўцаў імгненна забылася на статуты і выбухнула такім шалёным рогатам, які ледзь атрымалася суняць камандзірам праз некалькі хвілін.

Зразумела, усе расцанілі Вацікаў піск як недапушчальны жарт, нахабнае свавольства. Тут жа да сяржанта падбег камандзір узвода, прапаршчык, выхапіў з яго рук спіс асабовага складу і растлумачыў усім, як павінен адказваць радавы, калі чуе сваё прозвішча. Не падумаў таварыш прапаршчык, ой не падумаў, неабачліва зрабіў камандзір, калі зноў выгукнуў:

— Шпакоўскі!

Вацік ушчэнт збянтэжыўся ад такой пільнай, усеагульнай увагі да сябе, так расхваляваўся, мабілізуючы

рэшткі прытомнасці, што на гэты раз ягонае «Я!» прагучала ў сто разоў недарэчней і смяшней, чым упершыню: цяпер гэта быў пазнавальны ўсімі голас Пятачка з мультфільма пра Віні-Пуха.

Зноў грымнуў такі аглушальны рогат, якога, можна не сумнявацца, ніколі раней не чулі гэтыя сцены! Ды што там казарма — з іншых падраздзяленняў ваеннага гарадка на наступны дзень людзі распытвалі будучых кухараў, што там у іх адбывалася перад адбоем!

Служба ў вучэбцы праходзіла ў строгай адпаведнасці з патрабаваннямі статутаў. Казалі, што стараслужачыя з ліку пастаяннага складу паспрабавалі былі падпарадкаваць сабе папярэдні набор курсантаў, але ў іх нічога не атрымалася: дзядоў тых было не больш за дзесяць чалавек супраць сотні духаў. Адбылася нейкая жорсткая сутычка, у выніку якой камандзіры ад граху падалей развезлі тых няшчасных дэмбеляў даслужваць у іншыя часткі па ўсёй Паўночнай групе войскаў.

Да службы Радзевіч і ведаць не ведаў, што савецкія войскі, якія размяшчаюцца ў краінах так званай Варшаўскай дамовы, утвараюць нейкія там групы. Калі б яго раней спыталі, дзе месціцца Паўночная група войскаў, ён не задумваючыся адказаў бы, што дзесьці за палярным кругам. Як высветлілася, было ў Еўропе яшчэ тры групы войскаў: у Германскай дэмакратычнай рэспубліцы знаходзілася Заходняя, у Балгарыі, Румыніі ды Вугоршчыне — Паўднёвая, а зусім побач, у Чэхаславакіі — Цэнтральная.

Жорсткі парадак і дысцыпліна, якія імкнуліся падтрымліваць камандзіры, зусім не палохалі і не напружвалі памяркоўных беларусаў. Радзевіча крыху засмучала, што сяржанты, намеснікі камандзіраў узводаў, залішне дыстанцыяваліся ад толькі на перыяд малодшых падна-

чаленых, ад чаго здаваліся да смешнага фанабэрыстымі, але Міхал іх цалкам разумеў: хлопцы баяліся даць слабіну, падарваць свой аўтарытэт.

Намеснік камандзіра трэцяга ўзвода, масквіч, малодшы сяржант Аляксей Дзянісаў, выглядаў маладзейшым за ўсіх пастаяннікаў з салдацка-сяржанцкага складу. Рост меў крыху вышэй за сярэдні, светла-русыя кароткія валасы, жарсткаватыя шэрыя вочы, хударлявы, у заўсёды падкрэслена чыстым ды ідэальна адпрасаваным адзенні, з бездакорным рускім маўленнем, такі сабе стойкі алавяны салдацік, як у думках ахрысціў яго Міхал. Відаць, крыху пабойваўся сваіх падначаленых Дзянісаў, таму і імкнуўся, пры нагодзе і без, лішні раз нагадаць, хто тут галоўны. Але ад гэтых ягоных намаганняў выглядаць больш значным складалася ўражанне, што ў вучэбцы яго пакінулі зусім не за нейкія там асаблівыя лідарскія якасці, а проста пашкадавалі, што дзе-небудзь у дывізіі яго з'ядуць стараслужачыя.

Двух беларусаў, Алега Чарняка ды Міколу Сініцу, Дзянісаў прызначыў камандзірамі аддзяленняў. Міхал чамусьці пазайздросціў хлопцам, бо лічыў сябе таксама вартым гэтай пасады, якая не давала ніякіх прывілеяў, а наадварот, абцяжарвала дадатковымі абавязкамі. Несці адказнасць за трэцяе аддзяленне павінен быў стаўрапалец Віктар Ламаносаў.

Пацягнуліся доўгія аднастайныя дні курса маладога байца: пад'ём, зарадка, прыбіранне кубрыка, мыццёгаленне, сняданак, страявая, потым фізічная падрыхтоўка, абед, палітінфармацыя, зноў фізічная і страявая падрыхтоўкі, вячэра, вольны час, калі ўсе павінны перашыць бялюткую падшыўку на каўняры кіцеля ды напісаць лісты дадому, потым абавязковы прагляд інфармацыйнай праграмы «Время».

А яшчэ кожны трэці дзень узвод заступаў у нарад: адно падраздзяленне дзяжурыла ў казарме, другое ў сталоўцы, трэцяе ў вучэбным корпусе. На шчасце, каравульную службу для курсантаў адмянілі.

Штаб вучэбкі знаходзіўся на другім паверсе казармы, таму дзяжурства ў «распалажэнні» было самым непрывабным: пастаянна даводзілася гарлаць «смірна» таму, хто стаяў на тумбачцы пад гадзіннікам ля ўвахода, бо туды-сюды бясконца соўгаліся начальнікі; і няспынна даводзілася мыць узлётку — даўжэзны калідор, які, безумоўна, наўмысна быў вымашчаны бялюткай рабрыстай пліткай, на якой кірзавыя салдацкія боты ці афіцэрскія чаравікі пакідалі такія тлустыя чорныя шнары, што без мыла і адмысловай шчоткі іх немагчыма было адцерці.

Пачалі наладжвацца чалавечыя сувязі. Найперш усе трымаліся сваіх землякоў, але, папахадзіўшы ў нарады з прадстаўнікамі розных рэгіёнаў, паступова пачалі кантактаваць з тымі, з кім знайшліся агульныя інтарэсы. Абсалютна непадобныя знешне — азіяты, каўказцы, славяне — усе яны былі прадуктамі адной сістэмы выхавання, адной ідэалогіі, прадстаўнікамі аднаго пакалення, таму не дзіва, што вельмі хутка першапачатковая напружанасць у стасунках паміж асноўнай масай курсантаў знікла. Хлопцы распытвалі адзін аднаго пра тыя мясціны, з якіх паходзілі, дзяліліся сваімі жыццёвымі гісторыямі.

Міхал Радзевіч падрабязна даведаўся і пра лёс самага нягеглага курсанта ў вучэбцы, які не ведаў, дзе права, дзе лева, ад чаго меў процьму праблем на страявой падрыхтоўцы; не ведаў геаграфіі: на палітзанятках замест СССР паказаў на мапе Кітай, не ведаў ён і табліцы множання, не мог ні разу падцягнуцца і без страты прытомнасці прабегчы болей за паўкіламетра. Калі раней

падобны недарэка найхутчэй проста здзівіў бы Міхала, то гэты яго шакаваў, бо быў найбліжэйшым земляком, які не адыходзіў ні на крок і нават не разумеў, што сваёю дрымучай неразвітасцю кідае цень на ўсіх беларусаў. Вельмі часта Радзевічу даводзілася чуць пытанні кшталту: «У вас там усе такія?», «І шмат у вас там такіх?», «Адкуль ты яго такога выпараў?». Але збегчы ад Шпачка не было куды, хоць і вельмі часта, нягледзячы на абяцанне ягонай маці трымацца разам, карцела...

У бацькі Вацлава Шпакоўскага нарадзілася тры дачкі, а яму, як гэта часта бывае, вельмі хацелася сына, спадкаемца роду. Безвыніковыя спробы абзавесціся яшчэ адным мужчынам у сям'і далі плён, калі малодшай дачцэ Шпакоўскіх пайшоў ужо дзясяты год. У дзвюх старэйшых ужо былі свае дзеці — таксама дзяўчаткі. Калі Вацiку споўнілася пяць годзікаў, бацька раптоўна памёр ад сардэчнага прыступу. Неўзабаве развялася з мужам Вацікава старэйшая сястра і з дзвюма дочкамі вярнулася ў бацькоўскі дом. Хата ператварылася ў жаночы пансіён з адпаведнымі атрыбутамі: хусткі, сукенкі, калготкі, станікі, карункавыя накідкі на падушкі, аздобленыя вышыванымі кветкамі, прасціны ды насоўкі... А яшчэ бясконцыя жаночыя гаворкі пра горкую долю, слёзы ды галашэнні пры нагодзе і без...

Кожны год на ўсё лета прыязджала ў вёску да маці і сярэдняя Вацікава сястра таксама з дачкой... Такім чынам складаўся поўны камплект, як у той показцы: восем дзевак — адзін я.

Ні пра якое там ужо мужчынскае асобнае выхаванне ў такіх умовах для адзінага хлопчыка ў сям'і і гаворкі не было. Як усе ў доме, Вацік добра ўмеў вязаць, вышываць, цыраваць адзенне, прышываць гузікі, учыняць цеста для піражкоў і кіпяціць бялізну, але што тычыцца

самых звычайных хлапечых заняткаў, такіх як гульня ў футбол ці хакей, элементарнае катанне на ровары, страляніна з рагаткі, выразанне лука і стрэлаў — дык яны яго не цікавілі абсалютна.

Гадоў да дванаццаці Вацлаў насіў калготкі, даношваў за старэйшымі кашулі ды нагавіцы і не задумваўся нават, з якога боку на іх гузікі ці шырынкі, пакуль у школе не пачалі дражніцца дзеці. Яшчэ ў пятым класе ў яго маўленні, калі ён гаварыў пра сябе, надзвычай часта дзеясловы прошлага часу набывалі форму жаночага роду: я схадзіла, чытала, малявала...

Але несумненна самай галоўнай хібай жаночага выхавання і асяродку, у якім гадаваўся Вацік, было тое, што хлопчык абсалютна не ўмеў пастаяць за сябе, даць здачы любому крыўдзіцелю.

Не дзіва, што з вучобай не заладзілася ад самага пачатку: школьнікі кпілі з нязграбнага хлопчыка бязлітасна, жорстка і нястомна, як толькі і ўмеюць дзеці, ні на хвіліну не забываліся на недарэку, не даючы і секунды спакою, таму натуральна, што Вацік ненавідзеў школу і рабіў усё што мог, каб толькі лішні раз туды не трапляць: прыкідваўся хворым або браў кавалачак сала і скарынку хлеба ды хаваўся на час заняткаў у густым хмызняку, што рос якраз напаўдарозе паміж школай і хатай.

Калі нарэшце прамінулі бясконца доўгія восем школьных гадоў, настаўнікі з радасцю намалявалі ў пасведчанні Шпакоўскага аб базавай адукацыі мінімальныя станоўчыя на той час траякі, абы не вылоўліваць зацятага партызана ў тых абрыдлых хмызах яшчэ пару гадоў, і з чыстым сумленнем выпусцілі на прасторы жыцця.

На наступныя два гады прасторы тыя абмежаваліся сценамі бацькоўскай хаты, тэлевізарам, гародамі ды хлявамі на падворку, з адзінкавымі выхадамі з маці на працу

ў калгас, дзеля таго толькі, каб любая дзяржава не абвінавацiла хлопчыка, крый божа, у дармаедстве.

Затым былі дзіўныя провады ў войска: з мужчын — толькі Вацік і муж сярэдняй сястры, які аж за галаву хапаўся ад відовішча: штук дваццаць баб на падпітку галасілі, як на хаўтурах!.. Старэйшы не вытрымаў: выжлукціў пляшку гарэлкі і адключыўся. Малодшаму давялося паўночы аднаму выслухваць карысныя парады вопытных жанчын: ні з кім не сварыся і не біся, не пі, апранайся заўсёды цёпла, калі нехта будзе крыўдзіць, не бойся, скардзіся камандзіру, а яшчэ мой муж-нябожчык расказваў, як у іх было…

Самым прыемным успамінам з мінулага, якім Вацік з радасцю цяпер дзяліўся з новымі знаёмымі, была згадка пра апошнія тыдні перад войскам:

— Сядзіш, бывала, увечары на цёплай печы, а тут маці прыходзіць з крамы і прыносіць мае любімыя цукеркі «Муркі-кароўкі», ведаеце? Малочныя, цягучыя такія… Смаката...

Слухачы аж заходзіліся ад смеху не толькі ад той апантана-прагнай інтанацыі, з якой гаварыў Шпачок, той непаўторнай мімікі, калі ягоны доўгі носік пачынаў варушыцца ўверх-уніз, як пыса мурашкаеда, але найперш ад той інтэрпрэтацыі назвы цукерак, якія ведалі ўсе савецкія дзеці: на жоўтай абгортцы малюнак кароўкі і надпіс «Му-му». Вось вам і «Муркі-кароўкі»…

Доўгі час ніхто не папраўляў Вацлава, а толькі перыядычна прасілі распавесці яго пра любімыя цукеркі, нібы гэта быў надзвычай дасціпны анекдот. Да таго ж гаварыў ён на такой сакавітай трасянцы, ад якой у людзей, для якіх руская мова была роднаю ці добра засвоенаю, вушы скручваліся ў трубачку і закіпалі мазгі. Азія-

ты і каўказцы, калі чулі Шпакоўскага, проста думалі, што гэта яны не вельмі добра ведаюць агульнадзяржаўную. Зрэшты, сярод іх сапраўды было некалькі хлопцаў, якія практычна зусім не гаварылі і не разумелі па-руску.

З другога боку, беларускія словы аказаліся такімі «заразнымі», што праз пару тыдняў уся вучэбка ўжывала некаторыя перліны з лексікону Вацлава, нават намеснік камандзіра ўзвода, масквіч Дзянісаў, цяпер, калі выказваў згоду, гаварыў нашае «добра», толькі на рускі манер з мяккім «р» — гучала смешна: «добре». Будуць некалі ламаць галовы лінгвісты: скуль у каўказскіх ды азіяцкіх мовах яўныя беларусізмы.

Радзевіч таксама незласліва кпіў з земляка, бо наіўна спадзяваўся, што дапамагае тым самым развіць у ім элементарную абачлівасць, недавер да ўсіх і да кожнага, звычку хаця б збольшага задумвацца над тым, што гаворыш і што робіш. Як ні тлумачыў Міхал Вацлаву, што ён зрабіў не так, дзе памыляецца, але ўсё было бессэнсоўна: сваёй звышнатуральнай прымітыўнасці той ніяк не ўсведамляў і не імкнуўся мяняцца.

Дзякуй богу, хоць навучыўся выконваць элементарныя каманды: направа, налева, кругом ды хадзіць у страі з усімі ў нагу. Пасля доўгіх трэніровак на чале з усімі беларусамі вучэбкі недзе праз месяц службы дабіліся, што на вячэрняй паверцы ўсе курсанты перасталі зараць перад прозвішчам Шпакоўскага ў чаканні мульцяшнага «Я!»: цяпер яно гучала цалкам стандартна.

Таксама намаганнямі ўсяе беларускай дыяспары школы ваенных повараў навучылі Шпакоўскага больш-менш прыдатна чытаць тэкст ваеннай прысягі, якую мусілі прыняць трыццаць першага снежня, якраз напярэдадні Новага года.

## IV

Не тое што сумаваць па доме, але і проста падумаць, паразважаць, памарыць у вучэбцы не было калі: усё па распарадку, дакладна, хутка, інтэнсіўна. Нават так званы вольны час прызначаўся для канкрэтных мэтаў: адпраць, адпрасаваць і падшыць падкаўнерык.

Кожныя трэція содні — у нарад, а там у самым лепшым выпадку чатыры гадзіны сну, таму найперш усім хранічна хацелася спаць. У першыя тыдні службы здараліся выпадкі, калі хлопцы засыналі на нагах, проста ў страі.

Елі таксама дакладна па гадзінніку, і не сказаць, каб кармілі кепска, але рэакцыяй арганізма на такую пунктуальнасць было невыноснае пачуццё голаду, што з'яўлялася акурат за гадзіну да наведвання сталоўкі. Таму перажыць гэтую адну гадзінку было сапраўднай пакутай. А паколькі прымалі ежу тры разы на дзень, то адпаведна тры гадзіны на працягу содняў хлопцы не маглі думаць ні пра што на свеце, акрамя патрэбаў страўніка.

Да таго ж пастаянныя спартовыя заняткі ды страявая падрыхтоўка забіралі шмат энергіі. Нават жаўнеры з рамонтнага ўзвода ды будаўнікі, гледзячы на штодзённасць курсантаў вучэбкі, кпілі, што на самай справе іх рыхтуюць да службы ў батальёне выведкі ці спецыяльнага прызначэння.

Але набліжэнне любімага свята адчувалася і тут. Ніякіх знешніх прыкметаў не было, нават снег так і не лёг: сыпануў неяк няўпэўнена некалькі разоў і следам растаў. Відаць, нешта святочнае лунала ў паветры, даносілася з-за агароджы. А ў ноч на дваццаць пятага снежня і зусім здарылася нешта няўцямнае: неба над горадам расквецілі феерверкі і нават у казарму пракраліся радасныя воклічы — каталіцкае Раство, патлумачылі камандзіры.

Такога свята нашыя людзі тады яшчэ не ведалі, нават Вацік, бабка якога час ад часу ездзіла памаліцца ў касцёл аж у Гародню.

Прысяга — лухта: якое гэта свята? Толькі адказнасці пасля яе паболее: усякія там нормы статутаў пра дэзерцірства і ўсё такое. Пастроілі, як на паверку, толькі на вуліцы і са зброяй, кожны выйшаў, як паклікалі, са строю, перад сваім узводам прачытаў тэкст з чырвонай тэчкі, потым прамаршыравалі перад кіраўніцтвам вучэбкі і ўсё. Хаця не, не ўсё — абед далі святочны: плоў і па два вараныя яйкі.

Цікава, што ж будзе ўвечары? Новы год жа! Першы Новы год у жыцці, калі Міхал Радзевіч не дома. Колькі ён сябе памятае, уся вялізная радня збіралася ў дзедаўскай хаце ў Калюгах. Раней бацька, а апошнія пару гадоў Міхал прыносіў з лесу ёлку. Дружным натоўпам дзеці ўпрыгожвалі яе бліскучымі цацкамі, некалькі штук з якіх мелі яшчэ даваеннае паходжанне — як толькі ацалелі? Жанчыны гатавалі цэлыя тазы разнастайных салатаў: гарошак, селядцы пад шубай. Наразаліся гарадскія прысмакі: доктарская каўбаса ды сервелат. Мужчыны пілі гарэлку, жанчыны віно, дзецям пад бой курантаў дазвалялі паспытаць па глытку «Савецкага шампанскага» — смаката нечуваная. На мінулы Новы год Радзевіч яшчэ піў свой запаветны дзіцячы глыток, але пра гэта ён тут нікому не скажа: многія хлопцы выхваляліся, што да арміі з рэстаранаў не вылазілі. Хлусілі, напэўна ж. Ды ён ім і не зайздросціў зусім: куды там нейкаму рэстарану да іх вясёлай бяседы ў дзедавай хаце. Нічога лепшага няма і не можа быць ва ўсім свеце! Цяпер, здавалася, ён разумеў гэта асабліва выразна…

Зрэшты, і ў астатніх хлопцаў напэўна ж ёсць свае Калюгі, родныя і блізкія людзі, з якімі традыцыйна сустра-

каюць Новы год — адзінае несавецкае свята ў афіцыйным календары.

Увечары, пасля самай звычайнай, зусім не святочнай вячэры — пюрэ з рыбай, — усе хлопцы прыкметна прыціхлі, паглыбіліся ў свае патаемныя думкі: няўжо ўсё? Проста, як кожны вечар тут, прагучыць каманда «адбой» і яны палягуць спаць у такую незвычайную ноч? Як такое магчыма? Гэта ж проста злачынства!

Злачынства не адбылося! А палове на дзясятую хлопцаў зноў павялі ў сталоўку. Цяжка было паверыць сваім вачам, але цяпер вялікая абедзенная зала была аздобленая, як некалі спартовая зала ў школе на Новы год: па дыяганалях, крыж на крыж пад столлю віселі прыгожыя гірлянды з рознакаляровага дожджыку, на вокнах і сценах з'явіліся бялюткія сняжынкі, выразаныя з папяровых сурвэтак, зіхацела агеньчыкамі сапраўдная ёлка, а ўздоўж сценаў, чаго ніколі не бывала ў спартовай зале, утвараючы вялізную літару «П», стаялі сталы з сапраўднымі прысмакамі: яблыкі, цукеркі, пячэнне, хатняй вытворчасці пірагі ды пляшкі з раней ніколі не бачанай газіроўкай «Oranżadę». А яшчэ ля ёлкі, так каб было ўсім відаць, стаяў уключаны каляровы тэлевізар «Гарызонт» з «Ленінскага пакоя».

Але ўсіх курсантаў найбольш здзівіла, уразіла, па-сапраўднаму агаломшыла тое, што ў зале былі ўсе афіцэры і прапаршчыкі ў парадных строях, і прыйшлі яны сюды са сваімі жонкамі! Стала зразумела, што менавіта дбаннямі гэтых няўрымслівых жанчын у адарваных ад дому, знешне вялікіх, а па сутнасці звычайных, абсалютна чужых ім дзяцей будзе сапраўднае свята!

Яны маглі б выдатна адзначыць яго ў сваіх сем'ях, у сяброўскіх кампаніях, наведаць рэстаран, а яны, пакінуўшы дома сваіх малых, прыйшлі сюды, каб зрабіць

свята для тых, каму зараз па-сапраўднаму цяжка! Гэта было неяк нязвыкла высакародна і прыгожа!

Зусім не па-святочнаму засяроджаныя і прыцішаныя курсанты цяпер па-іншаму глядзелі на сваіх камандзіраў, многіх з якіх паспелі ўжо шчыра незалюбіць: аказваецца, яны таксама людзі, у іх ёсць сем'і, сябры, яны некага кахаюць, і хтосьці іх чакае дома…

Па тэлевізары генеральны сакратар віншаваў падначалены народ, нагадваў пра поспехі перабудовы і завяршэнне халоднай вайны, а дзясяткі хлопцаў разважалі над тым, у што немагчыма паверыць: упершыню за цэлы месяц яны бачаць жанчын наяве, а не ў сне!.. Якая Мальта? Хто такі Буш? Пры чым тут цеплаход «Максим Горький»*?

— С Новым, тысяча девятьсот девяностым годом, товарищи!

Ух ты! Якая смачная гэтая «Oranżadę», зусім як «Советское шампанское»!

Праз дзве гадзіны капітан Галкін, начальнік школы повараў, павіншаваў прысутных з Новым годам, які нарэшце дайшоў і сюды, пазычыў курсантам плёну ў баявой ды палітычнай падрыхтоўцы, а яшчэ праз паўгадзіны прагучала каманда «адбой»!..

А праз тыдзень здарыўся яшчэ адзін самы сапраўдны цуд. Неяк увечары ўсе курсанты — зразумела, акрамя тых, хто быў у нарадзе, — сядзелі ў «Ленінскім пакоі» і глядзелі галоўную савецкую інфармацыйную праграму «Время». Нехта слухаў дыктараў, нехта дапісваў ліст дадому, што не забаранялася, хтосьці спаў з расплюш-

---

* 2—3 снежня 1989 года ля Мальты на цеплаходзе «Максим Горький» адбылася неафіцыйная сустрэча Міхаіла Гарбачова і прэзідэнта ЗША Джоржа Буша-старэйшага, па выніках якой было абвешчана, што халодная вайна скончана.

чанымі вачыма — шмат у каго развіўся і такі неверагодны навык. Раптам аднекуль з першага паверха данёсся дзіцячы спеў! Жаўнеры прыслухаліся — не падалося! Спеў мацнеў і набліжаўся! Па калідоры другога паверха разнеслася гучнае рэха высокіх галасоў і дробненькі тупат не кірзавага абутку. Што гэта?! Дзверы ў пакой рэзка расчыніліся, і ў памяшканне ўварваўся спачатку зладжаны спеў нейкай народнай песні, а за ім увайшло з тузін дзяўчатак і хлопчыкаў у бялюткіх, як снег, вышыванках, з вяночкамі на галовах у дзяўчат. Нехта быў апрануты ў калматы кажух і маску казы, а маленькі хлопчык гадоў сямі трымаў на доўгім кіі залатую шматканцовую зорку! І хоць Радзевіч ніколі раней не чуў і не бачыў нічога падобнага, ён адразу зразумеў: валачобнікі! Усё, як распавядалі некалі старыя! У нейкае імгненне Міхалу нават падалося, што галасістая грамада спявае па-беларуску!..

Не, па-ўкраінску! Але ўсё адно гэта падарунак, гэта цуд!

Добрий вечір тобі,
пане господарю, радуйся!
Ой радуйся, земле,
Син Божий народився.

Застеляйте столи
та все килимами, радуйся!
Ой радуйся, земле,
Син Божий народився.

Та кладіть калачі
з ярої пшениці, радуйся!
Ой радуйся, земле,
Син Божий народився…

Шмат што праяснялася пад гэты цудоўны спеў: ледзь не хатняе святкаванне Новага года, спагада да сумных хлопчыкаў, якія апынуліся далёка на чужыне сярод незнаёмых людзей, цяпер і зусім для савецкай арміі неверагоднае — віншаванне з Божым нараджэннем… Усё гэта сталася магчымым таму, што значная частка афіцэраў і прапаршчыкаў школы — украінцы, а сярод жонак іншых камандзіраў пераважную большасць складаюць прыгажуні-ўкраінкі, якія не забыліся на сваю мову, свае карані, прышчэпленае бацькамі стаўленне да тых, каму цяжка…

Радзевіч пашукаў вачыма адзінага сярод курсантаў украінца, Валодзю Іўчанку — той аказаўся зусім побач, на суседнім радзе; хлопец ціха падпяваў дзецям і размазваў далонню па твары слёзы… Шчаслівы!..

Міхал ледзь стрымаўся, каб не заплакаць за кампанію…

Ён ведаў — валачобнікаў трэба абавязкова аддзячыць. Але чым? Каб мог, ён не шкадуючы аддаў бы гэтым дзецям усе скарбы сусвету за такі казачны напамін пра дом. Але тут ён на службе, ён — не гаспадар, яны тут усе казённыя людзі…

Кажуць, цэлы год цяпер не будзе шчасціць…

## V

Аднастайныя дні ў вучэбцы цягнуліся страшэнна марудна, а тыдні праляталі ў імгненне вока. Застаўся ў мінулым студзень, распачаўся люты, які тут абсалютна не адпавядаў сваёй назве: тэмпература была плюсавая, нейкі дробны нясмелы снег, што ўсё ж час ад часу церушыўся з пахмурнага неба, да абеду знікаў бясследна. І толькі на прыкметных узгорках, якія паўставалі на даляглядзе за горадам, бялелі снежныя шапкі.

Няўжо гэта і ёсць Судэты? Самыя сапраўдныя, ніколі ў жыцці не бачаныя горы. Дзіўна, Міхал не мог паверыць: уяўленне, падмацаванае кінафільмамі ды тэлебачаннем, малявала высачэзныя скалы, пікі якіх амаль заўсёды хаваюцца за аблокамі, а тут нейкія ўзгоркі, ці не такія ж, як у нас на Лагойшчыне. Там, незвычайна высокія для Беларусі, яны здзівілі Міхала, калі ён ехаў з аднакласнікамі на экскурсію ў Хатынь, а тут так званыя горы пакуль расчароўвалі.

А можа, гэта толькі ўскраіна вялізнага горнага масіву? І недзе далей, на паўднёвым захадзе, яны ўсё ж пераўтвараюцца ў сапраўдныя горы...

Аднойчы Міхал апынуўся сярод дванаццаці курсантаў, якіх адабралі для выканання нейкага спецыяльнага задання па-за межамі ваеннага гарадка. На ўскраіне места ў школы ваенных повараў была падсобная гаспадарка: некалькі хлеўчукоў, у якіх гадавалі свіней і два-тры цяляці на мяса. Час ад часу ў дапамогу тым хлопцам з ліку пастаяннага складу вучэбкі, што даглядалі жывёлу, накіроўвалі курсантаў. Туды памагатыя дабіраліся пешшу, і часта старэйшым прызначаўся нават не сяржант, а нехта з радавых. Прыйшлі, зрабілі тое, што загадаюць, і назад.

Але на гэты раз высветлілася, што выконваць тое спецыяльнае заданне жаўнеры будуць дзесьці далёка, бо іх павезлі на машыне, і хутка Явар зусім знік з поля зроку.

Магло скласціся ўражанне, што яны павінны ўвесці некага ў зман, хаваюцца ад упартай сочкі, заблытваюць сляды: аўтамабіль неверагодна часта паварочваў і рухаўся ў розных, нярэдка здавалася, што ў супрацьлеглых напрамках. Цікаўны Радзевіч прыліп да акна кунга і разглядаў навакольныя краявіды. Дарога на самай справе была пакручастаю: то падоўгу бегла досыць крута ўверх, і тады рухавік машыны аж заходзіўся ад напругі, гуў

усё вышэй і вышэй, як напятая струна, што вось-вось парвецца і тады надыдзе поўная цішыня аж да звону ў вушах, то рэзка зрывалася ўніз, і тады гук матору пераўтвараўся ў задаволенае буркаценне вялізнага драпежніка, што спатоліў нарэшце голад.

За пару хвілін міналі шматлікія невялікія вёскі з цаглянымі дамамі, спрэс крытымі чарапіцай. Ледзь не ў кожным паселішчы былі касцёлы, якія чамусьці больш нагадвалі кірхі з рэпрадукцый да нямецкіх казак.

Зусім неспадзявана аўтамабіль раптам выехаў на нейкую вялікую чатырохпалосную трасу, уздоўж якой пацягнуліся неабсяжныя і надзіва роўныя палі. Нішто сабе горны пейзаж!

У нейкі момант Радзевіч звярнуў увагу на вялізнае бялюткае воблака, што рэзка кантраставала з панурасвінцовым лютаўскім небам. Белая пляма павольна плыла насустрач аўтамабілю з правага боку. Можа, гэта такі дым? Час ад часу Міхал стаў пазіраць на самы прыцягальны аб’ект наваколля. І раптам усе, хто глядзеў на вуліцу, адначасова азваліся гучнымі воклічамі нечаканага здзіўлення.

— Халера! — выгукнуў ашаломлены Радзевіч.

Досыць далёка ад дарогі на даляглядзе паўставала грамада велічэзнай гары, вяршыня якой хавалася ў свінцовых хмарах, а прынятая за воблака бялюткая пляма была толькі яе маленькай заснежанай часткай.

Відаць, Судэты ўсё ж сапраўдныя горы.

Толькі праз чатыры гады, напрыканцы шчымлівай «Споведзі» Ларысы Геніюш, Міхал пазнае гэту самую высачэзную гару Судэтаў — Снежку. Аказваецца, і па яе схілах, прычым па абодва бакі дзяржаўнай польска-чэшскай мяжы, якая падзяляе акурат напалам знакамітую вяршыню, паспелі пахадзіць нястомныя ногі яго землякоў…

Машына спынілася ля нейкага адгалінавання чыгункі, спрэс засыпанага пілаваннем ды заваленага штабялямі дошак з аполкамі. Пад невялікім навесам шаргацела пілarama, з трубы маленькай прыбудоўкі павольна ўздымаўся шэры дымок, да пазнавальнага водару якога прымешваліся прыемныя пахі розных парод драўніны.

Спецыяльнае заданне, для выканання якога сюды і прывезлі будучых повараў вайсковага харчавання, заключалася ў тым, каб загрузіць дошкамі два вагоны, што стаялі тут жа на рэйках.

На шчасце, не толькі шырыня паміж рэйкамі польскай чыгункі была значна меншаю за савецкую, але і вагоны выглядалі проста лялечнымі, напэўна напалову меншымі за пачварныя імперскія баржы на колах.

І хоць хлопцы працавалі ў досыць хуткім і зладжаным рытме, пранізлівы сівер, што паціху дзьмуў, відаць, з блізкіх гор, абсалютна не даваў сагрэцца. Не такімі цёплымі аказаліся форменныя бушлаты, як здавалася. А што было б, калі б люты тут быў сапраўдным, з маразамі за дваццаць ды завеямі!

Але найбольш прыгнятала тое, што дошкі былі пакрытыя танюткім слоем падталай шэрані: дастаткова было ўзяць у рукі пару штук, як рукавіцы прамоклі наскрозь, а пальцы перасталі нармальна варушыцца.

Простая праца праз непрыдатную вопратку ды рукавіцы з адасобленым указальным пальцам, каб можна было націскаць на курок, ператварылася ў нейкае вытанчанае катаванне.

Настрой імгненна ва ўсіх сапсаваўся, дошкі паляцелі абы-куды: то не даляталі да вагона, то пераляталі на другі бок.

Як спецыяльна з пілармы выйшлі перакурыць рабочыя. Мабыць, відовішча ля вагонаў на самай справе

выглядала камічна: мужыкі пачалі рагатаць уголас і каментаваць нязграбныя высілкі «радзецкіх жаўнежаў».

Кпіны замежных пралетараў здаваліся нейкімі асабліва зняважлівымі ды злаславымі.

Яшчэ б якая хвіліна — і міжнароднага канфлікту было б не пазбегнуць. Але якраз у той момант, калі жаўнеры ўжо практычна перасталі шпурляць дошкі ў вагоны, а ў паветры залунаў водар немінучай сутычкі, ад купкі рабочых аддзяліўся адзін каржакаваты мужчына гадоў пад сорак і падышоў да найбліжэйшага з курсантаў.

Усе жаўнеры замерлі: гэтаму яшчэ што трэба?

Мужчына палез некуды глыбока ў кішэні сваёй курткі і раптам дастаў пару цёплых пальчатак з гумавым пакрыццём, працягнуў іх салдату:

— Прошэ.

Ад нечаканасці Міхал разгубіўся і замест вядомых яму польскіх слоў сказаў па-беларуску:

— Дзякуй вялікі…

Было відаць, што для мужчыны такая падзяка «радзецкага жаўнежа» таксама сталася нечаканасцю: ён нейк занадта пільна паўзіраўся сваімі пранізлівымі сінімі вачыма ў Міхала, нічога не адказаў і пайшоў да сваіх.

«Халера! Відаць, падумаў, што я так непазнавальна перакруціў «дзенькуе бардзо»».

Праз хвіліну паляк вярнуўся назад і раздаў усім курсантам такія ж спецыяльныя пальчаткі, якія ўжо прыкметна адагрэлі Міхалавы пальцы.

Рабочыя вярнуліся пад навес да пілорамы, а салдаты працягнулі грузіць вагоны цяпер зладжана і хутка, як і на пачатку.

Не болей як за гадзіну вагоны былі набітыя дошкамі. Заставалася чакаць прапаршчыка, які прывёз іх сюды

і паехаў па нейкіх іншых справах няма ведама куды. Хлопцы пайшлі пад сцяну навеса, туды, дзе раней курылі рабочыя: там было спецыяльна абсталяванае месца.

Па нейкіх там вайсковых нормах тыя з курсантаў, хто не курыў, павінны былі раз на месяц атрымоўваць цукар, а курцы — страшэнныя на выгляд і дужа смярдзючыя папяросы «Казбек». Нягледзячы на ўсю пачварнасць, «Казбеку» таго заўзятым курцам хапала максімум на дзён дзесяць, потым на папяросы пераводзілася мізэрнае грашовае ўтрыманне: астатні час яны вышуквалі недакуркі ў вадасцёках, выпрошвалі ў грамадзянскіх службоўцаў ці, калі выпадала такая магчымасць, чапляліся да замежных грамадзян.

Мабыць, толькі ў войску Радзевіч, які сам ніколі не курыў, па-сапраўднаму зразумеў усе перавагі здаровага ладу жыцця: курцы адчувалі натуральную ломку, бы наркаманы за дозу, гатовыя былі аддаць што заўгодна за смярдзючы недакурак «Казбека», у іх бясконца скакаў ціск, разладжваўся зрок і пухлі вушы! Так! Гэта не прыдумка! Выраз «хочацца так, аж вушы пухнуць» не з’яўляецца простай фігурай маўлення, а мае пад сабою рэальную падставу!

Натуральна, курцы і тут палезлі ў запляваную сметніцу па недапалкі. Глядзець на гэткае відовішча было брыдка. Якраз у гэты момант сціхла піларама і з-пад навесу пачалі выходзіць рабочыя. Першыя з іх паспелі заўважыць, чым займаліся «радзецкія» ў іхнай курылцы. Міхалу хацелася праваліцца скрозь зямлю ад сораму за сваіх таварышаў. На гэты раз ніхто з палякаў нават не пасміхнуўся: яны моўчкі падышлі да жаўнераў, дасталі пачкі з цыгарэтамі і працягнулі курсантам. Моўчкі закурылі. Праз некалькі хвілін той мужчына, што прынёс пальчаткі, сказаў да сваіх:

— Czas na obiad!*

І раптам паўтарыў для савецкіх:

— Пойдём с нами обедать, ребята!

— Proszę, proszę**, — падхапілі яшчэ некалькі галасоў.

Прыбудова ля навеса, з якой дыміла труба, аказалася невялічкай, але досыць утульнай і чысценькай сталоўкай, дзе ўладарыла пажылая пані. Гаспадыня не здзівілася дадатковым едакам, а толькі ўсхвалявана паўтарала:

— Bardzo proszę. Nie wystarczy chleba navseh! Jak nieprzyjemnie***.

Рабочыя ўсе як адзін адмовіліся ад хлеба, таму гасцям яго хапіла ўдосталь.

Тыя, хто паеў, вярталіся назад у курылку. Адтуль даносіліся гучныя воклічы і смех. Радзевіч не спяшаўся: тут было цёпла і пахла куды больш прыемна! Калі Міхал застаўся адзін за столікам, да яго падсеў той паляк, што прынёс пальчаткі і запрасіў абедаць: ён, мабыць, тут галоўны, калі ўсім распараджаецца.

— Ты беларус, хлопча? — раптам спытаў паляк панашаму.

Як такое магчыма? Міхал няўцямна ўтаропіўся ў паляка вачыма: не, ён, ведама, чуў, што ў Польшчы жывуць беларусы, але гэта на ўсходзе, вельмі далёка адсюль.

— Так, — нарэшце адазваўся Радзевіч.

— Я таксама. Мяне завуць Пётр Смык.

— Міхал Радзевіч.

— Дык яна ўсё ж яшчэ жыве?

— Хто? — не ўцяміў Міхал.

---

* Czas na obiad! (пол.) — час абедаць.

** Proszę — калі ласка.

*** Bardzo proszę. Nie wystarczy chleba navseh! Jak nieprzyjemnie (пол.) Калі ласка. Не хопіць хлеба на ўсіх. Якая непрыемнасць.

— Беларусь!

— Жыве, куды ж ёй падзецца?

— Проста ты не першы савецкі беларус, з кім я гавару. Але ніхто з іх двух слоў звязаць па-беларуску не мог.

— А як вы тут апынуліся?

— Тут шмат беларусаў жыве. Але большасць, як і ў вас, мовы не ведае. Мае бацькі з заходнікаў, як і асноўная частка мясцовых беларусаў. Тата ў трыццаць дзявятым ваяваў супраць немцаў у польскім войску, потым савецкі палон, Сібір. Каб там не згніць, запісаўся палякам, потым было новае войска польскае, цяпер прасавецкае. Пасля вайны ён застаўся ў Польшчы: яшчэ раз у Сібір не хацелася. Тут, на новых тэрыторыях, людзей не хапала, так і апынууўся ў Яленяй-Гуры, далёка ад радзімы, хаця заўсёды марыў жыць дзе-небудзь на ўсходзе. Яму было ўжо за трыццаць, калі на пачатку пяцідзясятых сюды з Беларусі прыехала маміна сям'я: быў нейкі перыяд, калі ў Польшчу выпускалі савецкіх грамадзян. Яны таксама запісаліся палякамі, абы збегчы з савецкага раю. Маці скончыла беларускую школу, бацька вучыўся ў польскай, але беларускую ў ёй выкладалі. Ды і матчыны бацькі, два браты, сястра — карацей, смешна было б у такой сям'і раптам загаварыць па-польску, не зразумелі б. Не мову, натуральна, а нагоду. Таму я гадаваўся ў беларускім асяродку. Калі пайшоў у школу, усе дзеці і настаўнікі пыталіся, адкуль я прыехаў, такі ў мяне адметны быў акцэнт. Што акцэнт! Час ад часу я мог наўпрост адказаць па-беларуску, бо абедзве мовы ведаў выдатна і не адчуваў розніцы. У нас у сям'і і кніг па-беларуску заўсёды хапала! Ты не падумай, я адукаваны чалавек! Сур'ёзна! Так! Я скончыў Вроцлаўскі політэхнічны ўніверсітэт, факультэт геаінжынерыі. Працаваў тут недалёка інжынерам на шахце, але потым за сувязь з «Салідар-

насцю» звольнілі… Цяпер крызіс у нас. Можна было б вярнуцца на былую працу, але шахта практычна не працуе… Таму пакуль тут: сям'ю ж нeяк карміць трэба… А ты адкуль з Беларусі, Міхал Радзевіч?

— Я з-пад Оршы.

— О, як далёка. І як там цяпер?

— Нібыта ўсё па-старому…

— А беспрацоўе ёсць?

— Здаецца, пакуль няма…

— А перабудова як?

— Пакуль не зразумела, буксуе перабудова…

— А ў людзей настрой які?

— Розны: у наменклатуры настальгія па мінулым і мяняць яны нічога не хочуць, а астатнія, здаецца, ужо не могуць жыць па-ранейшаму…

— Як думаеш, разваліцца Савецкі Саюз?

— Цяжка сказаць. Пакуль што не падобна, але і балты, і грузіны, і армяне, і малдаване ў адкрытую кажуць, што хацелі б выйсці…

— А беларусы як?

— Ніяк: адзін дзень адно гавораць, у наступны супрацьлеглае.

— У нас таксама весела: цэнтральныя ўлады дабіваюцца вываду савецкіх войскаў, а мы гадаем, што будзе, калі саветы сыдуць: ці не вернуцца немцы? Многія ж тут у такіх дамах ды кватэрах жывуць, гаспадары якіх жывыя-здаровыя зусім побач, у Германіі, і ў любы момант могуць заявіць свае правы… Як на вулкане сядзім…

— Радзевіч, паехалі, усе ўжо ў машыне! — паклікаў Міхала нехта з курсантаў.

Пётр Смык правёў Міхала да самага кунга. Развіталіся…

Усю дарогу да вучэбкі Міхал засяроджана думаў над незвычайнай пакручастасцю чалавечых лёсаў і пра дзіўныя супадзенні: ён адзін з беларусаў апынуўся ў гэтай камандзе і менавіта да яго падышоў мясцовы беларус — хіба не дзіўна?

На зямлю спусціліся прыцемкі і перамяшаліся з туманам: як ні ўглядаліся курсанты, а вялізнай гары з заснежанай вяршыняй больш не разгледзелі. Ці не прымроілася яна ім увогуле?

## VI

Кожны дзень пасля абеду ў курсантаў было хвілін трыццаць вольнага часу, на працягу якіх яны разбіваліся на купкі, дзяліліся навінамі з дому з землякамі, проста гаманілі са знаёмымі, па чарзе смакталі недакуркі смярдзючага «Казбека». Усё гэта адбывалася ў курылцы на малым пляцы. Нязменна з землякамі ўсе пераходзілі на родную мову. Усе, акрамя беларусаў. Хіба што Вацік Шпакоўскі расслабляўся і пачынаў балбатаць, як дома, на трасянцы. Зрэшты, найбольш цярпелі ад немагчымасці нешта выказаць патаемна рускія хлопцы, бо пры ўсім жаданні яны не маглі ў гэтым стракатым шматмоўным натоўпе пагаварыць так, каб іх не зразумелі.

Ужо некалькі дзён мінула пасля паездкі на пілараму, а Міхал Радзевіч усё згадваў пра гаворку з мясцовым беларусам. Ён не стаў нічога распавядаць пра гэтую сустрэчу астатнім землякам, бо іх відавочна падобныя рэчы не цікавілі: толькі беларусы з усіх курсантаў вучэбкі не трымаліся разам. Калі ўсіх астатніх родная мова аб'ядноўвала, то для беларусаў яна існавала дзесьці асобна, у іншым вымярэнні, не была нечым жыццёва неабходным. Алег Чарняк трымаўся разам са стаўрапольскай кампа-

ніяй, Ігар Спаткай далучыўся да масквічоў, Васіль Пятровіч пасябраваў з рускімі хлопцамі з Улан-Удэ. Толькі Радзевіч трымаўся асобна, а разам з ім Вацік Шпакоўскі. Наадварот, да іхнага тандэма хутка далучыліся ўкраінец Валодзя Іўчанка і масквіч Паша Герасімаў.

І вось нешта ўсё ж зачапіла Чарняка, нібы адчуў ён думкі Міхала. А магчыма, і свае меў такія самыя. Неяк, калі ў курылцы стаяў шматмоўны гармідар, ён падышоў да Радзевіча і наўмысна гучна, каб чулі ўсе, звярнуўся па-беларуску:

— Што ж гэта адбываецца, пан Радзевіч, усе на родных мовах гавораць, а ў нас нібы і няма сваёй?!

Адна гэтая фраза выклікала эфект вядомай бомбы: у курылцы ўсе імгненна змоўклі і ўтарапіліся на Чарняка і Радзевіча.

— Прапаную вашай мосці надалей таксама карыстацца роднай мовай у грамадскіх месцах! — працягнуў наўмысна пафасна Алег.

— Нічога не маю супраць, васпане! — пастараўся вытрымаць зададзены тон збянтэжаны Радзевіч. — Мяркую, што вашая прапанова слушная ды цалкам дарэчная!

У наступнае імгненне да хлопцаў падскочыў надзвычай рухавы маленькі таджык Хусан Рахімаў і, тыцкаючы пальцам то ў аднаго, то ў другога беларуса, узбуджана загаварыў:

— Дык вы, дык вы, — ён не мог знайсці патрэбнае слова. — У вас ёсць свая мова?!

— А ты думаў, толькі ў вас? — перадражніў няўрымслівага таджыка Алег.

— Дык вы не рускія?!

— А ты не ўзбек?! — у сваю чаргу не здаваўся Чарняк.

— Клас! Ніколі не падумаў бы… А скажыце яшчэ штонебудзь па-свойму…

Чарняк зірнуў на Радзевіча і спытаў:

— Вось бачыш, якім прыцягненнем валодае наша мова?

— Відавочна, нейкім надзвычайным!

— Ах…ець! — максімальна эмацыйна, як толькі мог па-руску, выказаў Хусан сваё здзіўленне. — Нічогачкі не зразумела!

— А то! Стаяць тут, балбочуць, усе такія важныя! Мы ад вас нічога не хаваем, хоць і маглі б. А вы нам косці мыеце ў нашай прысутнасці!

— Ды нічога мы нікому не мыем! — абурыўся Рахімаў. — Вунь мой зямляк зусім рускую не ведае! Як мне з ім гаварыць?! Ды ну вас у лазню! — махнуў рукой і вярнуўся да сваіх.

Беларусы пераглянуліся і па-змоўніцку ўсміхнуліся: ведай нашых!..

Звычайна, як распавёў хтосьці з пастаяннікаў, у часткі забіраюць па два-тры повары. У вялікія падраздзяленні могуць і болей узяць, але гэта адзінкавыя выпадкі. Усе пачалі задумвацца, з кім разам хацелі б служыць пасля вучэбкі.

Радзевіч разумеў, што ад аднаго кандыдата, Ваціка Шпакоўскага, яму нікуды не падзецца. Ды і шкада было небараку: які-ніякі зямляк. Але і цяжка было ўявіць, як можна ўвесь час быць з адным нягеглым Шпачком.

Валодзя Іўчанка, як высветлілася, быў камандзіраваны ў школу ваенных повараў з нейкага батальёна разведкі адзін, туды мусіў і вярнуцца пасля вучобы. З ім бы было, відаць, цікава служыць: разумны, кемлівы, дасціпны кіянін, да таго ж вызначаўся прынцыповасцю ды спагадай да Шпачка. Ён некалькі разоў стрымліваў нават Радзевіча, калі той пачынаў занадта апантана выхоўваць недарэку Ваціка.

— Ён жа твой зямляк! Не самы ўдалы, але нічога не паробіш, які ёсць! У мяне ніякага няма! Яму ж ад цябе маралі выслухоўваць куды як больш балюча, чым ад іншых...

Пасля такіх заўваг старонняга, па сутнасці, чалавека Радзевічу рабілася няёмка: ён і так гаротны, Шпачок той: то ўзводны чапляецца, то нампаліт спецыяльна, каб пасмяяцца, выклікае на палітзанятках:

— Та-ак! Курсант Шпакоўскі!

— Я!

— Адкажыце, якое воінскае званне мае намеснік камандзіра нашай школы па палітычнай частцы? — пытаецца старшы лейтэнант пра сябе любімага.

— Лейтэнант! — адказвае ледзь прытомны ад хвалявання Вацік.

Аўдыторыя ў каторы раз выбухае смехам.

— Адставіць! — супакойвае палітрук курсантаў. — Няправільна, — ледзь стрымліваючыся ад смеху, звяртаецца да Шпачка. — Другая спроба!

Вацік калоціцца ад панічнага жаху, нібы за няправільны адказ яго расстраляюць тут жа, здаецца, на вачах мізарнее больш звычайнага, ператвараецца з піянера ў акцябронка і ад страху чуе толькі палову падказкі:

— Старшы капітан! — вырываецца з яго няіснае воінскае званне з інтанацыяй беспадстаўнай надзеі.

Цяпер нават шыбы ў вокнах пазваньваюць ад зруйнавальнага рогату! Старшы лейтэнант нікога не супакойвае, рагоча разам з усімі і не можа спыніцца...

Па чырвоных ад сораму, крыўды і знявагі Вацікавых шчоках цякуць пякучыя слёзы. Ён спрабуе, як прамакаткай, нібы непрыкметна прыбраць іх рукавом гімнасцёркі, але нічога добрага не атрымоўваецца: з носа таксама па-здрадніцку пачынае цячы...

— Насоўка! — рыкае нампаліт.

Вацік пачынае нязграбна абмацваць кішэні — насоўка, як наўмысна, не знаходзіцца.

— Сядайце, таварыш курсант! — нарэшце падае каманду задаволены старлей.

— Ёсць, — ледзь чутна адказвае Вацік і апускаецца на крэсла.

Такая карціна паўтараецца на кожных занятках, калі выкладчык самай галоўнай дысцыпліны спрабуе высветліць у Ваціка Шпакоўскага званне кагосьці з непасрэдных ягоных начальнікаў.

Зацятая тупасць Шпакоўскага выводзіць Міхала з сябе: ну як ён за два месяцы службы не запомніць воінскія званні! Што можа быць прасцей?! Ужо маляваў яму сто разоў на паперцы ўсе магчымыя пагоны і спалучэнні на іх зорачак ды палосачак — бессэнсоўна. То ў яго малодшы маёр, то капітан старэйшы, а то яфрэйтар раптам ператвараецца ў старшыну — што гарызантальныя палоскі, што вертыкальныя, малыя зоркі ці вялікія — без розніцы! Ганьба!

Паабураецца, паабураецца Радзевіч ды змоўкне: які-ніякі, каб яму добра было, зямляк! Шкада дурня! Кінь такога аднаго — адразу зжаруць!

Здараліся выпадкі, калі Іўчанка заступаўся за самага нягеглага з наяўных беларуса, калі Радзевіча не было побач. Таму натуральна, што Ваціку Валодзя падабаўся і ён таксама быў бы не супраць служыць і надалей разам з добрым украінцам.

Ад усведамлення, што пасля вучобы ў школе з Валодзем дакладна не паедзе ніхто з новых сяброў, было сумна. Пакуль жа хлопцы асабліва не думалі пра бліжэйшую будучыню, а дзяліліся адзін з адным успамінамі пра мінулае.

Дзесьці пасля восьмага класа Радзевіч пабываў на экскурсіі ў Кіеве і цяпер ахвотна згадваў той непаўторны, шыкоўны тыдзень ва ўкраінскай сталіцы. Вельмі часта Іўчанку шчыра весялілі тыя ўспаміны беларуса, бо яны цалкам адпавядалі традыцыйным турыстычным маршрутам і вельмі аддалена нагадвалі кіяніну яго родны горад: як і паўсюль, прыезджыя бачаць толькі фасад.

Неверагодна, але Валодзя выдатна ведаў, чыім сынам быў Яраслаў Мудры*, пра гісторыю нядоўгага княжання Усяслава Чарадзея ў Кіеве, пра тое, што Уладзімір Караткевіч пачаў пісаць, калі вучыўся ў іхным чырвоным універсітэце**. Іўчанка нават чытаў «Лісце каштанаў»***! Не без гонару ўкраінец паведаміў, што ў Ялце пахаваны:

— Ваш знакаміты паэт Максім Багдановіч. Я па літаратуры народаў СССР якраз пра яго сачыненне пісаў.

Міхалу было няёмка перад Валодзем, бо ён, хоць і пабываў ва ўкраінскай сталіцы, з літаратараў ведаў імя толькі Тараса Шаўчэнкі, з навукоўцаў запомніў прозвішча Патон, і выключна як адмоўнага персанажа, які дастаў сваім «Барабанам» увесь Савецкі Саюз, згадваў спевака Мікалая Гнацюка. І гэта ўсё пра вялізную, найбліжэйшую суседку Беларусі!

— Нічога, прыедзеш пасля войска ў госці да мяне — даведаешся болей! І Вацлава з сабою вазьмі, няхай паглядзіць на маю радзіму, — часта запрашаў да сябе Валодзя новых сяброў.

---

* Сын хрысціцеля Русі князя Уладзіміра Святаславіча (з роду Рурыкавічаў) і полацкай князёўны Рагнеды Рагвалодаўны.

** Галоўны корпус Кіеўскага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі мае чырвоны колер.

*** Аповесць Уладзіміра Караткевіча, падзеі ў якой адбываюцца ў пасляваенным Кіеве.

— Штосьці мне падказвае, — кпіў з Ваціка Міхал, — што пасля войска пана Шпакоўскага і абцугамі ніхто з хаты нікуды болей не выцягне. Будзе ўсё астатняе жыццё на печы валяцца ды «Мурkі-кароўкі» жаваць!

— Усё астатняе не буду, а месяцы тры дакладна паваляюся! — абсалютна шчыра прызнаваўся Вацік. — Пасля войска можна ж тры месяцы нічога не рабіць? Праўда?

— Можна падумаць, што ты нешта да войска рабіў! Таксама сядзеў на печцы ды «Муркі-кароўкі» свае смактаў! Ды не на печцы нават сядзеў, а на карку ў сваіх баб сядзеў! — пачынаў заводзіцца Радзевіч.

— Ды супакойся ты, Міхал, сядзеў і сядзеў, — стрымліваў чарговую спрэчку землякоў-беларусаў украінец, — клопат вялікі. Ён пасля войска кааператыў свой, можа, арганізуе, грошай столькі заробіць, што ягоным жанчынам больш ніколі працаваць не давядзецца!..

Пра сваю сям'ю Іўчанка новым сябрам нічога падрабязна не распавядаў: бацька — аўтаінструктар, маці ў мастацкім музеі працуе, ёсць малодшая сястра, якая яшчэ школьніца, — і ўсё. Самая звычайная сям'я, што тут яшчэ гаварыць?

Масквіч Паша Герасімаў, які ўсё часцей і часцей бавіў вольны час з двума беларусамі і ўкраінцам, імкнуўся разам з імі трапіць у нарад, таксама нічога асаблівага пра сваё жыццё да войска не распавядаў: маці памерла, калі ён нарадзіўся, і хлопчыка гадаваў бацька разам са старэйшаю сястрой. Толькі адзін факт, які, відаць, для Пашы быў па-сапраўднаму значным, хлопец згадваў часта: яго бацька чалавек веруючы і з'яўляецца прыхаджанінам храма, у якім служыць нейкі надзвычай аўтарытэтны святар Аляксандр Мень.

З Міхалам і Валодзем Паша найперш гаварыў пра гісторыю, якую ведаў выдатна ў нейкім асаблівым, выразна

антысавецкім кантэксце: калі ўкраінец і беларус яшчэ мелі нейкія ілюзіі наконт магчымасці савецкай улады, як тады модна было казаць, з чалавечым абліччам, меркавалі, што ўсё сапсаваў Сталін, а Ленін быў добрым дзядзькам, то масквіч бэсціў Ільіча на чым свет стаіць, лічыў яго галоўным мярзотнікам усіх часоў і народаў і прыводзіў цэлую процьму аргументаў і фактаў, у якія цяжка было паверыць, але і абвергнуць не выпадала…

Мінаў сакавік, і ўсё часцей хлопцы дзяліліся сваімі думкамі наконт найбліжэйшай будучыні: напрыканцы красавіка і да сярэдзіны траўня яны ўжо будуць размеркаваныя па частках, а сказаць, што яны нечаму навучыліся па спецыяльнасці, немагчыма. Ды і як тут навучышся? Тая траціна часу, якая планавалася на вывучэнне спецыяльных прадметаў, замянялася працаю на гаспадарчым падворку, навядзеннем парадку на тэрыторыі, паркагаспадарчымі мерапрыемствамі ды бясконцымі спартовымі святамі. Нічога новага, акрамя таго, што ведалі да войска пра тэхналогію гатавання ежы, хлопцы не засвоілі. Было зразумела, што вучыцца гатаваць давядзецца ўжо непасрэдна на кухні салдацкай сталоўкі. Як у піянерскім летніку дзеці распавядаюць адно аднаму разнастайныя жахлівыя гісторыі, каб паказытаць нервы сябрам, і тым самым выдатна развіваюць творчую фантазію ды красамоўства, так і курсанты школы повараў ад нейкага часу распачалі дзяліцца сваімі больш чым цьмянымі ўяўленнямі пра тое, што і як трэба гатаваць, са сваімі калегамі па няшчасці. Але гэтае саматужнае навучанне мела большае дачыненне да дзіцячага фальклору, чым да нататак з кнігі «Пра смачную і здаровую ежу».

Хлопцаў неяк усё ж развезлі пасля сняданку па бліжэйшых вайсковых частках, каб прадэманстраваць увесь ланцужок гатавання абеду. Радзевіч адзін з беларусаў

вучэбкі апынуўся сярод курсантаў, якія павінны былі назіраць за прыгатаваннем ежы ў батальёне выведкі.

Найперш пайшлі паглядзець за працэсам атрымання прадуктаў на складзе. Апранутыя ў цёмна-фіялетавую форму хлопцы з нарада павінны былі перамяшчацца па частцы бягом. Відавочна было, што ўсе яны, акрамя сяржанта, былі аднаго прызыву з курсантамі. Кідаліся ў вочы незвычайны выгляд і паводзіны маладых разведчыкаў: пачварную брудную форму яскрава дапаўнялі аблiччы, на якіх чытаўся панічны жах, адбітак нейкай непазбежнай наканаванасці, хлопцы нікому не глядзелі ў вочы, а кожны рух нібы распадаўся на ланцужок драбнейшых, у выніку атрымоўвалася суцэльная мітусня, якая яскрава дапаўняла агульную нервовую атмасферу.

У нейкі момант Міхал затрымаўся ў пакоі з двума хлопцамі з нарада, якія набіралі бульбу ў вялікія жалезныя насілкі. І тады адзін з разведчыкаў узняў галаву, агледзеўся па баках і ўтаропіўся вялізнымі сінімі вачыма проста ў вочы беларуса:

— Ну здароў, Міхал Радзевіч!

Імгненная радасць, якая было дзесьці прамільгнула ў душы Міхала, тут жа змянілася панічнай разгубленасцю: Радзевіч мог паклясціся ўсім на свеце, што ніколі ў жыцці не бачыў гэтага чалавека раней.

— Не пазнаеш? — незнаёмец прачытаў неразуменне на твары курсанта. — Я Андрэй, Савіцкі Андрэй! Тоўсты! Барысаў, перасылку памятаеш? У нас ложкі побач стаялі!

— Тоўсты?..

Такім разгубленым Міхал не адчуваў сябе ніколі ў жыцці: перад ім корпаўся ў бульбяной кучы чалавек ці не ўтрая худзейшы за вядомага яму Андрэя Савіцкага. Калі б Тоўсты не загаварыў сам, Радзевіч ніколі б не пазнаў яго, зрэшты, ён і так не пазнаваў яго, нават

калі б Міхала катавалі бязлітасна і жорстка, патрабуючы сказаць, хто перад ім, Радзевіч ніколі не згадаў бы Андрэя.

— Што? Змяніўся?

— Не тое слова…

— Дык ты, значыцца, поварам будзеш?

— Так…

— І як там у вас у вучэбцы?

— Па-рознаму…

— Дзяды дастаюць?

— Не. У нас іх зусім няма.

— А ў нас лютуюць дзядулі.

Другі разведчык пасля гэтых слоў выразна ўтаропіўся ў Тоўстага, які цяпер больш нагадваў вязня канцлагера, чымся таго ранейшага ўкормленага самаўпэўненага прызыўніка.

— Нічога, вытрымаем, перажывем, затое потым…

Што будзе потым, Андрэй не дагаварыў: у пакой увайшоў сяржант і з вядомай кожнаму савецкаму чалавеку інтанацыяй падаў каманду:

— Шнель!

За ўвесь дзень, што правялі хлопцы побач на кухні, яны больш не абмовіліся ні словам. Андрэй нават ні разу не ўзняў вачэй на Міхала...

Калі вярталіся ў вучэбку, незвычайна засяроджаны Радзевіч разважаў над тым, што ўбачыў у разведбаце, над незайздроснаю доляй Тоўстага і дзякаваў богу, у якога так аддана верыла яго бабуля і якому моліцца бацька Пашы Герасімава, за тое, што накіраваў яго ў школу ваенных повараў, а не ў якую-небудзь чырванасцяжную кантужаную дывізію.

Было відавочна, што вучэбка — гэта толькі адтэрміноўка непазбежнага…

# VII

У сярэдзіне красавіка ўсталявалася абсалютна летняе надвор'е, ва ўсялякім разе недзе такое, якое ў Беларусі характэрна для канца траўня. Лісце на дрэвах не проста распусцілася, а і выразна шумела ад павеваў цёплага ветру, пад іх густымі шатамі лёг шчыльны цень. Не прыкрытыя брукам і асфальтам лапікі зямлі на тэрыторыі ваеннага гарадка, якім цяпер абмяжоўваўся навакольны свет курсантаў, нечакана зазелянелі свежаю травой. На вуліцы цяпер было куды больш прыемна знаходзіцца, чым у халоднай цёмнай казарме.

І калі адной пагоднай раніцай у штаб зайшоў незнаёмы старшы прапаршчык, сярод курсантаў імгненна распаўсюдзілася на гэты раз адзіная і бясспрэчная версія: купец!

Чым кіравалася начальства, незразумела, але праз якіх дзесяць хвілін у штаб паклікалі аднаго курсанта з другога ўзвода — Гаўрылава і двух з трэцяга — Герасімава і Шпакоўскага.

Міхал Радзевіч разгубіўся: няўжо разыходзіцца яго шлях са шляхамі новых сяброў?.. Хацелі ж разам паехаць… І як там цяпер Шпачок той будзе… Зрэшты ж, не зусім адзін: з Пашам яны ладзяць…

— Радзевіч! Дзе Радзевіч? — раптоўна даляцелі гучныя воклічы да Міхала.

Прамільгнула думка, што той купец збіраецца забраць аж чатырох курсантаў. Але насустрач ішоў Гаўрылаў:

— Ідзі, Радзевіч, хутчэй! Яны спыталі, з кім мы хочам разам служыць. У мяне свая кампанія ёсць, а хлопцы назвалі цябе. Так што паедзеце ўтрох…

Ужо праз паўгадзіны прыкметна ўзрушаныя сябры ехалі ў невядомасць пад брызентавым навесам у ЗІЛаўскім кузаве.

На пятліцах у прапаршчыка, які забраў іх з вучэбкі, былі эмблемы сувязіста, значыць, іх чакае служба ў нейкай частцы войскаў сувязі, і паколькі там патрэбна столькі повараў — частка тая дастаткова вялікая, не меншая, прынамсі, за батальён.

Не больш як праз гадзіну аўтамабіль спыніўся на першым святлафоры на ўскраіне нейкага горада, а яшчэ праз хвілін пятнаццаць, павіхляўшы па вулках, відаць, немаленькага места, заехаў праз стандартнага выгляду кантрольна-прапускны пункт на тэрыторыю ваеннага гарадка.

Тыя самыя, што і ў школе повараў у Явары, з чырвонай цэглы трохпавярховыя казармы ды пара атынкаваных шэрых будынкаў: штаб і сталоўка.

Старшы прапаршчык растлумачыў, што яны знаходзяцца ў горадзе Свідніца, дзе цяпер будуць служыць у асобным батальёне сувязі, і назваў нумар іх новай вайсковай часткі.

— Я ваш непасрэдны начальнік, старшы прапаршчык Пятроў, камандзір гаспадарчага ўзвода, — і пасля невялічкай паўзы чамусьці дадаў незразумелае: — Пакуль.

Камандзір адвёў новых падначаленых у сталоўку, дзе прадставіў хлопцам іх другога непасрэднага кіраўніка — начальніка сталоўкі, таксама старшага прапаршчыка.

У адрозненне ад высокага хударлявага Пятрова, начальнік сталоўкі Антонаў быў нізенькі каржакаваты суб'ект з відавочнымі прыкметамі першай стадыі атлусцення.

Пасада абавязвае быць укормленым. Адпавядае. Чалавек на сваім месцы. Ці месца яго так прыстасавала пад сябе?

Цікава: адзін і другі непасрэдныя начальнікі… Хто з іх больш непасрэдны? Хто з іх большы начальнік?

Пятроў сышоў, як сказаў, па справах, а начальнік сталоўкі пачаў распытваць хлопцаў пра нейкую лухту: хто

ўмее прыгожа пісаць ці маляваць — якія з іх повары, падобна, яго не надта цікавіла.

Ад Антонава хлопцы даведаліся, што ў ваенным гарадку акрамя батальёна сувязі размешчана фельд'егерская рота, якая забяспечвае дастаўку пошты для ўсёй паўночнай групы войскаў. Харчуюцца паштавікі разам з батальёнам сувязі ў гэтай сталоўцы, і ў іх ёсць свой кухар, які працуе разам з поварамі сувязістаў. Ён толькі жыве ў казарме фельд'егераў і выязджае з імі на вучэнні, а ў астатні час працуе па агульным графіку повараў тут.

Цікава: у пашталёнаў таксама бываюць вучэнні. Гэта як? Ну, дэсантнікі скачуць з парашутамі, пяхота то носіцца бы не ў сабе, то, бы краты, паглыбляецца ў нетры зямныя; танкісты соўгаюцца ў сваіх жалезных крэпасцях і шмаляюць з гарматаў па мішэнях, тут збольшага зразумела… А чым займаюцца на вучэннях пашталёны? Трэба распытаць пры нагодзе…

— Батальён сувязі складаецца з двух палявых вузлоў, скарочана ПВС, — (вядома ж, Антонаў сказаў паруску: ПУС). — Пры кожным ПУСе замацаваны повар. Жывуць повары ў гаспадарчым узводзе, але на вучэнні выязджаюць кожны са сваім ПУСам. Найчасцей на вучэнні вузлы ездзяць паасобку: адзін забяспечвае сувяззю штаб групы ў пастаянным месцы дыслакацыі, а другі трэніруецца ў палявых умовах. Калі на вялікіх вучэннях задзейнічаюць увесь батальён, то першы і другі ПУСы ўсё адно харчуюцца асобна: гэта ўсё ж аўтаномныя баявыя адзінкі...

У пакой увайшоў нейкі невысокі хлопец у кухарскім строі: на галаве бялюткі каўпак, з белай тканіны штаны і куртка, у руках фартух з прыкметнымі бруднымі плямамі.

— О! Якраз пра цябе гаворка, Сярожа! Знаёмцеся, гэта повар фельд'егераў Сяргей. Ён у самы бліжэйшы

час нас пакіне: дэмабілізуецца. Так бы мовіць, свой доўг радзіме сплаціў! Усё, цяпер ён вольны чалавек!.. Гэта я да чаго? — незразумела ў каго пацікавіўся старшы прапаршчык. — А! Сярожа, значыцца, звальняецца і фельд'егерам таксама спатрэбіцца новы повар. Казаў камандзіру, што пара шукаць замену? — звярнуўся Антонаў да дэмбеля.

— Пастаянна кажу! Ён мяне ўжо пасылаў некалькі разоў! Няма яму, бачце, калі ехаць у той Явар!

— Дык ты яму скажы, што хутка там усіх повараў разбяруць! — параіў начальнік сталоўкі.

— Ён ужо некалькім нашым прапаноўваў ісці на маё месца! Але ніхто не згаджаецца…

— А навошта мне тут непадрыхтаваны чалавек? Ладна, сам убачу твайго камандзіра — пагавару. Абед хто гатуе?

— Кротаў і Якіменка.

— Дарэчы, дзе яны?

— Яшчэ ранавата, пакуль не прыйшлі.

— Якое ранавата! Што значыць ранавата! — раптам ускіпеў прапаршчык.

— А што вы ад мяне хочаце?! Яны не прыйшлі, а вы на мяне крычыце! — у адказ павысіў голас Сяргей.

— Ладна, супакойся, — палагаднеў начальнік, — проста дастала мяне ўжо гэтая парачка: ніколі ў час не з'яўляцца. Дзякуй богу, хутка з'едуць. Па іх дакладна сумаваць не буду!

— А па мне будзеце, таварыш прапаршчык? — з прыкметнай іроніяй у голасе ўдакладніў Сярожа.

— Што па табе?

— Сумаваць, кажу, будзеце?

— А не пайсці б табе на х…, Сярожа!

— Пайду лепей да сваіх у казарму схаджу. Можа, камандзіра ўбачу.

— П…дуй ты ўжо куды-небудзь адгэтуль, дастаў!

Сяргей зірнуў на прыкметна агаломшаных папярэднім дыялогам маладых повараў:

— Яшчэ ўбачымся.

Невялічкі пакой, у якім заставаліся начальнік сталоўкі і маладыя повары, быў нечым накшталт склада: на зацягнутых фіранкамі шмат'ярусных паліцах, што цягнуліся ўздоўж усіх сцен, акрамя той, дзе былі ўваходныя дзверы, грувасціліся стосы самага разнастайнага посуду: шклянкі, талеркі, чарпакі, шумоўкі, відэльцы, лыжкі, каструлі, патэльні і розныя падобныя неабходныя на кухні рэчы. Але на сярэдзіне пакоя стаяў пісьмовы стол, на якім ляжалі нейкія накладныя, справаздачы, загады. Значыцца, гэта яшчэ і кабінет начальніка сталоўкі. Цяжка было падлічыць, колькі разоў хлопцы, ідучы сюды з камандзірам гаспадарчага ўзвода, уздымаліся ўверх, павачвалі, спускаліся ўніз: падарожжа па сталоўцы нагадала блуканне па якімсьці адмысловым лабірынце. Наўрад ці сюды можна было лёгка трапіць без спецыяльнай падрыхтоўкі ці правадыра. Сведчаннем таго, што ў гэтым пакоі вялікае начальства бывае рэдка, а магчыма і не трапляла сюды ніколі, былі пустыя пляшкі з-пад алкагольных напояў, што акуратнымі шэрагамі стаялі на ніжняй паліцы ля стала. Пераважалі бутэлькі з пазнавальнай этыкеткай і гіпнатычным надпісам для аматараў выпіць: «Столичная».

Без усялякага плафона, зверху пакой асвятляла самая звычайная голая лямпачка напальвання. Маленькае бруднае акно нагадвала пра сябе зусім не тым абсалютна бессэнсоўным тут шэрым чатырохкутнікам, якім выглядала, а нішаю пад самай столлю, у якой размяшчалася, і падказвала тым самым, што пакой знаходзіцца ў падвале. Гукі з паверхні сюды практычна не даходзілі.

Пасля сыходу фельд'егерскага повара Сяргея ў пакоі запанавала цішыня: адчувалася, што Антонаў не ведае, што рабіць далей са сваімі новымі падначаленымі.

— Халера! Ходзяць тут розныя, з думак збіваюць! — буркнуў прапаршчык і зноў замаўчаў.

Ён пацягнуўся да стала, узяў нейкую паперчыну, пакруціў яе ў руках, зрабіў выгляд, што спрабуе прачытаць, зноў паклаў на месца.

З калідора пачуўся гучны тупат салдацкіх ботаў. Начальнік сталоўкі ўтаропіўся ў дзверы. Праз імгненне ў пакой увайшоў нейкі старшы сяржант. Усю дарогу ён, відаць, бег і толькі перад дзвярыма ў кабінет начальніка сталоўкі спыніўся. Таму яму спатрэбілася некалькі секунд, каб суцішыць дыханне, перш чым нешта сказаць.

— Здражалатваршчпрапршчык, — нарэшце выбуркнуў нейкую няўцямную кашу сяржант.

— Здароў, Толік, — адгукнуўся Антонаў.

— Вось вы куды, значыцца, зашыліся! — звярнуўся сяржант да Пашы, Ваціка ды Міхала. — Думалі, не знайду!

— Э-э! Толік, прытармазі, іх сюды Пятроў прывёў знаёміцца! — азваўся начальнік сталоўкі.

— Пазнаёміліся і хопіць! Пятроў загадаў даставіць іх у казарму!

— А-а, зразумела. Ну тады бывайце, яшчэ ўбачымся.

— Направа! Крокам руш! — падаў каманду сяржант.

Хлопцы выйшлі ў доўгі цьмяны калідор і пабрылі да выхаду. Па тым, колькі разоў старшы сяржант блытаўся ў сутарэннях падвала, можна было зразумець, што ён тут бывае рэдка.

Калі нарэшце апынуліся на вуліцы, сяржант загадаў хлопцам стаць па росце ў шэраг:

— Направа! Крокам руш!

Сам пайшоў побач з міні-строем, бясконца прыгаворваючы:

— Левай! Левай! Раз-два!

Здавалася, што сяржант даўно нікім не камандаваў і гэты шпацыр прыносіў яму неверагодную асалоду. Яго чорныя вочы проста ззялі радасцю, а ўсё досыць сімпатычнае аблічча набыло той прыкметны выраз, які з'яўляецца ў драпежнікаў, калі здабыча праз імгненне непазбежна павінна трапіць у кіпцюры.

— Правае плячо наперад!

Павярнулі за рог казармы. Спінаю да сцяны, абапіраючыся ступнёю падагнутай левай нагі на мур, стаяў і курыў нейкі радавы: кручок і верхні гузік гімнасцёркі расшпіленыя, на незацягнутым рамяні вісіць ніжэй пояса нацёртая да нейкага ненатуральнага бляску спражка — відаць, што чалавек мае аж занадта вольнага часу.

— О! Кабаны! Гэта нашыя, Толік?

— Стой! Раз-два! — скамандаваў сяржант. — А то! Яны, родненькія! Дачакаліся нарэшце…

— Адкуль?! — спытаў радавы ў повараў.

— Я з Масквы, — першым адказаў Паша.

— Мы ўдвух з Беларусі, — адказаў за сябе і за Ваціка Радзевіч.

— Маскалік і два бульбашы… Цікавая кампанія. Не землякі, значыцца… Слухай, Толік, а ў нас яшчэ бульбашы ёсць?

— Ва ўзводзе няма, а ў першым ПУСе, здаецца, Гурыновіч і Фішман з Бульбандыі.

— Ой, не магу! Не гані, Толік: Фішман — бульбаш!

— Я сказаў, што ён адтуль, а пра тое, што бульбаш там ці не бульбаш, нічога не казаў! — з прыкметным абурэннем аспрэчыў сяржант.

— Ды ладна табе, Талян, гэта ж я так, не ўсур’ёз... А з Масквы маскалікі, здаецца, таксама ёсць?

— З другога ПУСа Трацьяк з Масквы дакладна. Гэта з нашага перыяду. А іншых я не ведаю. Ладна, потым пабазарым, баця чакае. Крокам руш!

На першым паверсе казармы размяшчалася гасцініца для камандзіровачных, на другім — першы ПУС, а на трэцім паверсе жыў, як неаднаразова давядзецца чуць у бліжэйшы час ад самых розных людзей новым поварам, самы прывілеяваны гаспадарчы ўзвод.

Хутка мяшкі з рэчамі, параднае адзенне і шынялі хлопцаў засталіся ў капцёрцы. Потым ім паказалі, дзе яны будуць спаць. Толік ні на крок не адыходзіў ад маладых кухараў і пастаянна прыспешваў, бы наперадзе хлопцаў чакала самая важная на сённяшні дзень справа. Калі засланлі ложкі, пайшлі ў пакой да камандзіра ўзвода.

Пятроў выдаў поварам эмблемы войскаў сувязі і чорныя пагоны з пятліцамі:

— Памяняйце зараз жа, а то вы са сваімі чырвонымі з космасу бачныя. Даю паўгадзіны. Потым вяртайцеся сюды.

Праз трыццаць хвілін хлопцы былі зноў у кабінеце камандзіра. Сяржант, падобна, увесь гэты час заставаўся тут.

— Значыцца так, таварышы салдаты, другі ПУС знаходзіцца на вучэннях, — пачаў з парога Пятроў. Тады, відаць, падумаў, што новенькія яшчэ не ведаюць, што такое ПУС, і працягнуў пасля невялічкай затрымкі: — Карацей, палова батальёна адсутнічае, таму наш узвод у поўным складзе знаходзіцца ў нарадзе. У звычайны час гаспадарчы і рамонтны ўзводы ад нарадаў вызваленыя. Ужо тыдзень хлопцы праз дзень сядзяць у нарадзе. А штодзённыя справы ніхто не адмяняў. Таму

сталоўка пакуль пачакае: калі ўсе збяруцца, тады будзеце па спецыяльнасці працаваць. Пакуль паходзіце ў нарады з астатнімі. Адзін на цэнтральны КПП, адзін на вароты ў парк і адзін у штаб. Зразумела?

— Так точна! — у разнабой адказалі хлопцы.

— Садоўнічы! — звярнуўся прапаршчык да сяржанта. — Развядзі! Па адным чалавеку адпаведна знімеш і накіруеш сюды. І глядзі там, каб маладых не чапалі мне! Усіх папярэдзь! А то ведаеш, што будзе?

— Ведаю, таварыш прапаршчык! — не хаваючы іранічнай ўсмешкі, адказаў Толік.

Праз пятнаццаць хвілін Міхал Радзевіч сядзеў у маленькім будыначку, дзе была кнопка, якая ўключала электрарухавік, што адчыняў і зачыняў вароты ў парк. Паркам называлася тэрыторыя, на якой размяшчаліся тэхнічныя майстэрні, запраўчная станцыя і гаражы для тэхнікі — боксы. Прыстаўлены Міхал быў да хлопца, старэйшага за яго толькі на адзін перыяд.

— Навабранец — дух, пасля прысягі паўгода службы — і ты кабан. Калі прыйшоў новы прызыў, ты — чарпак. Праз год — дзядуля. А як адтарабаніш паўтара года — дэмбель! — імгненна збольшага растлумачыў Радзевічу няхітрую тутэйшую неафіцыйную іерархію Герман (так звалі Міхалавага паплечніка па нарадзе).

Пасля некалькіх рытуальных пытанняў, адкуль хто родам, новы знаёмы Міхала, які не без гонару паведаміў, што паходзіць з Арлоўшчыны, прыкметна страціў усялякую цікавасць да маладога кухара і толькі праз кожныя пяць хвілін выходзіў на вуліцу пакурыць.

Уся сутнасць нарада заключалася ў тым, каб, зірнуўшы ў пуцёўку, выпускаць з парка ці, наадварот, запускаць туды рэдкія аўтамабілі. Няцяжкі занятак: націснуць час ад часу на кнопку. Два чалавекі тут былі патрэбныя

толькі затым, каб не пакідаць вароты без нагляду: днявальныя па чарзе хадзілі ў сталоўку, як тут было прынята казаць, прымаць ежу і бегалі ў прыбіральню.

Міхал хваляваўся за сваіх хлопцаў: як там яны? Паша Герасімаў самы дужы з іхнае тройцы: на паўгалавы вышэйшы за Міхала, спартовага складу, як характарызуюць людзей падобнага выгляду, ды і сталічная загартоўка — не абы-што. За яго турбавацца не варта: ён здольны пастаяць за сябе, любому дасць адпор, нікому мала не падасца. А вось Шпачок — праблема. Побач з яго дзіцячай камплекцыяй любы, самы нягеглы стараслужачы адчуе сябе героем.

Цэлых двое содняў хлопцы не бачыліся нават здалёк. І калі іх усё ж знялі з нарада, пагаварыць карцела ўсім, толькі практычна не было ніякай магчымасці: заўсёды побач знаходзіўся нехта чужы.

— Я ў штабе дняваліў, — шаптаў Міхалу Вацік, калі яго не маглі чуць староннія, — з вунь тым хлопцам, — ківаў Шпачок у бок чарнявага невысокага жаўнера з круглым праставатым тварам, — яго Віталікам завуць. Ён добры. Вунь той другі — Ігар, — цяпер доўгі носік Шпачка быў накіраваны на хударлявага кірпатага з вогненна-рыжымі кароткімі валасамі малодшага сяржанта, — такі паскудны! Ён на мяне наехаў, загадваў мыць прыбіральню! А я сказаў: добра, толькі заўтра гэтымі ж рукамі буду снеданне гатаваць! Ён страшэнна раззлаваўся, але адчапіўся, прымусіў Віталіка і прыбіральню мыць, і ўзлётку. Я толькі на тумбачцы стаяў. Віталік яшчэ не расшпілены, — працягваў дзяліцца сваім досведам Вацік, — ён адзін з вясенняга прызыву яшчэ не расшпілены. Ну, гэта значыць, калі месяцаў восем праслужыш і будзеш выконваць усе патрабаванні дзядуляў, не будзеш стукаць, то цябе расшпіляць: можаш хадзіць

з расшпіленым верхнім кручком гімнасцёркі, і больш ніхто з іншых салдатаў, нават дзяды, не можа табе загадваць нешта рабіць. Расшпілены — значыцца вольны! Мне гэта Віталік расказаў. Яны з Ігарам аднаго перыяду, але Ігара даўно расшпілілі, а Віталіка не, таму ён яшчэ кабан і павінен выконваць усе загады дзядоў і нават чарпакоў. У Віталіка былі залёты: ён неяк яшчэ даўно не здолеў растлумачыць падчас праверкі, скуль у яго сінякі на целе. Ён нічога не сказаў, але дзядам тады ўсё адно моцна ўляцела! Акрамя таго, павінен жа нехта быў да прыезду новых кабаноў абслугоўваць дзядуляў. Цяпер ва ўзвод прыйшоў малады кіроўца Лёха Камароў і мы ўтрох, так што Віталіка не сёння-заўтра расшпіляць! Ён кажа: дзедаўшчына — гэта крута! Там, дзе дзедаўшчына, служыць лягчэй, чым там, дзе ўсё па статуце! Тут максімум год памучыўся — і вольны, а там усю службу, да самага дэмбеля мучайся! Віталік казаў, што калі будзеш добра шарыць, ну, гэта значыць кеміць, хутка арыентавацца ў сітуацыі, дагаджаць дзядулям як след, могуць і раней, чым праз год, расшпіліць. Вунь таго хлопца, — Вацік паказаў на хударлявага невысокага чалавечка з нейкім адмыслова незадаволеным, злосным выразам на твары, — расшпілілі праз месяц пасля каранціну, самым першым. Дзяды неяк напіліся моцна, пачалі маладым фанеру прабіваць, а ён паспрабаваў бараніцца.

— Што значыць — фанеру прабіваць? — перабіў Міхал захоплены шэпт Ваціка.

— Ну, гэта калі да цябе падыходзіць дзядуля і кажа: фанера! Ты павінен стаць па стойцы «смірна» і адказаць: «Фанера новая, стодзюймовая к бою гатовая!» Дык вось гэты хлопец, яго Толік Малы завуць, Малы — гэта мянушка…

— Пачакай. А што пасля таго, як скажаш, што фанера да бою гатовая, павінна адбыцца?

— А! Ну, тады дзядуля б'е цябе вось сюды, — сказаў Вацік з такой інтанацыяй, нібы замест «б'е» прагучала слова «цалуе», і тыцнуў сябе ў сонечнае спляценне, — а ты павінен застацца на нагах. Зразумела?

Пасля гэткага красамоўнага тлумачэння Міхал здолеў толькі няўцямна кіўнуць: па ўсім бачна, што Ваціка ніколі моцна не білі, бо, падобна, ён зусім не ўяўляе, пра што гаворыць.

Шпачок жа, як ні ў чым не бывала, працягнуў, як яму, відаць, здавалася, надзвычай захапляльную гісторыю Толіка Малога:

— Каб ён стаяў і не рыпаўся, нічога б не было, а ён не проста павярнуўся да дзеда бокам, і той з усяе моцы прыпячатаў кулаком сцяну, дык яшчэ і штурхануў дзеда! Што там пачалося! Усім кабанам перапала, а Малога тыркалі галавой ва ўнітаз і ўсёй зграяй дубасілі цэлую ноч! Калі трохі працверазелі, падумалі, што Малы мёртвы! Ніякіх прыкметаў, што ён жывы, не было! Тады дзяды апранулі яго, паклалі ў коўдру, вывалаклі на вуліцу, перацягнулі праз агароджу і кінулі пасярод вуліцы, на праезджую частку, нібы ён пайшоў у самаволку і трапіў пад машыну! Уяўляеш! І на вочы нікому не трапіліся тыя п'яныя дзяды! Ачмурэць! Раніцою знайшлі Толіка, палякі ці нашы, невядома. Цэлы месяц у шпіталі пратрымалі! Ці не пяць рэбраў было зламана! Колькі ні распытвалі пракуроры ды следчы Толіка, што здарылася, ён казаў толькі: з лесвіцы ўпаў! Ён нават не ведаў, дзе яго знайшлі! Карацей, каб вельмі хацелі, даведаліся б, а так, калі сама ахвяра ніякіх прэтэнзіяў ні да каго не мае, усё і спусцілі на тармазах, — відавочна паўтараў не свае высновы Вацік. — Але дзяды спалохаліся не на жарт і, як

толькі вярнуўся Толік са шпіталя, адразу расшпілілі яго. Крута, праўда!

У сваёй радасці за Толіка Малога Шпачок выглядаў поўным вар'ятам: чалавека ледзь не забілі, яшчэ не вядома, як тое збіццё адгукнецца ў будучым, а Вацік у захапленні ад таго, як нядоўга Толіку давялося праць ды падшываць брудныя гімнасцёркі дзядоў. Яшчэ крыху, і здавалася, Шпачок выпаліць штосьці кшталту: вось бы і мне так!

Якраз у гэты час прагучала каманда строіцца на вячэрнюю паверку. Усе пачалі выходзіць з кубрыкаў і спускацца на вуліцу. Пастраеннем камандаваў Садоўнічы, той старшы сяржант, што забіраў маладых повараў са сталоўкі і разводзіў у нарадзе. Ён быў намеснікам камандзіра ўзвода. Дэмбелі, а іх у гаспадарчым узводзе было пяць чалавек, выйшлі з казармы ў тапках. Высветлілася, што спачатку адбываецца так званы вечаровы шпацыр: некалькі колаў па вялікім пляцы з гарланнем песень, а затым ужо пераклічка.

Вось гэтыя пяцёра, што цяпер імкнуцца прадэманстраваць сваю пагарду да агульных для ўсіх правілаў хаця б сабе і такім прымітыўным спосабам — прывалакліся ў тапках, толькі, можа, на якіх два гады старэйшыя за нас, але ў іх такія мацёрыя аблічча, што здаюцца яны старэйшымі гадоў на дзесяць, не менш. Цікава: гэта войска іх так падстарыла ці яны такімі былі і раней? Мо перажыванні за сваю неацэнную шкуру, калі іх па пяць разоў на дзень валаклі на допыты пасля збіцця Малога, такім чынам адбіліся на іхных аблічччах? Гэта называецца «сталі сапраўднымі мужчынамі»: збілі ўсёю хеўраю аднаго слабейшага за любога з іх, нават не паспрабавалі аказаць дапамогу, як непатрэбную рэч, выкінулі чалавека на вуліцу?..

Ну, перабаршчылі крыху, Толік, з кім не бывае? А ты малайчына, мужык! Нічога не сказаў следчым, не выдаў! Вось ад нас табе цукерка: можаш ужо ад сёння з расшпіленым кручком хадзіць. А тое, што і цяпер яшчэ мача з крывёю бывае, дык гэта дробязі, да вяселля ўсё пройдзе, як кажуць…

А магчыма, яны цэлы год не спалі: расшпіліць — расшпілілі Малога, але невядома, што ён сам пра свае рэбры думае. Можа, ён зусім не таму нічога не сказаў следчым, што вельмі хацеў павыхваляцца расшпіленым кручком перад сваім прызывам, а насамрэч Малы мог падумаць, што пара гадзікаў у дысбаце для ягоных крыўдзіцеляў — занадта слабое суцяшэнне, нераўназначная кампенсацыя за зламаныя рэбры ды адбітыя ныркі, таму, магчыма, вырашыў пакараць іх сам… Вось так разамлее-задрэмле аднойчы стомлены дзядуля, прысніцца яму родны дом, матуля, штосьці радаснае, каляровае, а ў гэты час і заспее яго, безабароннага, злапамятны Толік Малы, напрыклад, тыркне ў вуха шомпалам для чысткі аўтаматнай рулі — і ўсё, не прачнецца дзядуля, не пабачыць ніколі больш ні матулі, ні дома роднага, ні мора гарэлкі, ні таза піва, ні бабы з пышнаю …, ні дзеда Язава загаду*, нічога не пабачыць…

Змалку дзяцей вучаць, што павага іншых людзей, аўтарытэт здабываецца чалавекам доўгаю цяжкаю працаю, дапамогаю іншым, абаронаю слабейшых, а гэтыя пяцёра здабылі аўтарытэт праз збіццё і прыніжэнне тых, хто не мог адказаць? Цяпер яны ходзяць у тапачках,

* Ні дома роднага, ні мора гарэлкі, ні піва таз, ні бабу з пышнаю …, ні дзеда Язава загаду — словы з калыханкі для дзядоў: "Спи, наш дед, спокойной ночи, пусть приснится дом родной, баба с пышною п…ой, море водки, пива таз, деда Язова приказ об увольнении в запас". Язаў Дз. Ц. — міністр абароны СССР.

рамяні і зусім кінулі ў казарме... Нейкая крымінальная мараль, якую ўсе тут прымаюць за бясспрэчную ісціну! Нават небараку Шпачку зразумела яе няхітрая формула: спачатку ты цярпіш, а потым нехта павінен трываць твае выбрыкі і капрызы, сёння ты бяспраўны раб, а заўтра — рабаўладальнік, з адной толькі, але красамоўнай акалічнасцю: калі выжывеш...

Можа, коштам гэтага выжывання з'яўляецца больш ці менш паўнавартаснае вар'яцтва? Чаму б і не? Гэтая думка шмат што здольная растлумачыць: і хціваю зайздрасць да збітага на горкі яблык небаракі, і нічым не матываваную жорсткасць тых, хто збіваў... Цалкам верагодна, што некалі падчас вырабу з гэтых пяцярых «сапраўдных мужчын» іх так прэсанулі, што акрамя мужнасці яны набылі высакаякасныя псіхічныя адхіленні ды пажыццёвае маральнае калецтва.

Жанчыны традыцыйна спісваюць жорсткасць мужчын на гарэлку: як не п'е — нармальны чалавек, працавіты, спагадлівы нават, вып'е — звер зверам! Яны ж у войску не служылі, не ўяўляюць, што такое калектыўнае выхаванне мужнасці. А гарэлка, відаць, толькі каталізатар, вызваляе ўсё тое, што запісанае на падкорцы ў войску, прынамсі ў такім войску... Можа, яшчэ ў турме...

Радзевіч маршыраваў разам з усімі, нават падцягваў апошнія словы ў радках абсалютна незнаёмай песні, а сам ліхаманкава разважаў у думках над тым, што пачуў ад іншых і паспеў ужо разгледзець сам.

Ва ўзводзе, значыцца, чалавек трыццаць, пяцёра непадперазаных у тапках — гэта дэмбелі, двое з якіх — тыя самыя Кротаў і Якіменка, пра якіх згадваў начальнік сталоўкі. Значыцца, з імі давядзецца пазнаёміцца бліжэй. Нехта трэці таксама можа быць калегам-кухарам, бо з вучэбкі ўзялі нас трох, то і звальняюцца трое.

Халера, з пяці адмарозкаў, што ледзь не забілі Малога, верагодна, з трыма неабходна будзе яшчэ не адзін тыдзень, акрамя казармы, сутыкацца ў сталоўцы, можа, нават разам працаваць, пераймаць вопыт старэйшых, каб ім добра было… У тым кубрыку, куды пасялілі нас, відаць, жывуць толькі чарпакі з вясенняга прызыву, толькі тыя, хто адслужыў амаль год, і Лёха Камароў, хлопец нашага перыяду… Усяго ложкаў у нашым пакоі дваццаць, значыцца, калі адняць нашыя, кабанскія (і якая свіння прыдумала такую назву?), усяго ва ўзводзе шаснаццаць чарпакоў… Пяць дэмбеляў, шаснаццаць чарпакоў і чатыры кабаны — дваццаць пяць. І калі ва ўзводзе роўна трыццаць чалавек (а гэта зусім не факт!), то атрымоўваецца, нашых дзядоў усяго пяцёра! Няшмат… Ужо лягчэй… Зрэшты, тады ўся тая гісторыя з Толікам Малым выглядае неяк бязглузда: у іхным перыядзе суадносіны былі зусім не на карысць дзядоў: пяцёра супраць шаснаццаці! Тыя кабаны маглі самі лёгка, як тут кажуць, за дзень зачмарыць тых няшчасных дзядоў… Іх запалохалі? Пяцёра навялі страху на шаснаццаць? Неверагодна! Не, хутчэй, іх проста пераканалі, зачаравалі казкамі пра шчаслівую будучыню, спакусілі перспектываю раней ці пазней стаць паўнавартаснымі гаспадарамі чужых жыццяў!.. Вось і следчыя не паверылі, што Малога збілі дзяды: ні ў адным нармальным мозгу не магло ўкласціся, што пяцёра білі аднаго, а пятнаццаць, з якіх на месцы ахвяры мог быць кожны, ціхенька стаялі і назіралі… Пяцёра дзядоў… Нас чацвёра… Пяцёра дэмбеляў… Ага! Цяперашнія нашыя дзяды, вядома ж, таксама баранілі традыцыі, былі зацікаўленыя ў тым, каб паўладарыць над іншымі, калі прыйдзе час! Значыць, усё ж шаснаццаць супраць дзесяці, а не пяці… Хоць колькасная перавага і была на баку маладых, але

ім супрацьстаялі не проста крыху старэйшыя і фізічна дужэйшыя праціўнікі, а сапраўдныя адмарозкі, для якіх не існуе ніякіх тармазоў...

Тым часам поўнаю хадою ішла пераклічка. Як і раней у вучэбцы сяржант Дзянісаў, новы намеснік камандзіра ўзвода Садоўнічы прачытаў прозвішча Міхала, раздзяліўшы -дзь- на асобныя гукі, а -е- і зусім ператварылася ў -э-:

— Рад-зэвіч!

—Я!

Калі прагучала Вацікава прозвішча, за спінаю пачуліся скрозь смех каментары кшталту: пшэкі вярнуліся на сваю гістарычную радзіму!

— Ага! У якасці акупантаў! — рэзюмаваў нехта.

## VIII

Даўно ўжо прагучала каманда «адбой!», але падобна было, што ніхто не збіраўся спаць: тут і там чуліся гучныя воклічы, дзверы ў кубрык стаялі расчыненыя, з калідора даносіўся тупат.

— Атас! Дзяжурны! — крыкнуў нехта ў калідоры, і на імгненне на трэцім паверсе запанавала цішыня, у кубрыку ўсе застылі ў тых позах, у якіх іх заспеў воклiч. Акрамя трох новенькіх, у ложках ніхто не ляжаў.

Рыпнулі дзверы з лесвічнай пляцоўкі, ад тумбачкі днявальнага данесліся прыцішаныя галасы, потым цоканне падкаваных ботаў па плітцы ўзлёткі: падобна было, што нехта зрабіў некалькі крокаў у адзін бок, затым вярнуўся назад, зноў рыпнулі дзверы, а яшчэ праз паўхвіліны прыцішана прагучала:

— Пайшоў…

І зноў пачаў нарастаць шум, усе адначасова пачалі рухацца, нібы нехта нябачны адпусціў на магнітафоне кнопку «паўза», падобна было, што нават абарваныя на паўслове гаворкі так з паўслова і працягнуліся далей…

— Э-э! Пад'ём! Якога хера ўлягліся! — аберуч трасянуўшы Міхалаў ложак, зароў той рыжы малодшы сяржант Ігар, які паспеў ужо наехаць на Вaціка ў нарадзе.— Пайшлі ў капцёрку, зараз Паэта будуць расшпільваць!

Міхал не стрываў, надта цікава прагучала: «Паэта», — удакладніў:

— Каго?

— Каго-каго, Пушкіна! Лермантава, каго ж яшчэ, у нас тут адзін Паэт!

Міхал нічога не зразумеў з сяржантавага тлумачэння. Напаўдарозе да капцёркі ўсіх завярнулі ў ленінскі пакой: у невялічкай капцёрцы ўсе не змясціліся б. Сядаць на крэслы ніхто не стаў: сталі паўколам насупраць уключанага тэлевізара. Мэл Гібсан нешта няўцямнае хутка гаварыў па-польску. Нехта выключыў гук, перш чым Міхал пачаў услухоўвацца ў словы замежнай зоркі. Да тэлевізара выйшаў адзін дэмбель. На ім былі сподняя кашуля і форменнае галіфэ, а на нагах — тыя самыя тапачкі, што і на паверцы. Хтосьці з чарпакоў паставіў побач з тэлевізарам крэсла.

— Радавы Лермантаў! Ка мне! — скамандаваў дэмбель.

Да яго выйшаў той добры хлопец, як пра яго казаў Вацік, Віталік.

Паэт, значыцца, ягоная мянушка, а прозвішча на самай справе Лермантаў. Бывае ж!

— Па вашым загадзе прыбыў! — нібы афіцэру на пляцы, паведаміў Віталік.

Паэт тут адзін быў апрануты ў форму, у зашпіленай на ўсе гузікі і верхні кручок гімнасцёрцы, а рэмень

наўмысна быў зацягнуты тужэй за патрабаванні любых нарматываў, відаць, каб надаць выгляду адмыслова перабольшаную кабанскасць.

Дэмбель пацягнуўся да Паэта і не без намаганняў зняў з яго рэмень. Потым з тэатральнай павольнасцю, няспешна ссунуў спражку, тым самым ці не ўдвая павялічыўшы дыяметр рамяня, калі яго зашпіліць. Але ён не стаў чапляць рэмень на Віталіка, а таксама павольна наматаў яго да паловы на правую руку і зноў скамандаваў:

— Упор у крэсла прыняць!

Лермантаў абапёрся дзвюма рукамі на сядзенне крэсла.

З купкі чарпакоў хтосьці кінуў:

— Расслабся!

Дэмбель размахнуўся і моцна выцяў спражкай Паэта па адстаўленым азадку.

Міхал адвярнуўся: яны тут дакладна ўсе ненармальныя. Запар прагучалі яшчэ два ўдары. І здавалася кожны быў мацнейшым за папярэдні.

— Смірна! — зноў скамандаваў дэмбель.

Круглы твар Віталіка палаў чырванню, як сігнал святлафора, вялізныя сінія вочы былі поўныя слёз, і здавалася, вось-вось яны абрынуцца сапраўдным вадаспадам, які ўжо нічога не стрымае.

Дэмбель начапіў на ранейшае месца Віталікаў рэмень, які цяпер павіс адвольна і нічога не сціскаў, зноў дэманстратыўна запаволена пацягнуўся да Паэтавай шыі і расшпіліў кручок на каўняры:

— Усё: ты болей не кабан! Цяпер ты чарпак і вольны чалавек! Віншую!

Дэмбель паціснуў прыкметна збянтэжанаму Віталіку руку і пахлопаў па плячы. Следам да Паэта кінуліся віншаваць астатнія, найбольш радаваліся за таварыша чарпакі.

Калі амаль усе ўжо выйшлі з пакоя, Вацік таксама падышоў да Лермантава: яны ж ужо знаёмыя.

— Віншую! — мо крыху і занадта радасна, як для малазнаёмага чалавека, выпаліў Шпачок.

— Дзякуй, — неяк збянтэжана адказаў Паэт.

У сваю чаргу, тыя, хто яшчэ заставаўся ў пакоі, неяк з неразуменнем утаропіліся ў Віталіка. Ён адразу адчуў сваю памылку і выправіўся:

— Шарыш, кабан!

Цяпер можна было падумаць, што Вацік вось-вось заплача ад крыўды: ён жа ўжо лічыў Віталіка практычна сябрам…

Зноў здалося, што ўсе страцілі ўсялякі інтарэс да новенькіх, і хлопцы не прыдумалі нічога лепшага, як вярнуцца ў ложкі.

Гармідар на трэцім паверсе тым часам не толькі не зменшыўся, але і прыкметна ўзмацніўся.

— Паэт праставіўся не так ужо і сціпла, як можна было чакаць: пяць пляшак гарэлкі ўсё ж знайшоў, толькі плакаўся, што грошай няма, — гэта разважаў уголас той невысокі таўстун з круглым тварам і кучаравымі светлымі валасамі, якога Міхал за знешняе падабенства і гіпертрафаваны памер у параўнанні з арыгіналам паспеў ужо ў думках ахрысціць бройлерным Амурам.

— Я яму пазычыў, — азваўся той самы Герман, з якім паспеў пабываць у нарадзе Радзевіч.

— Навошта? Ты ж ведаеш — ён чмошнік*! Няхай бы хадзіў і надалей зашпілены!

Герман не паспеў нічога адказаць: у пакой забег Лермантаў і пачаў расштурхоўваць маладых кухараў, якія ляжалі ў ложках і рабілі выгляд, што спяць:

* Недарэка.

— Гэй, кабаны, пад'ём! З вамі хочуць пагаварыць! Бягом у капцёрку!

Чаго хацелі кабаны, тут нікога не цікавіла. Давялося зноў уздымацца і следам за Паэтам цягнуцца ў капцёрку.

— О! Бачыў, Фрол, — звярнуўся Герман да бройлернага Амура, — а ты кажаш, чмошнік! Ён яшчэ будзе самым лютым дзедам, вось пабачыш! За ўсе свае пакуты адарвецца на маладых!

Калі ўвайшлі ў капцёрку, Міхал заўважыў, што Лермантава з імі няма: дзесьці згубіўся па дарозе.

— О! Заходзьце, заходзьце, хлопцы, не бойцеся! — гаварыў адзін з тых дэмбеляў, якія былі на паверцы ў тапачках.

У капцёрцы было дзесяць чалавек: значыцца, Радзевіч у сваіх вылічэннях суадносінаў дэмбеляў і дзядоў на душу кабанскага насельніцтва не памыліўся.

І хоць па ўсіх прыкметах настрой у пакоі панаваў вясёлы, Міхал адчуў, як па спіне прабеглі мурашкі: адчувалася, што ад усіх гэтых людзей з усмешкамі на тварах нічога добрага чакаць не выпадае. Ды і ўсмешкі тыя былі больш падобныя да ашчэрвання драпежнікаў перад нападам.

Міхал разглядаў брыдкія чырвоныя ад гарэлкі абліччы і цяпер не адрозніваў, хто з іх дэмбель і крыху больш як праз месяц з'едзе адгэтуль, а хто будзе яшчэ паўгода на правах дзеда псаваць ягонае жыццё патрабаваннямі дадатковай працы, а магчыма, калі ён не будзе паспяваць задавальняць іхныя капрызы, і распускаць рукі. І здачы не дасі: старых крыўдзіць нельга!

— Ты, значыцца, з Масквы? — распытваў тым часам Пашу дэмбель.

— Так, з Масквы…

— З самой ці, можа, прыгарада якога?

— Побач з Арбатам жыву…

— Крута… Дзіця Арбата, значыцца, ну-ну…

— А вы абодва з Беларусі, землякі?..

— Так, мы з аднаго раёна, — адказаў за двух Міхал.

— А што гэта ў вас такія польскія прозвішчы ды і імёны?

— Звычайныя, беларускія, — зноў узяўся тлумачыць Радзевіч, — мы ж некалькі стагоддзяў у адной дзяржаве жылі…

— Міхал ці Міша?

— Мне ўсё адно: каму як падабаецца больш, той так і заве…

— А ты, значыць, Вацлаў? — пераключыўся следчы на Шпачка.

— Ага, Вацік… Так мяне ўсе завуць…

— Ну добра, хлопцы, зразумела. Мяне завуць Максім Кротаў, я тут адзін Максім, таму запомніць будзе проста, не пераблытаеце. Для вас я ніхто, дэмбель. Вось гэта, — паказаў ён на высокага смуглявага хлопца, — таксама дэмбель Аляксандр Якіменка. Вас сюды прывезлі замест нас: мы — повары. Незразумела толькі, чаму Пятроў прывёз трох, бо звальняемся толькі мы ўдвух. Ты не ведаеш, Толік? — раптам спытаў ён у сяржанта Садоўнічага.

У адказ той толькі адмоўна пакруціў галавой.

— Ладна, пазней разбярэмся. Дык вось, мы з Санем звальняемся. Значыцца, з заўтрашняга дня мы ў сталоўку ні нагой! Хопіць, мы сваю лямку адцягнулі…

— Э-э! Макс! Яны ж яшчэ ні халеры не ўмеюць! — раптам абурыўся нейкі хлопец з азіяцкай знешнасцю, што быў апрануты ў цяльняшку, як і яшчэ чацвёра.

— Знаёмцеся! — як ні ў чым не бывала працягнуў Максім. — Ваш дзед Рома Аліеў!

І працягнуў ужо да Ромы:

— Вось ты і павучыш, пакуль Вася не вернецца з выезду!

— Заўтра твая чарга сняданак гатаваць! — працягваў абурацца Аліеў.

— Усё! Я сказаў: хопіць! — агрызнуўся Кротаў тонам, які не прадугледжваў пярэчанняў. — Бяры аднаго ці трох адразу і наперад! Калі такое было, каб дэмбелі працавалі пры наяўнасці кабаноў?

Аліеў аж кіпеў ад злосці, але больш пярэчыць не стаў.

— Яшчэ адзін наш повар, таксама ваш дзядуля Вася Пунтус, цяпер з другім ПУСам на вучэннях, — зноў цалкам лагодным тонам працягнуў Максім. — Праз дні два яны павінны ўжо вярнуцца. Гэта, значыцца, у нас зноў жа дэмбель Юра Бандарэнка, кладаўшчык, — ён паказаў рукою на худога-худога цыбатага хлопца, галоўнай адметнасцю якога былі не толькі абсалютна белыя валасы, а і проста незвычайна брыдкае аблічча, на якое немагчыма было глядзець больш за секунду.

— Я ж таксама повар, толькі працую на складзе, — раптам азваўся пачварны Бандарэнка.

— А, і праўда! — тут жа падхапіў Кротаў. — Нас жа ўтрох з яварскай вучэбкі прывезлі, як і вас! Зусім забыў! Цяпер зразумела, чаму Пятроў трох узяў: нехта з вас пойдзе на месца Юры!

Міхал згадаў харчовы склад, на якім пабываў у разведбаце, і яму зрабілася зусім сумна ад перспектывы правесці паўтара года сярод цвілі і смуроду.

Толькі туды яшчэ не хапала трапіць! Як толькі магчыма трэба выкручвацца, каб застацца ў сталоўцы.

— Так, вось гэта, — Максім паказваў на чарговага дэмбеля, — Віктар Сакалоў. Ён вадзіцель. А гэта самы блатны і забяспечаны з тых, хто ў найбліжэйшы час вернецца дадому, — не без зайздрасці ў голасе казаў

Кротаў, — Андрэй Шумейка. Андруха ў нас працуе на батальённай свінаферме. Так бы мовіць, адмысловы спецыяліст па кабанах…

Усе зарагаталі, а Кротаў аж зайшоўся ад смеху і некалькі хвілін не мог спыніцца, каб працягнуць сваю місію па прадстаўленні сяброў.

— Смешнага нічога няма, — скрозь смех працягнуў тлумачыць Макс, — начальства лічы ніякага, а нешта прадаць заўсёды знойдзецца… Вось значыць як… Што ж, дэмбелі ўсе… Цяпер вашыя дзяды… Намесніка камандзіра, Толіка Садоўнічага, вы ўжо ведаеце, Рамана Аліева таксама, Вася Пунтус на вучэннях, яшчэ ўбачыцеся, такім чынам, вось гэта Сяргей Васільеў, ён возіць з гарнізоннай пякарні хлеб. Таксама кіроўца, — Кротаў паказаў на чарговага дзеда, — Лёха Малчанаў, — гэта быў той боўдзіла, які курыў за рогам казармы, калі сяржант вёў повараў са сталоўкі да камандзіра ўзвода ў першы дзень. — Усе? Нікога не прапусціў?

— А Махмуд?! — азваўся Садоўнічы.

— Прабач, брат, — цяпер Кротаў глядзеў на вусатага смуглявага хлопца, вельмі падобнага да персанажа індыйскіх фільмаў, — рэдка бачымся. Гэта Махмуд Забіраў, батальённы хлебарэз!

Махмудава ўсмешка была падобная да ідыёцкай грымасы, якія з'яўляюцца на тварах замежнікаў, калі яны ўслухоўваюцца ў абсалютна незразумелую мову і пры гэтым жадаюць прадэманстраваць прыязнасць да гаспадароў.

Міхал падумаў, што аднаго дзеда ўсё ж не палічыў: таго, што на вучэннях, Васю Пунтуса. Такім чынам, шэсць дзядоў на чацвярых маладых…

— Што ж, хлопцы, — зноў звярнуўся Максім да новенькіх, — вось і пазнаёміліся. Мы тут да вас прыгле-

дзеліся за тыя дні, што вы пабылі ў нарадзе, здаецца, вы нармальныя пацаны. Тады растлумачым вам правілы, паводле якіх мы тут жывем. Ёсць часткі статутныя і нестатутныя. Статутныя — гэта тыя, у якіх усё жыццё адбываецца па статутах, як у вас было ў вучэбцы. Цэлых два гады адбой-пад'ём, служба ды нарады: ніякай вольніцы! У нас квітнее дзедаўшчына! І гэта здорава! Яна зусім не такая страшная, як вы, напэўна, чулі яшчэ да службы. Там, дзе няма статутаў, служыць нашмат лягчэй! Як мы былі кабанамі, праўда, дзядулі нашы былі сапраўднымі ідыётамі, проста так з нас здзекаваліся, без усялякай прычыны збівалі штодзень і не давалі спаць! Мы напаўжывымі пачуваліся! Здавалася, прасцей павесіцца, чым такое трываць! Але ад нас усё змянілася: мы ад сваіх патрабавалі толькі выконваць такія-сякія даручэнні — і ўсё, ніякіх здзекаў! Не, ведама, за касякі каралі, але так сабе, без дай прычыны, ніколі!..

Выглядала, што ў іхным разуменні Толік Малы быў збіты да паўсмерці абсалютна справядліва... Нічога сабе: ніякіх здзекаў!

— Карацей кажучы, у нас тут такая сістэма: пакуль праходзіш курс маладога байца, ты — дух. Духі, праўда, жывуць асобна... Пасля прысягі духаў размяркоўваюць па ротах. Ад гэтага часу яны кабаны. Як вы цяпер. Ваша задача — выконваць усё, што загадваюць дзядулі: падшыць гімнасцёрку, памыць форму, пачысціць боты. Але самае галоўнае, каб у дзядуляў быў добры настрой, забяспечыць ім пасля адбою смачную пайку: бульбачкі насмажыць, плоў згатаваць, проста мяса таксама падыдзе, гарбата з прысмакамі, само сабой зразумела... Для повараў гэта не праблема... Уявіце, як тым кабанам, што не ў гаспадарчым узводзе служаць, выкручвацца даводзіцца: дзе што ўзяць і як прыгатаваць? Аднак спраўля-

юцца ж неяк… Калі прыходзіць наступны прызыў, кабаноў расшпільваюць, і яны больш не абавязаныя дзядулям дагаджаць, цяпер гэта не іхны клопат, ад гэтага часу яны чарпакі. Калі прыходзяць малодшыя на год, чарпакі аўтаматычна становяцца дзядамі: больш над імі нікога няма! Калі чарпака дзед яшчэ можа аб нечым папрасіць: нейкую дробную справу выканаць ці нават яшчэ абавязаны, напрыклад, у нарад за дзядулю ісці, дык дзядуля не падпарадкоўваецца нікому! Дзядулі ў прынцыпе добрыя: могуць і раней расшпіліць таго, хто асабліва добра шарыць, і калі кабаноў хапае. Вось сёння мы расшпілілі апошняга свайго кабана, вы бачылі. Цяпер ваш абавязак — дагаджаць сваім дзядулям і нам, дэмбелям. Але гэта, зразумела, зусім ненадоўга: максімум да канца траўня нас тут не будзе…

Да канца траўня застаецца роўна сорак дзён: нейкае злавеснае спалучэнне.

Адчувалася, што дэмбеляў вельмі цешыла думка аб тым, што да канца траўня іх тут не будзе. На хвілін дваццаць гаворка набыла выразныя прыкметы фальклору: згадваліся дагістарычныя часы, гэта значыць, дэмбелі і дзядулі расказвалі пра здарэнні, якія тут адбываліся так даўно, калі большасць з іх і думаць не думалі, што некалі будуць служыць у самым непераможным войску з такімі грунтоўнымі небаявымі традыцыямі. Па большай частцы ўсе гісторыі былі пра тое, як нехта з маміных сынкоў не вытрымаў старэчай навукі, здрадзіў традыцыям, не пажадаў у перспектыве стаць дзедам, стукнуў айцам камандзірам (якія ў большасці людзі разумныя і цудоўна ўяўляюць, што адбываецца ў казармах пасля іхнага сыходу дадому, але негалосна як ніхто і зацікаўленыя ў падобным стане рэчаў, бо дзедаўшчына спрошчвае іх нялёгкую працу па падтрыманні дысцып-

ліны і парадку ў даручаным вышэйшым кіраўніцтвам калектыве), і што таму небараку ў выніку за тое было. Як правіла, дзядулям ніколі не было нічога: ну хіба можна лічыць сапраўдным пакараннем некалькі колаў па стадыёне ў касцюмах хімабароны ці нават пяць содняў на губе. Значна цікавей пасля даносу складалася жыццё наіўнага шукальніка паратунку: тут табе і ўсеагульная пагарда, асабліва з боку прадстаўнікоў свайго ж перыяду, якіх ён у першую чаргу спадзяваўся абараніць ад дзедаўскага прыгону сваім учынкам, каварныя падставы і выкшталцоныя катаванні, якія ў выніку абсалютна лагічна прыводзілі стукача ці да самагубства, ці да вар'яцтва, ці да вялікага тэрміну ў дысцыплінарным батальёне... Асабліва ўсебакова смакаваліся выпадкі, у якіх прысутнічалі ўсе згаданыя павароты лёсу, толькі ў адваротнай паслядоўнасці: турма, вар'яцтва, самагубства... Давесці стукача да жывёльнага стану, калі ён пачынаў біцца аб сцены, ці падкінуць яму ў рэчмяшок поўны патронаў аўтаматны ражок, страшэнна даражэнны і папулярны ў мясцовых паляўнічых прыбор начнога бачання, малюпасенькую цыдулку, на якой запісаныя сакрэтныя коды са станцыі касмічнай сувязі, лічылася вышэйшым пілатажам, прыкметай абсалютнай казарменнай арыстакратычнасці.

— Вядома ж, можна адмовіцца і жыць самому па сабе, — тамадою на гэтым банкеце ўсё ж быў Макс Кротаў, які і працягнуў неабходныя павучанні. — Вось ты, Паша, дужы хлопец, любому з нас рады дасі. Можаш хоць сёння сам расшпіліцца і не слухаць нікога. Знаходзіліся і такія, але ў выніку ні адзін не вытрымаў: кім ты станеш для сваіх таварышаў, як ты будзеш пачувацца, калі яны будуць пахаць? Самае галоўнае, што будзе, калі прыйдуць вашы кабаны... Ты для іх не будзеш

дзедам! Ты не зможаш імі камандаваць: твайго ж перыяду хлопцы не дазволяць! Міша і Вацлаў будуць сядзець нага за нагу і семкі паплёўваць, а ты будзеш усю працу выконваць разам з кабанамі…

Міхал страшэнна абурыўся, што Макс прыраўняў яго да Вацiка, нібы толькі Паша і здольны з трох новенькіх пастаяць за сябе. Дэмбель увогуле па большай частцы звяртаўся да Герасімава, нібы ён галоўны ў іхнай кампаніі...

— Ды і Міша, відаць, дужы хлопец і мог бы любому з нас, калі што якое, пысу намыліць, — раптам зазначыў Кротаў, нібы адчуў настрой Радзевіча. — Падумайце, хлопцы, падумайце, што лепей: крыху пацярпець і стаць паўнавартасным членам грамады ці ўсю службу быць ізгоем. Што ж, а пакуль вольныя, ідзіце…

Хлопцы выйшлі ў пусты калідор — нават днявальнага не было на тумбачцы — і пабрылі ў кубрык. Паша выразна паглядзеў у вочы Міхалу і цяжка ўздыхнуў: ніякага выбару на самай справе няма.

— Крута, — раптам азваўся Вацік. Здавалася, ён аж свеціцца ад радасці і надзвычай нагадвае ў гэтую хвіліну дурнога шчанюка. — Мы прайшлі праверку!

— Ідыёт…— не стрываў Міхал. — Божачкі! Які ж ты, Вацік, ідыёт!

— Дык што, не трэба было згаджацца? — разгубіўся Шпачок.

Міхал у адказ толькі прыставіў указальны палец да скроні і пакруціў.

— Штосьці я не чуў, каб нехта пытаў у цябе згоды, — як ніколі раздражнёна зазначыў Ваціку Паша.

З ленінскага пакоя данёсся гучны рогат: відаць, чарпакі глядзелі тэлевізар.

У кубрыку спалі толькі чацвёра, астатнія ложкі былі пустыя. Хлопцы зноў пакладаліся на свае месцы.

Бясконца доўгі і трывожны быў дзень, уражанняў хапіла б на тыдзень у вучэбцы, і каб засвоіць іх, таксама спатрэбіцца нямала часу. А зараз… Міхал адчуваў, што зараз варта толькі заплюшчыць вочы — і прагучыць каманда «пад'ём», як гэта адбывалася апошнія месяцы…

Каманда і сапраўды прагучала, як толькі Радзевіч заплюшчыў вочы, але на гэты раз яна чамусьці бясконца паўтаралася і ложак хадзіў хадуном.

— Э! Пад'ём, я сказаў, — зноў па чарзе калаціў ложкі маладых Ігар. — Зусім ах…елі, кабаны!

Радзевіч падумаў, што ён не пачуў каманду дзяжурнага і той цяпер прыбег будзіць іх асобна — як няёмка атрымалася: першая ноч у частцы, і такая прыкрасць. Усе, напэўна, ужо на зарадцы. Ля тумбачкі іх зараз сустрэне камандзір узвода, будзе прачуханка!

Але калі Міхал ужо нацягнуў штаны, ён звярнуў увагу, што за вокнамі яшчэ цёмна і ўсе астатнія спакойна спяць. Ашаломленыя Паша і Вацік таксама няўцямна тапталіся ля сваіх ложкаў.

— Цішэй вы! Апранацца не трэба! П…дуйце на калідор!

Калі выйшлі з кубрыка, дзяжурны ледзь не ўголас працягнуў ушчуваць павараў:

— Ніколі такога нахабства не бачыў! Спаць яны заваліліся! Іх таварыш пахае не пакладаючы рук адзін, а яны спяць! Ва ўмывальнік ідзіце! Лёха растлумачыць, што трэба рабіць!

Ля тумбачкі днявальнага вісеў гадзіннік. Хлопцы не паверылі сваім вачам: толькі палова на першую!

Ім здавалася, што ад таго, як яны ўзняліся на свой паверх пасля пераклічкі, прамінула цэлая вечнасць.

Умывальнікам у войску называлі пакой, у якім уздоўж сцен віселі рукамыйнікі з люстэркамі, каб можна было

пагаліцца, і, у залежнасці ад колькасці жаўнераў у падраздзяленні, адзін ці два, так бы мовіць, нагамыйнікі — эмаліраваныя чыгунныя скрыні са злівам і падведзенымі да іх кранамі.

Лёха сядзеў на кукішках і цёр той самай шчоткай, якую выкарыстоўвалі для мыцця ўзлёткі, раскладзеную на падлозе нейкую анучыну.

— Да раніцы трэба вымыць, высушыць і падшыць чатыры камплекты, — растлумачыў Камароў, калі хлопцы ўвайшлі ў пакой. — Кожнаму па адным. Гімнасцёрку я ўжо адпраў, зараз дамыю штаны і пайду сушыць.

— А як сушыць? — пацікавіўся Герасімаў.

— Прасам, як жа яшчэ, — у сваю чаргу здзівіўся някемлівасці новенькіх Лёха. — Вунь там шчоткі, там мыла, — тыцкаў пальцам Камароў у розныя куткі мыйні. Вось форма. Прыступайце…

Хутка хлопцы, таксама як і Лёха, ужо шаргацелі круглымі шчоткамі па раскладзеным на падлозе адзенні.

— І самае галоўнае, — зноў загаварыў сябра па няшчасці, — ледзь не забыў: калі ўсё зробіце, трэба будзе раскласці камплекты на крэслы ля ложкаў дзядуляў. А вы ж іх пакуль не ведаеце. Форма падпісаная, таму толькі зверце, каб штаны і гімнасцёрка былі з аднаго камплекта, а дзе хто спіць — спытайце ў Ігара, ён пакажа. Малодшы сяржант толькі з выгляду такі злосны, але на самай справе, паверце, ён тут далёка не самае смярдзючае гаўно.

Што ж, як мог, абнадзеіў!

Самым цяжкім, вядома ж, аказаўся працэс высушвання. І каму такая ідыёцкая ідэя магла прыйсці ў галаву: сушыць прасам адзенне. І толькі, калі мінула не меней за тры гадзіны, стала відавочным, што ідэя працэсу была зусім не ў тым, каб дзядулі атрымалі раніцою чысцюткую

ды ідэальна адпрасаваную вопратку, а ў тым, каб кабаны не спалі ўсю ноч.

Вось табе і «мы не такія, ніякіх здзекаў». Выконвай своечасова — і ў свой час атрымаеш!

Шпачок засынаў стойма ля прасавальнай дошкі. Міхал перайшоў за суседнюю і то выспяткамі, то воклічамі стараўся абудзіць небараку, каб той, барані божа, не прапаліў дзедаўскія нагавіцы. Аднак кожнае Вацікава абуджэнне працягвалася некалькі секундаў, пасля чаго прас у ягоных руках зноў пачынаў рухацца павольней і паціху спыняўся зусім.

— Не спаць! — гаркаў Міхал.

Шпачкоў прас ненадоўга ажываў і праз імгненне заміраў нанова. Следам за воклічам ішоў выспятак, у адказ на які па пакоі разносілася няўцямнае мармытанне:

— Хто храп? Я не храп…

— Ты дзяцел!

— Я не хра…

— Шпак!

— Я дзяцел…

— Ты ёлупень! Прапаліш штаны — галаву адарвуць!

— Прапалоць гала… Усё, усё, не сплю, не спаць, не сплюць…

У іншых абставінах, магчыма, гэткае відовішча і падалося б смешным, але цяпер хлопцам не было калі і думаць, як выглядае іхнае змаганне са сном.

Нарэшце ўсе камплекты адзення былі прыведзеныя ў ідэальны стан, калі не лічыць рудых падпалаў знутры, старанна складзеныя, і хлопцы памкнуліся з бытавога пакоя ў калідор. Адразу ля дзвярэй яны напаткалі Аліева. Можна было падумаць, што ён чакаў іх наўмысна.

— Опанькі! А што гэта мы тут робім, стаяць! — з уяўна радаснай інтанацыяй звярнуўся дзед да каба-

ноў. — Ты глядзі, якая ўзорная чысціня. Ну-к, чый гардэробчык…

Рома па чарзе адкінуў полы гімнасцёрак, каб на ўнутранай кішэні прачытаць выпаленыя хлоркай прозвішчы гаспадароў:

— Кротаў, Якіменка, Шумейка… Так, гэта залёт, хлопчыкі, самы сапраўдны залёт… Якога хера вы дагаджаеце гэтым… дэмбелям?

— Але ж Макс сказаў, — паспрабаваў апраўдацца за ўсіх Герасімаў.

— Непарадак! Вы — нашы кабаны! Першачарговая ваша задача — дагаджаць нам! А гэтыя, пакуль не з'едуць, так, дадатковая нагрузка, не болей! Ім вы нешта павінны рабіць пасля таго, як выканаеце ўсе дзедаўскія заданні! Ніхто іх не прымушаў усіх сваіх кабаноў расшпільваць! Няхай бы сабе той паэт яшчэ паслужыў ім! Дадому яшчэ не меней за месяц, а яны гарэлку ўбачылі і добранькімі сталі! Цяпер хай выкручваюцца! А з вашага боку — гэта касяк! Самы сапраўдны залёт! Увечары будзем разбірацца!.. А зараз пяць хвілін вам на зборы і бягом у сталоўку сняданак гатаваць!

Хлопцы не маглі паверыць сваім вушам: спаць не давядзецца зусім. Толькі цяпер яны заўважылі, што за вокнамі прыкметна пасвятлела.

Забеглі ў кубрык, у якім гучна храплі стараслужачыя, без асаблівай увагі, дзе хто спіць, паклалі дэмбелеўскую форму на вольныя крэслы і паімчалі ў кабанска-чарпакоўскі пакой, каб заслаць свае халодныя ложкі і апрануцца.

Ля тумбачкі днявальнага стаяў Аліеў:

— Засталося тры хвіліны! — гаркнуў ён адтуль на ўвесь калідор.

— Што, ужо пад'ём? — спытаў нехта з чарпакоў.

— Не, гэта повары ў сталоўку ідуць, — растлумачыў у прыцемках незнаёмы голас.

— Зая…алі ўжо гэтыя повары…

Калі выходзілі з трэцяга паверха, Міхал зірнуў на гадзіннік: дзесяць хвілін на пятую… Доўгі будзе дзень…

## IX

Раман па-гаспадарску пагрукаў у дзверы сталоўкі спачатку кулаком, а калі не адбылося ніякай рэакцыі — павярнуўся спінай і пачаў лупіць абцасам бота па бляшанай паласе, прымацаванай знізу дзвярэй. У ранішняй цішы сонным хлопцам грукат здаўся невыносна гучным, як гром. Да таго ж яго шматкроць паўтарала рэха, як у бясконцых сутарэннях і пустых залах сталоўкі, так і ў нетрах ваеннага гарадка.

— Адчыняй, сука!!! Хопіць спаць!!!

Можна было чакаць, што зараз абудзіцца ўвесь батальён і, як гэта не аднойчы ўсе бачылі ў кіно, падчас раптоўнага нападу фашыстаў з вокнаў і дзвярэй казармаў пачнуць выскокваць чырвонаармейцы ў адным споднім, у паніцы спрабуючы нацягнуць нагавіцы замест гімнасцёрак ці наадварот.

Нарэшце з-за дзвярэй данеслася бразганне нейкіх жалезак і яны расчыніліся.

— Ты што, кабан, спіш у нарадзе!

Але на парозе стаяў хлопец з расшпіленым каўняром.

— Ага! Пакіне нехта тут кабана! Тады б ты яго і гарматай не дабудзіўся, — абсалютна спакойна азваўся хлопец у цёмна-фіялетавым адзенні. — А дзе Кротаў? Па графіку ён жа павінен сняданак гатаваць.

— Дзе, дзе, у п…дзе! — злосна буркнуў Аліеў і пераступіў парог.

У поварскім пакоі, які знаходзіўся ў падвале паблізу ад кабінета Антонава і ўяўляў з сябе невялічкую каморку, у якой стаялі два крэслы, стол і такая ж невялічкая канапка, што звычайна маюцца ў кабінетах дактароў, Раман пераапрануўся ў бялюткі кухарскі строй. Агледзеў маладых калег і выцягнуў са стоса бруднага адзення, якое ляжала ў кутку на падлозе, кожнаму па заплямленым фартуху:

— Няхай пакуль хоць так…

У сваёй ваеннай форме з пілоткамі на галовах і ў кірзавых ботах на нагах, з накінутымі бруднымі фартухамі хлопцы выглядалі страшна.

— Прыйдзе начальнік сталоўкі — што-небудзь прыдумае, — падобна, уголас падумаў Аліеў.

— Цяпер уважліва глядзіце і запамінайце, па два разы паўтараць не буду!

Узняліся з падвалу на першы паверх. Раман ішоў наперадзе і ўключаў асвятленне, стомленыя хлопцы валакліся ўслед. Увайшлі ў нейкі вялізны пакой. У цьмяным ранішнім святле, якое яшчэ ледзь-ледзь пранікала сюды праз брудныя зялёныя шклаблокі, якімі былі закладзены чатыры аконныя праёмы, немагчыма было нічога разгледзець.

— Гэта сэрца сталоўкі: наш варачны цэх! — урачыста паведаміў дзед і пстрыкнуў выключальнікам. — Любуйцеся!

У першае імгненне хлопцы не зразумелі, што паўстала перад іхнымі ўважлівымі поглядамі, бо ніколі ў жыцці не бачылі нічога падобнага: падлога, сцены, апрацоўчыя сталы, духавая шафа, вялікая электрычная патэльня і дзве пліты, чатыры агромністыя і адзін меншы паравыя катлы — усё адлівала адным карычневабліскучым колерам. Іржа? Але ў наступнае імгненне

пачуўся выразны шолах, нібы апалае лісце ад павеву ветру, і раптам іржавы налёт пачаў ці то вібраваць, ці то хваляваацца і знікаць: прусакі!

Хлопцы ўжо бачылі некалькіх прусакоў у вучэбцы, але там гэтыя насякомыя выклікалі сапраўдны перапалох і былі тут жа атручаныя!

Раман жа, было падобна, зусім не збянтэжыўся і рушыў далей. З-пад яго ног пачулася выразнае храбусценне, нібы ён крочыў па снезе.

Герасімаў прыплюшчыў вочы, Шпакоўскі прыкрыў далонню рот, Радзевіч паглядзеў на столь: яго найбольш непакоіла, што зараз які-небудзь бліскучы небарака сарвецца адтуль і трапіць акурат яму за каўнер!

Ну і брыдота!

Аліеў нарэшце заўважыў стан сваіх вучняў:

— Што, прусакоў ніколі не бачылі?! Галоўнае, глядзіце, каб у ежу надта многа не трапляла... Зрэшты, таксама мяса... Жартую. Проста ў санчастцы атрута скончылася, дык яны тут зусім расперазаліся: звычайна столькі шмат не бывае!

Пераадольваючы агіду, хлопцы рушылі ўслед за настаўнікам.

— Вось, хадзіце сюды, — Аліеў скіраваў да вялізнага катла, — найперш глядзім, што тут.

Узняў накрыўку, большую за метр у дыяметры, і зазірнуў у сярэдзіну.

— Халера, Краццяра і сапраўды сёння не збіраўся сняданак гатаваць!

Кацёл быў пусты. Раман адкінуў накрыўку поўнасцю, і цяпер яна нагадвала капот аўтамабіля.

— Звычайна мы наліваем неабходную колькасць вады з вечара і адкрываем пару: гэта дазваляе меней раніцою тут завіхацца. Болей паспаць усё адно не атрымаецца,

бо трэба пракантраляваць, каб падалі пару: качагары ў нас людзі вольныя, грамадзянскія, а таму абсалютна не пунктуальныя. Будзьце гатовыя, што давядзецца яшчэ не раз у кацельню самім бегаць ці нарад пасылаць, каб абудзіць гэтых выпівох.

Аліеў гаварыў і адначасова імкліва рухаўся, як аўтамат: адкруціў спачатку адзін кран, і ў кацёл палілася вада, потым — другі, і гучнае металічнае стуканне па трубах, якое гулкім рэхам разносілася па ўсіх пустых сутарэннях сталоўкі, калі хлопцы толькі прыйшлі сюды, на секунду перарвалася выразным шыпеннем недзе паблізу, а затым вялізны кацёл здрыгануўся ад цэлай серыі моцных удараў: нібы нехта нябачны выцяў некалькі разоў гэтую пачвару молатам, пасля чаго зноў навокал пацішэла і па-ранейшаму даносілася толькі дробнае ляскатанне па трубах і шум вады з-пад крана.

Каля другога, меншага катла паўтарылася тое самае.

Раней Міхал ніколі не задумваўся, як, у якіх каструлях гатуюць ежу для вялікай колькасці людзей. Самыя большыя, якія ён бачыў у школьнай сталоўцы, мелі аб'ём меншы за сорак літраў, але ж і людзей там харчавалася максімум паўтары сотні. Вядома ж, можна ўявіць металічныя цэбры і на сто, і на дзвесце літраў, але іх немагчыма будзе пры неабходнасці ні падняць, ні перанесці. Аказваецца, на такі выпадак даўным-даўно прыдумалі стацыянарныя катлы самых неверагодных памераў, аб'ём якіх вымяраецца нават не літрамі, а кубічнымі метрамі! Як усё геніяльнае, паравы кацёл — рэч неверагодна простая: па сутнасці, гэта і ёсць вялізная каструля, якая заўсёды стаіць на падлозе і якую не трэба нікуды валачыць. Адной толькі істотнай асаблівасцю гэтай каструлі з'яўляецца тое, што яна размяшчаецца ўнутры другой, крыху большага дыяметру. І вось у гэтую, натуральна, герме-

тычную прастору паміж унутранай і знешняй каструлямі па трубах падаецца гарачая па́ра — усё, залівай ваду і вары, што толькі пажадаеш, і хоць на тысячу чалавек!

Праз хвіліну повары і хлопец з нарада былі ўжо ў пакоі, пасярод якога на падлозе стаялі металічныя насілкі з прадуктамі: у вялікай алюмініевай каструлі недзе з вядро проса, пачак солі, папяровыя нулькі з заваркай і чырвоным перцам.

— Зразумела, параша, — зазначыў нешта няўцямнае Раман, — нясіце ў варачны.

Хлопец з нарада і Вацік павалаклі насілкі, хоць Аліеў не звяртаўся да некага канкрэтна.

Тым часам Рома пачаў перабіраць вялікую звязку ключоў, што вісела на доўгім бліскучым металічным ланцугу, другі канец якой завяршаўся маленькім карабінам, зачэпленым за пярэдні хамуток для падтрымання дзягі на нагавіцах. Адшукаўшы патрэбны ключ, ён адчыніў наступны пакой. Міхал яшчэ ў першыя дні службы заўважыў, што ў войску лічыцца асаблівым шыкам мець звязку з ключамі на доўгім металічным ланцугу: чым большая звязка — тым больш значны чалавек перад табой. Як стагоддзе таму вялізны гадзіннік на доўгім залатым ланцугу сведчыў пра несумненна высакароднае паходжанне свайго ўладара, так у войску ледзь не кожны жаўнер імкнуўся начапіць на сябе калі ўжо не металічны ланцуг, дык хаця б скураны пас з якім-небудзь ключом. Што і казаць: на фоне Раманавых бялюткіх кухарскіх нагавіц бліскучы ланцуг і вялізная звязка ключоў выглядалі недасягальна!

Ад белі наступнага пакоя аж заслязіліся вочы: белая кафля на сценах, вялізны белы халадзільнік, бліскучыя апрацоўчыя сталы з нержавеючай сталі, бы люстры, адбіваюць бялюткае святло лямпаў дзённага асвятлення. Мясны цэх.

Спрактыкаваным рухам Аліеў найперш адчыніў лядоўню:

— Такі і ёсць! Не крануў нават! Чортаў Крот! Вымайце, кладзіце на стол, вунь дошкі і нажы, пачынайце, я зараз.

Міхал і Паша зазірнулі ў халадзільнік: чвэрць тушы, як сказалі б дома, вясновага падсвінка.

Раман забег у варачны цэх, зазірнуў у першы кацёл, прыкінуў, ці хопіць вады, перакрыў кран і прычыніў крышку. Ля меншага катла пачакаў хвілін пяць, пакуль набегла болей вады, і паўтарыў тыя самыя маніпуляцыі.

— За мной! — кінуў хлопцу з нарада і Вацiку Аліеў і, нібы ў атаку, панёсся ў мясны цэх.

Радзевіч і Герасімаў тым часам ужо зрэзалі з мяса, як гэтаму вучылі ў школе повараў, сінія чарнільныя плямы ад пячатак*, распалавінілі кавалак: Міхал зразаў мякаць з кумпяка, а Паша — з часткі хрыбетніка і рэбраў.

— Бярыце дошкі, нажы — і наперад, — распараджаўся Аліеў. — Вось такімі кавалкамі рэжам: у нас сёння гуляш.

— Ага! Зараз! — абурыўся хлопец з нарада.

— Не кані, Віцёк! Я цябе проста прашу, не паспеем жа! Сам бачыш: гэты ўё…ак Крот на ўсё забіў!

Глядзі ты! Аказваецца, Рома ўсё ж ведае, як завуць гэтага з нарада. Адразу пыхі паменела, калі замаячыла перспектыва не паспець прыгатаваць сняданак…

Літаральна праз пяць хвілін у халадзільнік былі вернутыя голыя косці, а белыя і ружовыя дробныя кубікі свініны засквырчэлі ў распаленай электрычнай патэльні.

---

* На складах мяса праходзіла санітарную праверку, пра што і засведчвалі пячаткамі адпаведныя службы.

— Вялікая патэльня не працуе, — працягваў каментаваць усе дзеянні Аліеў. — На ёй, вядома ж, хутчэй было б.

І дадаў прыцішана, каб не пачуў Віцёк з нарада:

— Мы яе самі наўмысна зламалі, каб катлеты не рабіць і рыбу не смажыць: занадта марудныя заняткі. Хоць месяц які адпачнем, пакуль адрамантуюць. Потым можна мясарубку сапсаваць. Але яна занадта простая, за які тыдзень зробяць. Злоўжываць з гэтым, вядома ж, не трэба, але час ад часу можна… Зірніце, ці кіпіць там вада, — зноў ні да каго канкрэтна звярнуўся дзед.

Хлопцы пайшлі адразу ўсе. Міхал і Паша зазірнулі ў вялікі кацёл, Вацік — у меншы. І там, і там не кіпела.

— Салілі? — спытаў Раман.

Хлопцы паглядзелі адзін на аднаго: што за дурное пытанне, загаду ж не было, ды і ніхто з іх не ведаў, колькі трэба сыпаць той солі.

Аліеў зразумеў бессэнсоўнасць свайго пытання і пайшоў да насілак.

— Саліце ваду адразу: напалову хутчэй закіпіць, — каментаваў ён на хаду.

Выцягнуў з насілак пачак з соллю, рэзкім, спрактыкаваным рухам, відаць, каб яна стала сыпкаю, выцяў ім аб падлогу — на шчасце, прусакоў ужо на ёй не было — і падышоў да вялікага катла.

— Адчыні, — зноў не зразумела да каго звярнуўся дзед.

Міхал узняў вялізную накрыўку. Раман сыпануў з паўпачкі солі ў ваду і працягнуў распараджацца:

— Размяшай!

Паша зняў з падстаўкі, што стаяла побач з катлом, вялікую драўляную вясёлку і, бы вяслом, пабоўтаў ёю ў вадзе. Зрэшты, вясёлка такіх памераў і сапраўды больш нагадвала вясло, чым кухарскую прыладу.

— Што з чаем?

— Не кіпіць пакуль, — адказаў Вацік, гледзячы пад накрыўку меншага катла.

— Ну дык прычыні, не выстуджвай, хутчэй закіпіць. Ідзі лепей за мясам сачы, а вы ўдвух за мной!

Услед за дзедам Паша і Міхал павалакліся з варачнага цэха. Пераход аказаўся цікавым: узняліся на другі паверх, прайшлі праз вялікую абедзенную залу, застаўленую радамі сталоў, разлічаных на восем чалавек, і па другой лесвіцы спусціліся на першы паверх у такое самае памяшканне, у далёкім куце якога пад стэндам з надпісам «Меню», аздобленым нейкімі табліцамі і графікамі, асобна стаяў меншы стол. На ім ляжалі два журналы.

— Іх трэба абавязкова запоўніць, — тлумачыў Раман, гартаючы старонкі, — адзін для медчасткі, другі для дзяжурнага па батальёне. Перад кожным прыёмам ежы ў журналах павінны быць усе запісы: якія стравы, вага порцыі на аднаго чалавека і хто з повараў гатаваў, нічога складанага…

Да аднаго і другога журналаў былі прывязаныя самыя танныя шарыкавыя асадкі.

— Вось, глядзіце! — Аліеў нарэшце дабраўся да апошняга запісу і пацягнуўся да ручкі. — Сука! Ё…аны Крот! Ужо запісаў! Гэта ён не забыў зрабіць! Яшчэ з вечара пастараўся! Ну я яму!.. Гэта падстава!.. Бачыце, якая сука! А вы яму ўсю ноч порткі мылі!

Па ўсім было бачна, што Раман раз’юшыўся не на жарт!

— П…дуйце на х… назад! Увечары пагаворым!..

Калі б з ім тут апынуўся Вацік, а не значна дужэйшыя за яго Міхал ды Паша, можна не сумнявацца: Раман не стаў бы чакаць вечара, а сарваў бы на ім злосць проста тут.

Вярнуліся ў варачны цэх. Усю дарогу назад на гэты раз Аліеў ішоў моўчкі.

— Засыпайце проса! — зноў скамандаваў, не звяртаючыся ні да каго дакладна, Раман.

— А памыць? — не стрымаўся Міхал.

— Хочаш — мый, толькі гэта ж параша! Яе ніхто акрамя кабаноў не есць! Дзяды і чарпакі ўжываюць толькі высакародныя стравы: пюрэ, рыс, грэчку і макароны. Усё астатняе — пярлоўка, проса, сечка, аўсянка — гэта параша! Парашу дзядам нельга есці!

Міхал падумаў, што калі б яны ў сваёй вучэбцы былі такія пераборлівыя, то напэўна вымерлі б ад голаду: там якраз пераважалі кашы-парашы. Толькі ён асабіста нічога кепскага супраць іх не меў: цалкам сабе смачныя стравы.

Радзевіч моўчкі наліў вады ў каструлю з крупамі, узяў вясёлку і памяшаў. Зліў мутную ваду і паўтарыў увесь няхітры працэс яшчэ двойчы, пакуль вада ў каструлі не засталася чыстаю. Потым вытрас мокрыя крупы ў вялікі кацёл, спаласнуў гарачай вадой з катла каструлю, каб змыць тое, што наліпла да яе сценак, і вытрас у кацёл рэшту.

Паша, які дапамог Міхалу вытрасаць крупы ў кацёл, ціха, каб толькі Радзевіч пачуў, прагаварыў:

— Няўжо нарэшце наядзімся ад пуза?!

— Не кажы! — па-змоўніцку пагадзіўся Міхал.

Раптам Аліеў падскочыў як уджалены:

— Цыбуля дзе?!

Ён скочыў да насілак і рассунуў тыя два невялічкія кулёчкі, якія там яшчэ заставаліся і за якімі нібыта магла заваляцца цыбуля.

— Там, дзе бульбу чысцім, — абсалютна спакойна зазначыў Віцёк.

— За мной! — скамандаваў дзед і літаральна вылецеў з варачнага цэха.

Следам, бы ад пажару, з пакою выбеглі ўсе.

Бегчы давялося недалёка: Раман ускочыў у адзіны незачынены на замок пакой у канцы калідора.

— Ты чаго прыляцеў, Малы? — цяпер усе зразумелі, што дзед звяртаецца да Ваціка, — Бяжы назад і выключы патэльню.

— А як?

— Проста пераключальнік пастаў на нуль! Бягом!

На такім самым жалезным стале, як і ў мясным цэху, ляжала з дзясятак цыбулін і з тузін морквін.

— Дзякуй богу! Пачысцілі... Так, бярэм нажы, дошкі і наразаем! Агароднінарэзка не працуе!

Міхалу карцела пацікавіцца, чаму яна не працуе, але нервовасць дзеда, здаецца, лунала ў паветры, і ён не рашыўся.

Па дошках дружна застукалі нажы, а з-за акна даляцеў тупат многіх дзясяткаў ног у цяжкіх ботах.

— Ужо зарадка. Зараз мае прыйдуць. Пайду дзверы адчыню.

Віцёк выйшаў з пакоя.

Літаральна за хвіліну цыбуля і морква былі дробненька нарэзаныя.

— Зграбайце на дошкі і за мной!

Хлопцы на дошках перанеслі і высыпалі ў патэльню моркву і цыбулю. Раман сам пераключыў уключальнік патэльні на максімум, пасаліў мяса, даліў вады. Потым дзед выняў з насілак маленькія папяровыя пакуначкі і першым разгарнуў той, што выглядаў крыху прамоклым. Там была таматная паста. Лязом нажа ён рэзка ссунуў пасту ў патэльню і яшчэ раз перамяшаў страву.

— Паспяваем. Заварвайце чай і высыпайце цукар. Толькі пакіньце па паўпачкі таго і таго. Міхал, — упершыню звярнуўся дзед да маладога па імені, — аднясі заварку і цукар у поварскі пакой і прыхавай дзе-небудзь там, не кідай навідавоку. Вам яны яшчэ сёння спатрэбяцца.

Міхал выйшаў на калідор, за некалькі секунд перабег яго, павярнуў налева, выйшаў на пляцоўку, з якой разыходзіліся дзве лесвіцы: адна вяла ў падвал, а другая — на другі паверх; і толькі паспеў зрабіць некалькі крокаў уніз, як з верхняй пляцоўкі данёсся гучны вокліч:

— Стаяць, таварыш салдат!

Збянтэжаны Міхал спыніўся. Зверху на пляцоўку спусціўся нейкі здаравяка ў афіцэрскай фуражцы.

— Сюды падыдзі!

Радзевіч развярнуўся і зрабіў некалькі крокаў уверх па прыступках. На пляцоўцы стаяў вялізны афіцэр у белай, як у Аліева, поварскай куртцы з чырвонай павязкай на рукаве: дзяжурны па сталоўцы.

— Што гэта ў цябе? — афіцэр кіўнуў на пачак з-пад цукру, які трымаў Міхал.

— Гэта, — Міхал ліхаманкава спрабаваў прыдумаць правільны адказ, — цукар.

— І куды гэта ты яго валачэш?

— Ну, мы гэта… Хацелі гарбаткі папіць…

— Хто мы?!

— Повары…

— Вось жа сучкіна адроддзе! За мной! — літаральна зароў вайсковец страшэнным басам і рушыў па калідоры ў варачны цэх.

Не на жарт спалоханы нечаканай рэакцыяй, Міхал павалокся следам.

Чаго ён так усхадзіўся?

— Здравія жадаю, таварыш прапаршчык! — выпаліў Раман, як толькі дзяжурны пераступіў парог варачнага цэха.

— А! Аліеў! Сучкіна трыбуха! Тамбоўскі воўк табе таварыш, зладзюга! Я цябе папярэджваў, што, калі я дзяжурны, лепей нават не спрабуй што-небудзь скрасці?! Казаў?!

— А я нічога і не краў!

— Ага, ты думаеш, я паверу, што гэты малады самастойна дадумаўся асобна гарбаткі заварыць?! Як бы не так! Я выведу гэтую вашу паганую звычку ўсё цягнуць за плот! Вы ў мяне будзеце з агульнага катла жэрці! Як усе! Што для ўсіх гатуеце, тое і самі жарыце! Ідзі сюды! — прапаршчык зірнуў на Міхала.

Дзяжурны падбег да катла з гарбатай і адчыніў накрыўку:

— Высыпай!

Міхал выняў з каробкі з цукрам паўпачка заваркі, спачатку высыпаў яе, потым цукар.

— Размяшай! — кінуў дзяжурны Ваціку, які стаяў побач з вясёлкаю ў руках. — Вось так! — сказаў ужо прыкметна спакайней прапаршчык. — Гэты злодзей вас добраму не навучыць! А вам сорам пачынаць службу з хлусні. Глядзіце, будзьце пільнымі, яны тут усе зладзюгі, усё крадуць, і вас будуць прымушаць! Так нядоўга і да дысбата! Прывыклі чужымі рукамі жар заграбаць! Праўда, Аліеў?!

Раман, нічога не адказваючы, памешваў гуляш у патэльні…

Дзяжурны зірнуў на гадзіннік.

— Пара накрываць! Нарад! — гаркнуў ён так гучна, што можна не сумнявацца, яго пачулі ва ўсім вялізным будынку сталоўкі.

У імгненне вока ў памяшканні з'явілася з паўтузіна жаўнераў у фіялетавых робах і пачалася, на першы погляд, сапраўдная вакханалія: да вялікага катла прыставілі жалезны стол і на яго пачалі пераносіць стосы ўстаўленых адна ў адну, недзе літры на тры металічных ёмістасцяў. Іх падавалі праз невялічкае акенца ў далёкім кутку варачнага цэха. Раман зазірнуў у кацёл з парашай і перакрыў пару:

— Ідзі сюды, — махнуў Пашу.

Дзед поўнасцю адкінуў накрыўку катла, узяў вялізны чарпак і зачарпнуў кашы:

— Дзесьці па стольки. Калі застанецца — нічога страшнага. Яе ўсё адно ніхто не есць!

Воклічы дзяжурнага цяпер даносіліся аднекуль з глыбіні сталоўкі і суправаджаліся бразганнем жалезнага посуду.

— Ты, — Раман тыцнуў пальцам у Ваціка, — сюды! Будзеш разліваць гарбату. Сёння яна вунь якая насычаная і, мабыць, салодкая!

Пры апошніх словах дзед красамоўна паглядзеў на Міхала.

— Глядзі, паказваю адзін раз, — Аліеў працягнуў навучаць Ваціка, — нарад падстаўляе імбрыкі вось пад гэты кран. Твая задача наліць туды роўна на шэсць чалавек. Гэта прыкладна дасюль, — Раман правёў пальцам па боку пасудзіны. — Імбрыкі ў большасці старыя, і калі зазірнуць у сярэдзіну, то адмеціна, дакуль яны наліваліся заўсёды, добра бачная. Арыентуйся на яе. Запас, вядома ж, ёсць, але асабліва не захапляйся. Давай, пачынай!

Паша пляскаў ліпкай кашай, якая не жадала адрывацца ад чарпака, па малых кацялках, Шпачок засяроджана, бы капітан карабля, сачыў за ватэрлініямі імбры-

каў, Міхал без загаду павалокся следам за Раманам да патэльні з асноўнаю стравою.

Да яе таксама прыставілі жалезны стол, на якім стаялі гэткім самым чынам, складзеныя адна ў адну, як і ля катла з кашай, кацялкі, стосы вялікіх алюмініевых місак.

Раман адкінуў накрыўку, і неверагодна прыемны водар смажанага мяса стаў яшчэ больш выразным і невыносным для галоднага Міхала.

Дзед узяў малы чарпак і памяшаў гуляш.

— Халера!.. Дрэнна…

Што было дрэнна, Міхал не разумеў, але ўдакладніць не рашыўся. Было бачна: Раман не на жарт азадачаны і нешта ліхаманкава спрабуе для сябе вырашыць.

— Надта шмат мяса атрымалася… І як гэта я не падумаў, — раптам прамовіў уголас Аліеў.

Чаму тое, што мяса шмат, — дрэнна, Міхал не разумеў.

— Падай кацялок, — звярнуўся дзед да Радзевіча, і калі той пайшоў у бок вялікага катла, дадаў, — бяры два!

Міхал паставіў кацялкі на стол ля патэльні, і Раман тут жа абодва ледзь не даверху напоўніў духмяным гуляшом.

— Пастаў у духавую шафу! — загадаў Міхалу.

— Віцёк, — звярнуўся дзед да таго хлопца, які начаваў у сталоўцы і завіхаўся тут разам з поварамі ад самага рання. Ён, відавочна, быў галоўным у нарадзе пасля дзяжурнага па сталоўцы прапаршчыка і толькі тым цяпер і займаўся, што камандаваў тымі жаўнерамі ў фіялетавай форме, якія былі ў варачным цэху, — скажы сваім, каб гаспадарчаму ўзводу, на тыя два сталы, за якімі дзядулі сядзяць, мяса пакуль не ставілі і для нарада таксама, я для вас асобна пакінуў.

Віцёк згодна кіўнуў у адказ і пайшоў раздаваць загады сваім падначаленым.

— Цяпер глядзі, — Аліеў звярнуўся да Міхала, — мяса жаруць усе! Яго заўсёды не хапае! Таму з ім трэба быць асабліва ўважлівым! Калі не хопіць — п…дзец!

Раман паказаў, колькі трэба класці ў адну талерку, каб было больш-менш раўнамерна: мяса, сала, падліўкі. Прынамсі, каб выглядала раўнамерна. Міхал ведаў, што па правілах падобныя стравы павінны ўзважвацца, але, як няцяжка было здагадацца, вагі зламаліся…

Як толькі нарад разнёс усе стравы, з вуліцы данесліся тупат дзясяткаў ног і прыглушаныя каманды.

— Паспелі. Так, — звярнуўся Аліеў да сваіх маладых калег, — зараз пойдзем снедаць разам з усімі. Ты, — тыцнуў ён у Міхала пальцам, — ідзі прабяжы да раздатачнага акна з другога боку. Я табе перадам кацялок з мясам. Твая задача будзе даставіць яго за наш стол. Бачыў, дзе я сяджу?

Міхал у адказ сцвярджальна кіўнуў, Раман паглядзеў на Пашу і Ваціка:

— Ваша задача прыкрываць яго, каб ён не наскочыў на дзяжурнага па сталоўцы. Сачыце за прапарам: ён зараз як шалёны будзе тут усюды гойсаць! Таму, калі данясеш кацялок, сядзеш за наш стол бліжэй да сцяны, а мяса ні ў якім разе не выстаўляй: паставіш побач з сабою на лаўцы. Зразумела? Усё, пайшлі!.. Стоп! Фартухі здыміце! Яны толькі залішнюю ўвагу да вас прыцягваюць!

Дзе і калі яшчэ, у якой арміі свету адбываліся падобныя вайсковыя аперацыі?! Тут былі і выведка, і прыкрыццё, і заблытванне праціўніка, імклівае перамяшчэнне і маскіроўка! Ніводзін з удзельнікаў гэтай аперацыі, калі ішоў у войска, не мог і блізка ўявіць, што яму давядзецца займацца чым-небудзь падобным у самай непераможнай і магутнай арміі на планеце… Што і казаць: бегчы праз вялізную абедзенную залу з поўным

кацялком гарачэннага гуляшу — гэта вам не з калаша шмаляць па мішэнях ці скакаць з парашутам з самалёта…

— У цябе колькі скачкоў з парашутам?

— Сто!

— Крута!

— А ў цябе колькі забегаў з перашкодамі па сталоўцы з гарачым кацялком?

— Дзвесце!

— Грандыёзна!.. Ты — сапраўдны герой!..

Пакуль даставілі той гуляш да прызначанага месца, адрэналіну хапнулі ўсе.

Толькі Міхал сеў за дзедаўскі стол — адразу ў залу пачалі ўваходзіць жаўнеры і займаць свае месцы. Праз хвіліну ўсё вакол гуло і віравала, як на кірмашы. З'явіліся і гаспадарнікі. Калі дэмбелі ўбачылі, што за дзедаўскім сталом сядзіць кабан, яны проста зарыкалі на яго, як раз'юшаныя драпежнікі, але на Міхалава шчасце падаспеў Аліеў, які растлумачыў, што так трэба, гэта частка звышсакрэтнай вайсковай аперацыі па ўлагоджванні старaслужачых.

За суседнімі сталамі кабаны жэрлі з поўных місак кашу, у талеркі дзядоў і чарпакоў перакачавала па некалькі невялічкіх кавалачкаў свініны з падліўкай, якую яны старанна, бы губкамі, вымоквалі белым хлебам. Чорны хлеб зноў-такі елі толькі маладыя.

На сталах гаспадарчага ўзводу пшанічнага хлеба было прыкметна болей, чым на іншых, — яшчэ адзін прывілей, Махмуд пастараўся. Гэта значыць, камусьці дасталася меней, чым прызначалася. Паўнюткія ж талеркі мяса ў старaслужачых і зусім выглядалі дэманстрацыяй сваёй перавагі над іншымі жаўнерамі: любуйцеся, хто тут галоўны, хто тут гаспадар, глытайце слінкі і зайздросціце!..

— О! Бач, якія кемлівыя новыя повары аказаліся! — зазначыў уголас Садоўнічы.

— Ага! Настолькі кемлівыя, што не дазволілі Рому мяса скрасці! — выбуркнуўся Якіменка.

Аліеў змаўчаў. А Міхал толькі цяпер зразумеў, чаму раптам Раман быў такі шчодры: нараду поўны кацялок мяса наклаў, сваім кабанам дапамог улагодзіць дзядоў. Чаму ён, мяшаючы гуляш, прыгаворваў, што нешта шмат мяса атрымалася: бо калі б усё яно трапіла па прызначэнні, на іншыя сталы, лёгка было б заўважыць розніцу паміж звычайнымі порцыямі, калі мяса раскрадалася, і тымі, якія яны павінны быць. Наўрад ці Аліева стрымала прысутнасць маладых повараў, каб скрасці мяса. Верагодней, яго збіў з панталыку Кротаў, калі адмовіўся гатаваць сняданак: кудысьці ж трэба было падзець скрадзенае, а той чалавек, якому звычайна прадае Раман, не быў папярэджаны. Вось і давялося дзеду імправізаваць… Атрымалася на карысць кабаноў…

Маладыя кухары і Лёха Камароў зусім не грэбавалі прасяной кашай і не без асалоды засяроджана працавалі лыжкамі. Да таго ж, у адрозненне ад кабаноў з іншых падраздзяленняў, ім перапала не толькі падліўка, але і па некалькі кавалачкаў мяса!

Яшчэ адной прыемнасцю выявілася тое, што дэмбелі не павінны ўжываць масла, а іхныя порцыі абавязаныя з'есці кабаны. Супраць такой традыцыі кабаны нічога не мелі і з асалодаю з'елі яшчэ па кавалку белага хлеба з тоўстым-тоўстым слоем масла. Якія там заварныя піражныя! Яны і блізка не стаялі побач з незапланаванай лустаю звычайнага пшанічнага хлеба з гарачым салодкім чаем! Для сябе, вядома ж, кухары чаю не пашкадавалі. Да таго ж ён быў сёння такі насычаны і салодкі!..

— Хадзем на развод, — сказаў да ўсіх Садоўнічы, — і вы таксама, — кінуў ён у бок маладых кухараў.

Калі прыйшлі на малы пляц ля казармы, Міхал адчуў, як невыносна ён хоча спаць: бяссонная ноч далася ў знакі. Пакуль мітусіліся ў сталоўцы, неяк асабліва не было калі звяртаць увагу на стому, а як паснедалі, дык стала проста немагчыма трываць: вочы зліпаліся самі, хоць запалкі ўстаўляй.

Міхал зірнуў на хлопцаў: і Паша, і Вацік таксама клявалі насамі.

З'явіўся камандзір узвода Пятроў. Садоўнічы даклаў яму, што ніякіх здарэнняў не адбылося за час ягонай адсутнасці. Камандзір прывітаўся — яму нязладжана адказалі. Пятроў загадаў разысціся ўсім па месцах. Дзе тыя месцы, усе, відаць, выдатна ведалі. Новым поварам было сказана застацца.

— У сталоўцы пакуль абыдуцца без вас. Там і так лайдакоў хапае. А чаму гэта вы не паголеныя?!

— Не паспелі, таварыш старшы прапаршчык! — адказаў за ўсіх Міхал.

— Не паспелі?! Як гэта?! Усе паспелі, а вы не паспелі! Пакажыце падшыву!

Хлопцы расшпілілі кручкі на каўнярах.

— Што за трасца! — абурыўся Пятроў. — І падшыцца не паспелі!.. Апошні раз такое бачу: наступны раз атрымаеце нарад па-за чаргой!

Які нарад? Ён жа сам казаў, што гаспадарчы ўзвод вызвалены ад нарадаў.

— На губу адпраўлю! — для большай важкасці дадаў камандзір. — Бягом ва ўзвод! Даю паўгадзіны, каб прывесці сябе ў належны стан! Затым да мяне на даклад!

Хлопцы пабеглі ў казарму.

— Не зразумеў! Якога хера прыперліся?! — абурыўся малодшы сяржант Ігар, які стаяў ля тумбачкі днявальнага і, відаць, чакаў, хто ж там уздымаецца на ягоны паверх.

— Пятроў загадаў, — адказаў Паша.

— Ды насраць я хацеў на Пятрова!

— Ён ідзе следам, яму і скажы! — сонна зазначыў масквіч.

Болей пытанняў не ўзнікала, і хлопцы хутка пайшлі ў свой кубрык.

Калі яны паголеныя ўжо ішлі ў бытавы пакой, каб адпрасаваць падшыву, на парозе дзедаўскага кубрыка Пятроў распытваў малодшага сяржанта:

— Гэта хто спіць?

— Аліеў.

— Сняданак гатаваў?

— Так точна.

— Дык не ягоная ж чарга, здаецца.

— Хто іх там разбярэ з іхнымі чэргамі. Ён гатаваў. З вечара папрасіў, каб яго разбудзілі, забраў новенькіх і пайшоў.

— Што?! Іх? — камандзір кіўнуў у бок навараў.

— Так точна, — без ранейшай самаўпэўненасці ў голасе адказаў сяржант, бо зразумеў па рэакцыі начальніка, што сказаў нешта лішняе.

— Стаяць! — гаркнуў прапаршчык і прычыніў дзверы ў дзедаўскі кубрык. — Бягом да мяне!

— Вы гатавалі сняданак з Аліевым?! — звярнуўся прыкметна разнерваваны камандзір.

Сэнсу адмаўляць не было ніякага: Ігар ужо ўсё сказаў. Але хлопцы маўчалі, не цямячы, што так раззлавала Пятрова і які адказ будзе правільны.

— Хто загадаў?!. Я пытаюся, хто вам загадаў?! Аліеў?! Хто ваш камандзір?!

— Вы, таварыш прапаршчык, — нечакана адказаў найбольш спалоханы Вацік.

— Я ваш камандзір! — роў на ўвесь калідор Пятроў. — Без майго загаду вы нічога не павінныя рабіць! Я ваш непасрэдны начальнік! У войску нічога не робіцца без загаду! Ні-чо-га! — паўтарыў ён апошняе слова па складах. — А калі б там што-небудзь з табой здарылася: палец адарвала мясарубка ці лопнула труба і абварыла цябе параю з галавы да ног, — Пятроў тыцкаў пальцам у гаротніка Шпачка, — хто б адказваў, як ты думаеш, каму б твой бацька прад'явіў прэтэнзіі?!

Можна падумаць, наяўнасць загаду непасрэднага начальніка ўратавала б каго-небудзь з іх ад таго, каб бяздумна не ўсунуць руку ў мясарубку, ці ад струменю гарачэннай па́ры. Міхала заўсёды здзіўляла, відаць, выключна савецкая звычка ва ўсім, што б і дзе ні здарылася, шукаць крайняга і прызначаць вінаватага: сонечнае зацьменне — хто вінаваты? Землятрус? Нехта павінен адказаць!

Да таго ж у савецкім войску ў тыле, а не ў Афганістане, штогод гінулі дзясяткі жаўнераў, і Радзевіч ніколі не чуў, каб нехта з бацькоў прад'яўляў некаму нейкія прэтэнзіі: гэта ж гонар — гераічна (а па-іншаму ў нас ніколі нічога не адбывалася, асабліва ў войску) загінуць пры выкананні службовых абавязкаў, пераконвала афіцыйная прапаганда. Хіба што са з'яўленнем Камітэта салдацкіх маці нешта пачало змяняцца. Прынамсі ў галовах. І нават у мужчынскіх справах, як гэта нярэдка здаралася раней, жанчыны аказаліся наперадзе: ба́цькі пакуль не спяшаліся задаваць пытанні.

— Мой бацька памёр, — прашаптаў Вацік.

— Тым больш! — ляпнуў нешта незразумелае і недарэчнае прапаршчык і нечакана супакоіўся… — Усё. Болей да гэтага пытання не вяртаемся: выконваем толькі

тое, што загадаў камандзір. Ідзіце падшывайцеся і да мяне ў кабінет, — зусім лагодна скончыў Пятроў ушчуванні…

Смешна, але крыкі камандзіра ўзвода нечакана хлопцам дапамаглі: на нейкі час адагналі сон, і яны змаглі падшыць каўняры на сваіх кіцелях даволі хутка.

Калі прыйшлі ў кабінет начальніка, ён выдаў ім анучы, вядро і швабру і павёў некуды ўніз. Выйшлі на вуліцу і рушылі ў бок другога атынкаванага будынка ў гарадку. У штабе мінулі пост дзяжурнага па частцы. Праз акно ў сцяне з адтулінай для пропускаў, як у касе на вакзале, было бачна, што ў пакоі дзяжурнага ўсе сцены спрэс завешаныя нейкімі пультамі з рознакаляровымі маленькімі лямпачкамі, а стол застаўлены незлічонай колькасцю тэлефонных апаратаў. І як у іх не заблытацца?

Прапаршчык выняў ключ і адчыніў дзверы з шыльдачкай «Архіў», прапусціў хлопцаў наперад і растлумачыў, што трэба сцерці пыл з бясконца доўгіх шмат’ярусных стэлажоў, на якіх шчыльна, адна да адной, стаялі аднолькавыя кардонныя шэрыя тэчкі з надпісам «Дело», і памыць падлогу. Пасля інструктажу Пятроў пакінуў хлопцаў у пакоі адных, а дзверы зачыніў на ключ, і маладыя кухары выразна пачулі, як у калідоры аддаляюцца ягоныя крокі.

Хлопцы ўзялі па невялікім кавалку прасціны, намачылі, выціснулі і пачалі праціраць паліцы. Але вельмі хутка стала відавочным, што ніякага прыкметнага пылу на іх няма. Не зусім каб яны былі ідэальна чыстыя, але ж і архіў — не аперацыйная хірурга.

Падлога, якую тут пакрываў шэранькі стракаты лінолеум, і зусім выглядала чысцюткай: пры ўсім жаданні не маглі ж па архіве адвольна бадзяцца натоўпы жаўнераў у кірзавых ботах. Таму хлопцы якую хвіліну пацерлі найбліжэйшыя да ўваходу кавалкі лінолеуму, а потым

узялі вядро з вадой, швабру і вялікую анучыну, якая прызначалася для мыцця падлогі, і перайшлі да дальняй сцяны досыць вялікага пакоя. На гэтай сцяне месцілася аж чатыры акны, але, як высветлілася, паглядзець на вуліцу праз іх было немагчыма: ва ўсіх шыбах стаяла нятаннае рыфлёнае шкло. У памяшканні было горача не толькі таму, што вокны выходзілі на поўдзень, а таму, што яго працягвалі ацяпляць, відаць, каб у ім не завялася цвіль і, барані божа, не з'ела звышкаштоўныя дакументы. Увага да папер у войску была куды больш пільнаю, чым да людзей: жытло радавых даўно ўжо не ацяплялася і пад раніцу тэмпература ў кубрыках станавілася такой самай, як і на вуліцы. Дзяжурны па роце, як палонны немец пад Масквой, соўгаўся туды-сюды па доўгім калідоры казармы ў накінутай на плечы коўдры.

На повараў зноў пачала навальвацца санлівасць. Яны спачатку папаселі, а потым леглі на падлогу і імгненна паснулі. Толькі сон іхны быў зусім не падобны да глыбокага салодкага забыцця, якое авалодвае чалавекам у цёплым утульным ложку, калі яму не пагражае небяспека і ўсе турботы мінулага дня засталіся недзе ў недасяжным далёка. Хлопцы ж праваліліся ў той трывожнапамежны стан, калі знясілены чалавечы арганізм адмаўляецца нармальна працаваць і, у якасці папярэджання, пасылае ў мозг сігналы ў выглядзе самых неверагодных і выкшталцона рэалістычных вобразаў... Пасля такіх сноў людзі падоўгу блытаюцца ва ўспамінах: што было на самай справе, а што прыснілася. Рэальнасць і мроі перасякаюцца ў свядомасці і ўтвараюць нейкую дадатковую рэчаіснасць... Часам мінаюць дні, месяцы, гады, перш чым чалавек канчаткова ўсведамляе, што таго ці іншага здарэння, падзеі, сустрэчы, гутаркі ніколі ў матэрыяльным свеце не адбывалася... Відаць, пасля такіх усведамленняў нараджаюцца сумненні ў рэальнасці ўсяго

існага: можа, яно — толькі сон, плён неўтаймаванай фантазіі, ілюзія… А на самай справе мы — нешта іншае, і цяпер знаходзімся ў зусім іншым месцы і толькі на імгненне заплюшчылі вочы… Ці гэта ўжо цягнецца не адно дзесяцігоддзе, стагоддзе, не адну тысячу гадоў… Ці ёсць у нас увогуле вочы? Можа, яны — таксама ілюзія, спроба некаму ці сабе растлумачыць, як мы бачым? Як мы ходзім, дыхаем, ямо?.. І да бясконцасці: пішам карціны, складаем вершы, ствараем музыку, будуем хмарачосы, ляцім да зорак, кахаем, нараджаемся і паміраем… А мо і не існуе ніякіх «мы»?.. Можа, усё існае — гульня толькі адной свядомасці?.. І ўсе гэтыя «мы» толькі затым, каб было не так самотна і страшна… Бо аднаму напэўна ж страшна… Страшна толькі ад усведамлення, што ты адзін!...

Зусім не выпадкова егіпецкія жрацы, шаманы напаўдзікіх народаў і цалкам сучасныя паэты ў па-чалавечы наіўнай спробе знайсці адказы наўмысна, пры дапамозе самых разнастайных сродкаў і рэчываў, даводзілі сябе да такога памежнага стану… Яны зазіралі за край ля бездані пазасвядомага, валачылі адтуль малапрыдатныя для нашай рэчаіснасці вобразы і спрабавалі больш ці менш удала прыстасаваць іх да наваколля…

У выніку часам нараджаліся мастацкія шэдэўры, часам прыносіліся крывавыя ахвяры, але, па вялікім рахунку, для большасці людзей у рэчаіснасці нічога не мянялася, яна заставалася надзейнай і грунтоўнай…

Да таго ж сацыялістычны рэалізм і матэрыялізм, ваяўнічы атэізм, маразм састарэлых савецкіх правадыроў з мільёнамі іхных малаадэкватных адэптаў практычна не пакідалі на адной шостай частцы планетнай сушы ніякага месца для няпэўнасці, цьмянасці ды прывіднай хісткасці…

# X

Прывідная грунтоўнасць рэчаіснасці, якая выявілася зусім нядаўна і нечакана, крыху палохала Міхала Радзевіча, але ж болей усё забаўляла: цяпер па вяртанні з памежнага стану, у які ўсё часцей і часцей трапляў хлопец, ён падоўгу спрабаваў расшыфраваць значэнне тых мройных вобразаў, якія не выпалі з памяці. Што гэта — прадказанні ці папярэджанні? Як навучыцца разумець іх загадкавую мову? Можна было б зрабіць выгляд, што нічога незвычайнага не адбываецца, махнуць рукой на ўсё невытлумачальнае, як на бязглуздыя сны, што паспяхова і зрабілі Вацік ды Паша, але Міхал заўважыў, што некаторыя сцэны, бачаныя ў мроях надзіва рэалістычна, потым акурат так і паўтараліся ў жыцці. Ён не раз моцна ўражваў сяброў, калі казаў, хто зараз зойдзе, напрыклад, у варачны цэх і што спытае, калі за секунды да з'яўлення начальства прыбіраў падалей з вачэй тое, што яно не павінна было бачыць...

Выхаваны на трывалых забабонах вясковых жанчын, Вацік цяпер пазіраў на Міхала, быццам на нейкага ведзьмака, і, як ніколі раней, практычна не пярэчыў, калі зямляк загадваў яму нешта зрабіць ці ўшчуваў за нейкія «касякі»...

Але найчасцей Радзевіч думаў, што разумеў сэнс ужо некалі перажытага ў мроях толькі тады, калі падзея адбывалася ў рэчаіснасці. Ён ніяк не мог растлумачыць сабе: ці на самай справе яму даваліся нейкія падказкі, ці ён проста спрабуе звязаць сапраўднае жыццё з бязглуздымі вобразамі хваравітай свядомасці. Практычна так, як гэта бывае з людзьмі, апантанымі тлумачэннем сноў: стаў у сне ў каровіну аладку — да грошай! Праз нейкі час і сапраўды знайшоў грошы — спраўдзіўся сон! А потым усё ж улез па самую шчыкалатку ў дзярмо

буйной рагатай жывёліны! Пра што быў сон?! І ці меў ён хоць нейкае дачыненне да рэальных здарэнняў?

Асабліва Міхала непакоілі вобразы, якія ўпарта паўтараліся і якім пакуль усё ніяк не знаходзілася ніякага тлумачэння ў рэчаіснасці. Гэта магло азначаць толькі адно: наперадзе яго чакаюць нейкія незвычайныя і, калі меркаваць па вытанчанай абсурднасці тых мрояў, зусім не прыемныя прыгоды…

У якісьці момант Міхал пачынае бачыць сябе аднекуль з боку і з вышыні, але пры гэтым адначасова адчувае сваё цела. Ён ляжыць накрыты коўдрай і абкручаны нейкімі правадамі ці то на ложку, ці то на плыце, які павольна плыве пасярэдзіне невялікай ракі. Зверху сіняе-сіняе неба, як у сонечны дзень, але абрысы берагоў ледзь праглядаюцца скрозь густы белы туман. Паступова ложак-плыт прыбіваецца да невялічкай выспы — хлопцу добра бачна, як рака падзяляецца на два рукавы і агінае гэты кавалак сушы. Пасярод вострава ўзвышаецца проста неверагодна велічэзны дуб, пад якім на каменным троне сядзіць казачны старац у шэрай, да пят, бы жаночая сукенка, кашулі, з доўгаю сівою барадой і, відаць, ніколі не стрыжанымі белымі валасамі. У правай руцэ стары трымае крывы кій, які вянчае падобны да сарочынага гнязда неахайны клубок з голля і калючага дроту, левай рукою дзіўны чалавек павольна пагладжвае па загрыўку вялізнага ваўка-альбіноса. Ад асалоды страшэнны звер заплюшчыў вочы і перыядычна ашчэрвае бліскучыя жоўтыя зубы…

Ложак знік, і Міхал стаіць цяпер за два крокі ад старога ў звычайным сінім спартовым касцюме.

— Ты хто? — пытаецца дзед.

— Міхал Радзевіч.

На гук незнаёмага голасу воўк настаўляе вушы і рэзка ўздымае павекі — ад ненатуральнага выгляду вогненна-

чырвоных вачэй пачвары хлопцу здаецца, што ў яго ў сярэдзіне нешта абрываецца... Але ўжо праз імгненне ад ласкавага дотыку гаспадара фантастычная істота зноў заплюшчвае вочы, апускае вушы і больш не звяртае ніякай увагі на госця...

— Ведаеш, хто я?

— Не, не ведаю, — няшчыра прызнаецца Міхал, бо яму вельмі карціць сказаць «Бог», таму што з падобным выглядам старога толькі ён і асацыюецца.

Але чаму ён спытаў маё імя: ён жа ўсё ведае. Выключна для парадку, ці што?

— Дык навошта тады ты прыйшоў сюды?

— Неяк само сабою атрымалася... Я не планаваў...

Міхалу карціць запытацца, дзе ён, але смеласці не хапае.

— Дзіўна... Выпадкова сюды не трапляюць...

Бог уважліва вывучае Міхала паглядам пранізлівых чорных вачэй, ад якіх хлопцу здаецца, што яго бачаць наскрозь.

Каб неяк пазбыцца няёмкасці, Радзевіч, у сваю чаргу, пачынае разглядаць каменныя карункі і загадкавыя знакі, якія шчодра аздабляюць трон. На высачэнную шырокую спінку каменнага крэсла адначасова аднекуль з супрацьлеглых бакоў прылятаюць і садзяцца два велічныя арлы, чорны і белы. Вялізныя птахі не складаюць крылы, а, наадварот, шырока разводзяць іх у бакі, быццам імкнуцца прадэманстраваць усю іхную неабсяжнасць...

— Калі ты здолеў сюды прайсці, — нечакана абзываецца стары, — значыцца, ты адзін з нашых... Толькі я чамусьці блытаюся ў тваім радаводзе... Відаць, ты здалёк прыйшоў...

Нейкі дзіўны Бог: не ведае, адкуль я прыйшоў!

— Ха-ха-ха! — раптам рагоча дзед зусім не старэчым сакавітым басам. — Ты падумаў, што я Бог?!..

— Ну а хто тады? — баязліва цікавіцца Міхал.

— Я Ліздзейка!.. Чуў пра такога?!

— Не, не чуў…

— Прыйдзе час — абавязкова пачуеш!.. — гучыць, быццам пагроза. — А ты пакуль усяго толькі хочаш ведаць, ці вернешся дадому?..

Міхал не зусім цяміць, адкуль ён мусіць вяртацца, і таму нічога не адказвае.

— Табе ж ужо сказалі, — працягвае старац. — «Калі не трапіш туды, можа і вернешся жывым дадому».

— Куды туды? — перапытвае ўшчэнт збянтэжаны хлопец.

Але цяпер перад ім замест Ліздзейкі стаіць той самы жаўнер з перасыльнага пункта на аэрадроме і паўтарае некалі ўжо прамоўленыя ім словы:

— Гэта з дзікай дывізіі купцы, Борна-Сулінава. Пяхота. Амаль адны «чуркі». Калі не трапіш туды, можа і вернешся жывым дадому...

Пасля гэтых выпадковых словаў незнаёмага свядомасць звычайна вяртаецца да Радзевіча і ён выпадае з забыцця…

Хто такі той Ліздзейка, спытаць няма ў каго… Ды і ці ведае хто-небудзь наогул? Ці не з'яўляецца той дзед толькі кпінамі стомленага мозгу… Але Міхал не сумняваецца, што ён павінен быў недзе чуць ці чытаць гэтае дзіўнае ўласнае імя, бо сам наўрад ці прыдумаў бы падобнае…

Што не так з маім радаводам? І з якіх такіх «нашых» я адзін?.. Ведама — трызненне… Але, як ні дзіўна, арлам ёсць тлумачэнне: гербы Польшчы і Германіі, акурат белы і чорны арлы… Але прычым тут яны?.. У Борна-Сулінава я ўжо не трапіў, значыцца, у мяне ёсць шанц вярнуцца дадому жывым… Але ніхто ніякай

адназначнай гарантыі не дае: усё ж «можа і вернешся»... Шанц не вярнуцца таксама не выключаецца... І які сэнс тады ў тым навязлівым трызненні, якое штораз паўтараецца?..

Іншыя галюцынацыі з тых, што паўтараліся, былі хутчэй слыхавыя, бо карцінкі, якія іх суправаджалі, кожны раз былі розныя, невыразныя і практычна не запаміналіся...

— Харэ Крышна Харэ Крышна
Крышна Крышна Харэ Харэ
Харэ Рама Харэ Рама
Рама Рама Харэ Харэ*, — раптам пачыналі гучаць самі па сабе ў Міхалавай галаве абсалютна незнаёмыя словы...

Часам ён чуў, нібы звонку, аддалена, як гэтыя ж словы прагаворваюць ці спяваюць на розныя галасы нябачныя людзі...

Што за рама?.. Піларама?.. Крышна — «крыша»? Піларама, «крыша»... «Харэ», адным словам!

— Чырвоны фіят 126, — не зразумела, з якой нагоды пачынаў паўтараць, як абвестку на вакзале, нечы чужы голас. — Ля чыгуначнага пераезда з уключанымі аварыйнымі ліхтарамі... Улица Паркова, улица Паркова, улица Паркова...

Фіят — ведаю. Чаму менавіта 126-ы — не...

Паркавая вуліца? І што? У якім горадзе няма Паркавай вуліцы... Калі Паркова, значыць горад польскі... Дык мы ж у Польшчы — нічога дзіўнага... Можа, чуў дзе-небудзь?

---

* Індуісцкая мантра на санскрыце, ці махамантра (вялікая мантра). Складаецца з 16 слоў, якія з'яўляюцца імёнамі Бога на санскрыце: Харэ, Крышна і Рама.

— Sprechen Sie Deutsch?* — ледзь не штораз, як хлопец заплюшчвае вочы, пытаецца жаночы голас.

Ага! Аж два разы шпрэхен! Хэндэ хох! Шнелер! Гітлер капут! Увесь слоўнікавы запас савецкага піянера ведаю!..

Трызненні ёсць трызненні, што з іх узяць… Не варта спрабаваць іх зразумець…

# XI

Фанера балела і стракацела сіне-чырвонымі плямамі. Паэт Лермантаў праявіў салідарнасць: пранікнёна паведаміў, што ў яго на задніцы такая ж фіялетавая зорка, нават серп і молат відаць, толькі як у люстэрку: ці то дагары нагамі, ці то павернутыя ў другі бок…

Цар Пётр выявіўся такім жа брыдкім, як і на партрэтах: вірлавокім і з кацінымі вусамі… Каціна з вусамі… Скаціна з вусамі… І гэтыя пухленькія шчочкі, нібы заўсёды надзьмуты, незадаволены нечым… Так і хочацца пляснуць далонямі адразу па абедзвюх… Чым ты вечна незадаволены, чаго надзімаешся, пыхкаеш, як паравоз? Га? Вася?.. Пунтус? Пунтус-плінтус… Ну і прозвішча… Адпавядае: ён зусім не высокі… Толькі лыч як у цара, а так не вышэйшы за Шпачка, толькі ўкормлены як след і да таго ж яшчэ крываногі!..

Пакуль крываногі, пардон, цар Пётр I спаў бы пшаніцу прадаўшы, у кухарскім пакоі, вечна сонны, напаўпрытомны Шпачок, які пад чулым кіраўніцтвам змардаванага службаю дзеда гатаваў сняданак, «зафінціў» без ценю сумненняў у кацёл з ужо заваранай гарбатай

* — Вы гаворыце па-нямецку? *(ням.)*

цэлы пачак солі… На шчасце, сведкам ні з чым не параўнальнага відовішча стаў дзед з нарада, які спачатку нарагатаўся як след, затым прымусіў Ваціка з'есці паўбохана чорнага хлеба, запіваючы салёным чаем, а ўжо потым пашкадаваў небараку і вярнуў жменю скрадзенай для асабістых патрэбаў заваркі. Зварыць да снядання новую, хоць і занадта празрыстую гарбату — шкада, што мала заваркі скраў нарад, — усё ж паспелі, але Шпачку было ўжо на гэта напляваць: ён не проста курчыўся ад ванітаў — яго натуральна выкручвала навыварат, у гэтую хвіліну ён быў бы зусім не супраць, каб яго наўпрост расстралялі за сапсаваную казённую гарбату, чым так пакутаваць…

Герасімаву па-сапраўднаму пашчасціла: ён стаў асабістым рабом хлебарэза Махмуда. Цяпер ён жыў у хлебарэзцы і ў казарме не з'яўляўся зусім. Калі хлопцы часам сустракалі Пашу ў сталоўцы і скардзіліся яму, што ўтрох не паспяваюць дагаджаць дзядам і дэмбелям, а таму пастаянна нарываюцца на пакаранні за яўныя ды ўяўныя «касякі» ды «залёты», што практычна зусім не спяць і сілы іхныя на зыходзе, прасілі яго начаваць ва ўзводзе, дапамагчы ім, масквіч у сваю чаргу пераконваў іх, што гэта ён апынуўся ў натуральным пекле: Махмуд сапраўдны неандэрталец, чорт, нічога абсалютна не робіць, ледзьве гаворыць і разумее па-руску, а толькі тым і займаецца, што качае прэс, адцiскаецца ды пад невыносныя ўсходнія спевы з магнітафона содні напралёт дубасіць, бы баксёрскую грушу, драўлянымі палкаміі-нунчакамі няшчаснага Пашу.

Дзяды, па ўсім відаць, баяліся дзікуна Махмуда, бо самі нічога не казалі яму, каб вызваліў парабка-кабана для агульных патрэбаў ці хаця б час ад часу адпускаў яго начаваць у казарму. Астатнім жа кабанам, калі бачылі,

што яны фізічна не ў стане выканаць усе дзедаўскія пажаданні, настойліва раілі «наехаць» на Пашу, найлепей пабіць талакою і папярэдзіць, што, калі звольніцца яго-ны гаспадар, яго зашпіляць нанова, бо ён перасядзеў у сталоўцы ўсё кабанства і абслугоўваў толькі аднаго дзеда, а гэта ніяк не можа лічыцца роўным з дагаджэннем усім дзядам ды дэмбелям узвода. Больш за тое: зашпіленаму дзеду не тое што не будзе падпарадкоўвацца ні адзін кабан — усіх абавяжуць пагарджаць ім, грэбаваць, падстаўляць, правакаваць і біць пры кожнай нагодзе, адным словам, «чмарыць».

Лёха Камароў выказваўся, што гатовы наехаць на Пашу-масквіча, толькі як жа яго сустрэць, бо ў сталоўцы ён бывае толькі разам з усімі, калі прыходзіць есці, а Герасімаў якраз тады і не паказваецца. Штовечар Лёха распытваў Радзевіча і Шпакоўскага, ці гаварылі яны з Пашам і што той кажа ў сваё апраўданне.

Міхал і Вацік па-ранейшаму ставіліся да Пашы як да сябра, калі выпадала рэдкая хвіліна пагаварыць, з радасцю дзяліліся навінамі, думкамі, меркаваннямі, хлопцы давяралі Герасімаву, лічылі, што ён сапраўды трапіў у безвыходнае становішча, таму ніякіх апраўданняў ад яго не патрабавалі.

Радзевіч пастаянна корпаўся ў сабе: як так сталася, што ён уключыўся ў гэтую ідыёцкую гульню, ён жа заўсёды быў перакананы, што штосьці падобнае можа здарыцца з кім заўгодна, толькі не з ім, што ён той чалавек, які здольны супрацьстаяць, не падпарадкоўвацца любой сістэме, тым больш такой прымітыўнай, якой з'яўляецца дзедаўшчына. На чым яна трымаецца? Дзіцячыя страхі, падлеткавыя комплексы, падмена паняццяў пра гонар і справядлівасць, дабро і зло… Гэта ўсё так. Але найперш, відаць, на тым, што ў закрытых чалавечых

асяродках заўсёды складаюцца ідэальныя перадумовы для ўзнікнення чагосьці падобнага: калі справа тычыцца ўмоваў фізічнага існавання, інтэлект саступае ў важнасці і практычнасці перад сілаю. Гэта ў звычайным асяроддзі чалавек абірае, з кім мецъ справу, а каго лепей абысці, не заўважыць, абмінуць… А ў войску, у казарме — як на караблі: пазбегнуць стасункаў з непажаданымі асобамі немагчыма… Пры ўсім жаданні сысці ад беззаконня і гвалту тут не атрымаецца, бо адразу ж трапіш пад дзеянне закона юрыдычнага, які ператворыць цябе ў дэзерціра з непазбежнай перспектывай загрымець на некалькі дадатковых гадоў у яшчэ больш закрыты асяродак дысцыплінарнага батальёна… А якія цалкам узаконеныя жахі адбываюцца там, не раз даводзілася чуць не толькі ад старaслужачых, але і ад афіцэраў…

Як і ўсё астатняе ў Савецкім Саюзе, у войску стасункі паміж афіцэрамі і радавымі, як выявілася, насілі дваякі характар, мелі прыгожа-паказушныя знешнія праявы і зусім непрывабную ўнутраную сутнасць: з аднаго боку, камандзіры ўсяляк дэманстравалі клопат аб падначаленых, асабліва дбалі пра маладых: пастаянна цікавіліся, ці не крыўдзяць іх старaслужачыя; з другога боку, увесь гэты клопат тым і абмяжоўваўся: спытаць кабана ў прысутнасці дзеда, ці не прыніжаюць яго, і з пачуццём выкананага абавязку сысці дадому… Тое, што практычна да года службы ўсе маладыя выяўлялі проста нейкую паталагічную нязграбнасць: бясконца «падалі з лесвіц» ці «не маглі размінуцца з дзвярыма» і, як вынік, нібы баявыя ўзнагароды, пастаянна насілі на сабе адмысловыя гематомы, начальнікаў не засмучала зусім.

Назіраючы штодня такую крывадушнасць афіцэраў, маладыя жаўнеры не маглі не верыць пераканаўчым аргументам старaслужачых, што камандзіраў падобны

стан рэчаў цалкам задавальняе. Больш за тое, дзяды распавядалі безліч гісторый, якія зводзіліся да таго, што афіцэры імкнуцца хутчэй пакараць не крыўдзіцеляў, а іх ахвяр, пазбавіцца ад «стукачоў»: справодзіць небаракаў калі ўжо не ў дысбат, дык хаця б у іншую частку…

А што такое іншая частка? Усё тое ж самае, што і тут… Тым больш на працягу тыдня дбайныя сувязісты высветляць, куды цябе перавялі, і не без асалоды панарасказжуць новым тваім калегам такога, ад чаго немагчыма будзе пазбыцца не тое што да канца службы, а і да скону дзён…

Не без іроніі Міхал думаў, што нарэшце спасціг сутнасць славутых баявых традыцый савецкага войска, якія перадаваліся ад пакалення да пакалення і пра якія даводзілася чуць мільён разоў…

І Радзевіч, і Шпакоўскі неяк самі па сабе, не згаворваючыся, стараліся дапамагчы кабанам, якія прыходзілі ў нарад па сталоўцы, у справе забеспячэння іхных дзядоў дадатковымі харчамі. Прынамсі, заплюшчвалі вочы на іх дробныя крадзяжы ці на адвольнае карыстанне казённым посудам, патэльняю ды плітой. Натуральна, посуд пастаянна бясследна знікаў. Тады раз на тыдзень з'яўляўся начальнік сталоўкі і выдаваў неабходную колькасць лыжак, шклянак, місак і кацялкоў…

Цікавая, аднак, служба ў Антонава. Чым ён займаецца ў астатні час?

Кротаў і Якіменка, як і папярэджваў Макс, перасталі працаваць у сталоўцы зусім, хоць па-ранейшаму іх прозвішчы ўпісваліся ў графік. Фельд'егерскі кухар Сярожа не грэбаваў вучыць маладых, якія цяпер гатавалі з ранку да вечара. Праз гэта дэмбелі з гаспадарчага ўзвода бясконца кпілі з Сярожы, называлі яго лохам і «чмошнікам»: відаць, была ў іх нейкая гісторыя.

Аліеў і Вася Пунтус, які прыехаў з вучэнняў на другі дзень пасля несанкцыянаванага непасрэдным начальнікам удзелу ў прыгатаванні сняданку новымі кухарамі, з'яўляліся ў сталоўцы згодна з графікам, але толькі тое і рабілі, што прыхоўвалі ці кавалак мяса, ці некалькі бляшанак тушонкі на продаж і, у найлепшым выпадку, даўшы такія-сякія парады маладым, знікалі: самі ж не рабілі нічога.

Пасля салёнай гарбаты Вацік напрамілы бог прасіў Міхала кантраляваць яго. І недарма: некалькі разоў Радзевічу даводзілася ратаваць ад цукру боршч і кісель ад макаронных вырабаў. Гаворкі пра тое, каб яшчэ хоць раз дазволіць Шпачку застацца ў варачным цэху аднаму, і зусім не магло весціся.

Міхал і сам пабойваўся свайго стану: ён хоць і пастаянна кантраляваў кожнае дзеянне, выдатна разумеў, што ў любы момант можа адключыцца і ўчыніць штонебудзь як мінімум не горшае за салёны чай…

Праз чатыры тыдні службы ў батальёне сувязі, якія, здавалася, адабралі столькі ж высілкаў, колькі хапіла б на чатыры гады ў статутнай вучэбцы ваенных кухараў, дэмбелі пачалі з'язджаць. Першымі з гаспадарчага ўзвода, відаць, за асаблівыя службовыя заслугі, звольніліся Кротаў і Якіменка: забеглі неяк у парадных строях у сталоўку, раздалі ўсім, каго сустрэлі, па цыгарэціне і зніклі…

— Шкада нават неяк, — зазначыў Вацік.

Радзевіч толькі падумаў, што ён таксама чамусьці шкадуе, што больш ніколі ў жыцці, найверагодней, не ўбачыць ні Макса, ні Саню. І ў гэтым шкадаванні Міхал адчуў нешта хваравітае: яшчэ сёння раніцай ён пасылаў у думках гэтым брыдкім пачварам самыя страшныя праклёны, зычыў ім усяго самага найгоршага, у чым нават

нельга прызнавацца, а цяпер шкадуе… За бясконцыя знявагі і прыніжэнні, пастаянныя «наезды» і прабіванні фанеры… Шпачку ж яшчэ часцей ад іх даставалася, і вось табе на — шкадуе… Аб чым тут шкадаваць? Хіба толькі аб тым, што не паклапаціўся даведацца іх хатнія адрасы, каб вось цяпер, падчас развітання, назваць іх і паабяцаць абавязкова наведацца ў госці: няхай бы праз паўтара года ўздрыгвалі ад кожнага званка ў дзверы і ад любога шолаху за спінай… Але ж мы не зласлівыя і не помслівыя, мы — высакародныя, да такой нізасці ніколі не апусцімся… А як бы, цікава, гэтыя вылюдкі паводзілі сябе, калі б ведалі пра магчымасць акрэсленага развіцця далейшых падзеяў, як гэта бывае і сёння на Каўказе…

Пасля ад'езду Кротава і Якіменкі кабанам у гаспадарчым узводзе стала крышку лягчэй.

Потым знік фельд'егерскі повар Сярожа. Нават развітацца не забег. Міхалу і Ваціку адразу стала яшчэ складаней у сталоўцы: цяпер у іх тут не было ніякага перадыху, працавалі ад цямна да цямна ўдвух.

Яшчэ праз некалькі дзён зніклі ўсе разам астатнія дэмбелі з гаспадарчага ўзводу. Лёха Камароў, Міхал і Вацік не хавалі сваёй радасці з гэтай нагоды: цяпер на іхных карках засталося толькі пяцёра дзядоў, бо не стане ж раптам Махмуд начаваць у казарме. Ледзь не ўдвая паменела эксплуатататараў!

Эх, каб яшчэ Паша дапамог, дык і зусім ніштаватае жыццё стала!

Толькі ці не ў той самы вечар пасля ад'езду дэмбеляў дзяды быццам з ланцуга сарваліся: цяпер яны патрабавалі не проста памяняць «падшыву», вымыць нагавіцы ці кіцель, згатаваць смачную пайку і зварыць гарбату; цяпер дзядулі перад сном хацелі пачуць кожны раз новую казку пра тое, якое салодкае жыццё чакае іх

пасля звальнення, і абсалютна не маглі заснуць без адмысловай калыханкі ў выкананні хору кабаноў.

Тугія на вуха харысты завывалі без складу і ладу, дзяды крыўдзіліся, абураліся разбурэннем соннай атмасферы і арганізоўвалі пазапланавыя ўрокі сальфеджыа: прымушалі спевакоў адціскацца і прысядаць, вісець над ложкамі, упершыся рукамі і нагамі ў спінкі, прабівалі іхныя новыя, стодзюймовыя, гатовыя да бою фанеры і пастаянна падкрэслівалі, што яны не хацелі б ні ў якім разе займацца нечым падобным, дзядулі ўвогуле добрыя, але, бачыць бог, кабаны вінаватыя ва ўсім самі!

Цяпер нядаўняе мінулае да звальнення дэмбеляў здавалася казачным сном. Пасля начных трэніровак Міхал з цяжкасцю мяшаў вясёлкай кашу: рукі балелі невыносна. Яшчэ больш, чым раней, хацелася спаць, і захаванне кантролю над сабой вымагала неверагодных высілкаў…

А яшчэ ж неабходна было прыглядаць за Шпачком, які цяпер нагадваў гогалеўскую Панначку, адзінага паўстанца з труны, якога ведалі савецкія дзеці: і без таго доўгі нос цяпер здаваўся большым у два разы, шчокі запалі, а пад вачыма на папярова-бледнай скуры аблічча выразна праступалі чорныя плямы. Ён туляўся з цэха ў цэх, абапіраючыся на сцены, і калі яго пакідалі ў спакоі больш чым на хвіліну, тут жа выключаўся, аўтаматычна, па яго словах, як халадзільнік.

Чарпакі з гаспадарчага ўзвода пасля ад'езду сваіх былых дзядоў прыкметна актывізаваліся: глядзелі па начах тэлевізар, пілі піва, слухалі на магнітафоне ці спявалі пад гітару чароўныя ў сваёй тупасці салдацкія песні.

*До свидания, родной КПП.*
*Больше мне не сидеть на губе.*
*До свидания, кусок, мой закончился срок —*
*До вокзала один марш-бросок...*

Праз месяц максімум павінны прыйсці навабранцы, і тады яны стануць сапраўднымі дзядамі з адпаведнымі паўнамоцтвамі. Радзевіч шчыра спачуваў тым не вядомым яму хлопцам, якім давядзецца замяніць у гэтым змяіным кубле пяць дэмбеляў: з іх будуць здзекавацца цэлых шаснаццаць адборных вылюдкаў. А ў тым, што суседзі па кубрыку ў большасці сапраўдныя дэгенераты, сумнявацца не даводзілася.

Неяк пасля чарговай бяссоннай ночы, калі не больш чым праз сорак хвілін кухары павінныя былі пайсці ў сталоўку гатаваць сняданак, Лёха, Міхал і Вацік прывалакліся ў кубрык і, як былі апранутыя, забурыліся, не рассцілаючы, на свае ложкі і тут жа праваліліся ў трывожнае забыццё. Камарову па-сапраўднаму пашчасціла: ён зможа праспаць больш за дзве гадзіны — нязбыўная мара для Радзевіча і Шпакоўскага. Іх прыйдзе будзіць днявальны праз нейкіх сорак хвілін. Што такое сорак хвілін для змардаваных штучнай бяссонніцай хлопцаў, для якіх гадзіна пралятае ў адно імгненне?..

Міхал адчуў, як нехта тузае яго за плячо і шэпча: «Пад'ём!» Але на гэты раз, супраць звычайнага, чамусьці не стаў адразу ўскокваць з ложка, а найперш расплюшчыў вочы: над яго галавой навісала нечая тлустая срака!

— Пад'ём! — цяпер значна выразней данёсся аднекуль голас.

Радзевіч міргнуў некалькі разоў — срака не знікала. Тады ён, наколькі гэта было магчыма ў такім нязручным становішчы, сціснуў кулак і даволі моцна па ёй ударыў!

— Уй! — срака адскочыла ўбок. — Ты што, ах…еў, кабан!

— Ціха, ціха, Фрол, — супакойваў гаспадара тлустага азадка дзяжурны па ўзводзе малодшы сяржант Ігар, — пайшлі другога будзіць.

Чаго яны дабіваюцца? Што хацелі ўтварыць гэтыя ідыёты?

— Вацік! — паспрабаваў папярэдзіць Шпачка Міхал.

Але было запозна: неабсяжная Фролава срака ўжо навісла над спячым, а сяржант тузаў Вацікa за плячо:

— Пад'ём!

Змардаваны Шпачок, не расплюшчваючы вачэй, паспрабаваў ускочыць з ложка і тут жа, бы ў падушку, уткнуўся ў чарпакоўскі азадак, адскочыў назад на ложак і, абсалютна агаломшаны, паспрабаваў хуценька ўзняцца зноў — усё паўтарылася… Чарпакі аж зайшліся ад смеху! Толькі цяпер Міхал заўважыў, што акрамя Ігара і Фрола, за канцэртам назіралі яшчэ чалавек пяць… Усе былі на сёмым небе ад захаплення!.. Як жа вам мала трэба для шчасця!..

Каб вам добра было…

З нейкага часу Махмуд распачаў раз на тыдзень ладзіць у сваёй хлебарэзцы генеральныя ўборкі, для іх правядзення аднаго Пашы яму было, відаць, замала, а жаўнерамі з нарада ён грэбаваў. Таму душман, як ахрысціў яго ў думках і зваў за вочы Міхал, заганяў да сябе двух астатніх сталоўскіх кабаноў і прымушаў іх шураваць шчоткамі лінолеум, скрэбці нажамі да белі драўляныя латкі з-пад хлеба і націраць да бляску, каб быў як люстэрка, стол з нержавейкі, на якім дзялілася на порцыі масла.

Пры гэтым ён не пакідаў хлопцаў адных ні на секунду, не даваў ніякай магчымасці нязмушана пагаварыць, а ўвесь час вісеў над душою, чапляўся, злаваўся, бо ўсё, на ягоную думку, маладыя рабілі не так, як належала, былі крыварукія і ні на што не здатныя. У тым, што Махмуд не мог нічога ўцямна растлумачыць па-руску і яго папросту не разумелі, вядома ж, таксама былі вінаватыя ягоныя бледнатварыя кабаны.

Міхал так і не здагадаўся, чым ён справакаваў душмана, але той раптам схапіў з кута доўгую драўляную ручку ад шчоткі, пакруціў ёю ў паветры, як ніндзя, і нечакана даволі моцна выцяў Радзевіча па левай назе. Калі б удар прыйшоўся па цягліцах, мабыць, нічога страшнага і не здарылася б, але Махмуд трапіў якраз па сярэдзіне вялікай галёначнай косткі, дзе акрамя скуры нічога мяккага няма. Зрэшты, нічога надзвычайнага напачатку і не праявіліся: Міхал пацёр месца, куды трапіла палка, і праз хвіліну працягнуў працаваць, нібы нічога не адбылося.

На наступны дзень месца, куды прыйшоўся ўдар, чамусьці супраць звычайнага не пасінела, а пачырванела, і смылела, як апёк. Але Міхалу асабліва не было калі прыслухоўвацца да такой дробязі, як нага: штодзённых спраў у сталоўцы, як заўсёды, было аж занадта, і яны паглыналі ўсю ўвагу ды энергію. Аднак пасля вячэры хлопец адчуў, што яго пачало калаціць, нібы ён апынуўся ў лёгкім кухарскім адзенні на марозе. Толькі ўсе вакол аж млелі ад гарачыні: старэнькая вентыляцыя ў сталоўцы была вядомай праблемай.

Што ж гэта такое? Атруціўся? Штосьці падобнае з ім было тады, калі неяк у дзясятым класе ў школьнай сталоўцы ён з'еў няякасную катлету… Дакладна як і тады, усё вакол зацягнулася шчыльнай смугою… Што рабіць?..

У казарме нават дзяды заўважылі, што адзін з кабаноў выглядае не як звычайна, але адрэагавалі, як заўсёды, па-свойму, не арыгінальна: «Косіць»! Гэта значыць, прыкідваецца, спрабуе пазбегнуць выканання звычайных абавязкаў… Таму выявілі творчую фантазію напоўніцу, пастараліся як маглі, каб гэтай ноччу маладым было чым заняцца…

Пасля таго, як утаймаваныя калыханкаю дзяды нарэшце зрабілі выгляд, што спяць, а кабаны засталіся адны ў бытавым пакоі, Лёха Камароў пашкадаваў Радзевіча:

— Хопіць! Няўжо яны не бачаць, што ты ледзь прытомны?! Няхай ідуць сёння ў задніцу, не будзем мыць іхныя анучы! Абыдуцца! Ты, Міхал, ідзі кладзіся, а мы з Вацлавам толькі падшыем сёння ім кіцелі і хопіць!

Міхал пажадаў змяніць хаця б адну дзедаўскую «падшыву», каб трохі дапамагчы хлопцам, але не змог нават уцягнуць нітку ў іголку, і тыя пагналі яго з бытоўкі…

Дзве гадзіны! Цэлых дзве гадзіны ён зможа праспаць у ложку! Нават можна распрануцца!.. Ад гэткіх салодкіх думак Міхалу нават здалося, што ён пачуваецца значна лепей…

Але той стан, у які праваліўся Радзевіч, ніяк не падпадаў пад традыцыйнае паняцце пра сон: гэта было ўсё тое ж хваравітае трызненне, у якое ён трапляў штораз ужо больш за месяц пасля прыезду з вучэбкі, калі на нейкі час заставаўся нерухомым… Толькі цяпер усе тыя прывідныя, няўцямныя вобразы, што нахабна, без усялякага запрашэння лезлі ў Міхалаву свядомасць, нечакана набылі абсалютную рэалістычнасць… І толькі іх імгненная зменлівасць і немагчымасць ледзь-ледзь, без усялякай настойлівасці падказвалі, што ўсё ж такі гэта не сапраўднае жыццё…

Бацька бегае-спяшаецца па ворыве за плугам: конь калгасны, трэба за паўгадзіны паспець пераараць гарод, пакуль сусед паабедае… Міхал чамусьці ў ваеннай форме, але па-дзіцячы ные-вяжацца, каб бацька даў яму пахадзіць за плугам. Нарэшце Пятрок саступае. Міхал хапаецца за ручкі, тузае лейцы:

— Но! Пайшоў!

Конь кранаецца з месца, і з-пад адвала прыгожымі бліскучымі лустамі выслізгвае зямля і разбіваецца на дробныя камячкі. Але Міхал не паспявае прайсці і дзесяці метраў, як плуг падскоквае ўверх і вылятае з баразны. Конь адразу спыняецца, а бацька злосна крычыць:

— Зялёны ты яшчэ для такой справы! Дай ужо дааараць! Другім разам павучышся!

Міхал не пярэчыць, саступае і пільна ўзіраецца на свае кірзавыя боты: ці не моцна запэцкаў. Але на нагах у яго ўжо не боты, а белыя кухарскія нагавіцы і цёмна-сінія ці брудна-фіялетавыя, як колер формы, у якой ходзіць нарад па сталоўцы, паўкеды, і стаіць ён ужо не на цвёрдай глебе, а на кавалку асфальту, які выспаю вытыркаецца пасярод лужыны з карычневай глінянай жыжкі...

Чаму разбілі асфальт ля галоўнага ўвахода ў сталоўку? Цеплатрасу будуць мяняць? І як жа я трапіў акурат на сярэдзіну гэтай багны? Як выбрацца?..

— Скачы! — падказвае нехта нябачны.

Праўда! Я ж няблага ўмею скакаць! І з разбегу, і патроеным, і з месца! Чаго баяцца?

Міхал прымае стойку: крыху падгінае каленкі, адводзіць левую штуршковую нагу назад і, некалькі разоў гайдануўшыся ўзад-уперад, адштурхоўваецца і ляціць…

Здаецца, атрымалася: хуткасць нармальная, напрамак правільны… Але чаму так доўга, нібы на Месяцы, цягнецца палёт?..

Толькі паспявае Радзевіч падумаць, што здарылася з прыцягненнем, як адразу ж каменем падае ўніз. Правая нага надзейна прызямляецца на цвёрды бераг, а левая па-здрадніцку спачатку проста пляскае па глінянай жыжы, а ў наступнае імгненне і зусім правальваецца ў яе па калена… Толькі машынальна падагнуўшы пра-

вую нагу і нахіліўшыся наперад, Міхал не плюхнуўся спінаю ў лужыну… Цяпер левая нага напалову карычневая.

Халера! Толькі надзеў чыстыя нагавіцы!

На ганку сталоўкі аж заходзяцца ад рогату бройлерны Амурчык Фрол і малодшы сяржант Ігар.

Гэтых тут толькі не хапала!

— «Косіш»? — пытаецца школьная медсястра Алена Мікалаеўна, якая незразумела як апынулася побач.

— Не! — абураецца Міхал. — Хіба я вінаваты, што гэтую лужыну ніяк не пазначылі?!

— Якую лужыну? — шчыра дзівіцца медработнік.

— Гэтую! — Радзевіч паварочваецца ў бок лужыны і па інерцыі тыцкае ўказальным пальцам у брук.

Ніякай лужыны і блізка няма. Да таго ж які асфальт? На гэтым месцы заўсёды быў брук!..

Але ў наступнае імгненне Міхал разумее, што знаходзіцца ў нейкім дзіўным памяшканні са шклянымі сценамі, бы ў акварыуме. Побач сядзяць незнаёмыя хлопцы ў ярка-сініх касцюмах, і позіркі ўсіх скіраваныя ў адным напрамку, з якога даносіцца шум вадаспаду.

Радзевіч бачыў вадаспады толькі па тэлебачанні, але яму здаецца, што шумець яны павінны прыкладна так.

— Што там?! — пытаецца ён у суседа, нібы сам баіцца паглядзець.

Але той нічога не паспявае адказаць, бо вакол няма ніякага шуму, ён знік, цяпер гэта нейкі іншы пакой, тут пануюць паўцемра і цішыня. Цяпер Міхал сам штосьці тлумачыць, відаць, не вельмі кемліваму слухачу, аблічча якога не можа разгледзець:

— …Таму што калгасных кароў так кепска кормяць, што яны даюць столькі ж малака, колькі дае каза ў добрага гаспадара. А то і яшчэ меней!

Раптам Міхала аж да пят пранізвае шчымлівае шкадаванне, аж да слёз!

З чаго б раптам? Яму так шкада калгасных кароў? Укормленых коз? Ці, можа, загадкавага слухача?

— Ведама, пешшу пойдзем, тут недалёка! — зазначае нечы знаёмы голас з нейкім адметным акцэнтам.

— Уставай ужо, кухцік, пара ісці гатаваць сняданак, — зусім не па-вайскоical разбудзіў Міхала той самы Герман, з якім ён быў у нарадзе на КПП у парку.

Міхал сеў на ложку і звесіў ногі: левая, бы драўляная.

Зацякла ці што?

Галава трашчала, а майка была мокрая, хоць выкручвай. Міхал нават на імгненне падумаў, што не мог так спацець, верагодней ідыёты-чарпакі забаўляліся, лінулі нечым.

Хоць бы не мачой…

Але гэтыя так проста не пазбавілі б сябе асалоды паглядзець на рэакцыю ахвяры, не палеглі б вось так будзённа спаць…

Побач корпаўся-апранаўся Шпачок.

Міхал пацягнуўся да крэсла, узяў штаны і, па-ранейшаму седзячы, прасунуў у калашыну спачатку правую нагу, а потым паспрабаваў здранцвелую левую. Не падалося: левая распухла і цяпер не пралазіла ў звужаную да нізу калашыну: расклёшаныя нагавіцы не надта зручна сунуць у боты. На шчасце, ад нізу было некалькі гузікаў. Радзевіч расшпіліў іх, і нага не без напружання, але пралезла праз дзірку.

Мабыць, для падобных выпадкаў і змешчаныя там тыя гузікі.

Калі Міхал уссадзіў боты, халява на левым ссунулася гармонікам.

Чортаў душман! Гэтага толькі не хапала!

Трэба абавязкова вырвацца ў санчастку!

Хадзіць аказалася цяжка: левая нага смылела, бы абвараная. Радзевіч прыкметна кульгаў. Адразу пасля сняданку ў сталоўцы з'явіўся начальнік. Міхал спытаў у яго дазволу схадзіць у медчастку. Антонаў паглядзеў на Міхалаву хворую нагу і, прыкметна здзіўлена, пацікавіўся:

— Хто гэта цябе так?

Радзевіч і не задумваўся пакуль над тым, як будзе тлумачыць, што сталася з ягонай нагой: праўду гаварыць нельга ні ў якім выпадку.

Давялося імправізаваць на хаду. Міхал зірнуў на варачны цэх: зачапіўся за зліўны кран катла? Традыцыйна ўпаў з лесвіцы ці выпадкова стукнулі дзвярыма? На нагу ўпала вялікая каструля? На вочы трапіўся жалезны стол з тых, якія падстаўлялі да катлоў з посудам, каб раскладаць стравы.

— Нарад не спраўляўся, дык я ўзяўся дапамагчы паднесці стол да катла, а ў таго дзятла, з якім я яго нёс, рукі мокрыя былі — стол і выслізнуў. Натуральна, я таксама сваю палову не ўтрымаў, і ніжняй перакладзінай якраз па назе стукнула.

— Заставайся там і лячыся, колькі трэба, — Антонава, відаць, цалкам задаволіла байка Радзевіча. — Тут, калі сам не патурбуешся пра сваё здароўе, ніхто пра цябе не падумае. Пятрову я скажу, дзе ты.

У медчастцы працавалі жанчына-фельчар і малодшы сяржант тэрміновай службы Марат Сабанаеў, якога Радзевіч выдатна ведаў, бо той па тры разы на дзень прыходзіў па ежу для хворых і распісваўся ў адпаведным журнале за якасць салдацкіх страў.

Міхал лічыў Сабанаева мо калі і не сябрам, дык добрым прыяцелем дакладна: Марат хоць і быў на перыяд старэйшым за Радзевіча чарпаком, аднак з кухарамі

паводзіў сябе заўсёды тактоўна і ветліва. Вельмі часта медбрат, як жартам называлі Марата, затрымліваўся ў сталоўцы даўжэй, чым гэта было неабходна для выканання яго спраў, толькі затым, каб якую хвіліну проста пагаварыць з кухарамі. Нярэдка, калі стравы былі асабліва смачныя, Сабанаеў прасіў пакласці ў ягоныя тэрмасы паболей, і яму ніколі не адмаўлялі.

На ганку медчасткі Міхала зусім нечакана сустрэў адзін з самых непрыемных дзядоў з першага ПУСа, якія бывалі ў нарадзе па сталоўцы, Фёдар Падаляк. На галаву ніжэйшы за Радзевіча, дзед заўсёды паводзіў сябе так, нібы гэта ён глядзіць на ўсіх зверху ўніз. Міхал даўно ўжо прыкмеціў, што невысокія людзі вельмі часта імкнуцца прадэманстраваць сваю значнасць, пнуцца ўсімі камандаваць і павучаць.

Напалеон хрэнаў!

— Што, кабан, «касіць» прыйшоў?

Радзевіч нічога не адказаў на гэткае адмысловае імператарскае прывітанне і пайшоў у памяшканне.

Сабанаеў сустрэў Міхала нязвыкла холадна, нібы бачыў упершыню.

Можа, ён на самай справе не пазнае мяне, бо ніколі не бачыў у форме?

Марат без асаблівай цікаўнасці выслухаў Радзевічавы скаргі, зірнуў адным вокам на нагу і сунуў у рукі хвораму градуснік:

— На. Мерай тэмпературу.

Тэрмометр паказаў трыццаць дзевяць з паловай.

Аднак Сабанаеў ні кропелькі не здзівіўся, выдаў нейкую таблетку і, не разумеючы, чаго яшчэ чакае гэты кабан, прамовіў:

— Усё! Ідзі!

— Куды? — шчыра здзівіўся Міхал.

— Адкуль прыйшоў, туды і ідзі!

— Ты не пакінеш мяне тут?!

— Яшчэ чаго захацеў!

— Але ж ты бачыш, што я ледзь хаджу!

— Я ж табе даў таблетку! Чаго ты яшчэ хочаш?!

Міхал не верыў сваім вушам.

— І што, яна, па-твойму, дапаможа?

— Не дапаможа — прыйдзеш яшчэ! Сёння ўсё адно пятніца, доктаркі ўжо няма, толькі ў панядзелак будзе. Які сэнс цябе тут трымаць? Выпі таблетку і выспіся як след. Якая розніца, дзе ты будзеш валяцца: тут ці ў казарме?!

Было незразумела: Марат на самай справе не ведае, што кабану ніхто не дазволіць выспацца ў казарме, ці прыкідваецца.

Міхала аж трэсла ці то ад хваробы, ці то ад злосці, але ён моўчкі ўзняўся і выйшаў з прыёмнага пакоя: ніякага сэнсу спрачацца, відавочна, не было. Пераацаніў ён, відаць, ступень блізкасці з Сабанаевым. Халера! Няхай цяпер толькі папросіць дабаўкі, сволач!

— Ну што, кабан, не праканала! — пазлараднічаў у калідоры Падаляк.

Міхалу хацелася раздушыць гэтага прусака, ён з такой злосцю зірнуў на дзеда, што той нават ускочыў з крэсла, але не ўцёк, не адвярнуўся, а, відаць, наўмысна гучна, каб чулі ўсе, хто толькі зможа, заверашчаў:

— Давай! Удар мяне! Ну, удар дзядулю, кабан няшчасны!

Разлік Падаляка апраўдаўся: праз імгненне ў калідор выскачыла з паўтузіна хлопцаў у такіх жа сініх шпітальных строях, у які быў апрануты Федзька. Прынамсі два з іх былі таксама дзядамі, гатовымі пры неабходнасці кінуцца на свавольнага кабана. Якія правілы гонару? Караць нахабных кабаноў усёю зграяю тут і лічылася за гонар.

Не без намагання Радзевіч адвярнуўся ад шарыкаўскай* пысы Падаляка і выйшаў з медчасткі. Нават на вуліцы было чуваць, што Федзька выкрыквае яму ўслед нейкія красамоўныя пагрозы, але ўслухоўвацца ў іх Міхал не стаў.

Нага палала, галава па-ранейшаму балела. Таблетка ніяк пакуль не падзейнічала. Што рабіць?

Радзевіч вярнуўся ў сталоўку, але не стаў нікому паказвацца на вочы, а вырашыў непрыкметна прабрацца ў пусты адчынены пакой, што месціўся ў падвале адразу за кабінетам Антонава. У тым невялікім памяшканні, па столі і сценах якога цягнулася незлічоная колькасць трубак рознай таўшчыні, на падлозе ляжалі паралонавыя спартовыя матрацы, ці, як усе іх называлі, маты. Відаць, калісьці тут займаліся адзінаборствамі.

Міхал вырашыў, як і раіў медбрат, паспрабаваць выспацца: раптам і насамрэч дапаможа. Ён ні пры якіх абставінах не пакінуў бы Ваціка сам-насам з прыгатаваннем абеду, але стан быў невыносны.

Неяк справіцца. Можа, у такой сітуацыі дзяды ўсё ж дапамогуць. Зрэшты, начальнік сталоўкі напэўна ж загадае ім дапамагчы, бо ён жа ведае, што з Радзевічам.

Хлопец агледзеў непрывабны пакой без вокнаў, у якім смярдзела цвіллю ды пацукамі, пераклаў маты, каб было больш-менш зручна легчы. Замка ў дзвярах не было, і Міхал падпёр іх цаглінаю, якую, відаць, для таго нехта сюды і прывалок.

Яшчэ хвіліну Радзевіч павагаўся, выключаць святло ці не: з аднаго боку, яно павінна адпудзіць пацукоў, калі яны наважацца сюды прыйсці, з другога боку, святло

---

* Паліграф Паліграфавіч Шарыкаў — герой фантастычнай аповесці Міхаіла Булгакава “Сабачае сэрца”.

можа прыцягнуць увагу людзей. Халера, невядома яшчэ, што горш. Вырашыў выключыць, бо палічыў, што грызуны гаспадараць у сталоўцы па начах.

Марна Міхал спадзяваўся выспацца: як толькі ён лёг на свой імправізаваны ложак, дык адразу ж праваліўся ў той ужо звыклы напаўпрытомны стан ці ў нейкую паралельную рэчаіснасць, у якую трапляў апошнім часам заўсёды, калі выпадала рэдкая хвіліна адпачынку. Верагодна, хвароба паспрыяла таму, што на гэты раз адчуванне сапраўднасці было асабліва моцным…

## XII

Страх. Чысцюткае жывёльнае пачуццё. Першабытны страх, які не атаясамліваецца з нечым канкрэтным: яшчэ нічога дакладнага як бы і не існуе, бо не мае назваў. Павінны прайсці тысячы гадоў, перш чым страх увасобіцца ў прадметы, істоты, з'явы… А пакуль толькі чысцюткае пачуццё, якое пагрозліва ахінае душу… Душа ўжо існуе. Бо хто ж у адваротным выпадку адчувае гэты пагрозлівы страх…

Міхал кідае выклік некаму невядомаму: а вось і здолею! Нічога ты са мной не зробіш! Пляваць я на цябе хацеў!

Праз абсалютна цёмныя сутарэнні сталоўкі Радзевіч упэўнена некуды рушыць, нібы ідэальна бачыць. Вось ён узняўся з падвала, дайшоў да ніжняй пляцоўкі бакавой лесвіцы. Куды цяпер: направа ў доўгі калідор, у які выходзяць дзверы разнастайных службовых памяшканняў-цэхаў і які завяршаецца вялізным праёмам у сцяне — уваходам у варачны цэх, сэрца сталоўкі, ці ўверх, па прыступках?

Хлопец ідзе ўверх і пасмейваецца з недарэчнай думкі пра тое, што варачны цэх — нібы і ёсць сэрца сталоўкі:

ён жа дакладна ведае, што сапраўдным сэрцам сталоўкі, дзе жыве душа гэтага будынка, з'яўляецца зусім не смярдзючы — ніякая вентыляцыя не дапамагае, — ад падлогі да столі апанаваны прусакамі варачны цэх. Як бы не так! І каму ў галаву магла прыйсці такая прымітыўная думка?! Сэрца гэтага старога гмаху месціцца — гэта ж абсалютна відавочна — у той вежы з гадзіннікам, якая вытыркаецца пасярэдзіне даху. Варачны цэх — якая пошласць. Вядома ж, вежа! На ўсе чатыры бакі свету з яе пазіраюць аднолькавыя белыя цыферблаты з чорнымі стрэлкамі і лічбамі, а вянчае яе шпільчаты чатырохсхільны дах з флюгерам у выглядзе сцяжка, здаецца, знізу не надта добра бачна…

Міхал аднекуль ведае, што яму прызначана аўдыенцыя на вышэйшым узроўні. Чым ён заслужыў такі гонар? Што ў ім такога, чаго няма ў іншых? Можа, яго і запрасілі, каб растлумачыць, чым ён адметны? Як цікава… Ён нават паскарае крок. «Хутчэй, хутчэй», — прыспешвае яго нечы незнаёмы голас. Міхал ужо шыбуе праз вялікую залу на другім паверсе. Цяпер тут практычна поўная цемра. Толькі асобныя палоскі святла трапляюць сюды ад далёкіх вулічных ліхтароў, але яны не здольныя перамагчы густую, бы добрая кава, чарнату навокал.

Раптам з аднаго стала зрываецца і падае з неверагодным грукатам крэсла… Міхал замірае на месцы. Здаецца, цэлую хвіліну ў пустых залах, доўгіх калідорах, сутарэннях адбіваецца-ракоча гулкае рэха. Што гэта? Папярэджанне? Дэманстрацыя незадаволенасці? Папрок? Апошняе выпрабаванне: ці не спынюся, ці наважуся прадоўжыць шлях? Ён жа выдатна ведае: вяртання назад не будзе… А можа, гэта быў усяго толькі бяскрыўдны жарт?!

Хлопец зноў ажывае і рушыць з месца: не дачакаецеся! Адзін лесвічны пралёт — і перад ім зачыненыя дзверы на гарышча. Міхал выцягвае з кішэні вялікую звязку ключоў, за якой цягнецца доўгі бліскучы металічны ланцуг: так, ён салідны чалавек, у яго ці не самая вялікая колькасць ключоў у батальёне, і ў кожнага з іх ёсць свае дзверы!..

Вось ён ужо і на гарышчы. Нагрэтае ад чарапіцы за доўгі дзень паветра быццам ператварае цемру ў нейкую матэрыяльную субстанцыю, якую можна пакратаць, узважыць, скласці ў торбу… Цяпер Міхалу здаецца, што ён плыве… Павярнуцца направа, адштурхнуцца, і праз метраў дзесяць будзе акно…

Як правільна называюцца вокны, якія выходзяць на схіл даху: слыхавыя? назіральныя? У нас такія сустракаюцца надта рэдка. На гэтым жа даху іх цэлых чатырнаццаць: на кожным бакавым схіле па шэсць і па адным на вальмах. Чатырнаццаць вокнаў, а ў гэткай цемры нават абрысаў ніводнага не бачна.

Пальцы лёгка намацваюць зашчапку. Міхал адчыняе адну створку, і ў паддашша ўрываецца моцны струмень свежага паветра. Хвіліну вецер шыбуе бязлітасна, і хлопец адчувае сябе, бы ў аэрадынамічнай трубе. Знізу, аднекуль з нетраў будынка, даносіцца цэлая какафонія гукаў: штосьці бомкае, грукае, рыпіць, вые паветра — скразняк.

Што рабіць? Зачыніць акно? Спыніцца за некалькі крокаў да мэты?

Як адказ на нямыя пытанні — бы апошняя тлустая кропка ў канцы доўгага разважання, раптам увесь будынак скаланаецца ад магутнага выбуху і ўсё сціхае… Некалькі імгненняў Міхал разгублена азіраецца, нібы жаўнер пасля кантузіі, быццам тут штосьці можна ўбачыць: што адбылося? Якая такая неверагодная сіла ў адзін

момант спыніла гэты рэактыўны струмень паветра, гэтае разбуральнае тарнада?

Здагадка расчароўвае сваёю банальнасцю: гэта грукнулі і зачыніліся масіўныя старыя дзверы на гарышча. Халера…

Зноў выпадковасць? Ага! Як бы не так! Дзякуй за дапамогу!

Міхал адчыняе другую палову акна. Ніжні край на ўзроўні грудзей. Ён спрабуе падскочыць і затрымацца на выпрастаных руках, каб потым перакінуць нагу на схіл даху. Нічога не атрымоўваецца: высакавата. Калі чарговая спроба ўскараскацца на акно зрываецца і Радзевіч адчувае прыкметную стому, ён згадвае, што недзе тут, пад акном, павінны быць нейкія скрыні… Міхал павадзіў у цемры нагою туды-сюды, крыху глыбей у падстрэшша: нешта ёсць. Прысеў на кукішкі, падаўся наперад, абмацаў знаходку. Падобна, сапраўды нейкія скрыні…

І што гэта значыць: ён не першы? Не ён адзін абраны? Хто той другі? Як даведацца? Як пазнаць яго?

Хлопец адчуў, што прыкметна расхваляваўся. Яно і зразумела: не вельмі прыемна падзяляць самую важную ў тваім жыцці таямніцу, найвялікшае адкрыццё з некім яшчэ. Няўжо сапраўды нехта таксама здагадаўся…

Не можа быць! Проста хтосьці з кухараў падабраў ключ, каб хаваць тут скрадзенае, для нечага прынёс сюды гэтыя скрыні… Мог нехта і іншы абзавесціся ключом, хто-небудзь зусім выпадковы, які-небудзь боўдзіла з нарада… А што, зусім не кепска мець ключ ад нейкага памяшкання, куды пры неабходнасці можна прыхавацца на час: кабаны, напрыклад, усе як адзін толькі і глядзяць, каб зашыцца ў які непрыкметны куточак і хоць некалькі хвілінак пакімарыць…

Але скрыні… Самае слабое звяно ў тэорыі выпадковасці: яны ляжаць пад адзіным акном, праз якое можна

выйсці на дах, усе астатнія забітыя цвікамі і не адчыняюцца…

Паверыць жа ў тое, што нехта быццам бы без усялякай прычыны караскаўся на вельмі круты схіл чарапічнага даху, немагчыма!..

А можа быць, таго другога, хто ведаў таямніцу пра душу будынка, тут папросту ўжо няма: што, калі ён даўным-даўно звольніўся і цяпер жыве дзе-небудзь у сваім Тамбове ці Фергане, ходзіць штодня на працу, кахае жонку, гадуе дзетак і стараецца не згадваць, як пра невытлумачальны сон, пра свае начныя шпацыры па даху ў кампаніі з нечым нябачным, але адчувальна прысутным…

Так і ёсць: дом абірае некага на час службы, а калі той звальняецца, пасвячае ў свае таямніцы іншага… Толькі навошта? І што гэта за таямніцы?..

Міхал намацаў ды выцягнуў з падстрэшша тры досыць груваcткія скрыні. Склаў у стос пад акном, пакратаў туды-сюды, каб пераканацца, што яны надзейна стаяць адна на адной і не рассунуцца, калі ён стане на верхнюю.

Нібыта ўсё нармальна.

Спачатку абапёр на верхнюю скрыню адно калена, зноў пахістаў свой разборны слуп, затым узняў другую нагу і выпрастаўся — цяпер ніжні край акна быў на ўзроўні паясніцы.

Без усялякіх намаганняў Міхал перабраўся на дах і, калі пераканаўся, што падэшвы паўкедаў зусім не слізгаюць па чарапіцы, а трымаюцца надзейна, бы на асфальце, адарваў рукі ад аконнай рамы і зрабіў некалькі крокаў спачатку ўбок, потым уверх.

Як выявілася, уздымацца па крутым схіле зусім не страшна. У нейкі момант Міхал нават пасміхнуўся ўголас, бо нагадаў самому сабе лыжніка, які скочыў з высачэзнага трампліна, і цяпер у палёце лыжы наблізіліся

яму да самага носу. Каб не тыцнуць дзюбаю ў дах, Радзевіч палічыў за лепшае абапірацца на чарапіцу рукамі.

Вось і канёк. Можна адпачыць і агледзецца. Неба пахмурнае — ні зорачкі. З правага боку чорны правал — вялікі неасветлены пляц, за ім недзе клуб і агароджа пад самым чыгуначным насыпам. Ззаду парк, у якім дзенідзе гараць цьмяным святлом лямпы напальвання. Крыху святлей злева і наперадзе: там казармы і КПП. Але святло адтуль практычна зусім не прапускаюць зялёныя шаты вялізных старых таполяў, якія растуць уздоўж доўгай паўднёвай і карацейшай заходняй сценаў сталоўкі.

Да вежы з цыферблатамі не болей за дзесяць метраў. Міхал выпрастаўся на поўны рост і зрабіў некалькі крокаў, няёмка загінаючы ступні адна да адной, нібы спрабаваў такім чынам абхапіць востры канёк, каб надзейней трымацца. Так ісці было абсалютна нязручна. Тады Міхал абедзвюма нагамі стаў на самую вастрыню даху, выцягнуў рукі ў бакі, каб зручней трымаць раўнавагу, і, як гімнаст па бервяне, смела рушыў наперад.

Здавалася, дастаткова лёгенькага павеву ветрыку — і хлопец сарвецца ў чорную прорву. Крок, яшчэ адзін, і вось ужо вежа на адлегласці выцягнутай рукі…

Міхал і пацягнуўся да стрэлкі, схапіўся за яе шурпатую ад мноства слаёў фарбы металічную паверхню, і як толькі зрабіў апошні крок, гадзіннік азваўся пранізліва-доўгім, самотным ударам звону…

Гэты нечакана моцны гук зусім не спалохаў Радзевіча, а толькі нагадаў, што насамрэч ён цяпер не на даху, не ў самай высокай кропцы сталоўкі, калі не лічыць флюгер і маленькі дашак на вежы, а ў самым нізе будынка, у вільготным і цёмным падвале…

Вышыня яго ніколі асабліва не палохала, а вось як ставіцца да падвала, трэба яшчэ падумаць: у падзямеллях Міхал бываў яшчэ радзей, чым на гарышчах.

Са станоўчага: відавочна, тут не так небяспечна, бо як мінімум не ўпадзеш і не разаб'ешся! Так, паветра вільготнае і затхлае, смярдзіць цвіллю і пацукамі... Вось жа пацукі, каб іх халера, чаму яны выклікаюць такую агіду? Каты, сабакі, нават карова выклікаюць замілаванне! Што карова — самая брудная свіння непараўнальна сімпатычнейшая за любога самага чысценькага хатняга пацучка ці дробнай мышкі...

Радзевічу ўспомнілася гісторыя, якую яму ў лісце распавёў сябар, што вучыцца ў Тамбоўскім вышэйшым авіяцыйна-інжынерным ваенным вучылішчы імя Фелікса Эдмундавіча Дзяржынскага. Вось жа яшчэ: авіяцыйнае вучылішча імя Дзяржынскага! Што да чаго? Якой халеры? Здавалася б: дзе Дзяржынскі, а дзе авіяцыя? Хай сабе якая-небудзь школа міліцыі носіць ягонае імя, тады зразумела. А тут мала таго, што ваеннае вучылішча, дык яшчэ і авіяцыйнае... Гэта ж відавочна таксама недарэчна, як і саўгас імя Пушкіна ці калгас імя Лермантава. А Міхал на свае вочы бачыў гэтыя назвы сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, калі школьнікам быў на экскурсіі ў запаведніку «Пушкінскія горы». Нішто не здольнае стрымаць чалавечую фантазію...

У старой казарме, куды пасялілі абітурыентаў авіяцыйнага вучылішча, жылі такія вялізныя і тлустыя пацукі, памерам з ката, — распавядаў сябар — што зусім не баяліся людзей! Хлопцы, якія толькі адарваліся ад бацькоў, былі ў шоку ад такога дзікунства! А можа, гэта такое першае выпрабаванне на здольнасць мужна пераносіць усе цяжкасці і нягоды вайсковага жыцця?

Чым маглі, абітурыенты забівалі дзіркі ў падлозе, праз якія лазілі пацукі, а калі вярталіся ў казарму, нязменна знаходзілі прагрызеныя хатнія сумкі ці тумбачкі, у якіх заставалася што-небудзь з харчоў. Часам дастаткова было толькі паху. Нярэдка хлопцы паспявалі заспець

пацукоў на месцы злачынства і тады бязлітасна трушчылі іх кірзавымі ботамі. Асаблівым шыкам сярод будучых курсантаў лічылася схапіць тлустую пачвару за доўгі хвост, каб яна не паспела цапнуць вострымі зубамі за руку, і бразнуць ёю аб падлогу. Сапраўдны аўтарытэт набывалі тыя хлопцы, у каго атрымоўвалася забіць пацука адным ударам.

Кожную ноч хто-небудзь ускрыкваў ад таго, што выяўляў у сваім ложку непажаданага госця. І вось неяк пасля пад'ёму ўсе звярнулі ўвагу, што ў аднаго з абітурыентаў увесь твар у крыві, а навалачка на падушцы ператварылася з белай у чырвоную. Выявілася, што пакуль стомлены хлопец страціў пільнасць і спакойна, бы ў бацькоўскім доме, спаў, да яго ў ложак ускочыў пацук і абгрыз па краях абодва вухі!..

Усе, вядома ж, паспачувалі хлопцу: начальства, нават насуперак статутам, потым дазволіла яму адгадаваць доўгія валасы, каб прыкрывалі непрыгожыя агрызкі, іншыя курсанты супакойвалі небараку тым, што магло быць і горай: нічога не замінала таму пацуку абкарнаць нос, які немагчыма прыхаваць ніякімі валасамі... Людзі дасведчаныя сцвярджалі, што будучы авіяцыйны інжынер нічога не адчуў таму, што сліна грызуноў нібыта ўтрымлівае спецыяльныя ферменты, якія абязбольваюць...

Як добра было б мець якое-небудзь рэчыва, здольнае пазбавіць ад болю... Нага, фанера — гэта якраз можна трываць. Куды невыносней боль у душы ад усведамлення ўласнай нікчэмнасці, слабасці, баязлівасці перад звычайнай, па сутнасці, дваровай шпаной! У каго ты ператварыўся, Міхал Радзевіч, як ты здрабнеў! Бачылі б цябе твае сябры, як ты поўзаеш на кукішках у адных трусах па мокрай падлозе і шуруеш шчоткай у мыльнай пене нечыя брудныя нагавіцы, ці спяваеш бязглуздыя калыханкі, ці бегаеш з кацялком па сталоўцы ад дзя-

журнага… Як ты адціскаешся ад падлогі ці прысядаеш пад манатонны лік: раз-два. Як табе «прабіваюць» фанеру ці даюць аплявухі, а ты ніяк не супраціўляешся… Ты не супраць?..

Часам здаецца, што яшчэ вось-вось — і здарыцца нешта зусім страшнае, непапраўнае…

Аднекуль з кутка данесліся гучнае шаргаценне, валтузня, танюткае незадаволенае папіскванне.

Мабыць, пацукі нешта не падзялілі, — абсалютна абыякава падумаў Радзевіч.

Ці не вызначаюцца яны на мой конт: каму дастанецца мае вушы ці нос…

Буду ўсё жыццё хадзіць з доўгімі валасамі! І ніякія дзяды мне не забароняць: начальства ж дазволіла!..

Зрэшты, гэта сталоўка, а не пустая казарма, тут заўсёды знойдзецца што-небудзь зжэрці, толькі маіх вушэй ім і не хапала…

Штосьці невялічкае ўскараскалася на паралонавы матрац, на якім ляжаў Міхал, і знерухомела.

Падалося?

Прайшло некалькі хвілінаў — цішыня…

Так і ёсць: галюцынацыя на глебе страху ды прыдатных да месца ўспамінаў...

Але што гэта: на хворай галёнцы нібыта аднекуль з’явіўся дадатковы цяжар…

Можа, проста павялічылася пухліна?..

Пухліна зрушыла з месца і паціху перасунулася да калена… Зноў досыць працяглая паўза, дастатковая, каб патрывожаны сон вярнуўся…

Але Міхал занадта выразна адчуваў прысутнасць на сабе агіднай істоты, што цяпер прытупіць ягоную пільнасць не змагла б ніякая стома ці хвароба.

Яшчэ адзін такі пераход, і пацук апынецца на знешнім баку голай далоні, якая ляжыць на сярэдзіне сцягна.

Што рабіць?! Рэзка тузануць хворай левай нагой, каб жывёліна адляцела куды-небудзь убок, не атрымаецца. Раптам яна паспрабуе ўтрымацца: учэпіцца кіпцюрамі і зубамі ў нагу! Непрыкметна выцягнуць з-пад галавы правую руку таксама, відаць, не выйдзе. А калі б і атрымалася, што тады? Спрабаваць схапіць вёрткага пацука ў поўнай цемры? Наўздагад стукнуць па ім кулаком? А што, калі ён з перапуду ўскочыць у бот ці рукаў гімнасцёркі!..

І якраз у гэты момант, калі Радзевіча апанавала самая сапраўдная паніка, ён выразна адчуў, як па ягонай правай далоні, якая вытыркалася з-пад галавы, хуценька прадыбалі кіпцюрастыя лапкі і працягнуўся доўгі-доўгі халодны, шурпаты пацучыны хвост!

У адно імгненне хлопец, бы абвараны, ускочыў на ногі і, верагодна, гучна ўскрыкнуў, бо тут жа ў калідоры пачуліся крокі, дзверы з шаргаценнем адсунулі цагліну, якая іх падпірала, у пакоі запалілася святло: на парозе стаяў начальнік сталоўкі.

— Не зразумеў, — здзівіўся Антонаў, калі пабачыў Міхала, — чаму ты не ў медчастцы? Ты быў там?

— Быў…

— І што сказаў доктар?

— Нічога. Яе не было.

— А татарчонак што? Паглядзеў?

— Даў таблетку.

— І ўсё?

— Усё.

— А ну за мной!

Радзевіч ледзь паспяваў следам за прыкметна раззлаваным прапаршчыкам. Выйшлі са сталоўкі і пашыбавалі напрасткі праз вялікі пляц. Не прайшло і пяці хвілін, як Антонаў ужо ўшчуваў Сабанаева:

— Ты што, не бачыш, якая ў яго нага?! Я не медык і тое думаю, што гангрэнай можа скончыцца! Што ты яму даў?!

— Доктара ўсё адно няма! — запярэчыў Марат.

— А ты тут навошта?! Як ты яму дапамог?! Што за таблетку ты яму даў?!

— Аспірын…

— Сунь ты свой аспірын сам ведаеш куды! Што ён ад яго, думаеш, у скокі павінен пайсці! У яго нагу разнесла! Ён хадзіць не можа! Куды ты яго адправіў, сяржант?! Дзе ён можа выспацца, у казарме? Адразу бачна, што ты даўно там не жывеш! Зусім распанеў, сука! Зараз жа афармляй і кладзі яго ў палату! І антыбіётыкаў яму выдай! Доктару патэлефануй, растлумач, што ды як… І яшчэ, сяржант, запомні, — Антонаў тыцнуў указальным пальцам у бок Міхала, — гэта мой чалавек, а мы сваіх сталоўскіх у крыўду не даем. Не будзеш сябраваць з кухарамі — будзеш смактаць… лапу!

Толькі цяпер Радзевіч зразумеў прычыну такога нечаканага імпэту з боку начальніка сталоўкі: прапаршчык несумненна каўтануў ужо не адзін кілішак беленькай.

Ну выпіў чалавек і выпіў! Але ж дапамог!

— Ну, бывай. Колькі трэба, столькі і лячыся, — кінуў на развітанне Міхалу непасрэдны начальнік і сышоў.

Міхал падумаў, што Сабанаеў, вядома ж, палічыў яго сапраўдным «стукачом», які збегаў паскардзіцца на сяржанта Антонаву. Але самаадчуванне было такое кепскае, што Радзевіч вырашыў напляваць на думкі Марата.

Медбрат паказаў Міхалу яго ложак і выдаў камплект шпітальнага адзення. На шчасце, у палаце былі толькі хлопцы ягонага перыяду. Перш чым укласціся, Міхал пайшоў у пакой з умывальнікамі, уважліва агледзеў сябе ў люстэрка: ці на месцы вушы, і некалькі разоў з мылам вымыў рукі і твар.

Больш ніякіх падвалаў! Ніколі!

Упершыню за паўтара месяца Міхал па-сапраўднаму спаў, нават высокая тэмпература і хворая нага не пераш-

каджалі. Ён не ўзняўся вячэраць, толькі праглынуў выдадзеныя Сабанаевым таблеткі і вярнуўся ў салодкае забыццё.

Практычна кожную суботу ў войску наладжвалі паркава-гаспадарчы дзень: у казармах рабілася генеральная ўборка, мянялася бялізна, жаўнеры наведвалі лазню. Медбрат таксама вырашыў зрабіць генеральную ўборку ў медчастцы пры дапамозе дзядоў рукамі хворых кабаноў. Радзевічу падалося, што сяржант такім няхітрым чынам вырашыў адпомсціць асабіста яму за ўчорашняе прыніжэнне з боку Антонава ці за тое, што Міхал нібыта «настукаў» на Сабанаева прапаршчыку.

Выкурваць повара з ложка, куды той вярнуўся пасля сняданку, мяркуючы па ўсім, не без задавальнення прывалокся ўсё той жа Федзька Падаляк.

— Уставай, сучонак!

Дзед тузануў спінку ложка.

— Э! Ты што, аглух?! Лічыш сябе лепшым за іншых?! Уставай давай!

Міхал павярнуўся і агледзеў Федзьку з галавы да ног.

Такі ж гідкі, як той пацук у падвале!

— Лепей адвалі! — пагрозліва прасіпеў Радзевіч. — А то не пагляджу, што ты дзед!

Відаць, у інтанацыі і позірку Міхала з'явілася штосьці такое, што Падаляк не рашыўся чапляцца да яго далей.

Федзька выйшаў у калідор і ўжо адтуль, каб усе, хто быў у медчастцы, добра чулі, пачаў выкрыкваць пагрозы і праклёны ў бок Радзевіча:

— Зусім распеpaзаліся кабаны! Асабліва ў гаспадарчым узводзе! Блатны знайшоўся! Толькі ачуняй! Я цябе навучу з дзядамі размаўляць!

Ні даць ні ўзяць шакаляня з мульціка пра Маўглі.

Табакі яшчэ хвілін трыццаць не сунімаўся, зычыў Радзевічу найхутчэй здохнуць, бо ў адваротным выпадку

ён пакажа нахабнаму кабану штосьці такое, пасля сузірання чаго той стоадсоткава склеіць ласты!

Брудная плынь хваравітай свядомасці…

Як усё ж цяжка, напэўна, быць такім быдлам…

У панядзелак доктарка, як толькі агледзела Радзевічаву нагу, адразу ж сказала, што яго трэба тэрмінова адправіць у шпіталь.

Дзе знаходзіцца шпіталь, Міхал не ведаў.

Выйшлі з медчасткі на вуліцу ўтрох: Сабанаеў, Радзевіч і яшчэ адзін хворы кабан, які адразу не без расчаравання ў голасе спытаў сяржанта:

— Мы што, не на машыне?

— Ведама, пешшу пойдзем, тут недалёка! — адказаў медбрат з адметным акцэнтам.

«Нядаўна дзесьці я ўжо чуў гэтую фразу», — падумаў Міхал…

Калі мінулі КПП і пайшлі ўздоўж агароджы часткі па гарадской вуліцы, Міхал з цікаўнасцю пачаў разглядаць будынкі ваеннага гарадка з новага ракурсу, быццам хацеў даведацца, якімі яны бачацца мясцовым жыхарам. У нейкі момант ён зірнуў на будынак сталоўкі — ніякай вежы з гадзіннікам на яго даху не было…

# XIII

У шпіталі Радзевіча накіравалі ў хірургічнае аддзяленне.

Няўжо сапраўды ўсё так сур'ёзна? Раптам словы Антонава пра гангрэну не былі бессэнсоўным трызненнем п'янага чалавека? А што як нагу адпілуюць?

Ад хвалявання ці ад хваробы ў Міхала на лбе выступіў халодны пот, а па спіне пабеглі мурашкі.

У вялізнай палаце з высокай столлю, у якую прывяла Радзевіча дзяжурная па хірургіі, як скарочана называлі аддзяленне, медсястра, стаяла цэлых дванаццаць ложкаў, аднак занятыя былі толькі чатыры. Міхал толькі раз зірнуў на сваіх суседзяў і ўжо ведаў, хто з іх якога перыяду: адзін дзед, чарпак і два кабаны. Нічога дзіўнага: чым даўжэй чалавек знаходзіцца ў войску, тым старэйшым выглядае. Няхітрая тэорыя Радзевіча пацвердзілася адразу ж, як толькі хлопцы пазнаёміліся:

— Сяргей, ДМБ-90, восень. Зрэшты, «вясеннікі» ўжо ўсе з'ехалі, — прадставіўся дзед.

Абрэвіятурай ДМБ замянялі доўгае і складанае слова дэмабілізацыя, а лічба азначала год гэтага самага адваротнага працэсу мабілізацыі — звальнення з войска. Падобныя скарачэнні бясконцую колькасць разоў былі выдрапаныя чым-небудзь вострым на кожнай драўлянай тумбачцы і падаконніку ў кожнай без выключэння казарме, толькі яшчэ, як правіла, суправаджаліся імем аўтара і назваю геаграфічнай кропкі, з якой ён паходзіў: Віктар, ДМБ-85, Варонеж; Саня Котаў, ДМБ-61, Караганда; ДМБ-73, Краснадар… Запаветныя надпісы, старанна выведзеныя шарыкавымі ручкамі і алоўкамі, часам па-мастацку карункавыя, пакрывалі сталы ў ленінскіх пакоях і навучальных класах, калі не на знешняй, добра бачнай паверхні, дык на ўнутранай, прыхаванай ад староннiх вачэй, абавязкова. Гіпертрафавана вялізнымі, каб было бачна ўсім і здалёк, гэтыя літары і лічбы наносілі рознакаляровымі фарбамі на разнастайныя муры і агароджы, якія вельмі рэдка ці зусім ніколі не траплялі на вока вялікіх вайсковых начальнікаў…

Ці то ад хваробы, ці то з нейкай іншай прычыны Сяргей падаўся нейкім надта меланхалічна-спакойным.

— Валера. Я якраз «вясеннік», толькі ДМБ-91.

«Гэты больш жвавы», — адзначыў у думках стан чарпака Міхал.

Наступныя два суседы па палаце Ягор і Пеця нічым асаблівым не вызначаліся: хлопцы як хлопцы, такія ж пакуль зашпіленыя кабаны, як і Міхал, іхнае ДМБ-91, восень хаваецца яшчэ недзе вельмі-вельмі далёка…

Вярнулася сястра і павяла Радзевіча да доктара.

«Падпалкоўнік медыцынскай службы Кім В. А.», — Міхал прачытаў шыльду на дзвярах.

«Карэец?» — падумаў Міхал і адразу ж адчуў сімпатыю да яшчэ нябачанага афіцэра: прадстаўнік той самай нацыянальнасці, што і Віктар Цой, проста не можа быць кепскім чалавекам.

Азіяцкая знешнасць доктара пацвердзіла здагадку Радзевіча, і хлопец зразумеў, што ён у надзейных руках.

Падпалкоўнік не стаў выслухоўваць даклад хворага пра ягонае прыбыццё, зрабіць які патрабавалі вайсковыя статуты, а махнуў толькі рукой — змоўч, і пачаў распытваць, як абсалютна цывільны чалавек.

У выніку агляду Радзевічу прызначылі курс лячэння: нейкія таблеткі і, чаго ён ніяк не чакаў, праграванне хворай галёнкі: раней усе настойліва раілі прыкладаць да нагі што-небудзь халоднае…

Відаць, пасля ўжывання патрэбных лекаў, ужо на наступны дзень галава ў Міхала перастала балець, а тэмпература прыйшла да нормы.

Даўно ўжо хлопец не адчуваў сябе так добра. Міжволі згадаліся словы аднакласніка, які неяк выказаўся, што яму надзвычай падабаецца хварэць і ляжаць у бальніцы, бо не трэба рабіць урокі, усе цябе шкадуюць, спачуваюць, прыносяць самыя найлепшыя ласункі, і нават мама не крычыць: яна гадавала сына адна і, відаць, таму павышэнне голасу лічыла самым дзейсным выхаваўчым

сродкам. У астатні час крык у іхным доме не змаўкаў: мабыць, жанчына прывыкла гаварыць на падвышаных тонах і працягвала лямантаваць нават тады, калі ніякай нагоды для гэтага не было.

Радзевіч, наадварот, не выносіў хварэць, тым больш хоць на ноч застацца ў бальніцы для яго было сапраўдным пакараннем!

Але ў войску перавагі шпіталя над казармаю былі бясспрэчнымі, нават над статутнай школай повараў, не кажучы ўжо пра гаспадарчы ўзвод батальёна сувязі з яго гестапаўскімі парадкамі.

Адзінае, што Радзевіча цяпер турбавала, дык гэта думкі пра недарэку Ваціка: ці дапамагае яму там хто-небудзь, ці дае рады ён. Хоць бы гэтыя паганцы дзяды меней яго тузалі…

На трэці дзень Міхала зноў агледзеў доктар Кім. Ён доўга мацаў пухліну, цікавіўся, у якой кропцы баліць болей, а дзе меней. За тым знерухомеў на некалькі хвілін — задумаўся, а потым вынес вердыкт:

— Будзем рэзаць!

Калі хворы вярнуўся ў палату і распавёў астатнім пра вынікі візіту да хірурга, жвавы чарпак Валера з веданнем справы пацікавіўся:

— Хто цябе лечыць, Кім?

— Так, — пацвердзіў Міхал.

— Ён заўсёды так: вагаецца, вагаецца, а тады і кажа: лепей усё ж адрэзаць, будзем рэзаць, сястра! Яго хлебам не кармі — дай што-небудзь адрэзаць!

Усе засмяяліся: можна было падумаць, што той хірург няшчаснага Валеру спаласаваў скальпелем уздоўж і ўпоперак. Праўда, гаварыў хлопец пра доктара з сімпатыяй, а зусім не з папрокам.

Прыйшла сястра і адвяла Радзевіча не ў аперацыйны пакой, як ён думаў, а ў працэдурны кабінет. Аднак

тут стаяў такі самы хірургічны стол, а над ім вісела вялікая круглая свяцільня з мноствам лямпачак, якія звычайна бываюць у аперацыйных.

Спецыяльнымі рамянямі Міхала за рукі і ногі прывязалі да стала, накрылі прасцінай, абмазалі хворае месца ёдам і абкалолі — дэзінфекцыя і абязбольванне.

Потым прыйшоў доктар Кім. Сястра падставіла пад Міхалаву хворую нагу вялікі металічны латок.

Навошта? — не зразумеў хлопец.

Доктар узяў скальпель і спрактыкаваным рухам занёс над месцам удару. Радзевіч заплюшчыў вочы, але адчуў толькі нейкае паторгванне пухліны, а потым з яе нешта як быццам пацякло.

Міхал расплюшчыў вочы: хірург ужо без скальпеля, пальцамі паціскаў вакол разрэзу.

Хлопец прыўзняў галаву і зірнуў на сваю левую нагу: з невялікай раны струменіў жоўта-зялёны гной, перамяшаны з крывёю. У латок пад нагой ужо налілося не меней за літр агіднай вадкасці.

Нічога сабе! І дзе там столькі змясцілася?

— Не глядзі, — сказала медсястра Міхалу.

Ён не баяўся крыві і не вызначаўся гідлівасцю, але паслухмяна апусціў галаву.

— Добра, што разрэзалі! — зазначыў хірург.

Потым доктар даў нейкія незразумелыя распараджэнні сёстрам і пайшоў.

Калі галёнку забінтавалі, жанчыны ўкацілі ў пакой каталку і паставілі побач са сталом, на якім ляжаў Міхал.

— Пералазь, пакатаем! — загадала адна.

— Я і так дайду!

— Толькі не ў гэты раз. Гадзіны дзве яшчэ не зможаш.

Хлопец перасунуўся на каталку, і адна жанчына з лёгкасцю павезла хворага ў палату. Другая засталася навесці парадак у працэдурным.

Ля паста дзяжурнай сястры жанчына раптам спынілася, каб перагаварыць з калегаю.

— Ну, што, даведалася? — спытала тая, якая везла Міхала.

— Ужо вырашана дакладна: пераязджаем на працягу бліжэйшага месяца.

— У Легніцу?

— Так.

У гэты час Міхал звярнуў увагу на стос свежых газет, якія ляжаў на стале дзяжурнай сястры.

Нічога сабе: ужо восьмага чэрвеня!.. Пятніца…

Міхал хацеў запомніць дзень, калі яму зрабілі аперацыю, але ён адчуваў, што сённяшняя дата павінна сказаць яму пра нешта большае. Што ж такое?

Ён прыўзняўся на локці.

— Усё нармальна? — пацікавілася медсястра, якая кіравала каталкаю.

— Можна? — Міхал тыцнуў пальцам у стос газет.

— Забірай. Я ўжо ўсе перагледзела — нічога цікавага, — падзялілася сваімі ўражаннямі дзяжурная сястра, — усё толькі пра футбол…

Так і ёсць: футбол! Сёння ў Італіі стартуе чэмпіянат свету па футболе! Як ён мог пра гэта забыць?! Зрэшты, Міхал, калі толькі даведаўся, што падчас чэмпіянату будзе ў войску, ці не найбольш перажываў з гэтай нагоды: атрымаецца паглядзець ці не.

— А тут дзе-небудзь тэлевізар ёсць? — зусім беспардонна перарваў гаворку жанчын хлопец.

— Пачынаецца! — абурылася дзяжурная. — Хлебам іх не кармі — дай толькі футбол паглядзець!.. Ведама ж, ёсць, не ў каменным веку жывем!.. Толькі давай так: вы мне дапаможаце ўпакаваць для перавозкі лекі ды абсталяванне са склада, а я вам дазволю глядзець тэлевізар!..

Трэба было бачыць, што ўсчалося ў палаце, калі Радзевіч распавёў іншым хворым пра гутарку з медсястрой: нікога ўгаворваць не давялося, усе імгненна забыліся пра бязглуздую іерархію, якая іх падзяляла на дзядоў, чарпакоў ды кабаноў, і тут жа паляцелі на пост да дзяжурнай сястры, гатовыя выканаць любое яе даручэнне, абы толькі атрымаць доступ да запаветнага тэлевізара…

Міхал застаўся ў палаце адзін. Ён пагартаў газеты, даведаўся, што, калі ўсё будзе добра, яны змогуць ужо сёння а шаснаццатай гадзіне па мясцовым часе пабачыць прамую трансляцыю з Мілана стартавай гульні паміж зборнымі Аргенціны і Камеруна. Савецкае тэлебачанне паказвала менавіта гэты матч, бо зборная СССР уваходзіла ў тую самую групу «В», што і афрыканцы з паўднёвымі амерыканцамі.

Радзевіч выдатна памятаў, як і калі захварэў на футбол. Чэмпіянат СССР 1982 года, калі мінскае «Дынама» раптам пачало перамагаць ледзь не ў кожнай гульні і ператварылася з нічым не прыкметнай каманды ў топавы клуб, які прымусіў гаварыць і цікавіцца футболам ці не ўсіх жыхароў рэспублікі: не тое што ўсе мужчыны, нават жанчыны імкнуліся трапіць на стадыён ды абмяркоўвалі вынікі гульняў у гасцях. Дзеці ж на футбольным полі цяпер не проста спрачаліся, хто на якой пазіцыі будзе гуляць, а высвятлялі, хто будзе Пракапенкам, Курненінym, Алейнікавым ці Кандрацьевым. Часта спрэчкі перарасталі ў сапраўдныя бойкі. Каб раз і назаўсёды расставіць усе кропкі над «і», самыя ўпартыя саматужна на майках пісалі нумары і прозвішчы куміраў, таму нярэдка можна было назіраць карціну, калі ў адной і другой камандах супернікаў гулялі па тры-чатыры футбалісты з адным прозвішчам і нумарам. Хто такія Пеле ці Яшын, новае пакаленне ўяўляла цьмяна...

А потым быў феерычны чэмпіянат свету 1986-га ў Мексіцы, калі ці не трэцюю частку савецкай зборнай складалі беларусы. Міхал тады прагледзеў усе трансляцыі, стаў сведкам самага хуткага гола першынства ў выкананні Сяргея Алейнікава і, акрамя рукі Марадоны, на жаль, не ўгледзеў руку бога ў чвэрцьфінальнай гульні паміж Англіяй і Аргенцінай.

Гадзіны праз дзве Радзевіч не вытрымаў: узняўся і пайшоў дапамагаць хлопцам зарабляць доступ да свята.

Пакой, у якім стаяў тэлевізар, нагадваў акварыум: тры сцяны, акрамя вонкавай, у ім былі празрыстыя. Запаветны прыбор аказаўся практычна новенькім каляровым «Гарызонтам» з ідэальнымі карцінкай і гукам. Толькі калі сітуацыя на полі абвастралася і шматтысячны стадыён выбухаў крыкам, мікрафоны, відаць, не вытрымлівалі такога напору і з дынаміка даносілася штосьці аглушальнае, як шум вадаспаду.

У гэтым памяшканні Міхала штораз даймала трывалае адчуванне дэжавю.

Радзевіч па-дылетанцку думаў, што, выпусціўшы з галёнкі гной, яе зашылі, але на наступны дзень падчас перавязкі высветлілася, што ў ягоным выпадку, наадварот, трэба не дапускаць, каб рана зажыла перш, чым не будзе знішчана ўся інфекцыя. Калі медсястра зняла павязку, Міхал заўважыў, што пакладзены зверху на разрэз скрутак бінту і ваты набрыняў усё той жа чырвона-зялёнай брыдою. Калі тампон паляцеў у сметніцу, хлопец здзівіўся яшчэ больш: з незашытай раны тырчала штосьці колерам вельмі падобнае да косткі. Як выявілася, гэта была палоска танюткай спецыяльнай гумы, скручанай у рулончык, які закладаецца ў рану і не дазваляе зрастацца краям. Сястра разы тры прамыла дзірку на Міхалавай назе нейкімі вадкасцямі, заклала новы рулончык гумы, зверху прыладзіла чысты тампон і забінтавала.

— І надоўга гэта? — пацікавіўся хворы.

— Не меней, як на тыдзень.

Камерунцы перамаглі Аргенціну 1–0. Фантастыка!

На наступны дзень нашы прайгралі Румыніі 0–2. Першая гульня — і такі правал. Крыўдна было да болю.

Раніцай Міхал быў на першым паверсе, калі заўважыў, як прыехала хуткая дапамога і з яе разам з незнаёмым санітарам выскачыў Сабанаеў: мабыць, некага з нашых прывезлі. Да машыны падбеглі яшчэ некалькі чалавек у белых халатах і дапамаглі выцягнуць некага на насілках, з галавой прыкрытага прасцінаю.

— Што здарылася? — пацікавіўся Радзевіч у Сабанаева.

Той моўчкі працягнуў руку — павітаўся, праводзячы поглядам працэсію з хворым, якая ўжо размяшчалася ў грузавым ліфце, адказаў:

— Андрэя Гуцула з першага ПУСа ведаеш?

Міхал сцвярджальна кіўнуў.

— Вось знайшлі на падлозе ва ўмывальні ў лужыне крыві.

— Дык ён жывы хоць?

— Пакуль жывы, — абыякава адзначыў медбрат.

— Ён жа, здаецца, твайго перыяду, дзед практычна!

— Дзед: нашы духі ўжо ў батальёне, курс маладога байца праходзяць.

— Дык хто ж яго?

— Хто-хто, з лесвіцы ўпаў — ты што, не ведаеш!

Яшчэ Марат распавёў Радзевічу, што Ваціку, па ўсім відаць, ніхто не дапамагае: кожны раз адзін завіхаецца ў варачным, і выгляд у яго стаў яшчэ страшнейшы, чым быў...

Ад такіх навінаў Міхал не знаходзіў сабе месца: няўжо сапраўды Шпачок з дня ў дзень гатуе адзін, куды толькі глядзяць Антонаў з Пятровым, проста не заўважаюць нічога ці не хочуць заўважаць.

Наступную гульню савецкая зборная прайграла аргенцінцам. Нічога дзіўнага: яны фаварыты ў групе, у іх сам Дыега Марадона!

Міхалу тым часам перасталі закладаць у рану гуму, і яна пачала імкліва зацягвацца. І хоць у шпіталі было, як на курорце, ён выдатна разумеў, што трэба як найхутчэй вяртацца ў батальён: не толькі таму, што Шпачок там недзе ўжо ледзь жывы, а яшчэ і таму, што дзяды і так яго абвінавацяць у тым, што ён «закасіў».

Вось жа парадокс: Махмуд яго сюды справадзіў, а крайнім, як ні круці, усё адно застанецца Міхал!

Узяць бы тую ручку ад шчоткі ды выцяць таго Забірава па галаве! Страсення мозга дакладна не будзе, бо няма чаму стрэсціся…

Шпіталь тым часам імкліва пераязджаў. Усё часцей і часцей тых, хто ачуняў, прыцягвалі да працэсу: яны складалі ў скрыні абсталяванне, потым грузілі скрыні і мэблю ў машыны.

З нейкага часу перасталі прывозіць новых хворых: цяпер усіх адпраўлялі ў Легніцу.

З рэанімацыі ў палату перавялі Андрэя Гуцула. Міхал яго добра ведаў, бо той часта бываў у нарадзе па сталоўцы. Гуцул, вядома ж, — гэта мянушка. Андрэю забаранялі хадзіць, ды і выглядаў ён так страшэнна, што наўрад ці здолеў бы: высачэнны, пад два метры ростам, важыў ён цяпер ці не палову ад нормы — скура ды косці; на голенай галаве чырванелі чатыры доўгія пачварныя шнары, сцягнутыя хірургічнымі ніткамі; пераноссе, відаць, было зламанае, бо распухла проста да неверагодных памераў, і яго таксама аздабляла зашытая рана; бялкі вачэй былі спрэс залітыя крывёю, нават кропелькі белага на іх не праглядалася, ды і самі вочы атачалі цёмна-сінія плямы.

Калі нехта з хлопцаў забіраў з-пад Андрэя вутку, то ўсяляк імкнуўся захінуць ад вачэй хворага яе змесціва: там была кроў.

Першае, што сказаў Гуцул Міхалу, калі змог больш-менш разборліва гаварыць, дык гэта тое, што Ваціку вельмі цяжка і што ва ўсіх сваіх няшчасцях ён вінаваціць яго, Радзевіча.

Халера! Ну, хіба ж ён не бачыў маю нагу! Ды вось яшчэ і скардзіцца кожнаму сустрэчнаму!..

Нават тое, што СССР перамог зборную Камеруна са зруйнавальным лікам 4–0 і адзін гол забіў мінскі дынамавец Андрэй Зыгмантовіч, не супакоіла перажыванняў Радзевіча.

На наступную раніцу Міхал пайшоў прасіцца ў загадчыка хірургічнага аддзялення падпалкоўніка Кіма, каб яго сёння ж выпісалі. Але доктар сказаў, што ў сувязі з пераездам ёсць загад начальніка шпіталя, які забараняе адпускаць хворых да асобага распараджэння. Як Радзевіч ні ўпрошваў — нічога не атрымалася. Калі ён толькі памкнуўся вярнуцца ў палату, зазваніў тэлефон, і падпалкоўнік жэстам паказаў Міхалу затрымацца.

Выявілася, што патрэбны яшчэ адзін днявальны на КПП, і Кім загадаў Радзевічу пераапрануцца ў форму і заступаць у нарад.

І шчасціць жа мне на варотах стаяць!

Шпітальны КПП аказаўся даволі вялікім дамком з такімі ж аўтаматычнымі варотамі, на якіх Радзевіч ужо днявальніў у батальёне сувязі. Толькі тут было дзве канапы, пісьмовы стол і пара крэслаў. А яшчэ меўся радыёпрыёмнік, які, хоць і не бездакорна, лавіў асноўныя савецкія радыёстанцыі і — нават лепей, чым дома, бо тут, відаць, не «глушылі» — беларускую службу радыё «Свабода», дзе Міхал упершыню больш як за паўгода мог

даведацца, што адбываецца на радзіме. Акрамя таго, на КПП былі дзверы, якія наўпрост выходзілі на гарадскую вуліцу Свідніцы: была б цывільная вопратка — ніякай цяжкасці не склала б прагуляцца па вулках старога места. Тым больш днявальных ніхто ніяк не кантраляваў: пад'язджае машына — вароты адчыняюцца, выехала — зачыніліся, значыцца, усё нармальна. Міхал і так падчас гэтага нарада, пасля вячэры, калі практычна ўсе супрацоўнікі шпіталя разыходзіліся па дамах, штовечар выходзіў на вуліцу і шпацыраваў туды-сюды ўздоўж агароджы. Калі б нарваўся на патруль з камендатуры, які таксама час ад часу праходзіў за дзень па некалькі разоў каля шпітальнага КПП, сказаў бы, што збірае смецце.

Напарнікам Радзевіча на гэтым пасту аказаўся хлопец ягонага ж перыяду Саня Каваленка, які не прыдумаў нічога лепшага, як на пачатку чэрвеня захварэць на пнеўманію.

— Гэта, мабыць, таму, што я важыў да войска сто дзесяць кілаграмаў, а тут за паўгода скінуў аж трыццаць пяць! — выказваў ён свае меркаванні пра прычыны хваробы, больш уласцівай для зімы.

Саня спецыяльна, каб пахудзець, нічога не рабіў, усё атрымалася неяк само сабой: піва не піў, як дома, кінуў курыць, бо ад «Казбеку» можна задыхнуцца, зарадка штораніцы, спартовыя святы кожную нядзелю, ну і, вядома ж, начныя пазачарговыя трэніроўкі пад кіраўніцтвам дзядоў. Акрамя таго, хлопец служыў у батальёне пантоншчыкаў, дзе асноўнай зброяй была цяжэнная кувалда, якой часам даводзілася махаць без перадыху па некалькі гадзін.

Каваленкава сям'я пераехала з-пад Адэсы ў Абхазію, якраз калі Саня павінен быў ісці ў першы клас, таму

хлопчыку з украінскамоўнай сям'і мала таго што давялося вучыцца па-руску, дык яшчэ, як асобны прадмет, прыйшлося вывучаць грузінскую мову!

— Дык ты ведаеш грузінскую? — шчыра дзівіўся Міхал.

— Прызнацца, прытым, што ў атэстаце ў мяне па грузінскай стаіць чацвёрка, ведаю вельмі мала, мабыць, па-англійску і то болей засвоіў. Грузіны дома гаварылі па-свойму, таму і ведалі, для ўсіх астатніх гэта быў абсалютна фармальны прадмет. Пры пэўных акалічнасцях, напрыклад, калі бацькі вайскоўцы, можна было і зусім яе не вывучаць.

Радзевіч успомніў, як ганарыўся ягоны аднакласнік, якога вызвалілі ад вывучэння беларускай мовы, бо дактары знайшлі ў хлопчыка нязначнае пагаршэнне зроку: а вы ўсе калгаснікі!

— А з украінскай як?

— Нармальна: дома ж усе на ёй працягвалі гаварыць. Мама навучыла мяне чытаць па-ўкраінску. Толькі на працы і ў школе рускай карысталіся. А яшчэ, калі прыходзілі сябры бацькоў, украінцы, яны таксама гаварылі на роднай мове.

Сяржук Сокалаў-Воюш гарлаў пад гітару па радыё «Свабода» па-сапраўднаму надзённую і не пазбаўленую гумару песню, галоўнаю гераіняю якой нечакана сталася самая звычайная каза.

— Гэта ён пра што? — не зусім успрыняў досціп спевака гараджанін Саня Каваленка.

Міхал з веданнем справы тлумачыў калегу ўсе перыпетыі сюжэта песні і суадносіны іх з рэчаіснасцю: калгасныя каровы ад хранічнага голаду даюць гэтулькі ж мала малака, што і маленькая каза. Таму ці не прасцей на калгасных фермах трымаць замест кароў коз: можа,

хоць іх атрымаецца накарміць як след. Навошта ж мучыць ні ў чым не вінаватую жывёлу?!

Святло яшчэ не ўключалі, таму Радзевіч бачыў толькі сілуэт свайго слухача і не мог па выразе твару ацаніць: разумее яго тлумачэнні Каваленка ці не. Самога ж апавядальніка ў гэты момант непакоіла чарговая хваля адчування, што ўсю гэтую сітуацыю ён ужо некалі перажываў. Міхал мог паклясціся, што раней ніколі не чуў «Песню пра казу», таму наўрад ці расшыфроўваў некаму яе змест. Але пачуццё паўтору ўзнікла проста звышнатуральнае…

І скуль што бярэцца?...

Раптам з вуліцы данесліся нейкія гучныя крыкі. Праз акно, якое выходзіла на шпіталь, днявальныя па КПП убачылі, як на тэрасу выйшла некалькі жанчын у белых халатах, а следам з'явіліся мужчынскія постаці ў сініх піжамах. Усе, хто знаходзіўся на тэрасе, уважліва ўглядаліся некуды за агароджу. Хлопцы адчынілі дзверы і выйшлі ў горад: па вуліцы ў іхным напрамку рухалася купка маладзёнаў у цывільным. Іх было шасцёра, і яны намагаліся трымацца роўным шыхтом і маршаваць у нагу. Атрымоўвалася так сабе, бо хлопцы былі прыкметна датыя. Нічога звышнатуральнага ў гэткім відовішчы, мабыць, і не было б, калі б не той дзікі крык-песня, якую яны гарлалі па-нямецку: гэта было не што іншае, як пазнавальны нацысцкі марш. Нехта з жанчын на тэрасе ўбачыў на вуліцы Міхала з Санем і крыкнуў:

— Схавайцеся!

Але хлопцы не крануліся з месца: ну, выдурняецца моладзь, няхай сабе павыдурняецца, не стануць жа яны кідацца на вайскоўцаў.

Працэсія набліжалася.

Міхал назіраў за маршам маладзёнаў, як за бясплатным канцэртам, — абсалютна спакойна. Але адчуваў,

што напружанне расце на тэрасе: можа, яны не ўпершыню бачаць падобнае і пра нешта ведаюць…

Калі да днявальных заставаліся лічаныя метры, адзін з маладых людзей раптам, перакрыкваючы астатніх, выгукнуў нейкую каманду ў такт маршу і выразна пачаў адлік:

— Eins! Zwei! Drei!*

На drei шэраг параўняўся з КПП, малойчыкі даволі зладжана выкінулі наперад правыя рукі ў нацысцкім вітанні і сінхронна гаркнулі:

— Heil Hitler!

Радзевіч і сам не чакаў ад сябе падобнай рэакцыі на чуты-перачуты мільён разоў у кіно вокліч: ён зарагатаў нечакана гучна і надзіва заразліва. Услед пачаў гыгыкаць Каваленка, а праз імгненне спачатку бязладна затупаў, а потым таксама выбухнуў рогатам нацысцкі шэраг. Засмяяліся і на тэрасе.

Паверыць у тое, што ў сацыялістычнай Польшчы, нават сярод мясцовых немцаў, маглі ўзрасці нацысты, было немагчыма. Верагодней, гэта маладыя палякі, не на жарт спалоханыя зыходам савецкага войска з заходняй часткі сваёй краіны, такім наглядным чынам спрабавалі сказаць найперш суайчыннікам, а заадно і «радзецкім», што тут можа быць, калі войскі імперыі не застануцца. Міхал адразу згадаў гаворку з мясцовым беларусам на пілараме.

Бывае ж: у адной частцы краіны змагаюцца за вывад савецкай арміі, а ў другой зусім не супраць, каб яна засталася…

Вызваляць Радзевіча са шпітальнага палону прыйшоў сам Пятроў. Старшаму прапаршчыку не адмовілі: прызналі кухара абсалютна здаровым і адпусцілі з непасрэдным начальнікам да месца службы.

---

* — Адзін! Два! Тры! *(ням.)*

— Мяне ўжо ўсе дасталі: як толькі даведаюцца, што я з Абхазіі, адразу вяжуцца: запрасі ў госці пасля дэмбелю, запрасі ў госці. Адзін ты не напрошваўся, — адзначыў на развітанне Саня Каваленка, — таму вось мой адрас і тэлефон, — пантоншчык працягнуў старонку з нататніка, — звольнішся — абавязкова абзавіся, цябе запрашаю!..

Па дарозе ў частку Міхал наважыўся і спытаў узводнага, што новага ў батальёне.

Той, без асаблівага жадання весці гутаркі з падначаленым, усё ж распавёў, што фельд'егеры прывезлі сабе новага повара замест дэмабілізаванага і цяпер:

— ...Вам упяцёх у той сталоўцы і зусім не будзе чаго рабіць! Як ні зайду ў ленінскі пакой — Аліеў з Пунтусам сядзяць. Што там глядзець: нашы ўсё адно адгуляліся, цяпер дома ля тэлевізара ў іх чэмпіянат!

Значыць, таго, што ў сталоўцы цягне лямку адзін за ўсіх Шпакоўскі, Пятроў не ведае.

— Як я і разлічваў, — працягваў камандзір, — у ліпені ў мяне адпачынак, а потым перавод на іншае месца службы. Буду недзе ў Саюзе цяпер служыць.

Міхал згадаў, як Пятроў, калі прывёз іх у частку, пасля таго як сказаў, што ён іхны камандзір, тады неяк зусім недарэчы дадаў: пакуль. Цяпер гэтае «пакуль» набывала сэнс.

— Ты з Беларусі? Так? — раптам удакладніў Пятроў.

— Так.

— Добра было б, каб у Беларусь трапіць. Выйду на пенсію — абавязкова ўладкуюся ў вас на пастаяннае месца жыхарства.

— А вы самі адкуль?

— О! Я з-за Урала, з Сібіры! Там у нас першародная прыгажосць!..

— Дык чаму не на радзіму тады?

— Я ж кажу: там ніякай цывілізацыі!

Зусім нядаўна для Міхала стаў сапраўдным адкрыццём той факт, што ледзь не праз аднаго ўсе афіцэры і прапаршчыкі пасля зыходу ў адстаўку хацелі б жыць у Беларусі.

У канцы лютага Радзевіч не знаходзіў сабе месца: на кожным будынку ў ваенным гарадку, дзе размяшчалася школа повараў, з'явіліся плакаты з інфармацыяй, што 4 сакавіка адбудуцца выбары ў Вярхоўны Савет БССР. Як гэта магчыма: вышэйшы орган улады ягонай роднай рэспублікі будуць выбіраць тысячы абсалютна чужых людзей, якія не проста не ведаюць беларускіх рэалій ці ніколі не былі ў Беларусі, а, па вялікім рахунку, мякка кажучы, пляваць хацелі на тое, што там адбываецца ці будзе потым.

Свайго ўдзелу ў выбарах, напрыклад, узбекскіх Міхал не ўяўляў ні ў якім выглядзе…

Для поўнага ж шчасця, як кажуць, у беларускі парламент вылучаліся і афіцэры, што служылі ў Паўночнай групе савецкіх войскаў. Быў сярод іх і камандуючы групы генерал Дубынін.

Выбары, хоць і былі ўпершыню альтэрнатыўнымі, пры такіх акалічнасцях практычна не дапускалі магчымасці для апазіцыйных, не камуністычных сілаў правесці ў парламент адчувальную колькасць сваіх прадстаўнікоў: за каго тут, у ПГВ, будуць галасаваць ваеннаслужачыя ды іхныя сямейнікі, сумненняў не ўзнікала.

Хутка для сустрэчы з выбаршчыкамі на вайсковым самалёце, без усялякага дазволу польскага боку, прывезлі наменклатурных кандыдатаў у дэпутаты з самой Беларусі. Апазіцыйныя ж кандыдаты калі б і трапілі ў Польшчу, дык у савецкія гарнізоны — дакладна ж не.

Па той выбарчай акрузе, дзе месцілася школа ваенных повараў, балатаваўся нейкі маладжавы камсамольскі дзеяч, які падчас сустрэчы прачытаў з паперкі тэзісы сваёй феерычна-фантастычнай праграмы: яна задавальняла любыя магчымыя і немагчымыя густы, а таму ўтрымлівала ўзаемавыключальныя рэчы. Бюракрат абяцаў, што прыкладзе максімум намаганняў для таго, каб Савецкі Саюз стаў яшчэ больш маналітным і непарушным, а беларуская рэспубліка павялічыла сваю самастойнасць; што паспрыяе стварэнню найлепшых умоваў для развіцця нацыянальнай культуры і мовы ды пашырэнню сферы выкарыстання рускай мовы на Беларусі; абяцаў змагацца з ільготамі для наменклатуры, а прывілеі для ваенных пенсіянераў павялічыць; гарантаваў дбаць пра забеспячэнне роўнасці ўсіх рэлігійных канфесій і спрыяць аднаўленню праваслаўнай царквы.

Ніякіх пярэчанняў у сваёй праграме кандыдат не бачыў. Ён, відаць, дзейнічаў паводле прынцыпу: гавары тое, што ад цябе хочуць пачуць, будзь прасцейшым — і да цябе пацягнуцца людзі.

Прачытаў гэтую лухту не без натхнення, нават узнёсла атрымалася, і запрасіў усіх прысутных пасля завяршэння службы прыязджаць жыць у Беларусь, прапанаваў задаваць пытанні.

Нечаканую актыўнасць раптам выявілі жонкі афіцэраў будаўнічага батальёна, якія натуральна па сцэнцы размазвалі камсамольца за фразу пра спрыянне развіццю беларускай мовы: цёткі да глыбіні душы былі абураныя тым, што ў Беларусі ёсць беларуская мова!

— Запрашаеце прыязджаць да вас, а самі там нацыяналізм разводзіце, як у Прыбалтыцы! — верашчала самая актыўная кабета.

На імгненне твар наменклатуршчыка вылучыўся чырвонаю плямаю нават на фоне савецкага сцяга, які вісеў

у яго за спінай: раскусілі! Але ўжо ў наступную секунду аблічча кандыдата набыло ранейшае ружовенькае адценне колеру скуры маладзенькага парсючка: бюракратычная загартоўка ўсё ж спрацавала.

Камсамольскі дзеяч пачаў клятвенна завяраць, што яго няправільна зразумелі: у Беларусі такога, як у прыбалтыйскіх рэспубліках, не можа быць ніколі, там жывуць настолькі талерантныя людзі, што яны, каб барані божа не пакрыўдзіць якога-небудзь прадстаўніка брацкіх народаў, даўно пазбавіліся ўжо ад такіх перажыткаў чорнага мінулага, як дробнабуржуазны нацыяналізм:

— У нас даўно ўжо адна нацыянальнасць: савецкая! І мова ў нас адна: руская! Мы — інтэрнацыяналісты! — сыпануў ён традыцыйнымі лозунгамі ў якасці самага пераканаўчага аргумента.

Як ні дзіўна, на жанчын гэты танны прыём падзейнічаў лепей за цвярозыя разважанні, і яны пачалі задаваць больш практычныя пытанні: ці будзе каўбаса, ці дастаткова дзіцячых садкоў, як складана ў Беларусі абзавесціся дачным участкам.

Натуральна, па словах кандыдата ў дэпутаты, у БССР усё было проста цудоўна, а калі яго абяруць у Вярхоўны Савет — стане непараўнальна лепей!

Але перадусім у сваім жаданні пасяліцца ў Беларусі адстаўнікі кіраваліся зусім не каўбасой, а менавіта мовай, дакладней, яе практычнай знішчанасцю, адсутнасцю і адсунутасцю далей, чым на перыферыю жыцця: з каўбасой у Прыбалтыцы было прыкметна лепей…

Вось і па логіцы Пятрова: цывілізавана там, дзе хапае каўбасы, гучыць руская мова і тубыльцы не вытыркаюцца са сваімі адметнасцямі…

Калі прыйшлі ў свой ваенны гарадок, Радзевіч адразу ж спытаў у камандзіра дазволу пайсці ў сталоўку, і непасрэдны начальнік без ваганняў даў сцвярджальны адказ.

У будынку было надзіва пуста і ціха: сняданак даўно скончыўся, а гатаваць абед яшчэ не распачыналі. Хлопцы з нарада ўжо вымылі посуд і навялі парадак і цяпер у поўным складзе сядзелі на вуліцы ў цяньку ля цэнтральнага ўвахода. Міхал іх толькі чуў: ён прайшоў праз бакавыя дзверы.

Дзе цяпер Вацік: у кухарскім пакойчыку ці яшчэ ў варачным цэху?

Радзевіч накіраваўся на кухню.

Міхал увайшоў у варачны цэх — нічога за час ягонай адсутнасці там не змянілася: тыя самыя пахі ды колеры, усё абсталяванне на ранейшых месцах. Хіба што ад дзённага святла прусакі пахаваліся.

А можа, Сабанаеў зрабіў ласку і ўсё ж патруціў брыдкіх інсектаў?

Людзей у варачным таксама не было.

І толькі Радзевіч павярнуўся, каб выйсці, да яго данёсся добра знаёмы голас:

— А-а! З'явіўся, сволач! Выгуляўся! «Накасіўся»!

З лавы, якая стаяла паміж акном і вялікім катлом, чаму яе і не заўважыў Міхал, прыўзняўся Вацлаў Шпакоўскі. Ён гаварыў чужымі словамі, пры гэтым намагаючыся надаць голасу максімальна пагрозлівую інтанацыю, ад чаго той набываў нейкае істэрычна-старэчае адценне, нібы раз'юшаная бабулька спрабавала распачаць скандал.

І выглядала бабулька проста жахліва — скура ды косці — быццам апошнія тыдні пражыла не ў сталоўцы, а ў нацысцкім канцэнтрацыйным лагеры з адпаведным рацыёнам.

Як такую неадпаведнасць у абліччы кухара маглі не заўважыць непасрэдныя начальнікі Пятроў ды Антонаў? Ім што, вочы павылазілі?

— Вацік, што ты кажаш? Ты ж бачыў маю нагу, — паспрабаваў, як мага лагадней, запярэчыць Міхал. — Якое там «кашэнне»! З мяне ці не два літры гною выціснулі!

Але падобна было, што Шпачкова ваяўнічасць толькі ўзрастала і ніякіх аргументаў ён не хацеў успрымаць:

— Гэта ўсё ты! Ты ва ўсім вінаваты! Зямляк называецца!

— Можа, гэта я сам сябе палкай выцяў?!

Радзевіч намагаўся захаваць раўнавагу, але падобна было, штоВаціку неабходна было выкрычацца, і той папросту нічога вакол не ўспрымаў.

— Ты кінуў мяне аднаго! Каб не ты, нічога б не здарылася! Ты ведаеш, што мне тут давялося перажыць?! Ведаеш, як яны здзекаваліся?! І тут, і ў казарме! Нідзе перадыхнуць не давалі! А гэты крыванogi! Гэты ўкормлены вылюдак Пунтус!.. Гэтая брыдкая вусатая морда! Гэты Вася! Ён і зусім!.. Ён!.. Ён згвалціў мяне!..

— Як?! — міжволі ў Міхала вырваўся вокліч здзіўлення і неразумення.

— Як! Ты пытаешся, як?! — з вачэй Ваціка фантанам пырснулі слёзы.

Ён схапіў з падаконніка цяжкі пяцілітровы кацялок для першых блюдаў і са злосцю запусціў у Міхала. Пасудзіна праляцела ў некалькіх сантыметрах ад галавы ашаломленага пачутым Радзевіча. Ён нават машынальна не паспрабаваў ухіліцца. Несумненна, калі б яна дасягнула мэты, Міхал адразу ж вярнуўся б не на адзін тыдзень назад у шпіталь. Ёмістасць адскочыла ад супрацьлеглай сценкі і з бразганнем пакацілася па бетоннай падлозе.

— Як апошнюю калгасную шлюндру! Вось як!..

Шпачок змоўк, ціхенька апусціўся на лаўку і пачаў размазваць рукавом бруднай кухарскай курткі слёзы, якія ніяк не спыняліся.

Вакол запанавала ранейшая мёртвая цішыня: было нават чуваць, як падаюць кроплі вады з няшчыльна закручаных кранаў.

У Міхалавай жа галаве гуло так, быццам бы аб яе стукнулася і адляцела некалькі цяжкіх супніц. У ёй адбывалася сапраўднае вывяржэнне супярэчлівых думак і незнаёмых пачуццяў, якія нагрувашчваліся адна на адну, пераблытваліся і спараджалі суцэльны механічны гул, які, здавалася, разносіцца па ўсім наваколлі.

Гэтага не можа быць!

Для Міхала, як для цалкам тыповага прадстаўніка свайго пакалення і свайго часу, падобныя стасункі паміж прадстаўнікамі аднаго полу проста не існавалі. Ведама, ён чуў пра тое, што нешта падобнае здараецца ў турмах. Нават чуў як пагрозу з боку афіцэраў ці дзядоў зрабіць нешта такое з не вельмі кемлівым жаўнерам, але ўспрымаў гэткія пагрозы толькі як, няхай сабе і своеасаблівы, маўленчы зварот, у пэўным сэнсе не пазбаўлены камічнага адцення…

Але таму, што здарылася з Вацікам, Міхал, як ні імкнуўся, не мог знайсці вызначэння!

Ён так і стаяў пасярод варачнага цэха, бы непрытомны, аж пакуль не затрашчала пара ў трубах і ў сталоўку не вярнуліся хлопцы з нарада.

Пошукі адказаў ці выйсця давядзецца пакінуць на потым, зараз неабходна гатаваць абед.

Міхал збегаў уніз, знайшоў больш-менш прыдатнае — не самае бруднае — спецадзенне, пераапрануўся і ўзяўся за справу.

Шпачок застаўся ляжаць на ранейшым месцы.

— О! Усё правільна: цяпер Вацікава чарга адпачываць, — пракаментаваў нехта з нарада тое, што адбывалася на кухні.

Радзевіч падумаў, як хутка і проста атрымоўваецца гатаваць у нармальным стане, калі не цягне пастаянна на сон і свядомасць хаця б збольшага адэкватная: незабыўная сустрэча з земляком усё ж не дазваляла адчуваць сябе абсалютна цвярозым.

— Можа, ідзі лепей у кухарскі пакой, адпачні як след, — прапанаваў Радзевіч Шпачку.

Вацік і вухам не павёў, так і застаўся нерухома ляжаць на лаўцы, утаропіўшыся ў столь.

Калі абед быў прыгатаваны і нарад ужо збіраўся разносіць стравы па сталах, у варачны цэх увайшоў апрануты ў вайсковую форму Пунтус. Брыдкія каціныя вусы пасунуліся ўгору: дзед яхідна заўсміхаўся, калі пабачыў Міхала:

— А-а! Ты ўжо тут… А дзе Шпакоўскі?

Радзевіч нічога не адказаў.

— Аглух ці што?! Дзе другі, пытаюся?! — цяпер Васеў голас гучаў звыкла незадаволена.

Міхал адчуваў, як яго накрывае хваля такой нечуванай нянавісці, што баяўся разявіць рот, каб не нагаварыць чаго-небудзь лішняга: вольных вушэй у гэты момант, як на ліха, вакол было аж занадта.

— Ах, вось куды ты зашыўся!

Пунтус сам заўважыў Вацiка і памкнуўся да яго бліжэй.

— Думаў, не ўбачу?! Чаго не абзываешся?! Уставай, ты мне патрэбны!

Шпачок, як асуджаны да смяротнага пакарання, бязвольна ўзняўся з лаўкі.

Халера! Што ён робіць!

Радзевіч у два крокі падскочыў да вялікага катла, схапіў са стойкі чарпак з доўгай драўлянай ручкай і стаў паміж дзедам і земляком:

— Нікуды ён з табою не пойдзе!..

Нейкі боўдзіла з нарада, відаць, таксама старaслужачы, гучна прысвіснуў ад здзіўлення:

— Ніх…я сабе!..

— Абед трэба раздаваць! — прыкметна мякчэй дадаў Міхал.

— Вася! Табе не здаецца, што цябе толькі што «чмаранулі» ўласныя кабаны?! — не сунімаўся дзед з нарада.

Пунтус у імгненне вока збарвавеў настолькі, што, здавалася, ягоная галава вось-вось выбухне і запырскае крывавымі кавалкамі мазгоў і чэрапа ўсё навокал. Ён утаропіў-вырачыў свае мутна-сінія вочы ў Міхалавы, нібы спрабаваў прачытаць у іх, ці расказаў яму што-небудзь Вацік, ці гэтая нечаканая сутычка адбылася сапраўды толькі таму, што кабан занадта доўга адсутнічаў у батальёне і зусім пазбавіўся належнага пачуцця страху перад старымі.

— Абед і праўда трэба раздаваць, — Вася адвёў вочы ад Радзевіча і зіркнуў на ахоўніка традыцый з нарада.

Той толькі нядобра хмыкнуў і нічога не сказаў.

Пунтус зноў паглядзеў Міхалу ў вочы і пагрозліва прасіпеў:

— А з табой мы ўвечары яшчэ пагаворым!

# XIV

Міхал Радзевіч ужо даўно і трывала ўсвядоміў, што шахматы — не ягоная стыхія. Ён выдатна засвоіў усе магчымыя хады кожнай фігуры на полі бою, памятаў не адзін дзясятак класічных камбінацый, але ўсё адно больш прайграваў, чым перамагаў: сканцэнтравацца, мабілізаваць увагу, цалкам засяродзіцца толькі на тым, што адбываецца на дошцы, у яго ніколі не атрымоўва-

лася. Без здольнасці максімальна хутка і аб'ектыўна аналізаваць становішча, пралічваць усе магчымыя наступствы кожнага свайго дзеяння, кроку, учынку, руху ў бліжэйшай ды максімальна аддаленай перспектыве, няма чаго і сядаць за шахматны стол.

Здаровага прагматызму яму ніколі не хапала і ў вырашэнні штодзённых жыццёвых пытанняў, а калі сказаць усю праўду — не ставала катастрафічна.

Цяпер жа, і Міхал гэта выдатна разумеў, перад ім у жыцці паўстала самая сапраўдная шахматная партыя, якую ён не мае права прайграць, бо ад яе вынікаў залежыць, як складуцца ягоны асабісты і Вацікаў лёсы да канца службы ў войску, а магчыма і надалей…

Найперш было відавочна, што ніякай магчымасці параіцца з кім-небудзь у гэткім становішчы няма: чым меней людзей будзе ведаць, што здарылася, тым лепей. У сэнсе, неабходна, каб болей ніхто нічога і не ведаў. Здарылася? Гэта што, само сабою адбылося і ніякіх вінаватых няма? Стыхійнае бедства? Ведама ж, гаворка можа весціся толькі пра канкрэтны ўчынак аднаго вылюдка, Васі Пунтуса.

Трэба выбірацца самастойна.

Але як?

Прыйсці ў казарму і распавесці ўсё пра Пунтуса іншым дзядам? Яны ж, вядома, наўрад ці ўхвалілі б Васевы схільнасці: традыцыі ўзаемаадносін кабаноў і дзядоў, якімі б яны пачварнымі ні былі, ніяк не прадугледжвалі таго, што ён учыніў…

Але чаго вартае слова нейкага там кабана супраць слова чалавека, якога яны даўно ведаюць, супраць паўнавартаснага і аўтарытэтнага дзеда? Пунтус з лёгкасцю зможа перакруціць усё на сваю ж карысць: глядзіце, да чаго даўмеліся гэтыя тупыя кабаны, каб зняславіць дзя-

дулю! Яны надта шмат «накасячылі», таму ад страху перад немінучымі наступствамі і прыдумалі, як адцягнуць ад сябе ўвагу! Не выйдзе! Атрымаеце належнае па поўнай праграме!

Міхал так і бачыў карціну, як Пунтус вырачыць, нібы ад шчырага абурэння, свае вочы і, пырскаючы слінаю, з брыдкаю ўхмылкаю на вуснах будзе зусім не бараніцца ці апраўдвацца, а максімальна агрэсіўна нападаць, шчодра сыпаць адборнымі мацюкамі і па магчымасці эфектна дзерці глотку!

А што можа атрымацца, калі паверацЬ кабанам? Дапусцім, Пунтуса нават свае ж і зашпіляць, нават пачнуць «чмырыць», як апошняга кабана… А далей? Яны што, расшпіляць за баявыя заслугі Ваціка? Раптам пранікнуцца да яго шчырым спачуваннем і спагадай? Ніхто з дзядоў не падзеліцца такім незвычайным здарэннем са знаёмымі з іншых падраздзяленняў, не патлумачыць чарпакам, за што зашпілілі Васю? Адназначна на наступны ж дзень і да канца службы Шпачок ператворыцца ў аднаго з самых яскравых персанажаў салдацкага фальклору: а гэтага расшпілілі пасля таго, як трахнулі!..

Зусім не прывабная перспектыва! Нікому б такой радасці не пажадаў!

Тэарэтычна можна было б паспрабаваць пагаварыць наўпрост з Васем, папалохаць ці нават пашантажаваць… Але відавочна — пляваць ён хацеў на нашыя пагрозы і шантаж…

Што ж рабіць?

Пакінуць усё як ёсць — таксама не варыянт: Вацік не зможа быць заўсёды навідавоку, а Пунтус, безумоўна, не спыніцца… І што тады? Тады Шпачок ад роспачы, пачуцця віны і адчаю можа зрабіць што-небудзь непапраўнае з сабой… Што я скажу тады яго маме?.. Як змагу спакойна жыць сам?..

Нічога добрага не будзе, калі раптам Вацік у парыве нянавісці як-небудзь прыб'е ці пакалечыць свайго мучыцеля… Тады ён ператворыцца з ахвяры ў злачынцу! І ніякі суд не апраўдае: перавышэнне неабходных мераў абароны!..

Сам бы, здаецца, без ваганняў прыбіў бы таго вылюдка!..

Тады застаецца толькі адзіны шлях, магчымы па статуце, афіцыйны — скардзіцца начальству, ператварыцца ў вачах усёй вялікай салдацкай грамады ў «стукачоў»!

Ужо прыйшлі навабранцы, праз тыдзень-другі яны скончаць курс маладога байца і з'явяцца ў падраздзяленнях… Нават пры ўсіх «касяках» і «залётах» у дзядоў няма ніякіх важкіх падстаў, каб не расшпіліць сваіх кабаноў!.. Ну, няхай сабе яшчэ месяц, і яны будуць вольныя!..

І вось цяпер, калі б, здавалася, вызваленне блізкае як ніколі, адзін крываногі падонак стварыў столькі невырашальных праблем!

Але ж што яшчэ можа здарыцца да лістапада: толькі напрыканцы восені дзяды з'едуць. Дзе гарантыя, што нейкі там расшпілены кручок на каўняры абароніць Васіка ад Пунтуса? Ведама ж, сам факт таго, што Шпачок ужо не будзе кабаном, ніяк не стрымае Васю!

Відаць, усё ж іншага выйсця, акрамя як звяртацца па дапамогу да начальства, няма. Толькі з кім менавіта гаварыць: Пятроў дабывае апошнія дні на сваёй невялічкай пасадзе і яму ніякія разбіральніцтвы напрыканцы службы ў гэтым батальёне не патрэбныя; Антонаў — непасрэдны начальнік толькі ў сталоўцы, але яму, падобна, нават на тое, што ў ёй адбываецца, глыбока напляваць! Старшы лейтэнант Амросьеў, начальнік харчовай службы, той яшчэ афіцэр: відаць, «мажорык» нейкі, сынок наменклатурных бацькоў, служыць першы год і на ўсё пазірае скрозь пальцы: нават чарпакам піва набываў,

з дзядамі ж гаспадарнікамі і зусім запанібрата! З непасрэдных начальнікаў застаецца толькі намеснік камандзіра батальёна па тыле, капітан Філіпенка. Ён толькі некалькі разоў заходзіў у сталоўку і гаварыў з хлопцамі. Здаецца, цалкам адэкватны мужык: на выгляд ужо і стараваты, як для капітана, сур'ёзны, падоўгу распытваў, што ды як, прасіў выказваць, калі ёсць, прапановы наконт таго, што ў сталоўцы можна палепшыць, нават абяцаў найхутчэй адрамантаваць вялікую электрычную патэльню... А яшчэ кожны раз казаў, каб смела звярталіся да яго, калі ўзнікнуць якія-небудзь праблемы. З яго вуснаў гэтая прапанова заўсёды гучала як намёк на абсалютна канкрэтныя праблемы — дзедаўшчыну. Верагодна, вопытны афіцэр здагадваўся пра норавы, якія панавалі ў гаспадарчым узводзе.

Але што і як казаць таму капітану? Вось так прыйсці і галаслоўна распавесці пра людзей, якіх нам па тыле ведае куды болей, чым новенькіх кухараў, што тыя іх крыўдзяць. Якое недарэчнае слова! Яны што, абзываюць вас як-небудзь? Ставяць падножкі? Нейкі дзіцячы сад атрымоўваецца!

У Міхала галава ішла кругам: як ні круці — скардзіцца ён не ўмее!

Да таго ж Радзевіч разумеў: як гэта ні прыкра, але адправіць да Філіпенкі аднаго Шпачка ніяк не атрымаецца. Той абавязкова скажа ўсю праўду, як ты яго ні настройвай, і што будзе ў выніку — крымінальная справа, следчыя эксперыменты, розгалас на ўсю групу войскаў? Як ён сам потым усё гэта перажыве?..

Адзінае, што абсалютна відавочна: усяму ёсць нейкая мяжа! Няхай сабе скардзіцца начальству, «стукаць», тут, у войску, лічыцца страшэнным грахом! Але ці можна параўнаць усё тое, што прымушалі кабаноў рабіць

дзяды, — усе падшыванні і мыццё формы, адцісканні і прысяданні, гатаванне ежы і гарбаты, спевы калыханак, байкі, засоўванне паміж пальцаў ног і падпальванне паперы, «веласіпедзік», нават прабіванне фанеры — з тым, што вырабіў Пунтус з няшчасным Шпакоўскім?!

Ды любы з гэтых зухаватых дзядоў, калі б не ў войску, а дома яго як след збілі б хуліганы, хіба не пабег бы ў міліцыю: як жа — беззаконне, гвалт, ратуйце, дапамажыце…

— Ты як? — пацікавіўся Міхал у Ваціка, які, бы цень, цэлы дзень не адыходзіў ад яго ні на крок.

— Нармальна…

— Хадзем у казарму.

— А пайка для дзядоў?

— Хрэн ім у вочы сёння, а не пайка!

— Паб'юць жа!

— Гэтага нам якраз сёння і трэба дабіцца…

— Ты звар'яцеў?!

— Валі ўсё на мяне, калі што! Няхай мяне болей паб'юць, няхай як след аддубасяць! З цябе ўжо дастаткова!..

Вацік няўцямна ўтаропіўся на Міхала.

— Заўтра ўсё растлумачу! Тады зразумееш!

У казарму кухары заўсёды траплялі пасля адбою, бо неабходна было падрыхтавацца да гатавання сняданку. Ды і куды спяшацца? Усё адно нічога добрага там іх не чакала.

— Не зразумеў?! Чаму так позна? — спыніў кабаноў, калі яны ўзняліся на свой паверх, ці не заўсёды самы галодны дзед Лёха Малчанаў. — А пайка дзе?

— Няма, — з выклікам адказаў Радзевіч.

— Што?!

— Дзяжурны надта злы сёння трапіўся!

— А я не злы?! Дзяжурнага, значыцца, баіцеся, а дзядуляў — не?! На дзядуляў х…, значыцца, можна забіць?! Ці не прыпухлі вы там у сваёй сталоўцы, кабаны смярдзючыя!

Малчанаў крычаў наўмысна гучна, каб пачулі астатнія дзяды. Яны не прымусілі сябе чакаць і праз хвіліну былі ўжо ўсе на калідоры.

— Што здарылася? — з уяўнай лагодаю ў голасе пацікавіўся Садоўнічы.

— Ды кабаны зусім распеpackазаліся! Вунь, без пайкі прывалакліся! Зусім страх страцілі! — працягнуў лямантаваць Лёха.

— Гэта ўсё Радзевіч, — падключыўся Пунтус, — ён і мне сёння ў сталоўцы пярэчыў. Шпакоўскі ні пры чым. Гэты ў шпіталі адпачыў месяц, цяпер вылузваецца, праўда, Мішаня? — Вася нахабна, са сваёю брыдкаю ўсмешкай на твары, пазіраў Радзевічу ў вочы, нібы казаў паглядам: ну і што ты мне зробіш? Хто ты супраць мяне? Пляваць мне, што ты там ведаеш! Ты тут — бяспраўнае быдла!

Міхал не адводзіў сваіх вачэй ад дзедавых, гэта быў сапраўдны двубой позіркаў, ён таксама спрабаваў давесці сваё пасланне да Пунтуса: я ведаю, што ты — дробны брыдкі вычварэнец, ты смелы толькі з тымі, хто не можа за сябе пастаяць, са сваёю зграяю смелы, але я цябе не баюся!

— Фанера! — гыркнуў Вася.

Міхал стаў смірна, але не стаў дэклараваць належнае: новая, стодзюймовая… і па-ранейшаму нахабна глядзеў Пунтусу ў вочы.

Было бачна, што дзед на мяжы шаленства!

Ён сціснуў свой дробненькі кулачок і стукнуў Міхалу ў грудную клетку.

— І гэта ўсё? Што ж ты б'еш, як дзяўчынка, Вася! — з выклікам засмяяўся Радзевіч, хоць удар быў досыць балючы.

Твар Пунтуса імгненна пачырванеў, а на свавольнага кабана тут жа накінуўся Малчанаў:

— Што?! Што ты сказаў?! Паўтары?! Фанера! Фанера, я сказаў!

Лёха не стаў чакаць ад кабана ніякага адказу, а тут жа так моцна ўлупіў па ягонай грудзіне, што Міхал бразнуўся спінаю аб сцяну.

— Ну, як? Спадабалася? — злараднічаў дзед.

— Крыху лепей. Гэта ўжо як цётка базарная!

— Хто? Я — цётка! Чулі, што ён сказаў? Фанера! — зноў зароў Малчанаў і замахнуўся на Радзевіча.

І калі ўжо рух дзедавага кулака нічога не магло стрымаць, Міхал зрабіў тое самае, што некалі Лермантаў: рэзка павярнуўся бокам. Лёхаў кулак нават не дакрануўся да Радзевічавай гімнасцёркі, а з усяе моцы ўпячатаўся ў сцяну.

— А-а! — заверашчаў Малчанаў, як шалёны, і затрос кісцю правай рукі.

На сценцы, у тым месцы, у якое прыйшоўся ўдар, Міхал паспеў разгледзець дробныя кавалачкі чалавечай скуры: цудоўна!

У наступнае імгненне Радзевіча ўжо збілі з ног і пачалі футболіць нагамі: чэмпіянат жа свету, як-ніяк!

На Міхалава шчасце, ніхто з нападнікаў не быў абуты ў боты. Ён курчыўся на падлозе, спрабаваў прытуліцца да сценкі і прыкрыць галаву рукамі: мазгоў і так небагата!

— Стаяць! — нехта спрабаваў перакрычаць валтузню. — Хопіць, я сказаў!

Бойня таксама раптоўна, як распачалася, спынілася. Міхал з асцярогаю расплюшчыў ужо прыкметна пад-

пухлае вока: паміж ім і раз'юшанымі дзядамі стаяў Садоўнічы.

— Вам што, сумна жыць стала?! Прыгодаў на свае азадкі шукаеце? Што з вамі будзе, калі яны заўтра «стукнуць»? Дадому не вельмі хочацца ў час вярнуцца, ёсць жаданне пару годзікаў звыштэрміновую ў дысбаце паслужыць.

— Што ты вечна сцыш, Талян?! — паспрабаваў запярэчыць Малчанаў. — Нам не так перападала, успомні.

— Сцыш?! А ты ў курсе, каму першаму і болей за іншых дастанецца, калі што?.. Усё, я сказаў! Разыходзімся! Канцэрт скончаны!

Толік нахіліўся да Радзевіча:

— Ты як?

— Жыць буду.

— Ідзі абмыйся і спаць! На сёння «разборак» хопіць!..

На наступны дзень па абедзе Міхал і Вацік пераапрануліся з поварскага адзення назад у вайсковую форму і рушылі ў штаб.

— Можа, трэба было б з Пашам параіцца? — няпэўна спытаў Вацік.

— Мабыць, у гэтым канкрэтным выпадку — не: раптам ён усё ж як-небудзь прагаворыцца? Хочаш, каб кожны апошні «чмошнік» у батальёне тыцкаў у цябе пальцам і называў сам ведаеш як? Знакамітасцю хочаш стаць? Да таго ж нешта мне падказвае, што не сёння, дык заўтра Махмуд расшпіліць Пашу: дастаткова ён пабатрачыў.

Яшчэ ўчора Міхал быў поўны рашучасці пайсці і распавесці ўсё Філіпенку, нават забяспечыў важкія аргументы, каб не быць галаслоўным: цяпер яны прыкметна чырванелі на твары і сінелі на грудзях і па ўсёй спіне. Але сёння ён не быў зусім упэўнены, што трэба сказаць, каб неяк вырашыць праблему... Дапусцім, яны прадэманст-

руюць капітану свае баявыя раненні, распавядуць, што іх выключна дзеля задавальнення сваіх садысцкіх схільнасцяў дубасяць штовечар… І што далей? Якімі будуць ягоныя крокі? Ён выкліча ваеннага пракурора? Падставіць камандзіра батальёна: выкрыты факт дзедаўшчыны — гэта ўсё ж надзвычайная сітуацыя! А за ёю, адпаведна, камісіі, пазачарговыя праверкі, пошук вінаватых сярод камандуючага складу… Яму гэта трэба? Не факт, што ў выніку яго самога і не прызначаць вядомым козлікам… А што, калі ён выслухае, паспачувае, як выхавацелька садка пакрыўджанаму дзіцяці, і, як зрабіла б тая жанчына, збярэ ўсіх дзетак і памахае ім пальчыкам: ай-яй, міленькія, я ж вам казала, так рабіць нельга! Прысаромленыя дзетачкі апусцяць долу вочкі, нехта асабліва чуллівы нават шмыгане носам… А ну паабяцайце мне, што болей ніколі так не будзеце рабіць! «Абяцаем!» — хорам адкажуць дзеткі. Вось і цудоўненька, жывіце мірна, маленькія! І пойдзе надалей займацца сваімі дарослымі справамі… А дзеткі тым часам возьмуцца з падвоеным імпэтам за тое, чаго болей ніколі абяцалі не рабіць!..

Першым жа чалавекам, з якім хлопцы сутыкнуліся ў штабе, аказаўся батальённы пісарчук, чарпак з гаспадарнікаў Раман Цвяткоў.

— О! А вы што тут робіце?!

Хлопцы прыкметна збянтэжыліся: што ім на самай справе магло тут спатрэбіцца? Сусед па кубрыку выдатна ведаў, што ўчора адбылося на іхным паверсе, і цяпер быццам бачыў кухараў наскрозь.

— «Стукаць» прыйшлі?!

— Філіпенка на месцы? — як мага спакайней спытаў Радзевіч.

Цяжка сказаць, на чыім абліччы адбілася большае здзіўленне: на Вацікавым ці на Раманавым.

— Прыйшоў днявальны і сказаў, што ён нас выклікае, — патлумачыў Міхал.

— Здаецца, быў у сябе, — усё яшчэ з недаверам адказаў Цвяткоў.

— Куды ісці?

— У канцы калідора злева, там шыльда ёсць…

Повары пайшлі, а Раман яшчэ доўга глядзеў ім услед. На ягоным абліччы блукала адценне невырашальнай праблемы: схлусілі ці не?

Міхал пастукаў у дзверы кабінета намесніка камандзіра батальёна па тыле і папрасіў дазволу зайсці. На шчасце, капітан быў адзін.

Падобна было, што Філіпенка адразу зразумеў, за чым прыйшлі гэтыя двое: не кожны дзень радавыя без запрашэння траплялі сюды.

Ён запрасіў кухараў сесці і запытаўся, што здарылася.

— Таварыш капітан, — пачаў было Радзевіч і змоўк, бо не ведаў, што казаць…

— Ну, я слухаю?..

Хлопцы маўчалі.

— Дзяды дасталі, так?..

І тут Міхал у адно імгненне зразумеў, у якім кірунку трэба весці гаворку.

— Таварыш капітан, — пачаў ён цяпер надзіва рашуча і спакойна. — Мы не можам выконваць свае службовыя абавязкі!..

Ён распавёў камандзіру, што праз выбрыкі дзядоў гаспадарчага ўзвода яны ледзь спраўляюцца з асноўнай працаю і маглі б выконваць яе значна лепей, калі б элементарна высыпаліся! Згадаў Міхал і пра салёную гарбату, і суботнікі ў Махмуда, і пра другую вячэру для дзядоў пасля адбою.

— Вось вырадкі! — абурауся капітан. — Зусім зажэрліся! Распанелі! Пацукі тылавыя!

Пачуць апошняе вызначэнне ад галоўнага тылавіка было асабліва дзіўна.

Філіпенка ўсё цудоўна разумеў і сам папрасіў кухараў прадэманстраваць сляды дзедаўскай ласкі, якія старaслужачыя шчодра пакінулі на іхных целах. Асабліва капітана ўразіла «ўкормленасць» Ваціка:

— Табе што, і есці не давалі?

— Гэта ён на нервовай глебе так схуднеў, — адказаў за Шпачка Міхал.

— Ну і чаго вы цярпелі? Чаму раней не прыйшлі? Вы што, думаеце, мы не знойдзем на іх управу?

Далей афіцэр, як мог, красамоўна распавёў, што савецкая ўлада не павінна мірыцца з падобнымі фактамі і ён, як яе верны служка, зробіць усё, што ад яго залежыць, каб выкараніць зусім не характэрную для нашага войска з'яву!

Апошняя тырада крыху напалохала Міхала, бо вельмі нагадвала тыя ангажаваныя рэпартажы з войска ў прэсе, у якіх, выключна па канонах сацыялістычнага рэалізму, жаданае выдавалася за сапраўднае…

Потым Філіпенка пацікавіўся, хто з дзядоў найбольш жорсткі.

— Усе аднолькавыя, — спакойна адказаў Міхал.

Тады капітан чамусьці ўдакладніў персанальна пра Забірава і Садоўнічага.

— Гэта Махмуд мяне ледзь не на месяц у шпіталь спраходзіў!

— Значыцца, усё ж не сама сабою нага забалела?

— Дзе там!

Міхал распавёў, што адбылося насамрэч, і прадэманстраваў шырокі чырвоны шнар на галёнцы.

— Нічога сабе!..

— А Садоўнічы проста сцыкло, — ужыў не зусім нарматыўнае слова ўзрушаны Міхал, — таму ніколі

сам нас не чапаў, але іншым асабліва не пярэчыў, хіба што ўчора…

Афіцэр запэўніў хлопцаў, што цяпер усё будзе добра і на развітанне пацікавіўся:

— Да заўтра пратрымаецеся?

— Пратрымаемся…

Што Філіпенка збіраецца канкрэтна рабіць з дзядамі, не было зразумела.

А што, калі не з дзядамі, а з намі! Што, калі ён абярэ самы просты варыянт: выправадзіць «стукачоў» куды падалей, і справе канец — не яго цяпер праблема!..

Адным словам, ніякай пэўнасці і спакою пасля наведвання штаба не было.

Усё адно горш не будзе! Куды ўжо горш?!..

Падчас вячэры ў сталоўцы стаяў традыцыйны гармідар: барабанілі лыжкі, грукалі аб сталы кацялкі ды імбрыкі, па бетоннай падлозе тупалі кірзавая боты, чуліся воклічы камандаў і прыцішаны гул нізкіх галасоў…

У варачным цэху мітусіліся хлопцы з нарада.

Радзевіч стараўся не думаць пра тое, што будзе заўтра, але нічога не атрымоўвалася. Раптам нехта з нарада падбег да Міхала:

— Там цябе вашы клічуць.

— Дзе?

— За сталом, на вашым месцы, дзе ж яшчэ?

Гэтага толькі не хапала!

Міхал і Вацік не пайшлі вячэраць разам з усімі: яшчэ да прыходу батальёна ўзялі ў Пашы па кавалку хлеба з маслам і з'елі з гарбатаю проста на кухні.

Відаць, не варта было: лішнія падазрэнні.

Калі Міхал ужо паварочваў з калідора на лесвіцу, яго ледзь не збіў з ног нейкі хлопец у звычайнай баваўнянай форме колеру хакі, а не фіялетавай, у якой хадзіў

нарад па сталоўцы. У такім выглядзе ў гэтую частку будынка ніхто не заходзіў: кухары ў белым, нарад у фіялетавым.

— Здароў! — прывітаўся жаўнер і працягнуў руку.

— Здароў, — спакойна адказаў Міхал, ціскануў працягнутую руку і павярнуўся, каб рушыць далей.

— Стой! — крыкнуў хлопец.

Міхал спыніўся і зноў запытальна ўтаропіўся ў незнаёмага: ці мала хто.

— Ты што, не пазнаеш?

Во нейкі ёлупень: пабыў раз ці два ў нарадзе і думае, што яго тут усе ведаюць.

— Саня Купрыянец! З вучэбкі, першы ўзвод, Явар памятаеш?

— А-а! — Радзевіч цяпер разгледзеў эмблемы на пятліцах і здагадаўся, што перад ім фельд'егерскі повар: хлопца ён не памятаў абсалютна. — Што так позна?

— Ды ў нас камандзір з мухамі ў галаве, усё нешта ў вашага выгандлёўваў. Заўтра сказаў ісці ў сталоўку. Дык мне калі прыходзіць?

— Давай пасля сняданку падыходзь.

— А як тут у вас служба ідзе і наогул?

— Няма мне калі, прыходзь заўтра, тады і пагаворым. Усё, пакуль!

Міхал пабег уверх па лесвіцы, а прыкметна разгублены ад такой калегавай абыякавасці Саня застаўся стаяць у калідоры.

Радзевіч усё ж адзначыў у думках, што цяпер ім з Вацікам будзе, напэўна ж, крыху лягчэй. Як там яго?.. Купрыянец?.. Нейкае надта знаёмае прозвішча…

За сталамі гаспадарчага ўзвода ўжо нікога не было. Толькі плямы ад разлітай гарбаты і крошкі хлеба: спазніўся…

Што яны хацелі?

На выхадзе з абедзеннай залы, у якой дзе-нідзе яшчэ даядалі свае порцыі жаўнеры з розных нарадаў і хлопцы з камендатуры, Радзевіч напаткаў Сабанаева.

— О! Ты ўжо тут?! — штучна здзівіўся медбрат. — Як нага?

Вось жа мярзота: цяпер я табе патрэбны і табе ёсць справа да маёй нагі. Чаго ж яна цябе не зацікавіла, калі балела!

— Цудоўна! — рэзка і жорстка адказаў Міхал. — Прычым усе чатыры! — і нечакана нават для сябе вельмі гучна рохкнуў па-свінячы!

Марат пачырванеў, неяк няўклюдна адступіў і пасунуўся да выхаду з залы.

Радзевіч не любіў у кухарскім адзенні з'яўляцца ў абедзенных залах: белая вопратка імгненна прыцягвала ўвагу ўсіх, і заўсёды знаходзіліся ахвотныя бліжэй пазнаёміцца з патрэбным чалавекам. Многія з такіх навязліва-камунікабельных людзей пасля адной-двух выпадковых гаворак лічылі Міхала ледзь не найлепшым сябрам ці прынамсі старым знаёмым. Але повар найчасцей нават абліччаў такіх таварышаў не памятаў, не тое што імёнаў!

Не стаў выключэннем і гэты раз: не паспеў Радзевіч падумаць, што ў гутарцы з Сабанаевым рохкнуў, выключна каб падкрэсліць сваё кабанства і нядаўняе стаўленне медбрата да яго, а зусім не з жадання зняважыць пачуцці праваvернага татарына, як да яго падышоў нейкі жаўнер:

— Здароў, Міхал! — выгукнуў ён.

— Здароў, — Радзевіч пацiснуў руку абсалютна незнаёмаму чалавеку і хацеў пайсці ўжо, але той загаварыў зноў.

— Я твой вадзіцель, Алег.

Повар няўцямна глядзеў на высакаватага бялявага хлопца і спрабаваў зразумець: ці ён нешта недачуў, ці няправільна зразумеў: які ў кухара можа быць вадзіцель?

Алег здагадаўся, што Міхал не разумее, пра што ідзе гаворка, і ўдакладніў:

— Я з другога ПУСа. І толькі што, перад вячэрай, наш старшына сказаў мне, што на наступны выезд замест Васі Пунтуса з намі паедзеш ты.

— Выезд?

— На вучэнні.

— А калі тыя вучэнні будуць?

— Ніхто не ведае. Можа і заўтра, а мо і праз месяц.

— І што з таго?

— Нічога. Проста паведамляю.

— Ну, тады дзякуй… за навіну.

Міхал павольна пабрыў назад у варачны цэх, на хаду спрабуючы прааналізаваць пачутае ад Алега. З аднаго боку, тое, што некалі давядзецца ехаць на вучэнні, не магло быць незвычайнай навіною, з другога — чаму той старшына не казаў нічога раней? Відаць, таму, што рашэнне было прынятае толькі сёння. Значыць гэта, што яно вынік нейкіх мер, якія абяцаў прыняць нам па тыле, ці гэта простае супадзенне…

— Тут повар паштальёнаў заходзіў! — урачыста паведаміў Вацік, як толькі Радзевіч пераступіў парог варачнага цэха.

— Я ведаю.

— Саня Купрыянец, — Шпачок нібы не пачуў адказу Міхала. — У Явары ён быў у першым узводзе. Я яго памятаю. Уяўляеш, я думаў, што ён грузін, бо ён заўсёды ў кампаніі каўказцаў «тусаваўся», а ён, аказваецца, беларус!

Купрыянец — сапраўды надзвычай распаўсюджанае ў нас прозвішча. І як гэта я адразу не пацікавіўся?

— Ягоныя бацькі, — тлумачыў Вацік, — пераехалі ў Абхазію. Ён ужо там і нарадзіўся. У яго яшчэ сястра ёсць старэйшая. Яна памятае Магілёўшчыну.

«Штосьці падобнае я ўжо чуў», — падумаў Радзевіч.

— Камандзір у гэтых паштальёнаў — нейкі прыдурак: дзесяць дзён не адпускаў Саню ў сталоўку на працу. У нарад па роце ставіў праз дзень і ўсё! Чаго ён дабіваўся? Я тут адзін вешаўся, а ён на тумбачцы стаяў! Заўтра нарэшце прыйдзе!..

— Заўтра нас усіх чакае незвычайны дзень…

Калі хлопцы прыйшлі ў казарму, днявальныя іх адразу накіравалі ў пакой да дзядоў. Міхал звярнуў увагу, што на месцах дэмабілізаваных размясціліся самыя адмарожаныя чарпакі: павысілі?

— «Стукнулі»?! — адразу з парога паспрабаваў агаломшыць кухараў Лёха Малчанаў.

— З чаго б гэта? — Міхал хоць і намагаўся не выдаць хвалявання, але не без прыемнасці адзначыў, што ў дзеда правая далонь заматаная бінтам.

— Чаму тады ў сталоўцы не прыйшоў, калі паклікалі?

— Я прыйшоў, але ўжо нікога не было.

Ваціка напалохаць атрымалася: ён трымцеў, як асіна.

— І што ад вас Філіпенка хацеў? — спытаў пра тое, што хвалявала іх найбольш, Садоўнічы.

Ведаў жа, што будуць распытваць, і зусім не падумаў, што сказаць! — папракнуў сябе ў думках Радзевіч.

— Выпытваў, колькі цэнтнераў мяса Вася і Раман скралі за апошні месяц! — ляпнуў, не асабліва пераймаючыся наступствамі, Міхал.

Абодва дзяды паўскоквалі з ложкаў. Вася традыцыйна стаў пунсовым, а смуглявы Раман прыкметна збялеў.

— Жартую…

— Ты, ты-ты-ты дагаворышся ў мяне, — нечакана зазаікаўся Раман. — Нешта ты надта балбатлівы стаў, кабан!..

— Ну… Ён пацікавіўся, з якім ПУСам мы хацелі б выязджаць на вучэнні…

— Толькі дзеля гэтага выклікаў? — засумняваўся Садоўнічы. — Не можа быць! Хто тут калі ў каго пытаецца пра нечыя жаданні? З якім загадаюць — з такім і паедзеце!

— Ён распытваў, як у нас справы, ці не крыўдзяць дзяды…

— І вы ўсіх здалі! — перабіў Радзевіча нецярплівы сяржант Толік.

— Мы сказалі, што ў нас усё нармальна, што пад вокам у мяне зусім не сіняк ніякі, а проста закімарыў няўдала і нацёр рукавом у сне…

— Лухта нейкая! — не сунімаўся Садоўнічы. — І дзеля гэтага ён бы не стаў вас выклікаць! Самі паперліся!

— Я спытаў у днявальных, хто з іх бегаў па кухараў, — умяшаўся ў гаворку пісарчук Раман Цвяткоў, які цяпер, відаць, за асаблівыя заслугі атрымаў ганаровую прапіску на пражыванне ў дзедаўскім кубрыку, — яны сказалі, што ніхто.

— Мы і не казалі, што гаварылі з некім з днявальных са штаба, — выкручваўся як мог Міхал. — Са сталоўскага нарада нехта прыйшоў і сказаў, што нам прасілі перадаць, каб па абедзе прыйшлі да капітана Філіпенкі.

— Хто? — не здаваўся намеснік камандзіра ўзвода.

— Што хто? — удаваў неразуменне Радзевіч.

— Хто са сталоўскага нарада вам перадаў?

— Я не ўсіх ведаю, да таго ж мы якраз раздавалі ежу, там была такая мітусня, што, хоць забіце мяне, я не памятаю!

— Гэта мы заўсёды паспеем! — нявесела пажартаваў Пунтус.

— А ты — запомніў, хто гэта быў? — пацікавіўся Толік у Ваціка, у якога дрыжэлі вусны і, здаецца, уся пастава лепей за словы казала: раскусілі!

— Ён быў заняты і нічога не мог бачыць, — патлумачыў за земляка Міхал.

— Вы не думайце, мы ўсё адно даведаемся, калі вы хлусіце! Амросьеў — наш чалавек! І калі вы «стукнулі», ён нам скажа! І тады вам… — Малчанаў шукаў якую-небудзь асабліва страшную пагрозу. — Вешайцеся тады, — не прыдумаў нічога лепшага: старэчая памяць падводзіла.

— Вы — камсамольцы? — незразумела да чаго раптам спытаў Садоўнічы.

— А што? — машынальна перапытаў Міхал.

— А тое, што заўтра я прапаную правесці камсамольскі сход. Запросім на яго Філіпенку, і вы выступіце, распавядзеце, як вам тут добра жывецца, што мы вас не тое што не крыўдзім, а, наадварот, усяляк дапамагаем! Зразумела?..

— Без праблем, — спакойна пагадзіўся Радзевіч.

Што-што, а ўсю штучную, хлуслівую камсамольскую кухню Міхал ведаў выдатна: ён два гады ўзначальваў школьную пярвічку, удзельнічаў ва ўсіх раённых сходах ды канферэнцыях; у вучэбцы ваенных повараў, калі намеснік камандзіра ўзвода ўбачыў ягоную характарыстыку, адразу ж прызначыў-выбраў Радзевіча кіраваць перадавой моладдзю падначаленай баявой адзінкі. Але ў войску гэтая арганізацыя была яшчэ больш фармальнаю структурай, чым у цывільным жыцці: людзі займалі пасады, але нават не імітавалі ніякую дзейнасць. Таму, калі хлопцы пераехалі ў батальён сувязі, Радзевіч, адзіны камсамолец з трох новых кухараў, прынцыпова не стаў ні на які

ўлік, тым больш што той лейтэнанцік, які ўзначальваў пярвічную арганізацыю ў частцы, і зусім не цікавіўся прыналежнасцю хлопцаў да ўсесаюзнага ленінскага камуністычнага саюза…

Міхал ледзь стрымаўся, каб не зарагатаць ад адной толькі думкі, што ў гаспадарчым узводзе ёсць нейкая там камсамольская арганізацыя. Відаць, па інерцыі, калісьці, яшчэ ў антычныя часы, у войску было прынята імітаваць усесаюзную любоў моладзі да камуністычнай партыі, праводзіць урачыстыя сходы, на якіх клясціся-абяцаць быць вернымі спадкаемцамі слаўных баявых традыцый ды непарушных ленінскіх ідэалаў, кляйміць-ганьбаваць усемагчымых знешніх і ўнутраных ворагаў! Карацей, традыцыйна казаць начальству прыгожую хлусню замест вельмі непрывабнай праўды… Гэта такая гульня: і начальства ведае, што ўсё, мякка кажучы, зусім не так, і моладзь у курсе, але традыцыя абавязвае — усё павінна быць прыгожа, гарманічна і ніяк інакш! Падвоеная такая мараль: гаварыць супрацьлеглае таму, што думаеш і бачыш на свае вочы, выдаваць жаданае за сапраўднасць…

Але ўявіць падобную карціну цяпер, калі ў выніку палітыкі галоснасці ды дэмакратызацыі сродкі масавай інфармацыі ўжо даўно давялі да самых адсталых і несвядомых прадстаўнікоў моладзі ўсю камічную няздатнасць камсамола, было немагчыма!

Яны што, газет не чытаюць?

Зрэшты, паверыць, што чытаюць, было яшчэ складаней.

Яны чытаць хаця б умеюць?

— Тады на сёння ўсё, валіце да сябе! — падвёў вынік допыту Толік.

Аднак хлопцаў не пакінулі ў спакоі і гэтай ноччу. Спачатку ў кубрыку чарпакі паспрабавалі таксама да-

ведацца, чаго кухараў насіла ў штаб, але з імі Радзевіч не стаў цырымоніцца: каму трэба, той ведае, не вашая справа! Затым дзяды паклікалі Лёху Камарова. Той вярнуўся праз дзесяць хвілін і запрасіў Міхала і Ваціка ў бытавы пакой, быццам падшываць гімнасцёркі дзядоў.

Адзежу дзядоў ён насамрэч прынёс, але адразу ж паведаміў:

— Далі заданне прасачыць за вашай рэакцыяй: згадзіцеся дапамагчы ці не. Сказалі, каб любымі хітрыкамі выведаў, выклікаў вас Філіпенка ці самі паперліся. Абяцалі, калі высветлю, расшпіліць. Усе, акрамя Толіка, хацелі вас пабіць, але той запалохаў іх дысбатам.

Радзевіч моўчкі ўзяўся за працу і толькі пабойваўся, каб Вацік не нагаварыў нічога лішняга. Шпачок, на шчасце, маўчаў…

Калі кіцелі былі гатовыя, Лёха аднёс іх у дзедаўскі кубрык. Назад вярнуўся разам з Малчанавым, і той раптам нечакана пацікавіўся:

— А пайка будзе?.. Дзядулі жадаюць перакусіць!

— Мы нічога не прынеслі. Сёння ніяк не атрымалася, — адказаў Міхал.

Ён адчуў нейкую двухсэнсоўнасць становішча: нядаўна адпусцілі, цяпер нешта есці ім прыперла.

— Нават гарбаткі не зробіце? — удакладніў дзед Лёха.

— Нічога няма.

— Каб у гаспадарчым узводзе нічога не было, такога не бывае!

Малчанаў выцягнуў з кішэні вялізную звязку ключоў і пакруціў ёю на бліскучым металічным ланцугу.

— У нашым распараджэнні ўсе прадукты батальёна, а ты кажаш — нічога няма!

Міхал яшчэ цалкам не разумеў, да чаго вядзе Лёха, але прадчуваў, што да нечага, як заўсёды, нядобрага.

— Вось гэта ключ ад харчовага склада. Зойдзеце, адчыніце замок, уключыце святло і адразу за сталом кладаўшчыка ўбачыце шафу. У ёй на другой паліцы адкладзена ўсё, што трэба: два боханы хлеба, заварка, цукар і кавалак масла… Усё проста! Толькі галоўнае — не трапіцца на вочы патрулю і пячатку зняць і вярнуць на месца па магчымасці ашчадна, каб не бачна было пашкоджанняў.

Малчанаў нахабна пасміхаўся: ну, як мы вас!

Гэта была стоадсоткавая «падстава»: непрыкметна перайсці туды-сюды праз увесь добра асветлены ваенны гарадок, зняць і не пашкодзіць пластылінавую пячатку — за што само па сабе прадугледжаны тэрмін у дысбаце, — вынесці прадукты і не трапіцца ў рукі патруля было немагчыма!

Лёха працягнуў Радзевічу ключы:

— І яшчэ: калі зловяць, скажыце, што захацелі есці і выцягнулі ключы ў кладаўшчыка!..

Міхал нават не ведаў, хто цяпер кладаўшчык: Бандарэнка даўно звольніўся, а Малчанаў па-ранейшаму кіроўца. Хацеў сказаць яму, што прыдумка пра тое, як згаладнелыя кухары — а пасылалі толькі Міхала з Вацікам, Лёха Камароў заставаўся ў казарме — ноччу павалакліся ўскрываць харчовы склад, — смеху вартая і цягне хутчэй на танны анекдот, чым на рэальна магчымую сітуацыю, але не стаў: пасылаюць жа зусім не па ежу! Галоўная задача — «падставіць» кабаноў, а тады, што б яны ні казалі, ім не будзе веры!..

Ад казармы да сталоўкі метраў дзвесце — гэта недзе траціна адлегласці да склада. Калі затрымаюць на гэтым кавалку шляху, яшчэ можна будзе выкруціцца — напрыклад, прыйшлі ў казарму і ўспомнілі, што нешта не зрабілі ў сталоўцы: не ўключылі пáру, не выключылі пліту ці патэльню… На зваротным шляху, калі зловяць

паміж сталоўкай і казармай, можна будзе сказаць, што вяртаемся ў казарму значна пазней, чым звычайна, бо было зашмат працы… Аргументы, зразумела, так сабе, але ўсё ж лепей, чым ніякіх… Куды горш, што не існуе ніякіх апраўданняў на ўдвая большую за першую частку шляху: ім абсалютна няма чаго знаходзіцца пасярод ночы паміж сталоўкай і складам!

Выйшлі на вуліцу і ўздоўж сцяны прасунуліся да рога казармы — усё ціха, нідзе нікога не бачна. Цяпер самы асветлены кавалак — паміж двума найбліжэйшымі будынкамі: праезджая частка з ліхтарамі, з левага боку ў метрах пяцідзесяці КПП у парк, справа на такой самай адлегласці галоўны КПП, на якім яшчэ болей людзей — там акрамя днявальных можа адпачываць патруль ці нават зайшоў дзяжурны па частцы... Застацца не заўважанымі ні з аднаго паста было практычна немагчыма! Значыцца, перапаўзаць ці перабягаць гэты ўчастак бессэнсоўна: наадварот, трэба яго перайсці абсалютна спакойна, як удзень.

Рушылі. Рэдзенькія кусцікі бэзу, дарога, палоска зеляніны — газон ля сталоўкі, мур з брукаваным адлівам-тратуарам пад ім… Якраз сярэдзіна будынка. Цяпер дабрацца да краю і павярнуць за рог, там цёмна, можна нават перадыхнуць хвіліну…

Як толькі хлопцы ступілі ў цень ад бакавой сцяны сталоўкі, з цэнтральнага КПП данёсся гучны шматгалосы вокліч:

— Гол!!!

Халера, яны там што, футбол глядзяць?

Міхал шчыра пазайздросціў тым, хто цяпер сядзіць ля тэлевізара і любуецца матчамі чэмпіянату свету! Адна восьмая ўжо напэўна!

Калі хлопцы былі гатовыя пайсці далей, рыпнулі дзверы на КПП у парку. Яно цяпер было ад іх зусім блізка, якіх-небудзь метраў пятнаццаць-дваццаць. На парозе паў-

стаў цёмны сілуэт, які не зачыніў за сабою дзверы, зрабіў некалькі няўпэўненых крокаў і нахіліўся да зямлі, быццам нешта спрабаваў на ёй разгледзець у цемры. Да кухараў данесліся выразныя гукі: чалавек ванітаваў. З КПП незадаволена крыкнуў другі днявальны:

— Ты што, не мог далей адысці!

— Я прыбяру, — адказаў першы голасам чалавека на добрым падпітку.

Ён яшчэ пастаяў некалькі хвілін на вуліцы. Хлопцы чулі, як днявальны прагна ўдыхае свежае паветра. Нарэшце ўсё ж павярнуўся і сышоў назад на пост.

І не баяцца ж нічога!

Як ні дзіўна, найбольш адкрытая частка гарадка — пляц — ноччу аказалася практычна поўнасцю ахінутая цемрай: цудоўна, па ім можна прайсці непрыкметна ледзь не да самага склада, толькі ўздоўж дарожкі і ля тарцовай часткі будынка, дзе ўваход у падвальнае памяшканне, у якім захоўваюцца прадукты, гараць ліхтары.

Ці Малчанаў сам не ведаў, які ключ ад вісячага замка на дзвярах склада, ці Радзевіч, пакуль дайшлі, забыў — давялося перабіраць усю звязку. Па законах жанру падышоў ледзьве не апошні. Як Міхал ні стараўся, выцягнуць ніткі з-пад пластылінавага камяка, на якім стаяла пячатка, і не парушыць на ім малюнак, не атрымалася: нічога не паробіш, потым разбярэмся.

Увайшлі на склад і прычынілі за сабою дзверы. Радзевіч ліхаманкава абмацаў сцяну ля ўвахода, знайшоў выключальнік: дзіўна, на ім была не звычайная клавіша, а такая самая круцёлка, як на ўключальніках у бабуліным доме, цяпер такія не робяць. Міхал уключыў святло. Адкладзеныя прадукты знайшліся там, дзе і казаў Малчанаў. Распіхалі іх у рукавы: кожнаму па бохане, заварку і цукар Вaціку, Радзевічу паперчыну з падталым маслам…

Цяпер выбірацца. Усё ў зваротнай паслядоўнасці. Толькі ж што рабіць з пячаткай? Міхал выкалупаў ключом увесь кавалак пластыліну са звычайнага бляшанага корка ад пляшкі, які цвіком быў прыбіты да дзвярной каробкі: адзін канец падвоенай доўгай сінтэтычнай ніткі мацаваўся да ручкі дзвярэй унутры памяшкання, другі выцягваўся на вуліцу і прыкладаўся да корка, зверху накладаўся кавалак звычайнага пластыліну, на які ставілася спецыяльная пячатка. Такім чынам, адчыніць дзверы і не сапсаваць адбітак на пластыліне было немагчыма... Радзевіч заклаў нітку ў корак, зверху расціснуў пальцам пластылін, сунуў руку ў кішэню і выцягнуў манету, якая па дыяметры больш-менш супадала з пячаткай: дзесяць злотых, «ожэл бялы»* ў цэнтры і надпіс па краі «POLSKA RZECZPOSPOLITA LUDOWA»**, з адваротнага боку профіль знакамітага земляка: ADAM MICKIEWICZ***; прыклаў арла да пластыліна, націснуў на барэльеф: даруй, паэце! Няхай хоць так: усё ж лепей, чым нічога, можа і не заўважыць ніхто...

Як толькі выйшлі на асветленую дарогу, адразу ж пачулі выгук, які несумненна адрасаваўся ім:

— Стаяць!

З пляца падыходзілі тры постаці: патруль. На чале нехта ў афіцэрскай фуражцы: вось і ўсё!

— Гэта ж кухары, таварыш прапаршчык! — азваўся адзін з патрульных.

Прапаршчык выявіўся добра знаёмы з узвода рамонтнікаў: ён нярэдка бываў у нарадзе па сталоўцы.

— Чаго не спіце? — абсалютна спакойна пацікавіўся старэйшы.

---

* Белы арол *(пол.)*.

** Польская Народная Рэспубліка *(пол.)*.

*** Адам Міцкевіч *(пол.)*.

Тое, што ў хлопцаў нешта прыхавана пад кіцелямі, патрульныя не ўгледзелі.

— Вось, ідзем у казарму, — як мог спакойна адказаў Радзевіч.

— Дык ваша ж у супрацьлеглым баку! Вы што, заблудзіліся? — прапаршчык відавочна кпіў.

Што і казаць: тлумачэнне атрымалася бязглуздае, іх тут сапраўды не павінна быць!

— Старшына казаў, што цяпер повары будуць жыць у ПУСах, — неспадзявана азваўся той жа хлопец, які першым іх пазнаў.

Халера! Дык гэта ж той самы, мой вадзіцель, як яго там: Алег!

— А-а! Тады зразумела! — падобна, што прапаршчык зусім не пераймаўся, што кухары былі ўдвух: першы ПУС жыў у той самай казарме, што і гаспадарчы ўзвод, гэта да размяшчэння другога вузла сувязі заставалася два крокі. А па два повары ніколі не замацоўваліся за адным ПУСам. — Чаго ж так позна?

— Ды навалілася нешта ўсяго, — выкручваўся Радзевіч, — ялавічыну нейкую старую выдалі на сняданак, замучыліся рэзаць!

— Дык раніцай мяса лепей не есці?

— Лепей не трэба!

— Добра, што сказалі! А то я пажэрці люблю! Што ж, давядзецца на сняданне абысціся толькі гарбаткай!.. Ідзіце ўжо, а то вам паспаць застаецца нейкіх пару гадзін!

Шпачок тарганууся ў бок сталоўкі, давялося хапаць яго за рукаў і цягнуць у супрацьлеглым напрамку. Выглядала падазрона, але прапаршчык ніяк не адрэагаваў, павярнууся і пайшоў моўчкі, патрульныя пасунуліся за ім следам па асветленай дарожцы. На шчасце, яны рушылі не ў бок другога ПУСа: у адваротным выпадку ку-

харам давялося б увайсці ў чужую, абсалютна незнаёмую казарму, і ніхто не ведае, што іх там магло чакаць...

У адно імгненне Радзевіч скочыў у цень вялікага дрэва на краі пляца і павалок за сабой Ваціка. Патрульныя не азірнуліся. Цяпер яны былі як на далоні ў повараў, але самі бачыць беларусаў не маглі: ні даць ні ўзяць падпольшчыкі і паліцаі ў акупаваным Мінску.

Паліцаі рушылі па дарожцы, а падпольшчыкі ішлі следам па ахінутым цемрай пляцы.

На скрыжаванні ля цэнтральнага КПП патруль спыніўся. Цяпер кухары назіралі за ім з-за рога сталоўкі.

Прапаршчык нешта сказаў падначаленым — чуваць не было, — і працэсія пайшла ў бок парку.

Адлегласць паміж двума КПП невялікая: метраў сто — сто пяцьдзясят. Куды рушыць патруль ад паркавых варотаў, невядома. Раптам у бок казармы ці зусім засядуць у курылцы — што тады рабіць? Яны там могуць і да раніцы праседзець! Яны ж у бушлатах, ім цёпла! Заставалася толькі дачакацца, калі патруль дойдзе ўздоўж мура сталоўкі да сярэдзіны, і перабегчы на другі бок дарогі да рога казармы. Толькі б ніхто не выйшаў з цэнтральнага КПП і не было чуваць тупату ботаў…

Калі іх затрымаюць другі раз, наўрад ці нешта ўратуе ад грунтоўнага разбіральніцтва з даволі прадказальнымі наступствамі!..

— Пайшлі! — шэптам скамандаваў Міхал самому сабе і Ваціку.

Газон, праезджая частка, кволыя кусцікі бэзу… І калі ўжо Вацік, які рухаўся наперадзе, схаваўся ў цень за рогам казармы, адзін з патрульных азірнуўся і адразу ж сутыкнуўся паглядам з вачыма Міхала! На шчасце, гэта быў той самы Алег, ягоны кіроўца, які сёння ўжо адзін раз уратаваў хлопцаў, — хто-хто, а ён, у адрозненне ад

прапаршчыка, цудоўна ведаў, што да іх у казарму мог ісці толькі адзін повар! Радзевіч заўважыў, як кіроўца шчыра разгубіўся і стаў як укапаны: што тут урэшце адбываецца?! Міхал прыклаў да вуснаў указальны палец: ціха, так трэба, потым растлумачу! І скочыў у цень.

— Што там? — другі жаўнер звярнуў увагу на Алега.

— Так, нічога, падалося.

Патруль рушыў далей, а кухары ціхенька ўвайшлі ў казарму.

Тры гадзіны! Міхал зірнуў на гадзіннік ля тумбачкі днявальнага.

Ніхто не спадзяваўся, што кабаны вернуцца: усе паклаліся спаць. Нават вечна галодны Малчанаў хроп, бы пшаніцу прадаўшы! Хлопцы склалі прадукты да яго ў тумбачку: мо раніцай зжарэ! Міхал крыху павагаўся, выцягнуў шуфляду з дзедаўскай тумбачкі і паклаў туды звязку ключоў: праз паўтары гадзіны яны з Вацікам сыдуць у сталоўку гатаваць сняданак, няхай пасля пад'ёму павысвятляюць дзядулі з чарпакамі, дзе ключы ад харчовага склада. Зрэшты, дзе-дзе? У дзяжурнага па частцы, дзе ж яшчэ, кабаноў жа злавілі!

Калі хлопцы прыйшлі ў свой кубрык, за вокнамі ўжо было светла, а вулічныя ліхтары згаслі: чэрвеньскія ночы кароткія, маглі і не паспець да світання!

# XV

Днявальны разбудзіў Міхала і памкнуўся да Ваціка.

— Пачакай! Не чапай яго зараз! Няхай паспіць. Я адзін спраўлюся. Калі не забудзешся, уздымі яго хвілін за дзесяць да пад'ёму: падчас раздачы лішнія рукі не пашкодзяць.

Апошняя просьба была хлуснёй: Радзевіч лёгка справіўся б з раздачаю і адзін, ён проста хацеў, каб Вацік пазбегнуў раніцай гаворкі з дзядамі, каб тым засталося незразумела, злавілі ці не кухцікаў ноччу і ў каго цяпер ключы ад склада.

Шпачок з'явіўся ў сталоўцы да таго, як з вуліцы пачуўся тупат ботаў: значыцца, разбудзілі да пад'ёму, як і прасіў Радзевіч.

— Ну, як ты? — пацікавіўся ў яго Міхал.

— Нязвыкла неяк: даўно ўжо так не высыпаўся.

Яшчэ не скончыўся сняданак, калі прыйшоў Саня Купрыянец і Вацлаў павёў яго ў падвал: можа, атрымаецца злавіць Антонава і прадставіць новенькага, няхай выдае яму чысты камплект адзення. А калі начальніка сталоўкі няма, то трэба будзе пакапацца ў кухарскім пакоі: можа, там яшчэ знойдзецца нешта прыдатнае.

Міхал павольна вымыў пустыя катлы, вычысціў малую электрычную патэльню.

Прыйшоў дзяжурны па сталоўцы, забраў некалькі хлопцаў з нарада, узброіў іх вялізнымі жалезнымі насілкамі і алюмініевымі каструлямі і павёў на склад па прадукты да абеду.

Зараз пачнецца!

Пачалося ўжо праз хвіліну, нарад не здолеў бы за гэты час і ста метраў прайсці: у варачны ўляцеў увесь нейкі ўскудлачаны, мітусліва-ўзбуджаны чарпак з гаспадарчага ўзвода, імя якога Радзевіч не ведаў, і адразу кінуўся да кухара:

— Дзе ключы?!

— Якія ключы? — Міхал наўмысна трымаўся падкрэслена абыякава.

— Ад склада!

— Ад якога склада?

— Ад харчовага, якога ж яшчэ!

— У кладаўшчыка, мабыць.

— Я кладаўшчык!

— Дык што ты ад мяне хочаш?

— Учора Лёха Малчанаў вам іх даваў!

— Ён сказаў, што гэта галодныя кабаны ў кладаўшчыка іх скралі.

— Ну, хопіць ужо! Дзе ключы?

Радзевічу карцела адправіць яго да дзяжурнага па частцы ці да таго прапаршчыка, які камандаваў патрулём, але, відавочна, гэта пацягнула б за сабой дадатковую блытаніну і разбіральніцтвы.

— Каму аддаў, у таго і пытайся.

— Ён кажа, што ў яго няма!

— Ён што, нямыты ходзіць, у тумбачку раніцай не зазіраў?

— У тумбачцы, значыць!

Кладаўшчык маланкай вылецеў з варачнага цэха.

Радзевіч хацеў пайсці ў кухарскі пакой, але на парозе кухні з'явіўся Паша Герасімаў.

— Нічога не чуў? — пацікавіўся хлебарэз.

— У сэнсе?

— Днявальны са ўзвода прыбег, сказаў, што Махмуда Філіпенка выклікае. Не ведаеш, з чаго б гэта?

— Не ведаю, — паспрабаваў захаваць абыякавасць Радзевіч, хоць сам адразу ж падумаў: пачалося!

— Фельд'егерскі повар прыйшоў, ведаеш хто? — перавёў Міхал гаворку на іншую тэму.

— Не, не ведаю. Мне іхныя, калі бралі хлеб, даўно яшчэ казалі, што камандзір прывёз некага з Явара.

— Саня Купрыянец. Ён быў у першым узводзе.

— Не, не памятаю. А адкуль ён?

— Уяўляеш, беларус з Абхазіі! Я ў шпіталі, калі быў, пазнаёміўся з украінцам абхазскім! І што яны туды ўсе пруцца?

— Там мора і цёпла! Я і сам там пажыў бы з радасцю. Трэба будзе хаця б у госці напрасіцца.

Міхал згадаў, што ён ужо запрошаны, але выхваляцца не стаў.

Калі сябры вырашылі спусціцца ў падвал, напаўдарозе іх дагнаў хлопец з нарада:

— Паша! — выгукнуў ён неяк надта ўсхвалявана. — Там цябе Махмуд шукае!

— Дык у яго ж ёсць ключ.

— Не, яму ты тэрмінова патрэбны!

— Халера! Ні хвіліны спакою!

Герасімаў пайшоў наверх, а Міхал — у кухарскі пакойчык уніз.

Можа, так з якой нагоды выклікалі таго Махмуда?

— Антонава няма, — паведаміў Вацік, калі ўвайшоў Радзевіч. — Я тут нешта знайшоў, на першы раз сыдзе.

Міхалу чамусьці стала няёмка перад Купрыянцам за тую брудную вопратку, якую знайшоў Вацік:

— За ўвесь час толькі раз у пральню адвозілі, — пачаў ён апраўдвацца. — Мы ўжо і самі кіпяцілі, дык начальніку сталоўкі нават парашку пральнага цяжка знайсці! Адзін камплект з хлоркай паспрабавалі пракіпяціць, дык ён рассыпаўся, калі высах! А ў варачным жа па вялікім рахунку толькі дзень і можна пратрымацца ў адных фартуху і кашулі: то тут, то там усё адно да нечага дакранешся ці абпырскаеш! Ды і нагавіцы пэцкаюцца імгненна!

— У Антонава навюткага адзення поўна, — падключыўся Шпачок, — толькі ён усё эканоміць, беражэ на

выпадак праверкі ці з'яўлення ў сталоўцы якога-небудзь генерала!

Міхал распавёў пра сваё знаёмства ў шпіталі з украінскім абхазцам Санем Каваленкам.

— Ты бачыў Тоўстага! — шчыра здзівіўся Купрыянец. — Як ён?!

Радзевіч імгненна згадаў іншага Тоўстага, Андрэя Савіцкага, з якім пазнаёміўся на перасылцы ў Барысаве, а потым сустрэўся ў батальёне разведкі: што ж, тыя, хто даў хлопцам мянушкі, фантазіяй не вызначаліся, што ў Абхазіі, што ў Беларусі. Андрэй, праўда, не згадваў, як яго звалі да войска.

— А ты яго ведаеш?

— Не тое слова! Мы аднакласнікі і суседзі! Усё жыццё разам! Толькі ў войску і разлучыліся ўпершыню!

— Служыць пантоншчыкам. А ў шпіталі апынуўся праз пнеўманію!

— О! Гэта ў ягоным стылі, усё не як у людзей: улетку ды захварэць на пнеўманію, толькі Тоўсты здатны на нешта падобнае!

— І яшчэ! Давядзецца змяніць мянушку: ён цяпер худы, як трэска!

— Не можа быць!

— Ён мне казаў, што да войска быў тлустым, — я не мог паверыць!

— Ачмурэць! І хто б мог падумаць!

У пакой увайшоў збянтэжаны Паша і знерухомеў ля парога:

— Іх усіх пераводзяць у другую частку…

— Каго? — не стрымаўся Саня.

— Усіх дзядоў з гаспадарчага ўзвода!

— Не можа быць! — цяпер ужо здзівіўся Радзевіч. — З чаго б гэта?!

— Махмуд сказаў, што на іх нібыта «стукнулі». Прыбег, загадаў мне апрануць кіцель і расшпіліў! Яму далі пяць хвілін, каб забраць са сталоўкі свае асабістыя рэчы. Я цяпер не кабан!

— Нічога сабе! — выгукнуў Вацлаў.

Міхал ліхаманкава спрабаваў зразумець, ці ёсць у яго з Вацікам хоць нейкі шанц, што падумаюць не на іх.

— А што яшчэ ён сказаў? — не стрымаўся Радзевіч.

Герасімаў адказаў не адразу, нібы спрабаваў успомніць:

—Ты ж ведаеш, як ён гаворыць! Я і паловы ніколі не разумеў, толькі ківаў на знак згоды, а сам ні халеры не цяміў! «Воры, сволочи», — гэта я пачуў выразна. Што ім цяпер капец — таксама. Але хто яны, не ўцяміў абсалютна… Можа, ён начальства меў на ўвазе?

— Можа, — абыякава адказаў Міхал і звярнуў увагу, як спалатнеў Вацік: ён таксама, відаць, зразумеў, што ніякім не зладзеям (па-руску «ворам»), а «поварам» цяпер капец!

Час быў уздымацца наверх і гатаваць абед.

Паша сышоў у хлебарэзку, а хлопцы распачалі завіхацца ў варачным.

І хоць Саня яшчэ нічога не ўмеў і яму даводзілася ўсё паказваць і тлумачыць, утрох абед прыгатавалі без звычайнай мітусні і нерваў: вось бы так заўсёды!

Радзевіч, аднак, ні на хвіліну не забываў, што сёння адбылося ў гаспадарчым узводзе, і чакаў далейшага развіцця падзеяў. У тым, што яно будзе, Міхал не сумняваўся. Вось толькі якім яно атрымаецца для яго з Вацікам, ніяк здагадацца было немагчыма…

Толькі ўвечары, калі ў нарад па сталоўцы прыйшлі хлопцы з другога ПУСа на чале са сваім старшыною, вечна крыклівым і злым старшым прапаршчыкам Меліхавым, перамены набылі нечаканы паварот.

— Віншую, таварышы кухары! — выпаліў старшына, як толькі ўвайшоў у варачны цэх. — Ад сёння вы жывяце ў ПУСах! Ты, — тыцнуў ён пальцам у Ваціка, — у першым! А ты, — зазірнуў у вочы Міхалу, — у мяне! Усе вашыя рэчы ўжо ад гаспадарнікаў перанеслі, таму пасля адбою, калі ласка, як кажуць, міласці просім на новае месца дыслакацыі, так сказаць! Радыя?! Я даўно казаў, што трэба, каб кухары жылі ў сваіх падраздзяленнях! А то што гэта такое: ПУС уздымаюць па трывозе, а за поварам, як за афіцэрам якім, у гаспадарчы ўзвод пасыльнага трэба пасылаць! Нідзе такой бязглуздзіцы не бачыў! Цяпер усё стане як мае быць! Між іншага: на гэтым тыдні трывога чакаецца! Толькі я вам нічога не казаў!

Прапаршчык крутануўся і пабег крыкамі ды выспяткамі прыспешваць нарад.

Ашаломленыя кухары не ведалі, што і думаць: бясконцыя расповеды дзядоў пра тое, як ім пашчасціла, што яны трапілі ў гаспадарчы ўзвод, дзе да кабаноў ставяцца нечувана мякка ў параўнанні з ПУСамі, не прайшлі дарма. Атрымоўвалася, што яны змянілі дрэннае на горшае. Але галоўнае мэты яны ўсё ж дасягнулі: Пунтус цяпер далёка, і тое, што здарылася з Вацікам, больш ніколі з ім не паўторыцца. За гэта можна і папакутаваць.

Пунтус. Нейкае таксама беларускае прозвішча. Раней і не задумваўся. Адкуль жа ён быў?.. Як прыемна цяпер: быў. З Браншчыны? Далібог, адтуль… Тады ўсё зразумела з прозвішчам…

Вацік тым часам намагаўся справадзіць Саню Купрыянца, відаць, каб сам-насам перагаварыць з Міхалам.

— Калі заўтра прыходзіць? — пацікавіўся на развітанне абхазец.

— Не хочаш рабіць зарадку, дык скажы сваім, каб разбудзілі за пятнаццаць хвілін да пад'ёму, і прыходзь сюды, — параіў Радзевіч.

— Лагічна! — зазначыў Саня і пайшоў.

Ён сёння цэлы дзень паўтараў гэтае «лагічна», дзе трэба і не трэба. Усё ў яго лагічна: вось так нож трымай, каб не парэзацца, — лагічна; суп перад тым, як наліваць у кацялок, перамяшай, каб больш-менш аднародны быў, — лагічна; ля патэльні асабліва глядзі, каб гарачэнны тлушч не стрэліў: апячэшся — лагічна! Толькі вакол нас з Вацікам пакуль усё алагічна складваецца. А ўвогуле Саня, відаць, неблагі хлопец…

— І што цяпер? — спытаў прыкметна збіты з панталыку Вацік. — Гэта добра ці дрэнна?

— Думаю, горш, чым было, не будзе…

— Трэба было б у хлопцаў параспытваць… А двух кухараў у адзін ПУС нельга было накіраваць?

Міхал зразумеў, што Вацік найперш баіцца застацца адзін сярод практычна незнаёмых людзей.

— Супакойся ты ўжо! Ты туды ўсё адно толькі пераначаваць будзеш хадзіць! А там ужо — што ўсім кабанам, тое і табе! Час станавіцца самастойным, на ўсё жыццё нянек не напасешся!..

— Ну што, кабаны, вешайцеся!

Хлопцы і не заўважылі, як да іх падышоў Лёха Камароў. Цяпер ён быў з расшпіленым кручком на каўняры і аж ззяў ад задаволенасці сабою.

— Нашыя дзядулі выбылі ў невядомым кірунку. Як сказаў Філіпенка: «Туды, дзе Макар цялят не пасвіў!» Мяне на развітанне расшпілілі! Так што маё кабанства скончанае! Пра вас жа наказалі мне ды чарпакам распавесці ўсім у батальёне, што вы нарабілі!..

Лёха зрабіў працяглую паўзу, відаць, каб ацаніць выкліканую рэакцыю. Аднак ніякай рэакцыі кухары не выявілі, і ён працягнуў:

— Што тычыцца мяне, дык туды ім і дарога, калі што! Нават калі гэта і вы «стукнулі», мне на вас крыўдзіцца няма ніякай прычыны! А вось чарпакоў вы нашых ведаеце, яны вам спуску не дадуць, і не спадзявайцеся, самі разумееце: дрэнны прыклад для іхных кабаноў, якія на днях ужо прыйдуць ва ўзвод!

З Лёхавых словаў вынікала, што ўсё ж дакладнай прычыны, за што дзядоў звезлі, ніхто не ведае. Можа, нават у Амросьева хапіла мазгоў, калі ведаў, у гэтай сітуацыі прамаўчаць...

— Ігар у нас цяпер будзе замком!* А Толік Садоўнічы — хлебарэзам!

— Дык яго пакінулі?! — здзівіўся Міхал.

— Аднаго з усяго перыяду!

Лёха паазіраўся вакол: раптам хто слухае; і працягнуў шэптам:

— Нешта тут нячыстае... З чаго б раптам яго пакідаць? Чым ён лепшы за іншых? Ён жа намеснік камандзіра, за ўсё, што адбываецца ва ўзводзе, ён найперш адказны! Чарпакі нават паціху казалі, што сяржант сам мог Філіпенку закласці сваіх, каб яны не давялі нас да адчаю: калі б дзяды каго-небудзь з нас пакалечылі, хто б найперш адказваў? Толік жа сцыкло, гэта ўсе ведаюць!

Ну, капітан Філіпенка, відаць, з логікай у вас усё ў парадку, і з шахматамі таксама!

Бесклапотна-шчаслівы Камароў сышоў, а Радзевіч пацікавіўся ў Ваціка:

* Скарачэнне ад руск. «заместитель командира» — намеснік камандзіра ўзвода.

— Цяпер зразумеў, што трэба казаць занадта цікаўным?

— Што? — ці то пажадаў удакладніць, ці то і сапраўды не зразумеў Шпачок.

— Пра тое, што Толік — сцыкло: яму гэта наўрад ці пашкодзіць, а нам можа дапамагчы!

Паглядзім, як сяржант будзе цяпер сябе трымаць з кабанамі: у сталоўцы ўсё адно кожны дзень давядзецца бачыцца.

Калі скончылася вячэра і кухары перамясціліся ў мясны цэх, каб абцяць мяса з чарговай свіной паўтушы на сняданак, Вацік ужо паспеў выведаць сякія-такія звесткі пра жыццё ў ПУСах у хлопцаў з нарада і цяпер ахвотна дзяліўся аператыўнай інфармацыяй:

— У кожным вузле сувязі па два ўзводы. Усяго недзе крыху болей за шэсцьдзесят чалавек. Праўда, пакуль значна меней, бо яшчэ ўсіх, хто звольніўся вясною, не замянілі: літаральна на днях павінныя прыйсці кіроўцы пасля курса маладога байца, а ў жніўні ці верасні з вучэбак прышлюць сувязістаў. У першым ПУСе прыкладна аднолькавая колькасць чалавек кожнага перыяду, таму там дзедаўшчына проста квітнее, як мне сказалі, не горш, чым у гаспадарнікаў! А вось у другім усё інакш: там дзядоў не больш за дзесяць чалавек, недзе столькі ж ці на пару чалавек болей чарпакоў, а ўсе астатнія — кабаны! Калі дзяды толькі паспрабавалі на іх наехаць, тыя «стукнулі»! Самае смешнае, што пры такой колькасці кабаноў немагчыма старым высветліць, хто ж дакладна іх здае! Таму цяпер другі ПУС гулькаецца ў статутнае падраздзяленне: усе адзін да аднаго звяртаюцца выключна: «Таварыш салдат» і на вы! Першы ПУС лічыць іх усіх «чмошнікамі» і «стукачамі», у іх сапраўдная варожасць! Я і тое сёння заўважыў, як твае ў маіх нарад прымалі, думаў — паб’юцца.

Увайшоў Паша Герасімаў і паведаміў сябрам тое, што ўжо казаў ім Камароў:

— Заўтра пасля сняданку Толік становіцца хлебарэзам замест Махмуда.

І дадаў пасля паўзы тое, чаго не ведаў Лёха:

— Ён будзе адным хлебарэзам, а я іду да вас у кухары. Аднаму яму мала не падасца! Але нічога, няхай паўкалвае, дзядуля хрэнаў!

— Затое нас цяпер аж чацвёра! Можам скласці нармальны графік і гатаваць па чарзе! — узрадаваўся Вацік.

Недзе праз паўгадзіны пасля таго, як нарад па сталоўцы сышоў, усе справы на заўтра дарабілі кухары. Упершыню за час службы хлопцам трэба было разыходзіцца па асобных падраздзяленнях. Паша сёння таксама вырашыў пайсці ў казарму.

Радзевічу ў адзін бок, а Вацiку з Пашам у супрацьлеглы. Ім хаця б у адзін будынак, а Міхалу ў поўную невядомасць!

Міхал павольна сунуўся напрасткі праз чорнае поле неасветленага пляца і ўжо не першы раз перабіраў у думках тую інфармацыю, якую выведаў Вацік пра жыццё ў ПУСах. Усё адно ніякай пэўнасці не было. Ён сказаў Шпачку, што той можа заўтра не спяшацца: сняданак прыгатуе сам.

У новай казарме першым Радзевіча сустрэў дзяжурны па роце, малодшы сяржант з чарпакоў Андрэй, якога Міхал ведаў па нарадах у сталоўцы:

— О! Кухар! А я падумаў: дзяжурны па часці валачэцца! Усё нармальна!

Апошні вокліч адрасаваўся не Радзевічу: з ленінскага пакоя пачуўся гук тэлевізара. Відаць, дзяды і тут па начах не спяць.

— Цябе калі заўтра будзіць?

— У чатыры трыццаць.

— Запішы! — Андрэй звярнуўся да днявальнага на тумбачцы, якога Міхал таксама ведаў.

— Наіль! — сяржант гукнуў другога днявальнага, які дамываў у канцы калідора «ўзлётку». — Пакажы повару яго ложак!

Наіля Радзевіч таксама ведаў. Адразу зрабілася неяк спакайней.

— Хадзі сюды, Міхал, — паклікаў днявальны Радзевіча.

Ён нават маё імя ведае!

— Ты будзеш жыць у нашым кубрыку! У нас добра: толькі «асеннікі» тут жывуць. Вось твой ложак. Я сам хадзіў са старшыною да гаспадарнікаў па твае рэчы. Паглядзі ў тумбачцы: здаецца, нічога не забылі.

— Усё добра, — адказаў Міхал. — Нічога каштоўнага ў мяне там і не было.

Наіль сышоў. Усе вакол спакойна спалі. Радзевіч таксама ўклаўся ў ложак і яшчэ з паўгадзіны круціўся з боку на бок і ўслухоўваўся ў гукі з калідора: няўжо вось так проста яго пакінулі ў спакоі і ўпершыню за час службы ў батальёне сувязі дазволяць заснуць без усялякіх прыгодаў?..

Раніцай днявальнаму нават не давялося будзіць Радзевіча, бо ён так добра выспаўся, што прачнуўся самастойна!

Вацік, калі прыйшоў у сталоўку, таксама з радасцю паведаміў, што праспаў усю ноч!

— Дзяды мяне не чапалі зусім, а кабаны для іх хоць нешта і рабілі, але мне сказалі, што справяцца самі. Папрасілі толькі па магчымасці здабыць на вечар цукру ды гарбаты! Сказалі яшчэ, што чарпакі з гаспадарчага ўзвода сцвярджаюць, быццам мы стукачы, але яны гато-

вык самі мяне расшпіліць пасля дэмбелю дзядуляў, калі цяпер я буду ім дапамагаць здабываць прадукты! На гаспадарнікаў ім напляваць! Падобна, іх тут усе не любяць: блатныя!

Паша сказаў, што яму спатрэбіцца дні тры, каб усё ж увесці Толіка ва ўсе тонкасці няпростай хлебарэзнай справы.

— Абыдземся і без цябе! — аптымістычна зазначыў Вацік. — Вунь колькі я і зусім адзін спраўляўся.

Але праз два дні Меліхаў сказаў, што заўтра будзе трывога. Значыцца, кухары павінныя будуць са сваімі ПУСамі ўзняцца па сігнале, атрымаць зброю і бегчы ў парк, удзельнічаць у фармаванні аўтакалоны.

— Трымайся поруч са мной, я ўсё пакажу! — кінуў старшына да Міхала.

Такім чынам, Толікава навука на новай пасадзе скончылася на дзень раней: Паша і Саня ўпершыню павінныя былі гатаваць сняданак.

Пра трывогу ведалі ўсе. За дзесяць хвілін да ўмоўнага сігналу жаўнеры не толькі ўзняліся і апрануліся, а паспелі нават засцяліць ложкі.

Калі прагучаў сігнал, сувязісты нетаропка зайшлі ў пакой, у якім захоўвалася зброя, узялі свае аўтаматы, супрацьгазы і рэчыўныя мяшкі, выйшлі на вуліцу, пастроіліся і пабеглі ў парк.

У Радзевіча была задача прычапіць разам са старшыною бочку з вадою да машыны, у якой знаходзілася палявая кухня. Усяго было дзве машыны забеспячэння: у другой захоўваліся прадукты.

Калі бочку падчапілі, Міхал сеў у кабіну да Алега, а Меліхаў ускочыў у другі навюткі ЗІЛ з жалезным кунгам. Праз дзесяць хвілін яны ўжо стаялі ў доўгай калоне з практычна аднолькавых для неспрактыкаванага вока

аўтамабіляў, гатовай рушыць па сігнале ў любым напрамку. Насамрэч у кожным кунгу размяшчалася свая ўнікальная станцыя, здольная забяспечыць якаснымі, зашыфраванымі, абсалютна недаступнымі для ворага каналамі сувязі вялізную колькасць падраздзяленняў розных родаў войск. Прызначэнне кожнай станцыі хавалася за лічбамі, якія, акрамя спецыялістаў, ні пра што не казалі іншым: сто шэсцьдзесят першая, чатырыста трыццаць восьмая, сто шэсцьдзесят шостая...

— Як думаеш, паедзем ці не? — пацікавіўся Міхал у кіроўцы.

— Зараз будзе адбой! Калі выпраўляемся на выезд, таксама ўсе ведаюць. Да таго ж перад вучэннямі старшына харчы атрымоўвае на складзе. Так што сёння толькі адпрацоўвалі выхад у парк і фармаванне калоны. Цікава, хто сёння хутчэй справіўся: мы ці першы ПУС?

Сапраўды, праз трыццаць хвілін прагучала каманда «адбой» і калона была расфармаваная.

Пацягнуліся нязвыкла спакойныя і аднастайныя дні.

Нічога ад былога фанабэрыстага намесніка камандзіра гаспадарчага ўзвода ў Толіку не засталося: ён паводзіў сябе надзіва сціпла і добразычліва, ніяк не згадваў пра астатніх дзядоў, ледзь не па-сяброўску трымаўся з кухарамі.

Праз тыдзень батальён у поўным складзе ўсё ж выехаў на вучэнні. Першы і другі ПУСы рушылі ў розных напрамках.

Міхалу спадабалася сама даволі доўгая паездка ў кабіне ЗІЛа праз малыя і большыя паселішчы. Нейкую частку шляху ехалі па якаснай бетоннай аўтастрадзе, якую, як аўтарытэтна сцвярджаў Алег-кіроўца, збудавалі тут пры Гітлеры, і вяла яна на Берлін.

Разгарнуўся вузел сувязі дзесьці на самай мяжы з Германіяй у прыгожым старажытным лесе. Цяпер Радзевіч перазнаёміўся з усімі жаўнерамі, афіцэрамі і прапаршчыкамі.

Сярод дзядоў і чарпакоў большасць складалі расейцы з Масквы, Падмаскоўя і цэнтральных абласцей. Сярод жа кабаноў дзве трэці былі ўкраінцы, а трэць, па двятры чалавекі, — рускія, татары, узбекі і таджыкі. З Беларусі Міхал быў адзін.

Украінцы з заходнікаў паміж сабою размаўлялі толькі на роднай мове, а з усімі астатнімі па-руску, але з надта выразным акцэнтам. Яны шчыра здзівіліся, што Радзевіч іх без праблем разумее, і прыйшлі ў поўнае захапленне, калі ён пачаў з імі гаварыць па-беларуску: яны яго таксама выдатна разумелі. Жартам украінцы кпілі з «москалів», пагражалі расейцам тым, што, калі Украіна аб'яднаецца з Беларуссю, ім капец! Міхал не згаджаўся на падобнае аб'яднанне:

— Вас так шмат і вы такія спрытныя, што і нам тады капец! Лепей ужо паасобку! Будзем адзін да аднаго ў госці ездзіць!

Ніхто ні на каго не крыўдзіўся: ужо праз хвіліну «маскалі» і «хахлы» супольна цягнулі нялёгкую салдацкую лямку і зусім не надавалі ніякай перавагі ці палёгкі землякам.

А яшчэ старшына Меліхаў прывёз з сабою тэлевізар, і ўсе, хто хацеў, змаглі паглядзець фантастычныя гульні адной другой фіналу, а затым сёмага ліпеня — матч за трэцяе месца гаспадароў чэмпіянату свету з англічанамі, якія і перамаглі па пенальці. На наступны дзень зборная ФРГ з лікам 1—0 выйграла ў Аргенціны і трэці раз у сваёй гісторыі стала чэмпіёнам свету!

Што і казаць, відовішча было немагчымае, бо абсалютна супярэчыла ўсёй выхаваўчай рабоце вайсковых палітрукоў: недзе ў лесе, на захадзе Польшчы, ля самай мяжы з пакуль яшчэ фармальна падзеленай Германіяй натоўп савецкіх вайскоўцаў роў ад радасці за перамогу немцаў! Тых самых немцаў, з якімі ваявалі іхныя дзяды і якія, заходнія, па-ранейшаму прадстаўляліся прапагандыстамі выключна як спадкаемцы фашыстаў!

Сістэма па развіцці трывалага пачуцця нянавісці ўсё часцей давала збоі!

Радзевіч ад першай сустрэчы пабойваўся Меліхава: той заўсёды крычаў як рэзаны, мацюкаўся проста неверагодна складанымі маўленчымі зваротамі, нібы закончыў спецыяльны філалагічны факультэт нейкага адмысловага ўніверсітэта, і вельмі часта паскараў рухавасць асабліва запаволеных жаўнераў выспяткамі. Да кухараў, аднак, ставіўся даволі прыязна: мог прысесці побач, абсалютна чалавечымі словамі ды інтанацыямі распавесці якую-небудзь гісторыю. Прадметам асаблівага гонару і захаплення старшыны, па ўсім відаць, была ягоная дачка: як толькі ён згадваў сваю крывіначку, дык адразу ж пераўтвараўся з пачварнага двухметровага светла-русага монстра ў маленькага, надзіва сентыментальнага чалавечка, у голасе якога пачынала праяўляцца пяшчота, нейкія танюткі ноткі замілавання, і ніводнага не тое што грубага, але і без станоўчай эмацыйнай афарбоўкі слова ад яго не гучала:

— Яна такая прыгожанькая ў мяне…

У гэтую секунду ўсе слухачы нязменна напружваліся, бо не без страху чакалі, што прапаршчык ужыве параўнанне: «як я!».

— …Як сапраўдная маленькая каралеўна ці фея…

Чуць слова «фея» ад гэтага чалавека было настолькі нечакана, як «дзякуй богу» ад палітрука.

— ...Проста анёлак, а не дзяўчынка! Я прыходжу са службы, а яна сустракае мяне, у шчочку цалуе і кажа: «Татачка! Вось твае тапачкі! Адпачні хвілінку! Вось свежыя газеткі! Зараз будзем вячэраць!» І ўсё — стомы як і не было!..

Міхал думаў, што дачка была надта доўгачаканаю, таму і выклікае маленькая дзяўчынка такое захапленне ў немаладога ўжо старшыны.

На вучэннях Радзевіч хутка зразумеў, што ніхто з жаўнераў абсалютна не баіцца Меліхава: гэта ён знешне такі суворы ды шумны. Насамрэч ён выяўляў цуды вынаходніцтва, каб хоць крыху палепшыць побыт асабовага складу: недзе вышукваў дадатковыя матрацы, коўдры, падушкі, бо начаваць у палатках і ўлетку было досыць холадна; усімі праўдамі ды няпраўдамі павялічваў прапаршчык сціплы жаўнерскі паёк, меў запас адзення, ботаў, бялізны, чым пастаянна і дзяліўся з падначаленымі. Хлопцы, вядома ж, бачылі і цанілі шчыры клопат свайго старшыны, таму і гатовыя былі выслухоўваць ад яго любыя мацюкі-знявагі, атрымоўваць кухталі ды выспяткі, тым больш што яны, як і абразы прапаршчыка, насілі хутчэй эмацыйна-сімвалічны характар, чым мелі на самай справе хоць нейкае сапраўднае фізічнае ўздзеянне.

На вучэннях Міхал звярнуў увагу, што, як толькі выпадае рэдкая вольная хвіліна, старшына хапае ў рукі нейкую кніжку ў цвёрдай вокладцы, ашчадна загорнутую ў газету, і надзіва засяроджана чытае.

Сам факт таго, што Меліхаў умее чытаць, ужо выклікаў здзіўленне: настолькі ягоная знешнасць не стасавалася з друкаваным словам. Тым больш цікава было даведацца, што ён чытае. Радзевіч не хацеў пытацца,

а вырашыў напачатку паспрабаваць адгадаць, што можа чытаць гэты чалавек, хаця б якога плану літаратура яго можа цікавіць.

Пасля доўгіх узважванняў усіх «за» і «супраць» Міхал спыніўся на двух асноўных варыянтах: або гэта які-небудзь навамодны замежны дэтэктыў, якіх апошнім часам зашмат з'явілася на палічках кнігарняў і нават у шапіках «Саюздруку», або нейкі падручнік па невядомай яму спецыяльнай вайсковай дысцыпліне, кшталту «Арганізацыя жыццядзейнасці ва ўмовах ваеннага часу». У крайнім выпадку, як малаверагоднае выключэнне, Радзевіч дапускаў яшчэ варыянт таго, што старшына праявіў слабіну і ўсё ж узяў у свае рукі мастацкую кніжку пра вайну: што тыя пісакі бачылі ў жыцці!

Калі кніга засталася без нагляду, а шалёныя крыкі старшыны данесліся аднекуль з далекаватага ўзлесся і несумненна былі чуваць у бліжэйшых польскіх ды нямецкіх вёсках, кухар не без ваганняў усё ж наважыўся і зазірнуў на наступную, пасля загорнутай у газету вокладкі, старонку, на якой звычайна дублююцца прозвішча аўтара і назва. Тое, што ён там прачытаў, было настолькі немагчымым, неверагодным і дзіўным, што не магло быць праўдай ні пры якіх абставінах: «Марина Цветаева. Избранное». Гэта нейкая загадка, таямніца, невырашальны рэбус: дзе паэзія, тым больш такая складаная, не а-ля прыпеўкі пра правадыроў ды перадавікоў, а дзе Меліхаў!..

Радзевічу не хапала фантазіі, каб хоць неяк у думках наблізіць старшыну да Цвятаевай. Мо ён з кім-небудзь паспрачаўся, што зможа, адужае, прачытае... Ці ўсё ж катаванне паэзіяй — расплата за нешта, асабліва жорсткае пакаранне замест нейкіх там, напрыклад, дзесяці годзікаў дысбата.

Нейкі час пасля свайго адкрыцця Міхал і блізка не дапускаў думкі, што Меліхаў можа добраахвотна чытаць хоць нешта падобнае. Тым больш хлопец збянтэжыўся, калі аднаго разу прапаршчык пачаў задаваць яму нейкія дзіўныя пытанні:

— Ра-дзе-віч, — прагаварыў ён неяк прозвішча свайго падначаленага па складах, — дык ты дакладна беларус?

— Дакладней не бывае!

— Не паляк!

— Не. А што?

— І не з тых, што пытаннем на пытанне адказваюць, як вось цяпер?

— Гэта хто такія?

— Хіба не ведаеш?

— Не.

— Ну-ну… І продкі ўсе з Беларусі?

— Наколькі я ведаю, так…

З гэтых дзіўных роспытаў вынікала, што прапаршчык чытае тую кніжку цалкам асэнсавана, бо ведае факты біяграфіі знакамітай паэткі, пра якія ў зборніку вершаў, вядома ж, не згадваецца ні словам: рамантычна-трагічную сувязь Цвятаевай з Канстанцінам Радзевічам. У Міхала была добрая настаўніца рускай літаратуры, якую аніяк не стрымлівалі межы школьнай праграмы, і яна дазваляла сабе нечуваную вольніцу: знаёміць вучняў з творчасцю тых літаратараў, якія падабаліся найперш ёй, а не міністэрству асветы.

— А вы з казакоў? — пацікавіўся ў адказ Міхал у старшыны.

— Чаму ты так вырашыў?

— Рыгор Меліхаў.

— Што? Падобны?

— Абсалютна не!

— Чаму гэта?! — пакрыўдзіўся начальнік.

— Той чарнявы: татарская кроў! Вусаты!

— Скуль ты ўзяў, што татарская?

— Гэта не я, Шолахаў так вырашыў.

— Ты што, прачытаў «Ціхі Дон»?

— Прачытаў.

— Усю гэтую таўшчэзную кніжэнцыю? — удакладніў прапаршчык з недаверам.

— Усю.

— А я толькі кіно бачыў. Кніжка занадта вялікая, няма мне калі яе чытаць!..

— Ну, дык скуль вы?

— Так! З казакоў! Растоўскі я! У нас там усе казакі!..

Удакладняць прычыны цікаўнасці Меліхава да жыцця і творчасці Марыны Цвятаевай Радзевіч не рашыўся, бо знайшоў для сябе дастаткова лагічнае тлумачэнне: гэта найхутчэй элементарная даніна модзе. У Савецкім Саюзе з рэгулярнай перыядычнасцю ўзнікала мода, прычыны якой вытлумачыць немагчыма, на чытанне таго ці іншага аўтара: то Роберт Раждзественскі захапляў розумы ды сэрцы суайчыннікаў, то раптам абсалютна нечаспадзявана пачыналася сапраўдная эпідэмія Аляксандра Дзюма і чамусьці выключна бацькі, потым грамада кідалася на Яўгенія Еўтушэнку, якога зноў жа, быццам па нейкім цэнтралізаваным загадзе, змяняў той ці іншы савецкі ці замежны інжынер чалавечых душ, як тады часцяком называлі пісьменнікаў, нібы гэты збіты штамп найбольш дакладна вызначаў усю сутнасць мастацтва слова. Апошнія гады модным было чытаць забароненыя творы вядомых аўтараў. Ведаць творчасць пісьменнікаў, адна згадка пра якіх да перабудовы магла пагражаць немалым турэмным тэрмінам, цяпер лічылася адзнакаю выкшталцонага густу. Штодня газеты стракацелі імёнамі

адкрытых нанова геніяў. Ужо сам факт забароны ўспрымаўся як паказчык несумнеўнай значнасці ды якасці…

Калі скончыліся вучэнні і батальён прыбыў назад у Свідніцу, у пастаяннае месца дыслакацыі, Вацік з'явіўся ў сталоўцы не проста расшпілены: здавалася, ён выпраменьвае шчасце ў радыусе сотні метраў.

Высветлілася, што Шпачку ўдалося найперш, па яго ж словах, падлізацца да дзядоў: усяго некалькі дадатковых кавалкаў мяса ў іхных порцыях былі прызнаныя імі як сведчанне выключнай кемлівасці кабана.

— Уяўляеш, — трымаў ён справаздачу перад Міхалам, — якраз тыя тры галаварэзы, што збілі Гуцула, паставіліся да мяне ледзь не як да свайго «корыша»! Не такія яны ўжо і дрэнныя, — нечакана ўзяўся апраўдваць Гуцулавых катаў Вацік, — проста перабралі тады крыху лішняга. Да начальніка ПУСа таксама атрымалася падлізацца, а ў камандзіра ўзвода я нават папрасіў адпусціць мяне ў адпачынак, і той сказаў, што зімою вельмі можа быць, што і адпусціць. Толькі ўяві: дзесяць дзён дома!

Міхал не мог паверыць, што ягоны напаўдзікі зямляк, які зусім нядаўна, як чорта, баяўся любога незнаёмага чалавека, так лёгка адаптаваўся ў новым калектыве.

— Што ў нас там тварылася! Афіцэры з прапарамі п'яныя хадзілі на паляванне праз дзень, казуль стралялі, а я гатаваў. Як яны толькі адзін аднаго там не паперастралялі.

Радзевічу таксама на вучэннях некалькі разоў давялося гатаваць дзічыну, але ён не заўважаў, ці былі ягоныя паляўнічыя на падпітку. Здаецца, не.

— А вадзіцелі ўсе з каністрамі кінуліся ў бліжэйшую вёску паліва прадаваць. Думаў, як мы дадому даедзем? Але неяк прыехалі. Хлопцы казалі, што нашу салярку

палякі браць не хочуць, бо іхныя трактары ад яе псуюцца: надта кепская!

Міхал згадаў, як да яго пасля адбою падышоў кіроўца Алег, працягнуў прыбор начнога бачання і сказаў:

— На, парагачы!

Кухар надзеў на галаву шлем з фантастычным прыстасаваннем і паглядзеў вакол. Злёгку падсвечаны месяцам, лес на самай справе праглядаўся ідэальна. Прыбор апраўдваў сваю назву і прызначэнне цалкам.

— Смяяцца пасля слова «лапата»? — удакладніў Радзевіч, бо нічога смешнага не назіраў.

— Туды глядзі! — Алег павярнуў рукамі Міхалаву галаву ў бок бліжэйшых аўтамабіляў.

Відовішча сапраўды паўстала цікавае: ля бензабака адной машыны сядзеў на каленках яе кіроўца і спрабаваў пры дапамозе шланга пераліць паліва ў каністру. Але чамусьці ў яго нічога не атрымоўвалася: як толькі шланг накіроўваўся ў падстаўленую ёмістасць, бензін пераставаў цячы, небарака нанова пачынаў смактаць шланг і тады нязменна не паспяваў выняць яго без таго, каб не зрабіць некалькі глыткоў паліва. За тым жаўнер колькі часу пляваўся, а потым прага нажывы перамагала і ўсё паўтаралася нанова.

Зусім побач з ім прайшла пара больш удалых зладзеяў: на нядоўгай жардзіне, якая ляжала на правых плячах аднаго і другога, бы ўпаляваная здабыча, віселі аж дзве дваццацілітровыя каністры. Запраўшчыкі, — пазнаў Радзевіч, — пайшлі запраўляць транспартныя сродкі мясцовага насельніцтва…

Неяк само сабою так склалася апошнім часам, што пасля таго, як завяршалі прымаць ежу і разыходзіліся са сталоўкі ўсе падраздзяленні, кухары накрывалі стол для сябе. Хлебарэз Толік нязменна далучаўся да іх, хоць

нічога адмыслова хлопцы не гатавалі: усё было з агульных катлоў.

Аднойчы Міхал і Толік затрымаліся і засталіся за сталом сам-насам. Нечакана Садоўнічы спытаў:

— Не разумею, навошта табе было гэта трэба?

— Што?

— Ты выдатна разумееш, што… Ну, месяц, максімум паўтара — і вас бы ўсё адно расшпілілі. І гэта была твая ідэя! Не пярэч: Шпакоўскі сам бы да такога не дадумаўся… Ва ўсялякім разе, у яго б так ідэальна не атрымалася… Вось мне і не дае спакою думка: на-во-шта?!

— Давай падкажу, — спакойна зазначыў Радзевіч. — Проста адкажы самому сабе: ці можа ў прынцыпе існаваць прычына, якая б не пакінула выбару, што рабіць… Вось табой жа падкрэсленыя зыходныя дадзеныя: засталося пратрымацца зусім няшмат, большая частка пакутаў у мінулым, не сёння-заўтра пасля каранціну ва ўзвод прыйдуць «вясеннікі»… Да таго ж залётаў усё меней і меней, ты ўжо сёе-тое можаш і ўмееш… Тады на-вошта?! Хіба толькі ад поўнага вар’яцтва?.. Падобны я да вар’ята, да самагубцы?!.

— Не падобны… А сказаць ніяк?

— Што такое ў шахматах пат, ведаеш?

— Ведаю… Але ж я нічога такога не заўважаў…

— Павер мне, шкадаваць няма пра што...

Праз пару дзён Садоўнічы зноў здзівіў Міхала:

— Я б цябе сам расшпіліў, толькі цяпер не маю права: ты ў іншым падраздзяленні. Нядобра, што ты адзін не расшпілены…

— Не адзін, Саня Купрыянец таксама.

— Я маю на ўвазе з нашых, батальённых… Карацей, я тут перагаварыў з тваімі… Асноўны дзед у вас там Валодзя Бялоў. Ведаеш?

— Ведаю.

— Возьмеш сёння з сабой у роту пару бляшанак тушонкі ды пачак цукру. Хлеба я дам. Аднясеш яму, і ўсё будзе ў парадку.

— Дзякуй, Талян!

Радзевіч ніяк не чакаў нечага падобнага ад Садоўнічага, бо не думаў, што ён у стане разважаць глыбей, чым таго патрабуюць пісаныя ды не пісаныя законы салдацкага жыцця…

Міхал не пераставаў дзівіцца, наколькі адрозніваўся рэальны стан рэчаў у стасунках паміж дзядамі ды кабанамі ў ПУСах ад тых жахаў, якія распавядалі пра іх у гаспадарчым узводзе. Нават у першым вузле сувязі, у якім цяпер быў прапісаны Вацік і колькасць дзядоў была даволі значная, нічога падобнага да таго, што было звыклым у блатных гаспадарнікаў, не адбывалася. Кабаноў ставілі ў нарады разам з дзядамі, дзе адзіным прывілеем старых было тое, што ўсю фізічную працу выконвалі маладыя. З гэтым можна было цалкам мірыцца, бо нават самыя лютыя дзяды нават за «касякі» баяліся і пальцам кранаць маладых. Але ў нарадзе па сталоўцы было так шмат працы, што стараслужачым даводзілася ўсё адно што-небудзь рабіць. Акрамя таго, цудоўным фактарам, які ідэальна стрымліваў імпэт дзядоў, было тое, што вузлы сувязі пастаянна неслі каравульную службу: ахоўвалі парк з тэхнікай. Усе вартавыя былі ўзброеныя аўтаматамі Калашнікава незалежна ад тэрміну службы: і нічога не перашкаджала любому з пакрыўджаных кабаноў атрымаць маральную кампенсацыю ад дзеда пры дапамозе самай надзейнай зброі ў свеце. Таму выключна ў забаўляльных мэтах прабіваць фанеру, катацца на ровары ці прымушаць спяваць шэдэўры вайсковага фальклору тут нікому з дзядоў у галаву не прыходзіла: ці мала,

які зацяты кабан трапіцца. Тым больш што даволі часта палітрукі збіралі асабовы склад і распавядалі пра надзвычайныя здарэнні ў розных частках групы савецкіх войскаў: забойствы асобных вартавых кімсьці з маладзейшых калег ці расстрэлы цэлых каравульных змен.

Гатаваць для дзядоў па начах нейкія адмысловыя стравы, ці хаця б гарбатку, таксама ніхто не прымушаў: зрабілі — добра, нічога няма — не страшна. Тым больш праз дзень мыць форму ці наўмысна не даваць кабанам спаць тут не было прынята.

Здаралася, хтосьці з дзядоў дамаўляўся з адным-двума надзейнымі кабанамі, што расшпіліць іх узамен на выкананне ўсёй бруднай працы за яго, але нехта са староніх маладых ад зайздрасці даносіў на пазастатутныя адносіны і тады ў старых здараліся такія праблемы, пасля якіх прасцей было самому і падшыць каўнер, і памыць кіцель.

Такім чынам, калі ў ПУСах з'явіліся кухары, ім дастаткова было літаральна некалькі разоў прынесці пачастункі дзядам, каб заслужыць іхны давер і быць расшпіленымі ў хуткім часе.

У параўнанні з гаспадарчым узводам, у ПУСах дзяды практычна не пілі, а калі і наладжвалі бяседу, рабілі гэта не так нахабна, як тое адбывалася ў гаспадарнікаў — ледзь не ў адкрытую.

Выпадак з Андрэем Гуцулам быў рэдкім выключэннем, а зусім не характэрным здарэннем. Яго, мабыць, і збілі так жорстка таму, што нават п'яныя выдатна разумелі: ён даўно ўжо не кабан і нікога не выдасць.

Вельмі хутка ў новым падраздзяленні Радзевіч зразумеў, што нікому тут, па вялікім рахунку, няма да яго аніякай справы: ён мог прыходзіць і сыходзіць з казармы калі заўгодна, і нікога гэта не турбавала. Мог зусім

застацца начаваць у сталоўцы: на выпадак пытанняў заўсёды можна было сказаць, што гатаваў сняданак. Але пытанняў ніхто не задаваў.

Міхал зусім не баяўся, яму нават падабалася заставацца аднаму ў вялізным гмаху сталоўкі ноччу: ніхто не перашкаджаў думаць, можна было спакойна што-небудзь пачытаць, ды і наўпрост пахадзіць у паўзмроку па пустых залах вялізнага старога будынка, які бачыў на сваім немалым веку тысячы людзей, быў сведкам самых розных падзеяў ды незвычайных здарэнняў. Радзевічу здавалася, што ён падарожнічае па таямнічым старажытным замку, дзе некалі трымалі варожыя аблогі, балявала шляхта ды рыхтаваліся таемныя магнацкія змовы супраць караля. Напэўна, ён не вельмі б і здзівіўся, калі б аднойчы ўбачыў тут Чорную панну Нясвіжскага замка ці Малога Чалавека Балотных Ялін: атмасфера цалкам пасавала да сустрэчы з падобнымі персанажамі.

Дваццаць сёмага ліпеня Вярхоўны Савет БССР прыняў дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце. Гэты факт не мог не здзівіць Міхала, бо ён выдатна ведаў, што за суб’екты ўтваралі большасць у заканадаўчым органе. Тым больш ён сам нядаўна быў сведкам таго, як народны дэпутат Вярхоўнага Савета роднай рэспублікі на вачах усяго батальёна сувязі аддубасіў шлемафонам старшага лейтэнанта. Першы ПУС павінен быў здзейсніць марш. Узначаліць вучэнні прыехаў сам камандуючы групай войскаў генерал Дубынін.

— Глядзіце: сам баця наперадзе калоны на бэтээры! — не без захаплення адзначыў Вацік, калі галаўна́я машына з вялікім начальнікам спынілася пад адчыненымі вокнамі сталоўкі.

— Мой баця дома! — зазначыў Паша.

— Тваю маць, лейтэнант! — зароў тым часам генерал так гучна, што лёгка перакрычаў дзясяткі моцных рухавікоў, якія гулі на розныя галасы. — Дзе сувязь?!

Ён зняў з галавы шлемафон і працягнуў спалатнеламу маладому афіцэру. Той прыклаў да вуха навушнік, папераключаў нейкія тумблеры і працягнуў шлем назад генералу. Галоўны начальнік нацягнуў на галаву шлем, прыціснуў да глоткі мікрафон і штосьці прагаварыў. Відаць, сувязі па-ранейшаму не было, бо Дубынін імгненна пачырванеў, схапіў шлем правай рукой за вушы і, быццам дубінкай, пачаў мяцеліць няшчаснага лейтэнанта па галаве, як шкадлівага ката:

— Сука! Дзе сувязь, я сказаў?!

— Ну і ну! — здзівіўся такім паводзінам савецкага генерала Вацік.

— Баця? — не ўтрымаўся, каб не пазласлівіць Паша.

Можна было не сумнявацца, што ў ваенны час генерал без ваганняў асабіста застрэліў бы нядбайнага малодшага афіцэра.

Хутка ж усе зразумелі, што з сувяззю ўсё было ў парадку: камандуючы проста няправільна пераключаў тумблер, які вісеў на провадзе да шлема. Калона рушыла, а брыдкае адчуванне пры згадванні высокага начальніка засталося назаўсёды.

Сярэдзіна апошняга летняга месяца адзначылася сапраўднай трагедыяй, якая на доўгі час выбіла са звыклай каляіны абсалютна ўсіх: пятнаццатага жніўня загінуў у аўтааварыі галоўны кумір пакалення Віктар Цой. У галовах не ўкладалася, што такі яскравы чалавек, які «живёт по законам другим и кому умирать молодым», мог вось так проста, як самы звычайны абывацель, заснуць за аўтамабільным стырном…

Радзевіч быў у роспачы яшчэ і таму, што меў магчымасць пабываць на канцэрце «Кіно» ў Віцебску, але незразумела чаму вырашыў наведаць выступленне любімага гурта пасля службы ў войску…

Недарэмна ж кажуць: адклад не ідзе на лад…

А дзявятага верасня здарылася яшчэ адна трагедыя: нейкія вылюдкі забілі незвычайна папулярнага святара Аляксандра Меня, таго самага, якога добра ведаў ды шанаваў бацька Пашы Герасімава.

Забойства святара ўскалыхнула ўсю атэістычную імперыю, з трывогаю ўспрымалася многімі як пралог да нейкіх страшных падзеяў…

Па батальёне спачатку папаўзлі чуткі, а потым сапраўды было пацверджана начальствам, што да канца верасня частка павінна пераехаць у іншы ваенны гарадок.

Сказана — зроблена. У канцы верасня батальён сувязі вызваліў пункт пастаяннай дыслакацыі і ў поўным складзе пераехаў у іншае месца, дзе раней размяшчаліся мотастралкі. Новы гарадок месціўся літаральна за некалькі кварталаў ад ранейшага і неафіцыйна ўсімі называўся чырвоным: ці толькі таму, што ў ім усе будынкі былі з чырвонай цэглы, ці таму, што ў папярэдніх ягоных жыхароў былі чырвоныя пагоны.

Гарадок займаў значна большую тэрыторыю, чым ранейшы. Фельд'егераў перавялі ў Легніцу, бліжэй да штаба групы, таму кухараў засталося толькі тры чалавекі. З месяц у гарадку разам з сувязістамі дыслакаваліся выведзеныя з Заходняй групы войскаў пантоншчыкі ды спецкамендатура, якая таксама патрапіла сюды з Нямеччыны.

Часам на забеспячэнні ў сталоўцы стаяла да сямі сотняў чалавек. Тром гатаваць на такую колькасць людзей было складана, тым больш у тутэйшай сталоўцы ежа выдавалася на раздачы кожнаму асабіста.

У канцы верасня з Яварскай школы кухараў прывезлі трох хлопцаў вясенняга прызыву і, натуральна, пасялілі іх у той жа разбэшчаны блатны гаспадарчы ўзвод. Па знешнім выглядзе маладых кухцікаў няцяжка было здагадацца, у якую мясарубку яны трапілі, таму старыя кухары, якія зусім нядаўна пабылі ў іхнай скуры, стараліся хоць бы ў сталоўцы не надта абцяжарваць новенькіх.

Саша Дзейкін, Сяргей Сівохін і Андрэй Камышанаў усе ўтрох былі з Растоўскай вобласці, землякамі старшыны Меліхава, з казацка-шахцёрскіх сем'яў: дзеці ды ўнукі саслоўных ваенных ператварыліся пасля рэвалюцыі ў пралетарскую эліту — шахцёраў.

Неяк хлопцы распавялі пра Новачаркаскі расстрэл мірнай дэманстрацыі рабочых, які здарыўся ў першыя дні чэрвеня тысяча дзевяцьсот шэсцьдзесят другога года. Немагчыма было паверыць, што на незадаволеных банальным падвышэннем цэн на прадукты людзей кінулі войска. Хлопцы апісвалі здарэнне так падрабязна, быццам бачылі ўсё на свае вочы, бо многія іхныя сваякі ды знаёмыя ўдзельнічалі ў падзеях, вядома ж, не на баку арміі. Сямейныя паданні пра вынішчэнне бальшавікамі казацтва ды ўспаміны родных пра савецкую карную аперацыю ў Новачаркаску выхавалі з маладых жыхароў Прыдоння зацятых скептыкаў адносна існых парадкаў у імперыі зла…

Цяпер ім даводзілася служыць гэтай самай імперыі, ды яшчэ ў асяроддзі такіх адборных вылюдкаў, якія атабарыліся ў гаспадарчым узводзе.

У пачатку кастрычніка афіцыйна адбылося ўз'яднанне Германіі. Здавалася, што радасць, якая ахапіла ўсіх немцаў, адчуваецца і на гэтым баку мяжы.

Неўзабаве надышоў лістапад і пакацілася хваля дэмабілізацыі. Надышоў той дзень, калі з'ехаў да сябе

на Валынь і адзіны дэмбель з гаспадарнікаў Толік Садоўнічы.

Ужо ў снежні грунтоўнай падрыхтоўкай да звальнення з войска заняліся «вясеннікі»: маладыя кухцікі ўклейвалі фотаздымкі і аздаблялі адмысловымі малюнкамі з вайсковымі сюжэтамі дзедаўскія дэмбельскія альбомы. Верагодна, дэмбелям не ўсё падабалася: часцей і часцей можна было назіраць на абліччах маладых кухараў прыкметы «няўдалага праходжання праз дзверы» ды «падзення з лесвіцы».

Будынак сталоўкі меў два паверхі, падвал ды надзвычай складанай канфігурацыі гарышча, якое па сутнасці таксама ўтварала паверх. Кухарскі пакой размяшчаўся на другім паверсе ў прасторным светлым пакоі з вялікім акном. Частка гэтага пакоя падпадала пад край незвычайна крутога даху, таму столь у ім была не роўнаю, як звычайна, а з двума схіламі: у бок акна і да знешняй сценкі ўправа. Акрамя таго, убудаванасць пакоя пад дах вымушала зрабіць прастакутны выступ-рог у яго глыбіню: калі паглядзець на пакой зверху, то атрымоўвалася, што правы далёкі кут нібыта чатырохвугольнага ў плане памяшкання перакрыты выступам паўтара на паўтара метра і ўтварае дадатковы пяты вугал. Паміж схілам даху і сцяною гэтага выступу ў падстрэшшы ўтвараўся яшчэ адзін маленькі пакойчык, у які меўся тэхнічны люк. Хлопцы адразу ж ацанілі ўсе перавагі наяўнасці патаемнага памяшкання, у якое можна было што-небудзь ці каго-небудзь надзейна схаваць, і прыкрылі люк-уваход у падстрэшша шафаю. У гэткім светлым пакоі прыемна было пасядзець і пагаварыць. Была тут і радыёкропка, праз якую можна было ўволю слухаць навіны ды музычна-забаўляльныя праграмы.

Кацельная, з якой падавалі пару ў сталоўку, была тут жа, у падвале пад варачным цэхам, і працавалі там грамадзянскія служачыя. Адзін з трох качагараў, як выявілася, быў з Брэста. Нярэдка кухары замаўлялі цывільным купіць што-небудзь з таго, што не прадавалася на тэрыторыі чырвонага гарадка.

Жыццё і побыт на новым месцы хутка наладзіліся.

Неўпрыкмет адбылася сустрэча другога і апошняга Новага года ў войску.

Здавалася, за гады перабудовы ўсе ўжо звыклі да пастаяннага паскарэння тэмпаў жыцця: падзеі адбываліся так хутка і часта, што фізічна не хапала магчымасцяў, каб за ўсімі імі сачыць. Многія тлумачылі падобны эфект выключна тым, што падчас «застою» проста шмат пра што савецкім людзям не паведамлялі. Верагодней усё ж, застой таму і застой, што нічога і не адбывалася. Дзевяноста першы год ад самага пачатку зусім не запаволіў інфармацыйную плынь папярэдніх гадоў, а па-сапраўднаму палохаў нечуваным нагрувашчваннем падзеяў, іх імклівым развіццём, усё больш выразнай жорсткасцю і непрадказальнасцю…

Саюзныя ўлады на чале з Міхаілам Гарбачовым цяпер не выклікалі ніякай сімпатыі і не карысталіся падтрымкай найперш таму, што спрабавалі зброяю стрымаць памкненні нацыянальных рэспублік да большай самастойнасці. І калі ў студзені выбухнулі крывавыя падзеі ў Вільні, першы прэзідэнт СССР зрабіў самае бязглуздае, што мог здзейсніць у гэтай сітуацыі: ён пачаў распавядаць, што нічога не ведаў. Усе яшчэ больш пераканаліся: камуністы ўжо не кантралююць вялізную краіну.

Балтыйскія рэспублікі адназначна заявілі, што ні ў якіх перамовах аб лёсе СССР удзельнічаць не будуць: яны

незаконна былі акупаваныя ў трыццаць дзявятым і жадаюць толькі аднаго — аднаўлення сваёй незалежнасці.

Палякі — самыя простыя грамадзяне, моладзь, — якія самі зусім нядаўна пазбавіліся ад камуністычнага ярма і лічылі сваю краіну таксама пацярпелай ад змовы Сталіна з Гітлерам, імкнуліся ўсяляк выказаць падтрымку і салідарнасць найперш з Літвою: не толькі ўсё часцей і часцей ля варот КПП савецкіх вайсковых частак ладзіліся пікеты, выбухалі ўзрыўпакеты, але і ўся агароджа вакол іх была распісаная адпаведнымі лозунгамі.

Дзіўная была сітуацыя: вялікая частка тых, хто быў за тымі парасписанымі агароджамі, таксама была на баку літоўцаў, латышоў ды эстонцаў.

Упершыню людзі ў адкрытую пачалі абмяркоўваць верагоднасць грамадзянскай вайны ў імперыі зла.

Выбрыкі Садама Хусейна ў Кувейце крыху адцягнулі ўвагу ад таго, што адбывалася ў Савецкім Саюзе. Усе чакалі развязкі. А потым пачалася ці не першая ў гісторыі тэлевізійная вайна: яшчэ ніколі да «Буры ў пустыні», як назвалі аперацыю па вызваленні Кувейта саюзнікі, свет не бачыў столькі наўпроставых тэлетрансляцый з непасрэдных месцаў падзеяў.

Тым часам, каб захаваць хоць нейкае адзінства ці, прынамсі, выгляд нейкай супольнасці, крамлёўскія ўлады пачалі прапаганду ўсесаюзнага рэферэндуму пра лёс СССР, які прызначылі на сямнаццатага сакавіка.

Міхал Радзевіч, відаць, як і большасць жаўнераў, адчуваў нейкую двухсэнсоўнасць свайго становішча: з аднаго боку, у яго з’явілася процьма сяброў ды знаёмых з розных саюзных рэспублік, розных нацыянальнасцяў, з якімі яму зусім не было чаго падзяляць, яны цудоўна разумелі адзін аднаго, чыталі адны і тыя ж кнігі ды слухалі адну і тую ж музыку; з другога боку, ён задаваўся

пытаннем: а што мы тады ўсе робім тут, у абсалютна чужой краіне? Пры ўсіх раскладах атрымоўвалася, што, каб адбыліся сапраўдныя перамены ў жыцці, трэба галасаваць супраць захавання СССР. Бо дабіцца нейкай справядлівасці, усталяваць простыя і зразумелыя ўсім правілы гульні, як тады здавалася, у меншай краіне значна прасцей. Але найперш яго падштурхоўвалі галасаваць супраць самыя адданыя агітатары-прыхільнікі захавання адзінай краіны: пераважную большасць з іх утваралі такія замшэлыя наменклатуршчыкі, камуністы ды непрыхаваныя ворагі свабоды, што яны ж і не пакідалі сумневаў, якім бачаць абноўлены саюз — той самай ранейшай турмою з касметычным рамонтам.

Неверагодна папулярны ў Маскве Старшыня Вярхоўнага Савета РСФСР Барыс Ельцын за месяц да правядзення рэферэндуму публічна запатрабаваў адстаўкі Гарбачова. Калі да рэферэндуму заставаліся лічаныя дні, Ельцына пад пільным вокам тэлекамер спыталі, як ён будзе галасаваць. І са словаў папулярнага палітыка напрошвалася тая самая выснова, якую Міхал Радзевіч зрабіў самастойна: калі жадаеце сапраўдных перамен, свабоды ды дэмакратыі, трэба галасаваць супраць захавання імперыі.

Вацік і Паша чамусьці ў сваіх разважаннях паўтаралі выключна тое самае, што казалі салідныя дзядзькі ў касцюмах па тэлевізары: разам лепей! Маладзейшым кухарам, падобна, зусім не было справы да таго, што адбываецца за межамі казармы: іх займала толькі тое, як выжыць.

На галасаванне Міхал з'явіўся проста раз'юшаны ад упартасці сяброў: ніякія ягоныя аргументы пра тое, што незалежнасць рэспублік ніяк не пашкодзіць ім сябраваць, супрацоўнічаць ды ўтвараць нейкія аб'яднанні,

на іх не дзейнічалі. Тое, што цяпер галоўнаю праблемаю на ўсіх абшарах вялізнай краіны з'яўляюцца зацятыя камуністы-імперыялісты, якія цягнуць усіх назад, да звыклага ім таталітарызму, палітычнага ды нацыянальнага ўціску, ні Паша, ні Вацік не хацелі разумець.

У камісіі сядзелі некалькі добра знаёмых сяржантаў ды старшы лейтэнант, галоўны батальённы камсамолец.

І хто іх толькі сюды прызначаў? Наколькі аб'ектыўным будзе падлік галасоў?

Міхал атрымаў бюлетэнь, але не пайшоў у кабінку для галасавання, а наўмысна, каб бачыла па магчымасці большая колькасць людзей, сваёй ручкай пачаў тлуста замалёўваць слова «ДА»: можа, хто-небудзь задумаецца!

— Ніх…я сабе бульбаш дае! — не стрымаў эмоцыяў адзін сяржант, сябра камісіі, чым прыцягнуў увагу ўсіх, хто знаходзіўся на ўчастку. — Супраць Саюза! Табе ўжо чаго карціць?!

— Ты ўсё адно не зразумееш.

— Паглядзіце на яго! Самы разумны знайшоўся, ці што?! — суправаджаў Міхалаў падыход да урны надта прынцыповы сябра камісіі. — Усе «за» галасуюць, а ён адзін супраць!

Ён працягваў яшчэ нешта бубніць у бок Радзевіча, але Міхал не стаў услухоўвацца і рушыў бліжэй да выхаду. Там у чарзе па бюлетэні стаялі ўкраінцы з ягонага ПУСа.

— Чым ты яго так угнявіў? — спытаў кухара Ваня з Івана-Франкоўска.

— Супраць прагаласаваў.

— О! І я кажу, што трэба галасаваць супраць! — узрадаваўся Ваня і павярнуўся да сваіх землякоў: — Супраць трэба галасаваць!

— Адставіць агітацыю! — выгукнуў нейкі незнаёмы маёр, які таптаўся побач з чаргой.

Участак месціўся ў салдацкай кавярні, ці чайной, якую ўсе жаўнеры называлі «чайнік». Ля самага ўвахода стаяў тэлевізар, па якім на ўсю моц агітавалі галасаваць «за». Ён, відаць, маёра не раздражняў.

Разлік быў на тое, што тыя, хто пакуль не паспеў вызначыцца, як будзе галасаваць, пастаяць у чарзе, паслухаюць лішні раз тэлевізар і пераканаюцца, што большасць галасуе «за», таму вылучацца не варта, трэба галасаваць, як усе. Нехта выдатна ведаў псіхалогію савецкіх людзей, якім змалку прышчаплялі статкавыя інстынкты: быць такім, як усе, не адрозніваца нічым ад іншых, нават думаць, як думае большасць, ці прынамсі хаваць свае сапраўдныя думкі, калі яны не супадаюць з генеральнай лініяй.

Ужо ля самых дзвярэй Міхала зноў спынілі. Гэта былі хлопцы са спецкамендатуры Заходняй групы войскаў, з якімі ў Радзевіча склаліся надзіва прыязныя адносіны:

— Што не спадабалася нашаму маёру? — пацікавіўся Алег.

— А, дык гэта ваш такі апантаны! Тады зразумела! Агітацыю шые! — пажартаваў Міхал. — Вы ўжо прагаласавалі?

— Даўно! — адказаў за двух другі, Віталь.

— Тады чаго не сыходзіце?

— Забяспечваем парадак!

Радзевіч не ведаў прозвішчаў ні Алега, ні Віталя. Абодва хлопцы былі з Масквы, землякі Пашы Герасімава. З гэтай прычыны ці не, але пасля таго, як прадстаўнікі спецкамендатуры, ці, па сутнасці, прадстаўніцтва КДБ у войску, пабылі ў нарадзе па сталоўцы, Віталь і Алег часта заходзілі ў вольную часіну да кухараў, проста каб пагаварыць. Як ні дзіўна, але хлопцы распавядалі шмат падрабязнасцяў пра сваю звышсакрэтную

службу. У прыватнасці, з іхных словаў Міхал ведаў, што радавых у спецкамендатуры толькі адна рота, спартовая, як яе называюць. Па афіцыйнай версіі яны ўсе спартсмены, якія толькі і робяць, што трэніруюцца ды ўдзельнічаюць у спаборніцтвах. На самай жа справе ўсе радавыя ў іхнай частцы, хоць і маюць разрады па розных адзінаборствах, найперш займаюцца прыкрыццём следчых ды разведвальных аперацый іх ведамства, а не толькі спаборнічаюць з калегамі з іншых савецкіх вайсковых фармаванняў.

Некалькі хлопцаў са спецкамендатуры з'яўляюцца майстрамі аўтаспорту. У гаражы іх часткі толькі пара тыповых вайсковых УАЗікаў — астатнія аўтамабілі спрэс іншамаркі, на якіх хлопцы ў грамадзянскай вопратцы з чужымі дакументамі вазілі сваіх афіцэраў па ўсёй былой ГДР на сустрэчы з самымі сапраўднымі шпіёнамі, сачылі за нейкімі падазронымі суб'ектамі і, калі верыць Віталіку ды Алегу, не раз удзельнічалі ў пагонях ды перастрэлках. Прадметам асаблівага гонару аўтапарка спецкамендатуры з'яўляецца чырвоны амерыканскі «Форд», які некалі належаў самому дарагому Леаніду Ільічу Брэжневу. Кажуць, бацька «эпохі застою» вельмі любіў пакатацца на хуткасных спартовых іншамарках…

Яшчэ Віталь ды Алег распавядалі, што пераважную большасць асабовага складу іх камендатуры ўтвараюць афіцэры, спрэс маёры ды падпалкоўнікі, таму самым непрыемным з'яўляецца нарад у штабе: стой цэлыя содні навыцяжку перад імі! Да таго ж днявальны павінен сачыць за ўсімі афіцэрамі: хто да каго ў кабінет зайшоў, калі выйшаў, што было ў руках. Увагу падначаленых трэніруюць такім чынам ці настолькі не давяраюць адзін аднаму?..

— Ну-ну, забяспечвайце-забяспечвайце!

Радзевіч ужо павярнуўся, каб сысці, але Віталь нечакана выгукнуў:

— Глядзі, глядзі! — тыцкаў ён пальцам у тэлевізар, па якім паказвалі прамое ўключэнне з Ленінграда пра ходу ўсесаюзнага рэферэндуму. — Вось, зараз!

Міхал таксама прыпыніўся і ўгледзеўся ў экран: старшыня Ленсавета, вядомы дэмакрат Анатоль Сабчак распавядаў, як адбываецца галасаванне.

— Што? — пытаўся Алег, якому найперш адрасаваліся Віталевы воклічы. — Сабчак як Сабчак!

— Глядзі-глядзі! Побач з ім, вось!

Камера выхапіла побач з Анатолем Аляксандравічам нейкага непрыкметнага невысокага маладжавага тыпа.

— Пазнаў?!

— Не можа быць! — здзівіўся Алег.

— Ды ён гэта! Ён!

— А хто ён? — не вытрымаў Радзевіч.

— Хто ён?! Ды хто ж яго ведае, хто ён?! Гэта ніхто іншы, як той суб'ект з Дрэздэна*, якога наш Алежа меў гонар укласці на лапаткі! Бачыш, дзе ён цяпер?! Побач з самім Сабчаком! Капец табе, Алежа! Лепей табе не вяртацца ў Саюз! Ён табе гэтага ніколі не даруе: нейкі саплівы радавы пасмеў укласці... Думаю, не ніжэй за палкоўніка ён!

— Падпалкоўнік*, — удакладніў той самы маёр са спецкамендатуры, які назіраў за чаргою, а цяпер звярнуў увагу на сваіх надта шумлівых падначаленых. — Толькі крычаць пра гэта зусім не трэба.

Віталь з Алегам адразу спалохана сцішыліся, а Радзевіч нарэшце выйшаў з участка для галасавання.

---

* Субчык з Дрэздэна, падпалкоўнік — пасля службы ў КДБ пад прыкрыццём дырэктара дрэздэнскага дома Дружбы СССР — ГДР, з траўня 1990 года У. У. Пуцін працаваў дарадцам старшыні Ленінградскага гарадскога Савета народных дэпутатаў А. А. Сабчака.

Праз чатыры дні маскоўскія тэлеканалы наперабой перадавалі вынікі ўсенароднага волевыяўлення: практычна дзевяноста адсоткаў з тых, хто прыняў удзел у галасаванні, выказаліся за тое, каб абноўлены Савецкі Саюз працягнуў сваё існаванне. Пра тое, што з пятнаццаці саюзных рэспублік шэсць не падтрымалі правядзенне рэферэндуму, сціпла не нагадвалі.

— Гэта нейкі цырк! — абураўся Радзевіч. — Атрымоўваецца, што калі дзевяноста адсоткаў беларусаў жадаюць жыць у СССР, дык, напрыклад, латышы, якія не галасавалі зусім, павінныя падпарадкавацца волі суседзяў і застацца ў Саюзе. Цікава, як яны збіраюцца ўтрымліваць нязгодных? Так, як гэта ўжо было ў Тбілісі ды Вільні? Скінуць на Талін атамную бомбу: дык не даставайся ж ты нікому! Так, ці што?

Рэферэндум правялі, але небяспека грамадзянскай вайны пачала здавацца яшчэ больш выразнаю перспектываю, чым раней. Супярэчнасці былі сапраўдныя, а метады вырашэння ранейшыя: прапаганда і яшчэ раз прапаганда, прычым абсалютна бязглуздая ды няздатная: а раптам атрымаецца загаварыць. Ад усяго гэтага патыхала агоніяй і наіўным жаданнем адцягнуць непазбежнае…

# XVI

Неяк на пачатку красавіка Міхал звярнуў увагу на тое, што ўжо некалькі дзён маладыя кухцікі не выпускаюць з рук кавалкі тканіны, з якой шыюць салдацкія шынялі. Праўда, у іхных руках тыя кавалкі ўжо страцілі свой натуральны шэры колер, а былі цяпер зялёныя ад пасты ГОІ, як і пальцы, што іх няспынна церабілі.

— Was ist das?* — пацікавіўся Радзевіч у Сяргея Сівохіна.

— Я англійскую вучыў.

— Што гэта?

— Савецкая Армія!

Сяргей расклаў на далоні тканіну і прадэманстраваў дзве медныя літары, такой самай формы, як і на салдацкіх пагонах: «С» ды «А», аднак выразаныя з даволі тоўстай пласціны.

— Трэба нацерці так, каб выглядалі, як залатыя.

— І для чаго гэта трэба?

— Ну, нашыя дзядулі не могуць сабе дазволіць вярнуцца дадому ў звычайных пагонах!

— Вашыя дзядулі і самі па сабе, мякка кажучы, незвычайныя: арміі, лічы, няма, а ім залатыя літары на пагоны падавай! Ачмурэць можна!

— Чужымі ж рукамі не балюча жар заграбаць! Я і Саня паспяваем, а вось Камышанава Фрол ужо другі дзень пагражае прыбіць: у яго яшчэ на тыдзень працы, не меней! Ну і паб'е яго дзядуля — літары ж ад гэтага не бліскучымі! Навошта ён здзекуецца з яго? Усё адно ў найлепшым выпадку толькі праз месяц дэмабілізуецца. Сто разоў паспець можна, нават з Андрэевымі тэмпамі!

На наступны дзень маладыя кухары прыйшлі ў сталоўку нейкія асабліва прыцішаныя і засяроджаныя. Андрэй выглядаў найбольш засмучана. Увесь час яны збіваліся ў сваю невялічкую купку і нешта эмацыйна абмяркоўвалі.

Старэйшыя хлопцы стараліся лішні раз іх не турбаваць: і так было відавочна, што праблемаў у растоўцаў вышэй за дах!

---

* — Што гэта? *(ням.)*

Увечары ўся тройца затрымалася ў сталоўцы ледзь не да поўначы. Яны пайшлі ў казарму толькі тады, калі Радзевіч, які павінен быў гатаваць сняданак, сказаў, што кладзецца спаць у кухарскім пакоі.

Пайшлі і пайшлі сабе. Міхал зачыніў за імі дзверы, узняўся на другі паверх, рассцяліў ложак і заваліўся спаць…

Не меней, як праз тры гадзіны, Радзевіч аж падскочыў на ложку, калі з неверагодным грукатам раптам расчыніліся дзверы ў пакой, запалілася святло і ў памяшканне ўваліўся Андрэй Камышанаў. У яго быў такі спалохана-стомлены ды разгублены выгляд, нібы ўсю ноч ён уцякаў ад зграі галодных ваўкоў…

У два крокі ён пераскочыў пакой, схапіўся ад нізу за бок вялізнай трохстворкавай шафы і, быццам яна нечакана страціла ўсю сваю немалую вагу, лёгка адставіў яе ад сценкі, зняў з вешалкі бушлат, выняў крышку з увахода ў падстрэшша, праціснуўся ў яго невялічкую адтуліну і ўжо адтуль звярнуўся да Радзевіча:

— Схавай мяне, Міхал, калі ласка!

— Што здарылася?! — паспрабаваў высветліць агаломшаны Радзевіч.

— Потым! Усё потым! Калі ласка, пастаў на месца шафу! І нікому не кажы, што бачыў мяне!

Міхал прычыніў уваход у падстрэшша, не без намагання паставіў шафу на ранейшае месца…

Сну як і не было!

Відавочна, што здарылася нешта кепскае: магчыма, тлусты Фрол выканаў абяцанне і пабіў Андрэя, а можа і, загнаны ў кут, Камышанаў учыніў што-небудзь дрэннае з ненавісным дзедам. У любым выпадку, як кажуць, хрэн за рэдзьку не саладзейшы!

А палове на сёмую ў сталоўку прыйшоў нарад — спецкамендатура. Следам за імі ў варачны цэх чамусьці зазірнуў намеснік камандзіра батальёна сувязі па палітычнай частцы. Гэта было дзіўна, бо Радзевіч не мог прыпомніць, ці бачыў яго тут калі-небудзь раней.

Падчас сняданку, калі есці прыйшлі гаспадарнікі, Радзевіч адчуў у іхных паводзінах нейкую няўцямную перамену: звычайна гаваркія і нахабна-шумлівыя, сёння яны былі надзіва ціхія і засяроджаныя. Фрол быў на месцы, але душа ягоная, ці што ў яго там, відавочна не: ні кропелькі крыві на ўкормленым вечна румяным абліччы, ніякіх заклікаў да кухара кшталту «кладзі пабольш, не шкадуй» на гэты раз не было…

Калі Радзевіч пасля сняданку ўзняўся ў кухарскі пакой, там яго напаткалі толькі Паша і Вацік, які тут жа паведаміў сенсацыйную навіну:

— Андруха Камышанаў уцёк!

Міхал, як для такой навіны, не надта здзівіўся. Яму нават было крыху смешна, бо ўцякач, які тут жа сядзеў за шафаю ў падстрэшшы, быў ад Вапіка не далей, як за якія-небудзь два метры.

— Што здарылася? — пацікавіўся Міхал у Герасімава, бо той павінен быў ведаць болей за Шпачка, які жыў у іншым падраздзяленні.

— Хто ж яго ведае, што… З вечара ў казарму нібыта прыйшоў адзін Саня Дзейкін, сказаў, што Сяргей з Андрэем быццам гатуюць сняданак і засталіся начаваць у сталоўцы. Я тады ўжо спаў. Потым нешта здарылася ў парку. Кажуць, часавыя нават стралялі. А потым патруль у горадзе затрымаў Сівохіна. Дзяжурны па батальёне паведаміў пра надзвычайныя здарэнні куды трэба — і пачалося! Батальён узнялі па трывозе а пятай

раніцы, праверылі асабовы склад, і, як няцяжка здагадацца ці Сяргей прагаварыўся, зразумелі, што сняданак гатуеш ты, а Андрэй збег! Размеркавалі паміж усімі падраздзяленнямі тэрыторыю гарадка і парку і загадалі прачасаць.

— Я хацеў сысці ў сталоўку, — падключыўся ўзрушаны Вацік, — не пусцілі! Давялося разам з усімі соўгацца па завуголлях! А мае дурні яшчэ і кпілі з мяне: што, давёў, Шпакоўскі, маладога повара, кажуць, цяпер будзе табе гамон!

Міхал і Паша абмяняліся красамоўнымі позіркамі: сапраўды, у гэтай сітуацыі яны першыя падазраваныя, бо старэйшыя на перыяд, і маладыя практычна ўвесь час праводзілі ў сталоўцы, а зусім не ў казарме! Калі Сяргей ды Саня не скажуць начальству праўду — а яны, вядома ж, не скажуць, бо зусім не жадаюць на векі вечныя заставацца зашпіленымі кабанамі ды атрымаць ганебны ярлык «стукача», — следчыя пачнуць прасаваць найперш Міхала, Пашу ды Ваціка!

— Трэба ўзгадніць, што казаць! — вельмі сур'ёзна зазначыў Герасімаў.

Але ўзгадніць нічога не атрымалася: у наступнае імгненне ў пакой увайшоў нам па тыле капітан Філіпенка і загадаў ісці за ім.

Хлопцаў прывялі ў штаб, дзе панавала трывожная мітусня: з кабінета ў кабінет літаральна бегалі афіцэры і прапаршчыкі. Сярод іх Міхал пазнаў некалькі чалавек са спецкамендатуры і палкоўніка Андрэева, намесніка камандуючага войскаў сувязі Паўночнай групы войскаў.

Ну, зараз пачнецца!

Галоўных падазраваных, як яны самі сябе вызначылі, развялі па розных памяшканнях.

Міхал апынуўся ў кабінеце камбата, дзе на месцы гаспадара сядзеў Андрэеў, а за сталом, які ўсутыч быў прыстаўлены да камандзірскага, сядзелі два незнаёмыя падпалкоўнікі і перабіралі нейкія паперы.

Радзевіч даклаў аб сваім прыбыцці, як патрабавалі статутныя нормы, і замёр у становішчы «смірна» на сярэдзіне кабінета.

— Сядайце, таварыш салдат, — сказаў Андрэеў і паказаў на крэсла насупраць.

Міхал нерашуча сеў і паспрабаваў засяродзіцца ў чаканні пытанняў, бо расхваляваўся ён не на жарт: што і казаць, не кожны дзень яму даводзілася трапляць у такое асяроддзе. Калі ўжо быць абсалютна аб'ектыўным, ніколі не даводзілася. Да таго ж у ролі падазраванага ў злачынстве хлопец паўстаў упершыню. Асабліва няёмка было тое, што ён адзіны ведаў, дзе цяпер той, каго ўсе шукаюць…

А што, калі Дзейкін і Сівохін ужо нагаварылі на яго з Вацікам усялякай лухты: дзяды з гаспадарчага ўзвода напэўна ж казалі сваім кабанам, што Радзевіч і Шпакоўскі «стукачы», на якіх не тое што можна, нават трэба даносіць! А раптам Андрэя знойдуць у сталоўцы і ён скажа, хто яму дапамог схавацца, ці пацвердзіць афіцыйную версію, што спрабаваў уцячы ад здзекаў старэйшых кухараў! Вось жа становішча: куды ні кінь — усюды клін!

Афіцэры маўчалі. Галоўны пільна ўзіраўся ў Радзевіча, быццам спрабаваў здагадацца, пра што ён зараз думае.

У кабінет увайшоў камандзір батальёна падпалкоўнік Чарных і адразу з парога звярнуўся да повара:

— Усё, салдат, твой таварыш ва ўсім прызнаўся! Мы ўсё ведаем!

Прыём быў сам па сабе збіты. Да таго ж, хто і ў чым мог прызнацца?

— Твой зямляк сказаў, што вы білі маладых кухараў!

Радзевіч ледзь утрымаўся, каб не пасміхнуцца:

— Таварыш падпалкоўнік! Мы старэйшыя за іх толькі на адзін перыяд, і яны не з нашага падраздзялення! Калі б мы іх кранулі, хоць пальцам, нам бы іхныя дзяды паадрывалі б галовы! Тым больш, спытайце капітана Філіпенку, гаспадарнікі лічаць мяне ды Шпакоўскага «стукачамі»!

— А Герасімаў жа таксама з гаспадарчага ўзвода! Ён іх крыўдзіў?

Камандзір здаў самога сябе гэтым пытаннем: ніхто нічога не сказаў ні са старэйшых кухараў, ні з маладзейшых.

— Яны ж «вясеннікі», а ён восеньскі, не іхны дзед!

Дзіўным было тое, што чужыя афіцэры слухалі пра пазастатутныя дачыненні радавых і не задавалі ніякіх пытанняў: значыцца, яны цудоўна ведалі пра іх існаванне! Тады б і капалі ў гаспадарчым узводзе!.. Ці не вельмі жадаюць выносіць бруд на агульны агляд…

— Добра, ідзі гатуй абед!

Герасімаў і Шпакоўскі вярнуліся ў сталоўку практычна адразу ж услед за Радзевічам.

— Уяўляеш! Гэты ёлупень сказаў, што браў у сталоўцы тушонку! — выпаліў са злосцю Паша.

— Я ж сказаў, што даўно! І толькі бляшанак дзесяць за ўвесь час! — апраўдваўся Вацік.

— Ды цябе за адну маглі ў дысбат на тры гады адправіць! Дзесяць ён узяў! А чаму не сто дзесяць?! Якая розніца, колькі?! — абураўся Герасімаў. — Узялі б і спісалі на цябе ўсе скрадзеныя прадукты са складоў усёй групы войск! Чаму б і не: ты ж сам прызнаўся! Генералы,

вунь, асабісты казалі, вагонамі крадуць! У Заходняй групе войскаў, як выязджалі з Германіі, пад шумок умудрыліся нават некалькі знішчальнікаў скрасці! А сядзець будуць вось такія ёлупні, як ты! За бляшанку тушонкі, як за вагон! За каністру саляркі, як за ўвесь скрадзены недатыкальны запас паліва!

— А што пра Андрэя пыталіся? — пацікавіўся ў калег Міхал.

— Казалі, што ты прызнаўся, нібыта мы іх білі! — усё яшчэ нервова адказаў Паша.

— А мне сказалі, што тое самае Вацік казаў!

— Ведама! На «понт» бралі!

— Мне тое самае гаварылі, — нясмела азваўся перапалоханы Шпачок, — але ж гэта няпраўда! Я адразу зразумеў, што вы такога не маглі сказаць!

— А тушонка як усплыла?

— Яны, відаць, каб запалохаць мяне, — тлумачыў ушчэнт збянтэжаны Вацік, — пачалі крычэць, што ім вядома, быццам мы прадукты крадзем і прадаём! Нібыта Сяргей з Санем прызналіся!..

— І?! — не вытрымаў задоўгай паўзы Міхал.

— Я сказаў, што гэта было вельмі даўно, калі мы былі яшчэ кабанамі… Для дзядоў бралі, а не прадаваць! Растлумачыў, што калі б мы не прыносілі дзядам пайку, нам бы быў капец! Сказаў, што бляшанак дзесяць, можа, і ўзяў… Ой, што цяпер будзе…

— Ды супакойся ты ўжо! Ніхто тваіх дзядоў не будзе шукаць па ўсім Саюзе, каб высвятляць, колькі ты для іх і чаго скраў! Цяпер камандзіраў хвалюе, дзе Андрэй! — суцешыў Вопіка Паша. — Надалей проста думай, што і каму гаворыш!

— А Саню з Сяргеем хто-небудзь бачыў? — спытаў у сяброў Радзевіч.

— Думаю, цяпер мы іх не хутка ўбачым! — заначыў Паша. — Хадзем ужо абед прыгатуем ці што?

Хлопцы спусціліся ў варачны цэх. Праз нейкі час Міхал вылучыў хвілінку і вярнуўся ў кухарскі пакой.

— Есці хочаш?! — гукнуў ён у бок шафы. — Андрэй!..

— Не вельмі, — данёсся прыглушаны голас з-за сцяны.

— Я штосьці-небудзь прынясу пазней!..

Міхалу было вельмі прыкра на душы ад таго, што ён не можа падзяліцца сваім сакрэтам з сябрамі і яму даводзіцца іх асцерагацца: калі таямніцу ведаюць болей за двух — яна перастае быць таямніцаю.

Радзевічу давялося некалькі разоў непрыкметна вяртацца ў кухарскі пакой: спачатку ён прынёс і паставіў у шафу талерку з мясам, затым прынёс хлеб ды імбрык з кампотам, а потым прыбег з місаю грачанай кашы. Міхал зачыніў дзверы знутры, ключ пакінуў у замку, каб немагчыма было адчыніць звонку, адставіў шафу, выняў люк і перадаў ежу ўцекачу.

— І што далей?

— Не ведаю…

— Можа, вылезеш: пакуль што ты яшчэ не дэзерцір…

— Нізашто!.. Я падумаю…

Міхал прыставіў на месца шафу і спусціўся ўніз.

Тым часам надзвычайнае здарэнне абрастала новымі падрабязнасцямі: ледзь не кожны наведвальнік сталоўкі прыносіў сваю версію ды апошнія чуткі.

Адзін сцвярджаў, што пасля няўдалай спробы скрасці аўтамабіль у парку Андрэю ўдалося адабраць машыну ў нейкага пана і выехаць з горада ў бок мяжы з Германіяй. Наступны казаў, што Камышанаў сеў у цягнік. Потым некалькі чалавек запар пераконвалі, што Андрэя ўжо затрымалі на вакзале ці то ў Вроцлаве, ці то ў Вальбжыху…

Увечары ўсім кухарам загадалі начаваць у казарме, у сталоўцы на ноч нікога не пакінулі.

Высветлілася, што практычна ўвесь асабовы склад батальёна, за выключэннем гаспадарчага ўзвода ды тых, хто ў нарадзе, патрулюе ваенны гарадок і прылеглыя да яго вуліцы места.

Па графіку сняданак павінен быў гатаваць Сяргей Сівохін, але на яго разлічваць цяпер не даводзілася, бо ніхто не мог нават сказаць, дзе ён цяпер, таму Радзевіч вызваўся выйсці зранку на працу другі дзень запар.

Міхал не мог самому сабе растлумачыць, ці задрамаў ён у тую ноч, ці не.

Калі ж раніцою ён вярнуўся ў кухарскі пакой, то адразу ж заўважыў, што шафу адсоўвалі ад сцяны: яна стаяла цяпер не так шчыльна, як звечара.

Сышоў зусім ці проста вылазіў у прыбіральню?

Міхал услухаўся і выразна пачуў храп: спіць, як пшаніцу прадаўшы! Трэба будзе абавязкова разбудзіць яго перад тым, як з’явяцца хлопцы...

У абед Міхал зноў перадаў ежу Андрэю і пацікавіўся, што ён вырашыў рабіць далей.

— Ноччу сыду!

— Здацца яшчэ не позна...

— Не! Пасля таго, што я нарабіў... Соднямі на гаўптвахце не абыдзецца...

Радзевіч не стаў удакладняць, што нарабіў Камышанаў, бо кожную секунду хто-небудзь мог прыйсці ў пакой, а хуценька прыставіў шафу на месца і ўключыў гучней радыё.

Увечары Міхал угаварыў Ваціка памяняцца з ім у чарзе на прыгатаванне сняданку:

— Так трэба! Потым растлумачу.

Паша здзівіўся, што Радзевіч не ідзе начаваць у казарму:

— Нам жа загадалі ўчора!

— Тое было ўчора. Сёння ж ніхто нічога не казаў. Да таго ж там цяпер такая мітусня, што наўрад ці нехта стане пераймацца з таго, дзе я начую. Хутчэй за ўсё, проста не заўважаць маёй адсутнасці!

Герасімаў, натуральна ж, задумаўся, з чаго б гэта Радзевіч трэці раз запар бярэцца гатаваць сняданак, ад якога звычайна ўсе кухары імкнуцца пазбавіцца: гэта ж трэба ўзняцца яшчэ зацемна, аднаму соўгацца па настылых за ноч сталоўскіх памяшканнях, па якіх гуляюць ды выюць сцюдзёныя скразнякі, ад якіх мурашкі па скуры! А яшчэ трэба сачыць, каб не задрамалі качагары і не прыпынілася падача пары!

Паша павагаўся крыху: распытваць Міхала ці не, і вырашыў: меней ведаеш — лепей спіш! Будзе трэба — сам усё распавядзе.

Калі Шпакоўскі з Герасімавым сышлі, Радзевіч узняўся ў кухарскі пакой і выпусціў з падстрэшша Камышанава.

— Трэція содні не скончыліся: пакуль яшчэ можна вярнуцца! — пачаў Міхал упрошваць Андрэя не рабіць глупства. — Пра што вы ад пачатку думалі?! Куды вы хацелі збегчы?! Куды ўвогуле адсюль можна ўцячы?!

— Я не паспеў адпаліраваць літары, а Фрол ужо зрабіў мне апошняе папярэджанне! Калі б я прыйшоў у казарму, ён бы абавязкова пабіў мяне… Яны і так напярэдадні ўсю ноч з нас здзекаваліся: фанеру прабівалі, адціскацца прымушалі, прысядаць, над ложкам вісець… Галоўнае ж, хлопцаў за што? Яны ж усё зрабілі! А гэтыя вылюдкі ржуць: у нас калектыўная адказнасць! Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго!.. Ведаеш, як крыўдна адчуваць сябе абсалютна бездапаможным! Ды любога з іх я ў сумленнай бойцы збіў бы на горкі яблык! А тут яны ўсім кагалам лезуць, смелыя!.. Некалі абяцалі, што ніякага здзеку не будзе, толькі выконвай загады дзядуляў і ўсё!

Што яны не такія, якімі былі іхныя дзяды!.. А потым пакрысе, па кропельцы... З нейкага моманту стала відавочна, што яны большую асалоду атрымоўваюць не тады, калі мы паспяваем вымыць іхную форму ці прыгатаваць пажэрці, а наадварот, калі ў іх ёсць нагода нас пакараць! П...дзіць ім нас падабаецца! І заданні пачалі выдумляць з кожным разам усё складаней! Адзін патрабуе: плоў прыгатуйце! Другому бульбу смажаную падавай!.. Я часам думаў: вось вазьму і задушу падушкай гэтага брыдкага таўстуна Фрола: ён галоўны гаўнюк! І што тады? Найхутчэй мяне лёгка знойдуць, і ніякія мае аргументы ніхто слухаць не стане: трэба было звяртацца да камандзіраў, «стукаць», значыцца! Паскардзіцца — самому сабе смяротны прысуд вынесці!.. Тады ўжо лепей адразу самагубствам скончыць! Толькі і ў гэтым выпадку таксама атрымаецца, што яны перамаглі! Самагубца і самагубца: сам вырашыў добраахвотна развітацца з жыццём, хто тут вінаваты? Найхутчэй нікога і шукаць не стануць. Вось я і падумаў: чаму мая маці павінна галасіць на магіле сына, а Фролава выхваляцца, які яе геройскі: з залатымі пагонамі з войска вярнуўся!.. Карацей, самы відавочны варыянт — збегчы ў Германію. Яна цяпер адзіная і не савецкая! Да мяжы тут рукою падаць! Да таго ж гэтая мяжа паміж «братнімі» краінамі не такая ўжо і надзейная, як савецкія. Я чуў, як адзін прапаршчык распавядаў, што мінулай восенню са знаёмымі палякамі паехаў неяк у грыбы. Хадзілі яны, хадзілі і заблудзіліся! Выйшлі ў рэшце рэшт да нейкай вёскі. Бачаць бар. Вырашылі зайсці выпіць піва і заадно даведацца, дзе яны. Толькі пераступілі парог, а бармэн ім і кажа: «Guten Tag!»* Яны нават не заўважылі ніякай мяжы!..

* Добры дзень! *(ням.)*.

Лепей няхай мая маці ведае, што я жывы ды на волі, чым турма ці могілкі... Тым больш цяпер такі час, што, можа, усё хутка зменіцца і можна будзе спакойна ездзіць праз мяжу... Пісаць і званіць дадому мне ніхто дакладна не забароніць, а з часам, можа, калі не я да бацькоў, дык яны да мяне змогуць прыехаць!..

— Але ж ты не ведаеш мовы, там абсалютна чужыя людзі, якія не надта любяць савецкіх вайскоўцаў!

— Вашыя ж сябры са спецкамендатуры казалі, што ў ГДР ва ўсіх школах дзеці вывучалі рускую мову! Да таго ж яны вам прыносілі кніжкі, выдадзеныя на Захадзе па-руску!

Гэта была чыстая праўда: асабісты распавядалі, што, калі яны служылі ў Германіі, на КПП іх часткі прыходзілі людзі, пераважна вернікі, і прыносілі хрысціянскую літаратуру: Евангеллі, жыцці праваслаўных святых, малітоўнікі. Жаўнерам забараняелі браць гэткую літаратуру, але ўсе таму і цікавіліся ёю, што начальства не дазваляла! Калі Паша з Міхалам папрасілі даць і ім пачытаць што-небудзь забароненае, Алег і Віталь у той самы дзень прынеслі ім усе чатыры кананічныя Евангеллі на сучаснай рускай мове! А крыху пазней, відаць, у якасці бонусу, — зусім не хрысціянскую «Бхагават-гіту»*, якая таксама прыемна ўразіла цікаўных беларуса і масквіча...

— Там людзі ў Бога вераць, таму на вуліцы падыхаць не кінуць, неяк дапамогуць...

— Дык навошта вы павалакліся ў парк? Чым вы думалі: там жа ўзброеныя часавыя?!

— Я сказаў хлопцам, што вырашыў рабіць. Спытаў, хто са мною. Дзейкін адразу быў супраць. Ён у нас надта

* Помнік старажытнаіндыйскай рэлігійна-філасофскай думкі на санскрыце, аснова індуісцкай філасофіі.

правільны: усё павінна быць па правілах. А хто вызначае тыя правілы?! Сівохін адразу згадзіўся: ён авантурыст да мозгу касцей! Гэтаму толькі і карціць як болей правілаў парушыць! Карацей, дамовіліся, што Саня нас прыкрые ў казарме, а мы з Сяргеем павінныя за ноч максімальна наблізіцца да мяжы. Ідэальна, вядома ж, было б яе перайсці, але гэта ўжо — як пашчасціць... Было б у нас адзенне цывільнае — паспрабавалі б на цягніку ці аўтобусе якім бліжэй да граніцы дабрацца, а так кроку немагчыма зрабіць за агароджаю, каб не нарвацца на патруль... Тады мне і прыйшла ў галаву думка пайсці ў парк і скрасці вайсковую машыну: пакуль арганізуюць пагоню, мы палову шляху пераадолеем ужо. Да таго ж ім спатрэбіцца яшчэ час, каб зразумець, куды мы накіроўваемся.

— Але там жа аўтаматчыкі?! Як вы спадзяваліся непрыкметна прабрацца ў боксы? А выбрацца потым як?

— Дамовіліся, што Сяргей прыцягне ўвагу вартавога, а я пракрадуся ў бокс: яны ж не зачыненыя, толькі апячатаныя, і трос праз усе дзверы працягнуты. А машыны ўсе запраўленыя пад завязку, і ключы ў замку тырчаць. Я пра гэта ў хлопцаў з нарада паціху распытаў.

— Ты ўмееш вадзіць?

— У баці «Масквіч», таму я з гадоў чатырнаццаці ўжо кіроўца! Правы таксама атрымаў! Дома ляжаць... Карацей, план быў такі: Сяргей застаецца за плотам і выкрыквае што-небудзь антысавецкае. Я тым часам крадуся да боксаў, ускрываю крайнія вароты, выцягваю трос і пракрадаюся ў першую машыну...

— А далей?

— Далей заводжу аўтамабіль, выбіваю вароты і з максімальнай хуткасцю, каб не апаматаліся вартавыя, імчу да таго выезду з парку, які выходзіць прама на горад-

скую вуліцу, выношу і тыя вароты, падбіраю ля іх Сяргея, і мы едзем згодна з указальнікамі з горада…

— Ты думаеш, так проста ў незнаёмым горадзе ноччу знайсці дарогу?

— Можна спытаць у каго-небудзь!

— Дзіцячы сад!.. І што пайшло не так?..

— У тым і справа, што спачатку ўсё ішло проста ідэальна, як па нотах! Я спыніўся насупраць першых варот бліжэйшага ад агароджы бокса, а Сяргей пайшоў далей, каб апынуцца на супрацьлеглым баку з тарца будынка. Адразу за агароджаю быў цень. Калі вартавы павярнуўся да мяне спінаю і пайшоў уздоўж варот, я лёгка пералез праз плот і сцішыўся ў зацені. Але гэты ёлупень Сівохін ледзь усё не сапсаваў адразу: ці тое ад хвалявання, ці проста не падумаў, што будзе крычэць, ён раптам ведаеш што гаркнуў?.. «Гітлер капут»! Я ледзь стрымаўся, каб не зарагатаць уголас. Тады давай крычэць: «Рукі прэч, рукі прэч»… А ад чаго ці каго прэч, не ўдакладняе! Вартавы, праўда, засяродзіўся, аўтамат на агароджу наставіў і крычыць у адказ: «Ідзі спаць, дурань п’яны!» Яно і праўда: хто ж цвярозы будзе такой фігнёй займацца?!.. Я агледзеўся, каб іншыя хлопцы з нарада не падцягнуліся і выпадкова з імі не сутыкнуцца, — нікога, і пабег да абраныхваротаў. У бок аўтаматчыка я стараўся не глядзець: здавалася, калі зірну на яго, ён адразу адчуе мой пагляд і азірнецца. Пячатка, трос, усё за нейкія долі секунды выцягнуў, лёгка. Чую, Сярога выправіўся: «хай Гітлер» ужо гарлае!.. Тут жа заўважыў, што на правай палове вялізных дзвярэй маленькая брамка ёсць — цудоўна. Праслізнуў праз яе і прычыніў за сабою: цяпер вартавы, калі і азірнецца, нічога не заўважыць. Калі б створку варотаў адчыніў — адразу б у вочы кінулася… А ў сярэдзіне такая цемень — хоць

вока выкалі! Дабраўся я навобмацак да кабіны, нават не ведаю, якая машына, вялікая нейкая — ключы на месцы… Ну, усё, думаю, паехалі! З ручніка зняў, patorgaў рычаг каробкі — нейтралка, выціснуў счапленне, крутануў ключ — цішыня!.. Я нават не паверыў! Туды-назад! Нічогачкі!.. Што рабіць?! Сапсаваная машына? Палез у наступную — тое самае!.. Яшчэ адна таксама аказалася нежывою! Я ўжо хвалявацца стаў, аж калаціць пачало! Вырашыў, што, мабыць, клемы з акумулятараў паздымалі. Мой бацька так рабіў часам, калі машыну дзенебудзь на вуліцы пакідаў… Згадаў пра запалкі… Ледзь усе не спаліў, пакуль знайшоў, за што пацягнуць, каб капот адчыніўся!.. Зазірнуў пад яго на адной машыне — ЗІЛ аказваецца, на другой, трэцяй — няма акумулятараў!.. Нічога сабе баяздольнасць… Няўжо яны ўсе на падзарадку паставілі?.. Запалкі скончыліся, і на вуліцы зусім ціха стала: змоўк чамусьці Сярога… Ну, усё, думаю, пара выбірацца…

— Эх ты, вадзіцель з правамі! ЗІЛ — гэта не «Масквіч»! Па-першае, акумулятары ў іх не пад капотам стаяць, а з боку кіроўцы, ля прыступкі пад дзвярыма ёсць ніша спецыяльная. А па-другое, ва ўсіх грузавых машынах ёсць такі вялікі металічны тумблер, «маса» называецца, ён адключае акумулятар!.. Усё там было на месцы і ў поўным парадку!.. Ну і як ты вылез з тых боксаў?

— На жаль, не так лёгка, як трапіў у іх. Галоўная праблема ў тым, што адтуль ніяк немагчыма разгледзець, дзе вартавы: а што, калі адчыню брамку, а ён насупраць стаіць?! Зрэшты, выбару не было. Вырашыў: адзіны шанц выбавіцца — дзейнічаць па магчымасці нахабна і хутка! Штурхануў ад сябе дзверцы і паляцеў, як скажэнны, у бок агароджы! Чую зусім побач: «Стой, страляць буду!» Але стрэліў ён толькі тады і тое ў паветра, калі я ўжо

праз плот пералазіў: ведама, на маё шчасце, разгубіўся хлопец: яны ж небяспеку звонку прывыклі чакаць, а тут з сярэдзіны зачыненага бокса нехта вылецеў! Я б на ягоным месцы і з аўтаматам абасраўся б! Цікава, хто гэта быў: знаёмы ці не?.. Скочыў я на тратуар, аж тут зноў крычаць: «Стой!» Бачу, гэта патруль бяжыць, і якраз з таго боку, куды Сівохін пайшоў... Карацей, я на пяту — і ў гарадок. А ў сталоўку праз акно ўлез, тое, што ля хлебарэзкі, яно не зачыняецца, я ведаў... Далей, мяркую, расказваць не трэба?..

— Зразумела, гора-ўцякач!.. Цяпер жа збегчы будзе яшчэ складаней, калі не перадумаеш: увесь гарадок ды і ўсё места патрулююцца!

— Ужо не перадумаю! Ці пан, ці прапаў! Буду дзейнічаць зноў па магчымасці хутка ды нахабна! Авось і пранясе!

— Эх, ужо гэтае вашае авось! Калі зловяць, не кажы хоць, што ў сталоўцы хаваўся, ці хаця б, што я ведаў...

— Не хвалюйся, не скажу!.. Колькі ўжо?

— Думаю, каля дзвюх...

— Самы час! Хадзем уніз.

Спусціліся ў варачны цэх: тут вокны добра адчыняліся і ад сцяны сталоўкі было метры тры да агароджы, за якой праходзіла звычайная вуліца Свідніцы. На супрацьлеглым яе баку месціўся вялікі прыватны ўчастак з трыма вялізнымі цяпліцамі, у дзвюх з якіх цвілі кветкі, а ў трэцяй, наколькі можна было бачыць праз шкло, вырошчвалі зеляніну ды гуркі з памідорамі. Аднак гэтая найбліжэйшая сяліба ўяўляла вялізную небяспеку: па начах па ёй гойсалі чатыры велічэзныя сабакі, якія адказвалі на любы рух па вуліцы страшэнным брэхам. Участак з цяпліцамі неабходна было абмінуць, а там ужо — як пашчасціць...

Хлопцы спачатку развіталіся:

— Дзякуй табе, Міхал, за ўсё!

— Бывай, мо калі яшчэ і ўбачымся, Андрэй! Удачы табе!

Затым адчынілі акно. На вуліцы чуліся галасы, быццам удзень; па агароджы слізгануў прамень ліхтара. Счакалі некалькі хвілін. Здаецца, далекавата. Пара! Андрэй пералез на бляшаны адліў і пакрысе павіс, трымаючыся рукамі за ніз аконнай каробкі. Міхал прытрымліваў яго-ныя рукі. Да зямлі засталося каля метра.

— Адпускай!

Як толькі боты ўцекача грукнулі па глебе, аднекуль зусім побач крыкнулі:

— Стой!

Андрэй скочыў убок, а Радзевіч выразна пачуў гулкі тупат ботаў, які імкліва набліжаўся. Міхал паспешна зачыніў акно і ледзь паспеў схавацца, як з вуліцы данесліся галасы і скрозь шыбы па сценах варачнага цэха забегалі плямы жоўтага святла ад электрычных ліхтароў.

Што цяпер будзе?! Нічога ў яго не атрымаецца! Мабыць, ужо злавілі!..

Аднак раніца пачалася як звычайна: нічога новага ніхто не паведаміў. Калі б затрымалі Камышанава, дык толькі б пра гэта і было гаворкі!..

Прыйшлі з казармы Паша з Вацікам. Таксама нічога новага не сказалі.

Хлопцы ўтрох сядзелі пасля сняданку ў кухарскім пакоі, як раптам расчыніліся дзверы і ў памяшканне літаральна ўварвалася цэлая дэлегацыя: тыя два падпалкоўнікі, якіх Радзевіч бачыў на допыце ў кабінеце камандзіра, батальённы палітрук, начальнік сталоўкі Антонаў, Саня Дзейкін і Сяргей Сівохін.

— Ну, паказвайце! — звярнуўся палітрук да Сані і Сяргея.

Першым апрытомнеў Сяргей: ён падышоў да шафы і ўзяўся за яе ніз збоку.

«Халера! Там жа посуд застаўся!» — спалохана падумаў Міхал.

— Што стаў? Дапамагай! — звярнуўся Сяргей да Дзейкіна.

Той неяк надта паспешліва падбег да сябра, і разам яны лёгка адставілі шафу ад сцяны.

— Ні храна сабе! — здзівіўся ўголас Антонаў, калі ўбачыў на сцяне люк.

Адзін з падпалкоўнікаў імкліва падышоў да толькі што вызваленай сцяны і адчыніў лаз у падстрэшша:

— Камышанаў! Выходзьце! Мы ведаем, што вы там!

У пакоі запанавала мёртвая цішыня: усе, акрамя Радзевіча, чакалі адказу.

І скуль жа ён ведае?

Падпалкоўнік схапіў з тумбачкі настольную лямпу, пстрыкнуў выключальнікам і, бы Гервасій Выліваха* з кветкай шыпшыны ў апраметную, палез у падстрэшша праз невялічкую дзірку ў сцяне.

Праз імгненне з апраметнай вылецеў імбрык і бразнуўся аб падлогу: з яго носіка паліўся недапіты Андрэем кампот. Следам вылецелі брудныя алюмініевыя талеркі і глуха пляснуліся аб лінолеум...

Затым з праёма ў сцяне вытыркнулася галава падпалкоўніка ў фуражцы і, як ні дзіўна, з выразам нечуванай асалоды на абліччы. Афіцэр увесь праціснуўся ў пакой і выставіў наперад правую руку, у якой трымаў салдацкі бушлат:

* Галоўны герой аповесці Уладзіміра Караткевіча “Ладдзя роспачы”.

— Што гэта?! — акінуў пільным паглядам прысутных трыумфатар.

Яму ніхто не адказаў: усе маўчалі, як зачараваныя, быццам высокі начальнік трымаў у выпрастанай руцэ не брудноватую салдацкую ватоўку, а галаву Медузы Гаргоны!

— Чый?!

Зноў ніхто не азваўся.

— Так, значыцца, добраахвотна ніхто не жадае…

Усе маўчалі…

— Што ж, зараз паглядзім…

Следчы дэманстратыўна павольна адхінуў крысо адзежыны і прачытаў выпалены хлоркай на ўнутранай кішэні надпіс:

— Аляксандр Македонскі!

На гэты раз пасміхнуліся ўсе, хто быў у пакоі, акрамя Вацікa, нават другі следчы не стрымаўся. Аднак першы падпалкоўнік абсалютна не адчуў гумару:

— Хто з вас Македонскі?! — начальнік утаропіўся ў адзінага, хто не рагатнуў.

— Я Шпакоўскі, — ледзь чутна прагаварыў спалоханы Вацік і, відаць, каб не было ніякіх сумненняў, паказаў пальцам на вешалку. — Мой бушлат вунь вісіць, — удакладніў.

Бушлатаў у кожнага жаўнера ў батальёне было па некалькі штук, бо тыя, хто звальняўся з войска, натуральна, не забіралі іх з сабою, а для тых, хто заставаўся служыць, гэтая цёплая вопратка была сапраўднаю знаходкай падчас працы ў парку ля машын ці на вучэннях.

Да следчага, відаць, нарэшце дайшло, што надпіс на ватоўцы — усяго толькі досціп нейкага даўно ўжо дэмабілізаванага жартаўніка, якога тут ніхто і ведаць не ведае. Ён кінуў салдацкую адзежыну на ложак і паказаў на талеркі ды імбрык:

— А гэта скуль там узялося?

Усе маўчалі.

— Таварыш падпалкоўнік, — нечакана азваўся Антонаў, — можа, гэта ад мотастралкоў яшчэ засталося?

— А-га! Як жа! Вунь падліва яшчэ свежанькая! — не прыняў версію начальніка сталоўкі следчы. — Хто з вас сёння начаваў у сталоўцы?

— Я, — узняўся Міхал і прадставіўся, — радавы Радзевіч.

— Вам жа загадалі быць у казарме! Чаму вы апынуліся тут?

— Гэта ж заўчора загадалі, каб мы начавалі ў падраздзяленні, а ўчора ніхто нічога не казаў. Да таго ж, калі гатуеш сняданак, начаваць тут нашмат зручней: можна крыху болей паспаць, ды і пераапранацца па сто разоў туды-сюды не трэба.

— Ну і дысцыплінка ў вас, таварыш маёр, — звярнуўся падпалкоўнік да батальённага палітрука. — Што хачу, тое і варачу! Уся група войскаў, значыцца, на вушах стаіць, а гэты спакойна застаецца ў сталоўцы і дапамагае дэзерціру Камышанаву пакінуць схованку! Так?! — следчы ўтаропіўся ў Міхала пранізлівым позіркам, быццам і на самай справе ўсё ведаў.

— Апошні раз я бачыў Камышанава пазаўчора…

— А гэта тады што? — падпалкоўнік штурхануў бліскучым носікам чаравіка імбрык.

— Я не ведаю…

— Гэта я, — раптам абазваўся Герасімаў і ўсе павярнуліся да яго.

— Ты дапамог Камышанаву?! — узрадаваўся асабіст.

— Не! Я паклаў туды посуд…

— Навошта?!

— Нея̌к ноччу я захацеў есці, пайшоў уніз, прыгатаваў і прынёс сюды, — даволі ўпэўнена хлусіў Паша. — А потым паленаваўся адносіць назад брудны посуд, а пакідаць яго навідавоку не хацелася: адсунуў шафу і паставіў у падстрэшша, думаў — пазней прыбяру…

— І? — удакладніў падпалкоўнік.

— Забыўся, — спакойна патлумачыў масквіч.

— Забыўся ён!.. Толькі памятайце: мы нічога не забываем! Зловім вашага таварыша — усе, як адзін, пойдзеце па справе як саўдзельнікі!

Радзевіч непрыкметна скасавурыўся на Антонава з палітруком: таксама саўдзельнікі?

— Што ж, тут мне ўсё зразумела! Хадзем! — скамандаваў падпалкоўнік.

— А мы, — нясмела спытаў Дзекін, — можам застацца?

— Не можаце! За мной!

Калі наведвальнікі сышлі, Радзевіч падзякаваў Пашу за дапамогу:

— Я, шчыра кажучы, разгубіўся. Нічога ў галаву не прыходзіла. Калі б не ты, не ведаю, чым бы і скончылася…

Калі Ваціка не было паблізу, масквіч удакладніў у Міхала:

— Дык ён быў тут?

Цяпер сэнсу выкручвацца не было:

— Быў.

— І куды падзеўся?

— Сказаў, што ў Германію…

Праз некалькі гадзін Паша зноў згадаў Андрэя:

— А ведаеш, — звярнуўся ён да Міхала, — Камышанаў мае рацыю: ніхто не возьмецца прадказаць, чым скончыцца гэтая перабудова, ці не паўстане зноў жа-

лезная заслона. Пакуль ёсць магчымасць, трэба бегчы ў вольны свет. Іншай можа не надарыцца больш ніколі!

— Ты пабяжыш?! — здзівіўся Радзевіч.

— Не, я не пабягу. Я — фаталіст! Але ўсведамляць, што такая магчымасць ёсць, пагадзіся, прыемна... Дзіўна, што іншыя гэтага не бачаць...

Ужо праз дзень узмоцненыя патрулі адмянілі: батальён у поўным складзе вярнуўся ў казарму. Яшчэ праз содні ў сталоўцы з'явіліся Дзейкін і Сівохін. Абодва расшпіленыя: не выдалі сваіх дзядуляў, значыцца.

— Такую схованку засвяцілі! — абурыўся Вацік.

— Цябе б так прэсанулі, ты б і не такога панагаварыў! — агрызнуўся Сівохін. — Мы нават не памятаем, калі і як сказалі пра яе! Некалькі содняў спаць не давалі! І ўсё, як у кіно, лямпай у вочы свяцілі! Аднаму богу вядома, што я там трызніў, нават цяпер не па сабе!

— Нас нават гіпнатызавалі! — раптам зазначыў Дзейкін.

— Скуль ты можаш ведаць? — засумняваўся Паша.

— У нас у школе неяк выступаў вядомы гіпнатызёр...

— Ага, Кашпіроўскі, — перабіў Саню скептык Герасімаў.

— Не, нейкі іншы, — зусім не сумеўся Дзейкін, — не такі вядомы. Дык вось, напачатку ён адбіраў тых, на каго можа ўздзейнічаць: папрасіў сашчапіць далоні і, не разрываючы, узняць іх над галавою, вось так...

Дзейкін узняў над галавою выпрастаныя рукі з сашчэпленымі пальцамі далонямі ўверх.

— Потым нешта там палічыў і папрасіў у гэткім жа становішчы растуліць рукі. Паспрабуйце, гэта зусім не проста... Бачыце... Вось тых, хто не здолеў адчыніць замок, ён запрасіў на сцэну. Я таксама выйшаў, хаця, калі шчыра, не асабліва і намагаўся раздымаць свае рукі: мне проста было цікава, што будзе. Але мужык той праз

імгненне вылічыў, што я прыкідваюся, і сагнаў са сцэны. З тымі ж, хто застаўся, чаго ён толькі не выраблуў: і на адной назе загадваў стаяць, і плаваць па падлозе, бы па вадзе, і пеўнем крычэць — яны ўсё выконвалі! Я б ні за што не паверыў, што такое магчыма, калі б не ведаў усіх паддоследных! Ні секунды болей не пашкадаваў, што на мяне не дзейнічае. Мы потым дапытваліся ў тых акцёраў нашых, што яны адчувалі, — ні адзін нічога не памятаў!

— Неяк непраўдападобна, каб яны такія метады прымянялі ў такой дробнай справе: падумаеш, жаўнер уцёк! — цяпер выказаў сумненні Радзевіч.

— Не кажы, — шматзначна запярэчыў Саня, — гэта справа гонару: пад самым носам у спецкамендатуры такое здарылася!

— Ды якое такое?!

— А вось гэта я падчас гіпнозу і зразумеў! Чаго яны такі гармідар з такой, як ты кажаш, дробнай справы раздзьмулі!..

— Ну і чаму? Не цягні ката за хвост!

— Як толькі той упарты падпалкоўнік, што ў падстрэшша лазіў, пачаў у мяне перад носам свой гадзіннік на ланцужку, як маятнік, пагойдваць, я адразу здагадаўся, што да чаго, і зрабіў выгляд, быццам на мяне дзейнічае!.. Спачатку ён задаваў агульныя пытанні: як мяне завуць, дзе я нарадзіўся, хто мае бацькі… А потым і кажа: «На якую спецслужбу заходніх краін вы працуеце?» Уяўляеце?! «Ні на якую», — адказваю. Тады ён яшчэ пра нейкую лухту параспытваў: як прозвішча камандзіра батальёна, якое званне ў начальніка сталоўкі, хто са старэйшых кухараў самы злы…

— І што ты на гэта сказаў? — напружыўся Паша.

— Вядома ж, Шпакоўскі!

Усе зарагаталі, а Вацік прыкметна разгубіўся:

— Ты што, здурнеў?!

— Як ты сам не зарагатаў? — скрозь смех пацікавіўся масквіч у Сані.

— Цудам! Выключна цудам! Ляпнуў не падумаўшы!

— Вось менавіта, думаць трэба, што гаворыш, Дзейкін! — абурыўся Шпачок.

Смех выбухнуў з новай сілай: усе ведалі звычку Валіка выкладваць кожнаму сустрэчнаму ўсё, што трэба і не трэба!

— Чыя-чыя б карова мычала, а твая б ужо… не брахала! — выказаўся за ўсіх Радзевіч.

Калі крыху супакоіліся, Дзейкін працягнуў:

— А потым ён зноў пытаецца: якую іменна станцыю сувязі вам загадалі скрасці?! Зразумелі цяпер, у які бок яны найперш думалі?! З чаго раптам такі перапалох?! Калі б вы, — цяпер Саня звяртаўся да Сяргея, — не палезлі ў той парк, дык вашу адсутнасць і праз тыдзень ніхто б не заўважыў! Да самага Берліна спакойна пехатою дайшлі б за гэты час! Але ж мы разумныя, нам трэба з камфортам, каб ехаць!

Сівохіна ж, падобна, у гэты момант турбавала штосьці зусім іншае:

— Я ж нічога не памятаю!.. Што я ім нагаварыў?!

— Не хвалюйся: калі б сказаў, на чыю выведку працуеш, тут бы не сядзеў! — супакоіў сябра Дзейкін.

Усе зноў засмяяліся…

А яшчэ праз тыдзень у сталоўку завіталі госці са спецкамендатуры: Алег ды Віталік. І як заўсёды, між іншага, вядома ж па сакрэце, паведамілі, што іхныя следчыя дакладна высветлілі, што дні тры таму Андрэя Камышанава пад выглядам нябожчыка, у труне перавезлі праз мяжу ў Германію!

— Хто перавёз? — удакладніў Радзевіч.

— Хто-хто?! — у сваю чаргу шчыра здзівіўся Алег. — Вы што, не ведаеце, што тут дзейнічае цэлая арганізацыя, якая хавае дэзерціраў з савецкага войска і займаецца іх перапраўкай на Захад?

— І як з імі звязацца? — пацікавіўся Паша.

У абодвух гасцей аж сківіцы адвіслі ад здзіўлення.

— Ды супакойцеся вы! Жартую я!

— Ну і гумар у цябе, Паша! — абурыўся Віталь. — Такімі рэчамі не жартуюць! За іх ведаеш што можа быць?

Радзевіч жа моцна здзівіўся, што грамадзяне Польшчы дапамагаюць уцекачам з савецкага войска, і, відаць, прычына зусім не ў тым, што яны справядліва ставяцца да яго як да акупацыйнага і, адпаведна, імкнуцца максімальна нашкодзіць, а ў тым, што палякі выдатна разумеюць розніцу паміж асобным чалавекам і сістэмай, цудоўна ведаюць, ад чаго бягуць тыя жаўнеры і што з імі будзе, калі іх зловяць: родная дзяржава не стане на іхнюю абарону, не будзе дакопвацца да прычыны ўчынку, а жорстка пакарае за сам факт дэзерцірства!

Палякі толькі пачалі пазбаўляцца ад падобнай абрыдлай сістэмы, на свабодных выбарах абралі дэмакратычны парламент і прэзідэнта, нанова вучацца жыць вольна, не баяцца адкрыта выказвацца на любыя тэмы і, натуральна, не могуць мірыцца з ганебнымі перажыткамі таталітарызму ды абсалютна крымінальнага гвалту, якія яшчэ пануюць на іхнай зямлі, за бетоннымі агароджамі савецкіх ванных гарадкоў…

Таму дапамога ўцекачам ад здзекаў — гэта найперш праява той легендарнай польскай салідарнасці, якая дапамагла перамагчы, здавалася, непарушны, жалезабетонны маналіт таталітарызму ў іхнай краіне, пагроза вяртання якога па-ранейшаму яшчэ застаецца, пакуль тут

знаходзіцца чужое войска, а ў Савецкім Саюзе могуць прыйсці да ўлады рэваншысты.

«За нашу і вашу свабоду!» — ранейшы лозунг паўстанцаў не толькі не страціў актуальнасць, а якраз набыў абсалютна празрыстую надзённасць: немагчыма камусьці аднаму пачувацца па-сапраўднаму вольным, калі нехта побач гібее пад ярмом несправядлівасці ды гвалту…

## XVII

Ужо ў сярэдзіне траўня асобны батальён сувязі чарговы раз змяніў месца пастаяннай дыслакацыі: цяпер даводзілася абжывацца ў ваенным гарадку, які ўяўляў дакладную копію першага, Свідніцкага, з той толькі розніцай, што ўсе будынкі размяшчаліся ў ім, нібы ў люстэркавым адбітку: цяпер цэнтральны КПП знаходзіўся не злева, а справа, калі стаяць тварам да галоўнага ўвахода ў сталоўку. Насупраць асноўных варотаў, адпаведна, быў кантрольна-прапускны пункт у парк. Ды і сама сталоўка, натуральна, таксама была быццам перакручана на трыста шэсцьдзесят градусаў: галоўныя дзверы ў ёй выходзілі не на праезджую частку паміж двума КПП, а на пляц. І месціўся гэты клон першага гарадка, у які былы камандзір гаспадарчага ўзвода старшы прапаршчык Пятроў прывёз год таму з Явара трох новых кухцікаў, у горадзе Легніца, дзе знаходзіўся штаб Паўночнай групы войскаў. За неверагодную колькасць савецкіх грамадзян, якая ці не пераўзыходзіла колькасць мясцовых жыхароў, гэты горад з нечай лёгкай рукі ў Польшчы называлі Маленькая Масква.

Неўзабаве ў гэты ж гарадок пераехалі і фельд’егеры, якія год таму былі суседзямі сувязістаў у Свідніцы, таму

іхны повар абхазскі беларус Саня Купрыянец зноў прыйшоў працаваць у сталоўку.

Такім чынам, цяпер у сталоўцы працавала аж шасцёра вопытных спецыялістаў. Ніколі раней не было хлопцам так проста і лёгка гатаваць: толькі раз на тыдзень выпадала кожнаму зрабіць сняданак, пасля чаго можна было адпачываць цэлы дзень. У адрозненне ад сваіх папярэднікаў, кухары не ламалі абсталяванне, а наадварот, імкнуліся падтрымліваць яго ва ўзорнай чысціні ды спраўнасці. Паводле новых нормаў харчавання вайскоўцаў, жаўнерам пачалі выдаваць малако! Мяса ж усё часцей і часцей набывалася ў мясцовых гаспадароў, і цяпер гэта была не толькі свежая нятлустая свініна, а і бараніна ды курaціна.

Стравы ў звычайнай салдацкай сталоўцы набылі неверагодную для падобных установаў якасць, а меню пачало вызначацца прыкметнай разнастайнасцю. Тыя з сувязістаў, хто выязджаў з батальёна ў камандзіроўкі ў іншыя часткі, заўсёды, калі вярталіся, не шкадавалі кампліментаў на адрас сваіх кухараў. Усё часцей і часцей афіцэры і прапаршчыкі, якія знаходзіліся ў нарадах, прыходзілі ў сталоўку і елі тое самае, што і іхныя падначаленыя. Раней нічога падобнага не было ніколі. Яны таксама нярэдка не шкадавалі добрых словаў для тых, хто завіхаўся на кухні.

Кухары адчувалі, што іх па-сапраўднаму паважаюць і ставяцца, як да людзей важных. Асабліва гэта разумелі старэйшыя, якія і самі не паспелі заўважыць, як у канцы траўня, калі з’ехалі апошнія «вясеннікі», ператварыліся ў самых статусных жаўнераў у батальёне — дэмбеляў. Не пазней, як у кастрычніку, Вярхоўны галоўнакамандуючы, прэзідэнт СССР Міхаіл Гарбачоў падпіша адпаведны загад, а яшчэ праз месяц яны ўжо будуць дома!

Радзевіч адзначыў, што прапаршчыкі і ледзьве не ўсе афіцэры цяпер вітаюцца з ім за руку, нібы з роўным: як ні круці, а практычна большасць з іх ён ведае ўжо цэлы год.

Галоўным жа прывілеем было тое, што абсалютна нікога з начальства не цікавіла, чым займаюцца старэйшыя кухары і дзе яны знаходзяцца: сталоўка працуе спраўна, значыцца, усё добра.

Міхал мог тыднямі жыць у сталоўцы, мог у любы час прыйсці ў казарму, уключыць тэлевізар, і калі дзяжурны па частцы заспяваў яго пасярод ночы ў ленінскім пакоі за недапушчальным праглядам якога-небудзь галівудскага шэдэўра, то ці проста далучаўся, ці здароўкаўся і сыходзіў. Асабліва ж Радзевічу падабалася падарожнічаць па тэрыторыі ваеннага гарадка. І хоць ягоная плошча была зусім невялікая, усё ж адна зацішная мясцінка вабіла найбольш: стрэльбішча. Ім даўно не карысталіся, і цяпер тут буялі, як на сапраўдным лузе, разнастайныя краскі, гулі пчолы, па краі шумелі досыць вялікія бярозкі. Адразу за агароджаю пачынаўся прыгожы прыватны сад пана Юзіка, да якога жаўнеры валачылі ўсё, што можна было прадаць. Калі легчы ў траву галавою да пачварнага бетоннага плота-мяжы гарадка, каб ён не трапляў у поле зроку, узнікала поўная ілюзія, што ты дзесьці дома, прылёг адпачыць на ўскрайку дзедавай сялібы...

Паколькі праект будынка сталоўкі быў тыпавы і звонку практычна поўнасцю супадаў з праектам той сталоўкі, у якой кухары пачыналі службу ў батальёне сувязі, адчуванне нейкай своеасаблівай разнастайнасці дэжавю не пакідала ўсіх, хто папрацаваў у першым гмаху. Кожны дзень нехта са смехам распавядаў астатнім, як сутыкнуўся са сцяною, якой раней там не было, пераб-

лытаў дзверы ў доўгім падвальным калідоры і трапіў не туды, куды планаваў, як не мог уцяміць, чаму з акна замест казармы стаў бачны пляц.

Калі Радзевіч упершыню апынуўся на супрацьлеглым баку пляца і ўбачыў сталоўку цалкам з пэўнай адлегласці, яму зрабілася зусім не да смеху: на самым цэнтры крутога даху будыніны ўзвышалася чатырохкутная вежа, з граняў якой пазіралі на ўсе чатыры бакі свету белыя кругі цыферблатаў з чорнымі лічбамі і стрэлкамі, а вянчаў яе флюгер — металічны сцяжок, які тырчаў на стрыжні над шпілістым чатырохсхільным дашкам.

Міхал вярнуўся ў сталоўку, знайшоў ключ ад дзвярэй, якія вялі на гарышча, і адразу ж пайшоў даследаваць вежу з сярэдзіны. Гадзіннікавы механізм напалову адсутнічаў, затое высветлілася, што калі пакруціць адну вялікую шасцяронку, усе чатыры пары стрэлак тут жа пачнуць рухацца. Цікава, хто-небудзь знізу заўважыць, што гадзіннік «ажыў»?

Калі Радзевіч агледзеў усе вокны на гарышчы — натуральна, іх было роўна чатырнаццаць, — высветлілася: адчыняецца толькі тое, што справа ад увахода і пад якім ляжаць тры скрыні, збітыя з грубых негабляваных дошак.

Хлопец паставіў адна на адну тыя скрыні і ўскараскаўся на верхнюю, адчыніў акно, з якога добра праглядалася палова гарадка: пляц як на далоні, дом культуры, мяжа-агароджа, чыгуначны насып, а за ім крыху правей сцяна аднолькавых пяціпавярховікаў — дамы афіцэраў і служачых.

У правым ніжнім куце рамы тырчыць напалову ўбіты і загнуты цвік, да яго прывязана белая капронавая нітка, якая цягнецца праз увесь схіл даху да нейкай металічнай сферы, што вісіць пад тым цыферблатам на вежы, які пазірае на пляц, акурат над цэнтральным уваходам

у сталоўку. Міхал аднекуль ведае, што гэтая сфера — звон, хоць яна зусім не падобная да тых званоў, якія ён недзе бачыў... Цікава, дзе? Хіба што па тэлевізары...

Радзевіч агледзеў наваколле: на пляцы ўжо выстраіўся ўвесь батальён. Развод. Начальнік штаба, як заўсёды, махае рукамі, надта эмацыйна, толькі кожнае дзясятае слова не мат, даводзіць да падначаленых, якія яны ўсе спрэс кантужаныя ідыёты і якія позы з «Камасутры» ён выкарыстае ў дачыненні да іх, калі яшчэ хаця б толькі раз, барані божа, нехта пасмее ці набярэцца нахабства, забудзе гэтае папярэджанне, наблізіцца, падыдзе, не схаваецца, збяжыць, трапіцца на вочы, не выканае распараджэнне або праявіць якую-небудзь ініцыятыву без узгаднення!.. Карацей, спрэс узаемавыключальныя патрабаванні! Падобна, маёру падабаецца пры нагодзе пагуляць у фюрэра: наўмысна ці не, але, калі толькі ў яго з'яўляецца магчымасць, калі адсутнічае камандзір і ён застаецца за галоўнага афіцэра ў батальёне, начальнік штаба, відавочна не без асалоды, паўстае на пляцы перад раўнюткімі шыхтамі асабовага складу і ўчыняе самую сапраўдную істэрыку, падобную да той, якую дэманстраваў зачараваным немцам крывавы правадыр трэцяга рэйху. Выкрыкванне ім мацюкоў, грымасніčанне ды пырсканне слінаю звычайна цягнецца не меней за паўгадзіны! Паназіраеш за такім відовішчам, і нават калі не чытаў «Бхагават-гіту» ніколі раней, нічога не чуў пра рэінкарнацыю, непазбежна саматужна прыйдзеш да высновы пра магчымасць перасялення душаў. Можа, на самай справе менавіта гэтага начальнік штаба і дабіваўся ад падначаленых?..

Міхал разумее, што яму дастаткова толькі крыху прысесці на скрыні, каб з пляца яго не заўважылі, і з асалодаю рэзка тузае за капронавую нітку — наваколле

аблятае высокі, пранізлівы гук, які звонкім рэхам шматкроць адбіваецца ад найбліжэйшых будынкаў, а начальнік штаба абрываецца на паўслове і, як усе на пляцы, паварочвае галаву ў бок вежы з гадзіннікам. З паўхвіліны людзі ўнізе, нібы зачараваныя, глядзяць на раптоўна ўваскрэслы стары хранометр: натуральна, што танюткай капронавай ніткі яны не бачаць.

Радзевіч сам сабе пасміхаецца ад такога ўдалага жарту: столькі людзей адначасова ён ніколі яшчэ не ўводзіў у ступар.

Затым маёр павольна, нібы толькі прачнуўся, аглядае асабовы склад і падае каманду разысціся.

Міхал тут жа прычыняе акно, разбурае штуршком нагі піраміду са скрыняў пад ім і збягае з гарышча: раптам начальства заявіцца паглядзець, што тут адбываецца з гадзіннікам.

Ён абавязкова вернецца сюды апоўначы...

Масквіч Паша Герасімаў таксама па-свойму выкарыстоўвае нечаканыя прывілеі дзедаўска-дэмбельскага становішча: не, ён не здзекуецца з няшчасных кабаноў, нікога не прымушае мыць свае нагавіцы, не прабівае нічые фанеры. Для падобных танных забаў у гаспадарчым узводзе ёсць жахлівы Лёха Камароў. Паша ж наўпрост практычна не бывае ў казарме, а займаецца самай сапраўднай даследчай дзейнасцю: падарожнічае па невядомай старажытнай Легніцы. Яшчэ ў Свідніцы сябры са спецкамендатуры здабылі яму на замову цывільную вопратку: красоўкі, джынсы, пару кашуль ды лёгкую спартовую куртку… Там сходзіць у самаволку Герасімаў не паспеў, а вось на новым месцы адрываецца напоўніцу! Калі для Радзевіча са Шпакоўскім заўсёды існуе пагроза трывогі і неабходнасці бегчы ў парк са сваімі ПУСамі, што і не дазваляе ім, акрамя адсутнасці цывіль-

нага адзення, далучыцца да Пашавых шпацыраў, то Герасімаву нікуды бегчы не трэба: для прывілеяваных гаспадарнікаў трывогі не існуе.

У цывільным адзенні Паша бадзяецца па горадзе не толькі па начах, але і ўдзень. Ноччу небяспеку ўяўляюць мясцовыя крымінальнікі ды іншыя напаўадэкватныя суб'екты, а ўдзень даводзіцца быць пільным, каб не сутыкнуцца з кім-небудзь са знаёмых афіцэраў, якія таксама найчасцей перамяшчаюцца па вулках горада не ў вайсковай форме.

Пасля вяртання са сваіх рызыкоўных падарожжаў Паша гадзінамі з задавальненнем дзяліўся новымі адкрыццямі з сябрамі, падрабязна распавядаў пра тое, што бачыў. Масквіча ўражвала найперш старажытная архітэктура: велічныя храмы і вузкія брукаваныя вулкі места, надта крутыя чарапічныя дахі з высачэннымі трубамі-комінамі… Для савецкага чалавека гэтае места было амаль Парыжам. У адрозненне ад Міхала і Ваціка, якія бачылі горад толькі мелькам, падчас выездаў на вучэнні, Паша спакойна заходзіў у касцёлы і разглядаў старажытныя вітражы, слухаў арган і чытаў надпісы на шыльдах, якія шчыльна туліліся на сценах храмаў. Яшчэ Герасімаў адзначаў, што новыя магазіны з'яўляюцца ў гэтым горадзе, як грыбы пасля дажджу: кожную вандроўку ён знаходзіў на знаёмых вулках незнаёмыя большыя і зусім маленькія крамы.

— Далібог, у Маскве ні на адной цэнтральнай вуліцы няма такой колькасці крамаў, цырульняў, касметычных салонаў, як тут на самай шараговай! — шчыра дзівіўся Паша. — Вось яны, жахі капіталізму! А ў нас, кажуць, магазіны ўсе спрэс пустыя стаяць, нічога няма!

— І цэны, цэны сталі такія, што проста жах! — падключыўся Вацік. — Той рыжы прапаршчык, са спецы-

ялістаў, ну з майго ПУСа каторы, што з адпачынку вярнуўся, казаў, што пачак цыгарэт цяпер у Саюзе каштуе цэлых сем рублёў! Уяўляеце, такія грошы за пачак цыгарэт!

— Табе чаго турбавацца? Ты ж не курыш, — не стрымаўся, пакпіў са Шпачка Радзевіч.

Вацік задумаўся на некалькі секунд, а потым выдаў:

— Можа, каб танней каштавалі, дык і закурыў бы!

Паша з Міхалам пераглянуліся і проста пакаціліся ад смеху!

Лета распачалося надзіва цёплае ды лагоднае: ніякага параўнання з мінулым прахалодным і дажджлівым.

Пры любой магчымасці ўсе імкнуліся выйсці на вуліцу, пазагараць на сонейку ці пасядзець у цяньку.

Неяк па абедзе Міхал, Вацік ды Саня Купрыянец адпачывалі на ганку сталоўкі, дыхалі свежым паветрам, атрымлівалі асалоду ад прыгожага чэрвеньскага дня. Да іхнай кампаніі далучыўся старшы прапаршчык Меліхаў, які дзяжурыў па сталоўцы. Ён сеў побач з Радзевічам на гранітную прыступку, выцягнуў з кішэні насоўку і абцёр ёю шыю і мокры ад поту лоб.

— Таварыш прапаршчык, — звярнуўся да свайго старшыны Міхал, — што там чуваць наконт вучэнняў? Будуць ці не ў бліжэйшы час?

Радзевіч думаў, што было б зусім не кепска апынуцца зараз дзе-небудзь за горадам, на рэчцы, ці ў лесе, дзе якраз паспелі суніцы.

— Жартуеш?! Якія цяпер могуць быць вучэнні: амаль усе спецыялісты ў адпачынках! Дзяцей трэба каму ў летнікі, каму ў інстытуты ўладкоўваць!

З-за рога сталоўкі з боку КПП выйшла высокая, вельмі сімпатычная дзяўчына гадоў сямнаццаці ў лёгенькай паркалёвай сукенцы і накіравалася ў бок кухараў.

— О-го! — не стрымаўся Саня. — Ніфіга сабе!

Ва ўсіх астатніх проста сківіцы адвіслі ад здзіўлення.

Цывільныя з ліку дзяцей ды жонак вайскоўцаў нярэдка заходзілі на тэрыторыю гарадка па розных справах. Найперш у кнігарню і прадуктовую краму, але месціліся тыя ўстановы зусім у іншым напрамку, таму шляхі наведвальнікаў ніколі не пралягалі паўз уваход у сталоўку.

Прыгажуня набліжалася, як непазбежнасць! Міхал адчуў такое хваляванне, быццам першы з людзей убачыў прадстаўніка іншай цывілізацыі! Дзяўчына ж, як наўмысна, глядзела акурат толькі на яго!

У чым справа?! Мы знаёмыя?! Яна мяне з некім пераблытала?!

Дзяўчына спынілася за два крокі і радасна паздароўкалася:

— Прывітанне!

Агаломшаны Радзевіч нясмела адказаў:

— Добры дзень…

— Тата! — удакладніла прыгажуня.

Як?! Гэта дачка Меліхава?!

Ён жа быў перакананы, што дзіця старшыны мае не больш за якіх-небудзь пяць годзікаў: у такіх памяншальна-ласкальных інтанацыях прапаршчык заўсёды згадваў сваю малую.

— Здароў, мая донечка! — імгненна растаў суворы дзяжурны. — Што ты тут робіш?

— Прыходзіла ў кнігарню і вырашыла цябе пабачыць, тата! Маці дазванілася да твайго стрыечнага брата, ён сказаў, што абавязкова нас сустрэне ў Маскве!

— Вось і добра! Вось і цудоўненька! Будзеш, значыцца, у сталіцы вучыцца!

Бацька з дачкой абмяняліся яшчэ некалькімі фразамі, і старшына пайшоў правесці яе да КПП.

Саня выказаў тое, пра што найперш думалі ўсе хлопцы:

— І хто б мог уявіць, што ў гэтага каня педальнага такая прыгожая дачка!

Усе згодна заківалі галовамі.

Калі неўзабаве Меліхаў вярнуўся, Купрыянец не вытрымаў і жартам пацікавіўся ў яго:

— Таварыш прапаршчык, а вам зяць не трэба?

— Што! Хто! — звыкла закрычаў старшына, бы абвараны. — Ты для яе пустое месца! Хто ты такі?! Ты і пазногця яе не варты! Яна з залатым медалём школу закончыла! У Маскве, ва ўніверсітэце будзе вучыцца!..

— Ды супакойцеся вы, я ж яе больш ніколі ў жыцці не ўбачу, таварыш прапаршчык!

Меліхаў зразумеў, што пераўзышоў усе неабходныя меры абароны, махнуў рукой і знік у сталоўцы.

— З такім таткам застанецца паненка ў дзеўках! — пакпіў Саня. — Яму, відаць, зяця не ніжэй за генерала падавай! Вось звольнюся, наўмысна паеду ў Маскву, знайду яе і закахаю ў сябе!

— Ага! Хутчэй іголку ў стозе сена знойдзеш, чым яе ў сталіцы, Казанова абхазскі! — пакпіў Радзевіч з наіўных Саневых пагроз.

Са сталоўкі выйшаў Герасімаў, які гатаваў сняданак, а потым забурыўся спаць у кухарскім пакоі:

— Што новага чуваць на белым свеце? — пацікавіўся ён у сяброў.

— Самае цікавае ты ўсё адно ўжо прапусціў, — канстатаваў Саня.

— Кажыце ўжо! Як-небудзь перажыву!

— Купрыянец закахаўся! — паведаміў галоўную навіну Радзевіч.

— Вось ты мне лепей скажы, Паша, — звярнуўся Саня да масквіча, перш чым той пачаў высвятляць, хто ж

тая шчасліціца, якая стала прадметам захаплення «абхазца», — ці можна ў Маскве знайсці дзяўчыну?

— Не зразумеў: увогуле ці нейкую канкрэтную?

— Канкрэтную.

— Вядома ж, можна. Што ты пра яе ведаеш?

— Гадоў сямнаццаць, прозвішча Меліхава…

— Што?! Дачка старшыны?! Ну вы, блін, даяце! Вам што, іншых дзяўчат мала?! Спадзяюся, яна хоць не ў тату пайшла?!

— Разумею, паверыць практычна немагчыма, але яна — прыгажуня! — паказальна-роспачна ўздыхнуў Саня.

— Што, праўда? — паглядзеў на Радзевіча масквіч.

— Як гэта ні дзіўна, але факт! — пацвердзіў Міхал.

— Тады ў мяне ўмова, — раптам ажывіўся Герасімаў, — пасля войска ты прыязджаеш да мяне ў Маскву, і я дапамагаю табе знайсці там, калі не перадумаеш, дачку старшыны, а наступным летам ты запрашаеш мяне да сябе ў Абхазію! Згода?!

— Ды без праблем! Прыязджайце на лета ўсе, калі ласка! Утрох і прыязджайце! Там гэтых прыгажунь будзе, як сабак нярэзаных! З усяго Саюза з'едуцца! Не хапала нам яшчэ па Маскве гойсаць: няхай Меліхаў сам галаву паломіць, за каго дачку аддаць! Такога зяця згубіў, ёлупень! Яшчэ ад роспачы валасы на сабе дзерці будзе, ці што ў яго там засталося: прыстойны, можна сказаць, чалавек прапаноўваў руку і сэрца, а ён: хто ты такі, хто ты такі! Пазногця яе, бачце не варты! — жартаўліва абураўся Саня. — У мяне свой дом на цёплым моры ёсць! А гэта як мінімум не горш за ўніверсітэцкі дыплом!..

Усе хлопцы шчыра рагаталі не так са зместу Санінай тырады, як ад той інтанацыі, з якой ён прамаўляў: быццам перад імі нечакана матэрыялізавалася ўсім добра знаёмая Баба-Яга ў выкананні Георгія Міляра*…

* Георгій Міляр (1903—1993) — савецкі акцёр тэатра і кіно.

— Што ж, я, у сваю чаргу, — скрозь смех загаварыў Паша, — прапаную адзначыць такое казачнае запрашэнне!

— Як адзначыць?! — выказаў здзіўленне ўсіх Міхал.

— Тут недалёка ёсць крамка, у якой прадаецца самае сапраўднае, найлепшае ў свеце, як кажуць, чэшскае піва! Магу купіць!

— О! Клас! Што можа быць лепей у такую гарачыню за куфаль халодненькага піва! — з неверагодным энтузіязмам адгукнуўся Саня.

— Ты як? — Паша пацікавіўся ў Радзевіча.

Міхал толькі некалькі разоў у жыцці каштаваў піва і зусім не быў ад яго ў захапленні, але цяпер не наважыўся выдаваць сваёй недасведчанасці:

— Можна, — нерашуча адказаў ён.

У Ваціка згоды ніхто не пытаўся: ён, як малое дзіця, заўсёды мусіў рабіць тое, што рабілі старэйшыя.

Аднак хутка высветлілася, што ў бліжэйшы час наладзіць бяседу не атрымаецца: ні ў каго няма грошай. Вырашылі мерапрыемства адкласці на тыдзень: недзе там павінны былі выдаць грашовае ўтрыманне.

Сем дзён праляцелі ў імгненне вока. Міхал апрануў сваю чысцюткую «афганку», як называлі жаўнеры новую форму, якую тут выдалі ўпершыню: нагавіцы мелі шмат кішэняў і прашытыя стрэлкі, таму на каленках вопратка не так расцягвалася і адвісала, як было ў ранейшых штанах; на гімнасцёрцы таксама была безліч накладных і ўнутраных кішэняў, адразу прышытыя пагоны і ніякіх пятліцаў: эмблемы роду войскаў мацаваліся проста ў куточках каўняра. Замест пілоткі ў новым строі была кепка з доўгім казырком, які ўдала захінаў вочы ад сонца. Калі Радзевіч прыйшоў у казарму, яму паведамілі, што выплату затрымліваюць: няма грошай. Наколькі Міхал памятаў, падобная затрымка была ўпершыню: відаць, у Саюзе справы зусім сумныя, калі адбываюцца

такія рэчы. Самае непрыемнае, што ніхто не мог сказаць, калі грошы з'явяцца.

Радзевіч прагна чытаў газеты, слухаў радыё, глядзеў тэлевізар: яму хацелася разабрацца ў тым, што ж адбываецца на радзіме. Падобна, рэформа фінансавай сістэмы, якую праводзіў першы прэм'ер-міністр СССР Валянцін Паўлаў, не давала ніякіх станоўчых вынікаў, а наадварот, прывяла да нечуванай раней нестабільнасці: тавары зніклі, цэны раслі, заробкі падалі. Прапаршчыкі, якія вярталіся з адпачынку, распавядалі пра такія дзіўныя рэчы, у якія немагчыма было паверыць: некалькі з іх сцвярджалі, што ў краіне адбываецца самы сапраўдны сабатаж — нейкія невядомыя сілы перашкаджаюць таму, каб жыццёва неабходныя прадукты і тавары траплялі ў гандлёвую сетку, прычым іх не проста затрымліваюць на нейкіх складах, а нібыта часта вывозяць за гарады і паляць!

Прэзідэнт Гарбачоў, падобна было, не рашаецца заняць нейкую адну жорсткую пазіцыю, а спрабуе ўседзець адразу на двух крэслах: дэмакрата-рэфарматара і кансерватара, захавальніка славутых традыцый савецкага народа, а папросту — улагодзіць раз'юшаную партнаменклатуру.

У выніку складвалася ўражанне, што Міхал Сяргеевіч стаў чужым сярод партапаратчыкаў і не стаў сваім сярод дэмакратаў.

У РСФСР тым часам абралі першага прэзідэнта: Барыс Ельцын перамог адразу ж, другі тур не спатрэбіўся. Дзіўна было, што ў выбарах Вярхоўнага Савета БССР усе, хто служыў у Паўночнай групе савецкіх войскаў, удзельнічалі, а ў выбарах прэзідэнта самай вялікай саюзнай рэспублікі — не.

Паша Герасімаў ледзь не маліўся на Ельцына, бо спадзяваўся, што толькі цяпер і пачнуцца сапраўдныя пераўтварэнні, а камуністычны маразм назаўсёды знікне.

Барыс Мікалаевіч сапраўды займаў больш выразную пазіцыю ў параўнанні з Гарбачовым. Прынамсі, выглядала менавіта так.

Радзевіч згаджаўся з Пашам у тым, што, калі станоўчыя змены распачнуцца ў Расіі, яны абавязкова распаўсюдзяцца на ўвесь Савецкі Саюз.

Праўда, цяпер роля і самога непарушнага саюза, і ягонага прэзідэнта выглядала даволі цьмяна: усе рэспублікі абвясцілі аб суверэнітэце, маюць нейкае сваё кіраўніцтва. Да таго ж толькі дзевяць з пятнаццаці ўдзельнічаюць у перамовах аб далейшым сумесным пражыванні, астатнія недвухсэнсоўна заявілі, што больш не маюць патрэбы ні ў чыёй апецы.

Вядома ж, Міхалу Радзевічу хацелася, каб Беларусь дзейнічала таксама рашуча ды асэнсавана, як балтыйскія рэспублікі, але тое, што ён выдатна ведаў, як абіраўся Вярхоўны Савет БССР і што за людзі туды трапілі, практычна не пакідала месца для аптымізму. Як ні крыўдна было прызнаць, але Беларусь паўставала самым сапраўдным камуністычным запаведнікам. І калі, напрыклад, у Малдове камуністы былі малдаванскія, у Грузіі — грузінскія, у Літве — літоўскія, то ў Беларусі яны былі савецкія, інтэрнацыянальныя, якія люта ненавідзелі ўсё беларускае.

У канцы чэрвеня жаўнерам нарэшце далі грошы: аж па чатырнаццаць тысяч злотых! Інфляцыя пераўтварыла палякаў, а заадно і іхных акупантаў, у сапраўдных мільянераў.

Няўжо і ў нас некалі можа быць нешта падобнае?..

— Проста насмактацца піва — неяк нецікава, — выказаўся Паша, калі хлопцы атрымалі грошы.

— А як цікава? — удакладніў Саня Купрыянец.

— Тут зусім побач ёсць мясцінка, дзе можна пакупацца!

— Удзень?!

— Навошта адразу ўдзень?! Ноччу вада яшчэ цяплейшая! І галоўнае — абсалютна бяспечна!

— Што за мясцінка? — пацікавіўся Міхал.

— Калі прайсці па чыгунцы ў бок жытла нашых афіцэраў, праз метраў трыста будзе эстакада. Гэта самае складанае месца на нашым шляху: пад ёю праходзіць падсвечаная ліхтарамі дарога і ездзяць машыны. Яшчэ праз столькі ж — рэчка. Але яна зусім маленечкая, практычна канаўка, у ёй не пакупаешся. Над ёю мост — адна назва: некалькі бетонных слупоў і перакладзіны, нібы ў паветры шпалы вісяць. Толькі і глядзі, каб паміж імі ўніз не шуснуць. Крыху далей, праз метраў сто пяцьдзясят — вялікі чыгуначны мост і цалкам сабе прыдатная рэчка: невялікая, але адразу ля моста мясцовыя купаюцца!

— Я плаваць не ўмею, — сумна адзначыў Вацік.

— Там плытка зусім! Максімум па грудзі! І шырыня метраў дзесяць-пятнаццаць, не больш!.. Ну, як ідэйка?!

— Не мора, вядома ж, але паплаваць хочацца, — задумліва прагаварыў Саня.

— Прапаную застацца ўсім на ноч у сталоўцы, насмажыць мяса, гуркоў свежых адкласці!..

— Я маласольныя люблю, — меланхалічна зазначыў Шпачок.

— Ну дык насалі! Хто ж табе замінае?

— У мяне ёсць кавалак салёнага сала, з часнаком нават, — па-ранейшаму запаволена працягнуў Вацік.

— Ну, калі сала ёсць, тады прапаную ўзяць па пляшцы піва на брата і адну гарэлкі! — ажывіўся Паша.

— І бульбы наварыць! — нечакана бадзёра дадаў Вацік.

— А як жа ж без бульбы: такі натоўп бульбашоў, ды без бульбы! Без бульбы ў нашым выпадку ніяк немагчыма! — пакпіў адзіны з кампаніі не бульбаш…

У адказ Радзевіч жартам папалохаў Герасімава, што насамрэч аднаму маскаліку з трыма бульбашамі небяспечнаісці купацца: можна нырнуць ды не вынырнуць.

На наступны дзень усе нібы апрытомнелі: трэцяга ліпеня да загаду аб звальненні «асеннікаў» у запас застанецца роўна сто дзён! Такім чынам, хлопцы адзінагалосна згадзіліся, што пікнік цалкам лагічна прымеркаваць да гэтай падзеі.

За сто дзён да загаду дэмбелі ў батальёне па традыцыі галілі пад нуль валасы на галаве! Аднак сёлета ў святле барацьбы з пазастатутнымі дачыненнямі нампаліт папярэдзіў, што ўсіх, хто паголіцца, немінуча чакаюць мінімум пяць содняў на гаўптвахце! Здавалася б: хто пацерпіць ад таго, што дэмбелі паголяцца? Такая сабе падмена сапраўднай барацьбы з дзедаўшчынай, яе імітацыя. Зрэшты, падобныя папярэджанні адбываліся кожны раз, але імі ўсё і абмяжоўвалася: усіх не пасадзіш!

Але на гэты раз адразу некалькі дэмбеляў выказалі сумненні, што за сто дзён валасы ў іх паспеюць адрасці, а ехаць дадому лысаму нікому не хацелася. У выніку дамовіліся, што ўсе пастрыгуцца нагала. Сказана — зроблена!

Трэцяга ліпеня Міхал, Паша і Вацік прыйшлі ў сталоўку пастрыжаныя, як навабранцы! Саня Купрыянец з'явіўся лысы, як Фантамас!

— Добра, што мы не пагаліліся здуру! — адзначыў Вацік тое, пра што падумалі ўсе, калі ўбачылі Саню.

Фельд'егеры ўсё ж падтрымалі традыцыю, і цяпер падчас абеду ў зале за адным сталом blішчэлі пяць голеных патыліц. Толькі лянівы не выказаўся на іхны конт:

— О! Турысты з Хірасімы!

— Чарнобыльцы!

— Не, я тое ж, што і яны, есці не буду!

Увечары ўсе стрыжаныя і адзін голены кухары засталіся ў сталоўцы. Насмажылі самых сапраўдных адбіўных, наварылі бульбы і загарнулі яе ў коўдру, каб не астыла. Засоленыя Вацікам у абед па ўсіх правілах, з часначком і кропам, агуркі дайшлі да кандыцыі. Усе прысмакі склалі ў салдацкія рэчмяшкі, у тым ліку і запаветныя пляшкі, якія содні чакалі свайго часу ў патаемным месцы. Пра сала таксама не забыліся.

Апоўначы ўрачыстая працэсія выйшла са сталоўкі праз бакавыя дзверы. Ледзь не адразу за імі пачыналася доўгая цёмная прысада, якая цягнулася ўздоўж пляца. Справа ад яе чарнеў аднапавярховы будынак, які некалі выкарыстоўваўся ў якасці склада, а цяпер зеўраў пустымі аконнымі і дзвярнымі праёмамі. Няспешна прайшлі па алейцы і хутка ўперліся ў мяжу гарадка — бетонную агароджу. На другім баку паміж агароджай і чыгуначным насыпам бегла сцежка, якая вяла да жытла афіцэраў і служачых: самы кароткі шлях дадому для начальства. Таму афіцэры і прапаршчыкі вярталіся з працы не праз КПП, каб не рабіць вялікае кола, не хадзіць лішняга і не марнаваць час, а якраз у гэтым месцы пералазілі праз плот. Адпаведна, над адным пралётам калючы дрот адсутнічаў, а на зямлі ляжаў цэлы стос цэглы. Ліхтары ўздоўж мяжы асвятлялі сцежку, затое верх насыпу патанаў у цемры.

Хлопцы лёгка пераадолелі перашкоду, ускараскаліся на круты адхон і сталі абсалютна недасяжныя для чужых вачэй.

З высакаватага насыпу добра праглядаліся асветленыя кавалкі іх гарадка: пляц, дом культуры, сталоўка, шэраг казармаў. Злева, ледзь падсветленая, цягнулася нейкая прамысловая зона, а крыху наперадзе — савецкія панэльныя пяціпавярховікі, у некалькіх вокнах якіх

яшчэ гарэла святло. Справа чорным правалам зеўрала стрэльбішча, за якім выдатна праглядаліся тэхнічныя боксы парку. Былі цудоўна бачныя і часавыя, якія няспешна соўгаліся туды-сюды ўздоўж гаражоў. Міхал адразу ж, калі разгледзеў парк, згадаў пра Андрэя Камышанава.

Дзе ён цяпер? Што з ім? Ці вернецца калі-небудзь на радзіму?

— Цяпер паскараемся! — скамандаваў Герасімаў.

Пад эстакадай праходзіла самая сапраўдная шырокая гарадская вуліца з ліхтарамі ды ходнікамі, па якой, хоць было і пазнавата, рухаліся аўтамабілі і брылі пешаходы.

Праз метраў сто пад хлопцамі апынуўся яшчэ адзін пераезд праз чыгунку, але гэты быў маленькі ды цёмны.

Ужо прайшлі прыкметна болей, чым апісваў Паша: відаць, наўмысна зменшыў адлегласць, баяўся, што хлопцы не адважацца ісці так далёка.

— Доўга яшчэ? — пацікавіўся ў масквіча Саня.

— Амаль прыйшлі! Не хвалюйся!

Пераадолелі яшчэ прыкладна дзвесце метраў.

— Асцярожна! — шэптам папярэдзіў сяброў Паша.

Метраў трыццаць чыгунка быццам вісела ў паветры. Знізу патыхнула цёплай вільгаццю, а вочы, якія ўжо звыклі да цемры, добра адрознілі вузенькую бліскучую стужку, данёсся і сцішаны пошум плыні.

— Гэты ручай назву мае! — каментаваў Герасімаў. — Чорная Вада, здаецца. Неяк так, толькі на польскі манер. Я і не згадаю, як гэта гучыць. Мне адзін мясцовы сказаў.

— Чарна вода? — прагаварыў Радзевіч.

— Падобна! А тая большая рэчка, да якой мы ідзем, называецца Качава. Што гэта за трасца, не ведаю.

— Мабыць, «утиная» па-вашаму, — зноў удакладніў Міхал.

— Сур'ёзна?! — здзівіўся Паша. — А што, цалкам прыдатная назва для рэчкі, не тое, што ў нас: Масква, Волга, Кама — што азначае, ніхто не ведае!

— Гэта, відаць, таму, што не вы іх называлі! — не стрымаўся Радзевіч, каб не пакпіць са славутых імперскіх амбіцый. — Панахапалі чужога! — ледзь стрымліваўся, каб не зарагатаць, Міхал. Але прагучала ўсё адно смешна.

Паша адчуў іронію ў словах сябра-беларуса і зусім не пакрыўдзіўся:

— Я асабіста ні ў каго нічога не хапаў! Цяпер каб і хацеў вярнуць, дык няма ж каму!

— Кемска воласць! Кемска воласць! У Шпака магнітафончык, у пасла медальёнчык! — працытаваў персанажаў любімай камедыі Саня Купрыянец. — Меня терзают смутные сомнения!

— Не было ў мяне ніколі ніякага магнітафончыка! — абсалютна сур'ёзна запярэчыў Вацік. — Якія могуць быць сумненні?!.

І хоць свайго земляка Шпакам ці Шпачком называў адзін Міхал, і тое толькі час ад часу, Паша і Саня таксама цяпер нечакана адчулі сугучнасць прозвішчаў Вація і кіношнага персанажа.

На пару імгненняў павісла паўза, а потым усе, акрамя Шпачка, дружна выбухнулі рогатам.

— Што?! — шчыра не разумеў прычыну весялосці сяброў Вацік. — Чаго вы ржэце, як коні?!

— И вас вылечат! — працягнуў скрозь смех цытаванні Купрыянец.

— Ды што такое?! Можаце нармальна сказаць?! — ужо пачынаў злавацца Шпачок.

— Няўжо ты не глядзеў «Иван Васильевич меняет профессию»? — цяпер заінтрыгаванасць выявіў Паша.

— Які Іван Васільевіч? Не ведаю я ніякага Івана Васільевіча!

Тройка аж заходзілася ад смеху! Яны нават забыліся пра небяспеку!

— Халера! — спалохана азваўся Вацік. — Ну і ну! Глядзіце!

Ён, мабыць, паказваў пальцам, але ў цемры не было бачна, усе нібыта адчулі і так, куды трэба глядзець: наперадзе грувасцілася велічная канструкцыя чыгуначнага моста.

— Здаецца, прыйшлі! — паведаміў Герасімаў. — Глядзіце ўважліва, злева павінна быць сцежка ўніз.

Сцежка сапраўды знайшлася. Калі спусціліся з адхону, трапілі на раўнюткую пляцоўку, на якой расла дробненькая траўка. Цень ад моста падаў якраз на гэты бераг, таму тут было значна цямней, чым навокал. Хацелі прайсці крыху далей, на святлейшае месца, але там рос высачэзны жорсткі быльнёг.

— Халера! Нічога не бачна, хоць вока выкалі! — абураўся Паша.

— Давайце вогнішча запалім, — прапанаваў Саня. — У мяне ёсць чым.

— Ёсць запалкі?! — адразу павесялеў масквіч. — Як я сам не падумаў?! Светані сюды! Тут дзесьці месца спецыяльнае, камянямі абкладзенае.

Месца для вогнішча знайшлі, і ўжо праз пяць хвілін на ім затанчыла полымя, якое вырвала бераг з абдымкаў цемры. Побач знайшлося сухое галлё і некалькі гнілых дошак, якія лёгка ламаліся: хоць на ўсю ноч хопіць, калі паліць ашчадна.

Гэта быў сапраўдны маленькі пляжык: траўка дробненькая, бы падкошаная, і схіл да вады пакаты, не круты

зусім, як ля возера. Рэчка калі і шырэйшая за дзесяць метраў, дык не нашмат. Супрацьлеглы бераг высокі і парослы хмызамі.

Разаслалі на траву газеты і расклалі закуску.

— Ну, што найперш: піва ці гарэлку будзем? — спытаў Паша.

— Звычайна не трэба мяшаць, — выказаў тое, што неяк чуў ад старэйшых, Міхал.

— Калі выпіць піва, а праз нейкі час гарэлку, яна практычна не падзейнічае, — аўтарытэтна заявіў Саня. — А калі спачатку моцны напой, а затым слабы — уставіць грунтоўна, толькі галава потым будзе балець!

— Можна адразу перамяшаць, ёршык называецца, выключае імгненна! — зноў выявіў дасведчанасць масквіч.

— Мы сюды прыйшлі па што? Піць ці купацца? Акрамя таго, вы памятаеце, калі апошні раз бралі ў рот спіртное? Я, напрыклад, пабойваюся нават толькі самае лепшае ў свеце піва паспытаць: хто ведае, як падзейнічае? Пра гарэлку і гаварыць няма чаго! — прызнаўся Міхал. — Таму давайце па нарастаючай: пап'ем піва, акунемся па разіку, а потым ужо, у залежнасці ад самаадчування, можна і гарэлку пакаштаваць.

Усе згадзіліся з аргументамі Радзевіча. Паша спрытна адкаркаваў чэшскае піва і раздаў усім па пляшцы:

— Ну, за сто дзён да загаду!

Ці піва сапраўды было лепшым у свеце, ці змянілася Міхалава ўспрыманне, але халодны напой і насамрэч здаўся нейкім надзіва прыемным: гаркавасць у ім была, але зусім не тая, што ў «Жыгулёўскім», і адценне кіслага таксама прысутнічала, аднак толькі ледзь-ледзь, як лёгкая згадка. А пах! Які прыемны пах мела гэтая вадкасць: нібы ідзеш дома па знаёмай вуліцы паўз хлебазавод,

а ветрык даносіць водар свежай выпечкі: тут табе і ваніль, і цукар, і падпаленая жытняя скарынка!

Неўпрыкмет на душы зрабілася спакойна і ўтульна, як не было ўжо даўно. Міхал не мог растлумачыць, чаму так сталася: дзеянне гэта напою ці той атмасферы, што панавала навокал.

Сябры таксама заўсміхаліся, загаварылі прыкметна гучней, пачалі жартаваць і дурэць, як дзеці. Радзевіч дапіў піва і некалькі разоў паспрабаваў стаць на галаву — нічога не атрымалася.

— Купацца! — гукнуў Саня.

Хлопцы імгненна, як па трывозе, распрануліся і скочылі ў цёплую, бы сырадой, ваду. Толькі Вацік увайшоў паціху, абачліва. На сярэдзіне рэчкі было па горла — не схлусіў Паша пра глыбіню. Дно цвёрдае: жвір упрамешку з камянямі, ногі намацвалі даволі вялікія пляскатыя камянюкі, якія былі быццам умураваныя ў дол.

Жаўнеры пляскаліся, пырскаліся, ныралі і плавалі то па даволі імклівай плыні, то супраць яе. Урэшце выкараскаліся на бераг і вырашылі пакаштаваць гарэлку. Здавалася, ад спажытага піва і знаку ўжо не засталося.

Натуральна, кілішкаў не было: замест іх узялі звычайныя жалезныя эмаліраваныя конаўкі. Паша адкаркаваў пляшку і разліў гарэлку так, каб можна было пракаўтнуць адным глытком.

— За хуткае вяртанне дадому! — прапанаваў масквіч.

Хлопцы чокнуліся. Паша рашуча задзёр галаву і ўліў у сябе пякучую вадкасць:

— А-а! Моцная, зараза!

Саня паўтарыў кожны рух Герасімава, толькі нічога не сказаў, а зрабіў выгляд, быццам «занюхвае» рукавом адзежыны: прыціснуў да носа голую правую руку і з шумам уцягнуў паветра.

Вацік усадзіў у конаўку свой доўгі нос, нюхаў і крывіўся: мяркуючы па ўсім, пах быў не такі прыемны, як у піва.

Міхал адвярнуўся, каб не бачыць Шпачковы страшныя грымасы — ён ведаў дакладна, што гарэлка не той напой, які нюхаюць, і рашуча праглынуў вадкасць з конаўкі: рот апаліла, а з вачэй самі пакаціліся слёзы:

— Халера!

Радзевіч прысеў і схапіў агурок Вацікавай вытворчасці, адкусіў кавалак — у роце адразу перастала пячы, а ў сярэдзіне пачала распаўсюджвацца лагодная цеплыня.

Яшчэ праз імгненне ўсе накінуліся на ежу. І скуль толькі апетыт браўся?!

— Чакайце-чакайце! — спыніў імпэт сяброў Паша. — Трэба адразу яшчэ па адной выпіць, а потым ужо грунтоўна паесці!

Выпілі яшчэ па глытку і зноў вярнуліся да ежы.

Міхал не адчуваў, што моцна захмялеў, — яму проста было добра і весела: здавалася, што ён усё жыццё ведае Пашу, Саню і Ваціка, што яны звязаныя не толькі сяброўскімі, але і самымі сапраўднымі братэрскімі повязямі. Ён шчыра дзівіўся з іхнай дасціпнасці, ад усяго сэрца шчыра рагатаў з мільён разоў чутых анекдотаў ды гісторый. Дэжавю: ізноў адчуванне, што яны сядзяць уначы ля вогнішча немаведама які ўжо раз... Міхал здагадваецца: проста недзе ў сусвеце заўсёды ёсць гэтае месца, у якім нічога не мяняецца, дзе вось, як цяпер, навісае ледзь не над галовамі пачварна-велічны гмах чыгуначнага моста, на якім танчаць адбіткі полымя, імклівая плынь нясе чорныя воды невядомай ракі, на беразе якой сядзяць чацвёра п'яных, шчаслівых дзевятнаццацігадовых, стрыжаных нагала юнакоў. У іх яшчэ ўсё наперадзе! Цэлае жыццё!

У нейкі момант усе, як па камандзе, паварочваюцца і ідуць да вады. Цяпер нават баязлівец Вацік даходзіць да сярэдзіны рэчкі.

П'яным купацца нельга! Гэта аксіёма! Толькі хто тут п'яны?! Што такое — адна пляшка на чацвярых? І калі такое было, каб нехта ў дзевятнаццаць прызнаўся самому сабе, што ён п'яны?

Міхал некалькі разоў нырае да супрацьлеглага берага і шчыра здзіўляецца, калі вынырвае, як прыкметна яго аднесла плынь. Насуперак ёй хлопец вяртаецца на ранейшае месца і заклікае сяброў:

— Глядзіце!

Плюхаецца ў ваду, у палёце ўдыхае поўныя грудзі паветра і зноў па дыяганалі дастаткова хутка прыбіваецца да супрацьлеглага берага.

Але, падобна, на яго ўжо ніхто не звяртае ўвагі, усе таксама захоплена плешчуцца ды ныраюць. Нават Вацік двума пальцамі заціскае свой доўгі нос і на некалькі імгненняў з галавою хаваецца пад ваду.

Паша вылазіць на бераг, разганяецца і, паслізнуўшыся, пляскаецца аб ваду ля самага берага — усе аж заходзяцца ад смеху.

Міхал прымае рашэнне ырнуць супраць плыні, а калі вынырвае, разумее, што стаіць практычна на тым самым месцы, быццам і не было гэтых паўхвілінных высілкаў пад вадою, — нецікава.

Тады ён паварочваецца спінаю да моста, набірае паветра і адштурхоўваецца ад дна. Глядзець бессэнсоўна: поўная цемень! Толькі ў вока можа пясок трапіць. Але Радзевіч і так прыходзіць у поўнае захапленне, бо адчувае, як неверагодна хутка імчыць пад вадою, нібы Іхтыяндр*! Калі ж ён вынырвае, яго здзіўляе, як шмат ён

---

* Герой фантастычнага рамана "Чалавек-амфібія" рускага савецкага пісьменніка Аляксандра Бяляева.

праплыў: не менш за дваццаць метраў! Міхал разумее, што назад прасцей вярнуцца па беразе, чым змагацца з імклівай плынню. Напачатку ісці па вялікай траве дужа непрыемна, але потым ён заўважае сцежку: зусім іншая справа!

Другі раз Радзевіч праплыў пад вадой не менш за трыццаць метраў, а калі вынырнуў, зразумеў, што мог бы праплысці і яшчэ больш.

— Можа, хопіць ужо? — пацікавіўся Паша, калі Міхал другі раз выйшаў з цемры на пляж, на якім ля вогнішча грэліся сябры.

— Яшчэ разок, і ўсё! Калі яшчэ давядзецца…

Міхал дайшоў да сярэдзіны рэчышча, намацаў нагамі большы камень, каб адштурхнуцца, набраў поўныя грудзі паветра і нырнуў. Хлопец імкліва ляцеў над камяністым дном рэчкі і вылічваў, колькі ўжо праплыў: дасюль быў першы раз, напэўна недзе тут вынырнуў у другі… Цяпер, калі выдыхаць з лёгкіх не ўсё адразу, можна праплысці яшчэ метраў дзесяць… Усё! Хопіць! Усплываю!.. У тое ж самае імгненне, калі жаўнер скіраваў уверх, штосьці незразумелае адбылося з плынню: яна спачатку нібы запаволілася, а потым неяк ад нізу рэзка штурханула яго некуды ўбок. Але галава была ўжо на паверхні і спалоханы Міхал ліхаманкава пачаў азірацца вакол: што адбылося? Ён паспрабаваў стаць, але не дастаў дна! Нічога сабе! Раптам хлопца неверагодна лёгка, як трэску, перакруціла некалькі разоў: вір! Але Міхал адчуў, што яго не цягне ўніз, а наадварот, нібыта выштурхоўвае з вады. Вакол было так цёмна, што ён не мог разгледзець берагі, каб хоць зарыентавацца, куды і як хутка яго нясе! І круціць жа, як у пральнай машыне! А што там далей?! Раптам вадаспад?! Неяк надта шумліва стала! Як толькі прыйшла думка пра вадаспад —

Міхала балюча стукнула аб нейкую сцяну правым бокам, а напаўсагнутыя ногі шарганулі па грудзе камянёў: бераг? Хлопец выпрастаў ногі: неглыбока, па пояс толькі, але плынь такая моцная, што зноў паваліла яго. Наперадзе сапраўды быў, як здалося, нейкі каменны мур. Радзевіч упёрся ў яго рукамі і зноў прыўстаў на ногі: так і ёсць — пасярод рэчкі каменная сцяна-водмель. Парог?! Нішто сабе! А калі б галавой камянюку злавіў ці ўпаў з гэтага, няхай сабе і невысокага, вадаспадзіка?!

Міхал крыху аддыхаўся і, перасоўваючы адначасова спачатку левую руку з левай нагою, а затым правыя руку і нагу, бокам пасунуўся да берага. Ён ледзь выкараскаўся з вады, бо тут не было нават за што ўхапіцца: усё спрэс засыпана камянямі.

Вогнішча не было бачна зусім: нічога сабе нырнуў! Ці, можа, хмызы захінаюць агляд? Халера! Як прабрацца да сваіх: тут жа і дзядоўнік, і крапіва, напэўна ж, буяе… Нішто сабе шпацыр у адных трусах можа атрымацца!

Але выбару не было. Міхал трошкі аддыхаўся, узняўся з груды камення і павольна абмацаў правай нагой, куды яе можна паставіць, зрабіў крок, потым яшчэ адзін, за ім наступны... Здаецца, усё нармальна, можна ісці. Хлопец крыху смялей памкнуўся наперад і раптам паслізнуўся: нязграбна заваліўся на бок і, хоць паспеў выставіць рукі, аднак у наступнае імгненне ўпаў на спіну і неспадзявана моцна выцяўся патыліцай аб вялізны валун: усё навокал адразу для яго знікла…

— Міхал! Хопіць ужо выдурняцца! Вылазь! Час ісці дамоў!

Паша ўжо апрануўся і стаяў на краі берага, ля таго месца, з якога яны заходзілі ў ваду. Ён быў перакананы, што Міхал вырашыў падражніцца: ці ў вадзе пад самым берагам хаваецца, ці вылез і адышоўся ў цемру.

— Не смешна зусім! Вылазь давай! Я цябе бачу!

З рэчмяшком на спіне да Пашы падышоў Вацік:

— Я таксама бачу! Пайшлі ўжо!

— Вогнішча тушыць будзем? — спытаў Саня, які толькі запіхаў у свой мех коўдру.

— Пачакай: Іхтыяндру трэба ж будзе крыху абсохнуць!

— Калі ён будзе абсыхаць?! Вунь на ўсходзе светла ўжо зусім, ісці трэба! Мокры няхай цяпер валачэцца.

Вакол сапраўды прыкметна пасвятлела. Над вадою пачала ўздымацца белая па́ра…

— Міхал!.. — неяк безнадзейна-трывожна раптам ускрыкнуў Вацік.

Ад гэтага ўскрыку і Пашу з Санем стала не па сабе.

Масквіч хуткім крокам пайшоў уздоўж берага.

— Халера! — вылаяўся Купрыянец і, як па трывозе, за некалькі секунд распрануўся нанова і пераплыў на другі бераг. Таксама рушыў уздоўж ракі.

Не на жарт перапалоханы Шпачок здранцвеў на месцы.

Праз метраў сто Паша ўпёрся ў даволі вялікі масіў алешніку, павярнуў да вады. На супрацьлеглым беразе з'явіўся Саня.

— Ну, што? — спытаў «абхазец».

— Нічога! Можа, panыраць?

— Бессэнсоўна: калі ўтапіўся, плынню ўжо далёка аднесла, не знойдзем!

— І што рабіць?

— Нічога: калі жывы, праспіцца і вернецца… Вось жа сто дзён да загаду адзначылі! Ніколі не забуду!

— А калі не вернецца?..

— Пайшлі назад!

Калі хлопцы вярнуліся і Саня пераплыў на іхны бераг, было ўжо зусім светла, вогнішча ледзь-ледзь дымілася

і сушыцца не было калі. Ён нацягнуў на мокрае цела форму і павесіў на плячо рэчмяшок з коўдраю. Тады паглядзеў на Міхалава адзенне:

— Трэба забраць!

— А калі Міхал вернецца? — не згадзіўся Паша.

— Да гарадка і ў трусах дабяжыць, тут недалёка. Урэшце можа і дацямна пачакаць, нічога не здарыцца. А калі форму раней рыбакі якія знойдуць, што тады? Ці патруль? Яна ж падпісаная! Лепей нікому не ведаць, што мы тут былі!

Хлопцы распіхалі Міхалаву «афганку» па сваіх рэчмяшках.

— Пайшлі! — скамандаваў Саня.

— А Міхал?! — нарэшце апрытомнеў Шпакоўскі.

— Пайшлі! — цяпер на Ваціка буркнуў Паша. — Мы яму ўжо нічым не дапаможам!

Шпачок павалокся ўслед за масквічом і «абхазам», яго аж калаціла, і зусім не ад холаду.

— Хопіць табе ўжо! Супакойся! — азірнуўся на Ваціка Герасімаў. — Ты што, бачыў, што ён утапіўся?! Можа, схаваўся дзе-небудзь за кустом і заснуў.

Паша шчыра сумняваўся, што можна голаму ды мокраму заснуць на калючай халоднай траве, але ўсё ж дадаў, каб падбадзёрыць Шпачка:

— Глядзі, каб ён яшчэ раней за нас дома не апынуўся!

Калі праходзілі паўз афіцэрскія пяціпавярхоўкі, як стрэл, у ранішняй цішы недзе ў шыбіне бразнула шкло, і на балкон на трэцім паверсе аднаго з дамоў выйшаў мужык у споднім, прыкурыў цыгарэту, і толькі тады, калі пстрыкнуў запалкаю ўніз, заўважыў трох жаўнераў на чыгуначным насыпе. Ён схапіўся аберуч за парэнчы і нахіліўся наперад. Было бачна, як у яго з рота выпала

цыгарэта. Але ні хлопцы не маглі разгледзець з такой адлегласці твар мужчыны, ні ён іхныя абліччы. Напэўна, нехта з батальённых начальнікаў: уздымецца цяпер вэрхал.

Але, як ні дзіўна, у гэты дзень ніякай актыўнасці начальства не выявіла…

## XVIII

Мінула не менш за дзесяць хвілін, перш чым Радзевіч дазволіў сабе прызнацца, што ўжо не спіць: ён ляжаў ва ўтульным ложку і, як гэта часта бывала, не расплюшчваў вачэй. Прыемна было адчуваць сябе адпачылым і бадзёрым. Вось-вось прагучыць каманда «пад'ём!», і ад гэтай млявай цішыні і знаку не застанецца.

Як заўсёды з калідора даносіліся прыцішаныя галасы: днявальныя. Можа, хто-небудзь з начальства прывалокся на пад'ём.

Міхал пачуў, як да яго ціхенька набліжаюцца нечыя крокі: відаць, замовіў, каб разбудзілі крыху раней.

Ён хуценька расплюшчыў вочы, каб папярэдзіць торганне за плячо ці тузаніну за спінку ложка з нязменным мармытаннем: «Кухар, уставай!» Ад яго заўсёды паўкубрыка прачыналася.

Але тое, што ён убачыў, не проста збянтэжыла, а прымусіла яго зноў з недаверам заплюшчыць вочы: мабыць, усё ж не прачнуўся!

Міхал зноў нясмела прыўзняў павекі: не падалося! Ён знаходзіўся ў нейкім зусім невялічкім пакойчыку, справа штосьці хаваюць сінія фіранкі ці шырма, злева акно і каля яго за маленькім столікам сядзіць маладая

жанчына ў нечым светла-зялёным: калі ён расплюшчыў вочы першы раз, яна якраз падыходзіла да стала.

Жанчына быццам адчула Міхалаў пагляд і азірнулася:

— Guten Tag! — з прыязнай усмешкай на сімпатычным абліччы прывіталася яна па-нямецку.

— Guten Tag, — аўтаматычна, як на ўроку нямецкай мовы, адказаў Радзевіч.

— O! Sprechen Sie Deutsch!

На гэтую фразу Міхал таксама выдаў некалі зазубраны адказ:

— Ja. Natürlich*!

Жанчына неверагодна ўзрадавалася і абрынула на шакаванага Радзевіча доўгую-доўгую тыраду, з якой ён зразумеў толькі асобныя словы і таму быў вымушаны сціпла ўдакладніць:

— Wenig…

На абліччы жанчыны адбіліся неразуменне і разгубленасць. Яна ўдакладніла, што ён меў на ўвазе са сваім «крыху».

Радзевіч, насуперак усім граматычным нормам, як змог зляпіў вядомыя яму словы ў нейкае кульгавае падабенства сказа, з якога вынікала, што ён натуральна гаворыць па-нямецку, але крыху.

— Einen Moment!** — выгукнула медсястра і выйшла з пакоя.

Тое, што ён знаходзіцца ў нейкім шпіталі, было відавочна. Але што ніяк не ўкладалася ў Міхалавай галаве, дык гэта як ён сюды трапіў і, натуральна, нямецкая мова.

Толькі цяпер Радзевіч убачыў, што да ягонай правай рукі ад штатыва, на якім вісіць пакет з празрыстай вадкасцю, цягнецца трубачка, а ў вене тырчыць катэтар.

---

* Ja. Natürlich *(ням.)* — Так. Натуральна.

** Einen Moment! *(ням.)* — Хвілінку! (даслоўна: Адзін момант!)

Што ж здарылася?! Аварыя?!

Але ж Меліхаў казаў, што ў найбліжэйшы час ніякіх вучэнняў не будзе.

Міхал паспрабаваў сесці і толькі тады заўважыў, што некуды ў грудзіну ўстаўлены яшчэ адзін катэтар, да якога цягнецца празрыстая трубка з нейкай вадкасцю чайнага колеру.

Халера! Што ж адбылося? З даху ўпаў?!

Радзевіч паварушыў нагамі, выцягнуў перад сабою рукі і некалькі разоў сціснуў далоні: здаецца, усё цэлае.

Тады Міхал абмацаў левай рукой твар — усё на месцы, няголены толькі. Потым правеў далонню па галаве: чаму валасы такія кароткія? Лысы практычна! Што за трасца?!

Толькі калі рука дацягнулася да патыліцы, здаецца, усё цела працяў пякучы боль, аж у вачах пацямнела.

Гэта яшчэ што?!

Радзевіч як мага ашчадна пачаў абмацваць балючае месца: досыць вялікая пухліна і зацягнутая скарынкай невялічкая рана ці шнар, мо нават некалькі драпін, засохлыя камячкі крыві на валасах.

Міхал раструшчыў адзін такі камячок двума пальцамі, сцягнуў з валасоў і паднёс да вачэй: так і ёсць, засохлая чорная кроў і пах ёду.

Хто ж мяне так? Немцы? Скуль яны ўзяліся? А можа, гэтая медсястра — палячка, але з нейкай прычыны падумала, што я немец і пачала гаварыць па-нямецку?

Хлопец ліхаманкава спрабаваў згадаць, што ж з ім адбылося, але адзінае, што памятаў найбольш выразна, дык гэта з'яўленне ля сталоўкі дачкі Меліхава і свой недарэчны адказ на яе прывітанне: і як яму ў галаву магло прыйсці, што такая прыгажуня можа вось так проста прывітацца з ім? Справядліва абурайся старшына,

што звычайныя жаўнеры і пазногця яе нявартыя. Крычаў ён тады толькі на Купрыянца, але, зразумела, тычылася ўсіх.

Міхал прыўзняўся і зірнуў у акно: толькі вяршаліны дрэў і дзесьці наводдаль чарапічныя дахі. Такія могуць быць дзе заўгодна: і ў Легніцы, і ў Свідніцы, і ў Явары, ды і ў Берліне, мабыць, таксама. Ніякай падказкі…

Дзверы расчыніліся, і ў пакой увайшоў мужчына ў белым халаце. На галаве белая медычная шапачка, на шыі стэтаскоп вісіць, рост сярэдні, сівая казліная бародка і пранізлівыя цёмныя вочкі за круглымі шкельцамі акуляраў — ні даць ні ўзяць Доктар Айбаліт.

— Guten Tag! — прывітаўся па-нямецку, як і медсястра, доктар.

Міхал адказаў таксама, як на ўроку замежнай мовы.

Тады Айбаліт спытаў у крыху нязвыклай форме, як для старэйшага чалавека:

— Wie ist Ihr Name?*

Радзевіч зразумеў, але секунду павагаўся: ці можна казаць праўду?

— Міхал, — проста адказаў ён без прозвішча.

Але доктар папрасіў назваць і прозвішча.

— Радзевіч.

— Czy jesteś Polakiem?!* — раптам запытаў немец па-польску.

— Nie!**

— Kim jesteś?*** — зноў па-польску ўдакладніў доктар.

Міхал вагаўся, што казаць, бо не мог зразумець, якімі могуць быць наступствы ягонага адказу.

---

* Czy jesteś Polakiem?! *(пол.)* — Ты паляк?

** Nie! *(пол.)* — Не!

*** Kim jesteś? *(пол.)* — А хто?

— Sowjetunion*, — нарэшце прагаварыў ушчэнт разгублены хлопец.

— Усё зразумела! — раптам перайшоў на рускую Айбаліт. — Мяне завуць доктар Дучман! — не без гонару адрэкамендаваўся мужчына. — Як вы сябе адчуваеце?

— Добра. А дзе я?

— Хваляваццa не трэба: вы сярод сяброў, і вам больш не пагражае ніякая небяспека!

— А хіба была нейкая небяспека?

Доктар падумаў некалькі секунд і працягнуў:

— Вы памятаеце, што з вамі здарылася?

— Не памятаю, калі шчыра…

— Гэта не вельмі добра, але, мяркуючы па ўсім, — Дучман узяў руку Міхала, намацаў пульс і ўтаропіўся ў гадзіннік, — усё будзе добра…

Потым доктар уставіў у вушы трубачкі стэтаскопа і прыклаў слухаўку да сэрца Радзевіча.

— Дыхаем… Не дыхаем…

Паўтарыў тое самае са спіны.

— Вы былі ў коме, малады чалавек. А гэта, я вам скажу, такая непрыемная штука, што ніхто не можа прадказаць, чым усё скончыцца. У вашым выпадку скончылася добра...

Ад слова «кома» ў Міхала ўсё абарвалася ў сярэдзіне: ён ведаў, што ў такім стане людзі могуць знаходзіцца нават гадамі.

— І як доўга я прабыў у… непрытомнасці?

— Дакладна не скажу, але ў нашай бальніцы крышку болей за содні.

— Ну а як я сюды трапіў?

* Sowjetunion *(ням.)* — Савецкі Саюз.

— Вас знайшлі на беразе ракі без прыкметаў жыцця, у адных трусах. І вось па іх ды яшчэ па кароткай стрыжцы зразумелі, што вы савецкі салдат, якога моцна збілі. Польскія калегі з Легніцы вельмі непакоіліся за вас, бо, як яны тлумачылі, там такое часта здараецца. Яны казалі, што ў савецкім войску стараслужачыя нярэдка збіваюць нашабранцаў. Гэта праўда?

— Я ўжо дэмбель, — замест адказу меланхалічна зазначыў Радзевіч, бо ўсе ягоныя думкі цяпер былі скіраваныя на той пікнік ля ракі, успамін пра які імгненна вярнулі словы пана Дучмана.

— Хто? — не зразумеў доктар.

— Стараслужачы.

— Дык хто вас пабіў?

— Ніхто. У тым уся справа, што ніхто…

— Яны ж казалі, што вас ні ў якім разе нельга перадаваць савецкім вайскоўцам. Яны ўжо даўно дапамагаюць такім, як вы, тым, хто пакінуў войска.

— Дэзерцірам?

— Так.

— Але я не збягаў з войска! У сэнсе, я планаваў вярнуцца! Так! Мне трэба тэрмінова вярнуцца! Якое сёння чысло?

— Шостага ліпеня…

— Калі маю адсутнасць заўважылі ў частцы, мне засталіся лічаныя гадзіны… А тады ўжо дэзерцірства з усімі наступствамі… Толькі б хлопцы прыкрылі, толькі б ніхто не звярнуў увагу, што мяне няма…

Міхал паказаў на катэтары:

— Вымайце гэта хутчэй, доктар! Калі ласка! І я пабягу да сваіх!

— Гэта немагчыма! Вам яшчэ мінімум тыдзень трэба знаходзіцца пад наглядам! Прайсці ўсебаковае абследаванне, бо кома — такая каварная штука…

— Я ўжо праз некалькі гадзін магу стаць злачынцам! Які тыдзень?! Мне засталося дaслужыць чатыры месяцы, і я паеду дадому! Я хачу дадому!..

— Супакойцеся, калі ласка. Давайце паспрабуем паразважаць прагматычна, рацыянальна, без залішніх эмоцыяў, паглядзім на сітуацыю з іншага боку... Калі ўжо так склалася, што вы тут, дык чаму б не скарыстацца? Тысячы людзей хацелі б апынуцца на вашым месцы...

— Доктар, што вы кажаце?! Хто б гэта хацеў апынуцца ў шпіталі з разбітай галавой?! Ды яшчэ з перспектывай загрымець пад фанфары!

— Прабачце, куды загрымець?..

— У турму, куды ж яшчэ!

— Вось я і кажу: пакуль вы тут, у вольнай і дэмакратычнай вялікай Германіі, турма вам не пагражае! Наш урад...

— Дзе?! — істэрычна ўскрыкнуў Радзевіч і ўскочыў з ложка. — У Германіі?!

Ён адчуў, што зараз зноў страціць прытомнасць! Яго нават павяло ўбок! Абодва шланжыкі катэтараў напяліся, як струны, і Міхал роспачна пляснуўся назад на ложак.

— Так! Мы знаходзімся ў Гёрліцы, самым усходнім горадзе адзінай Германіі! Хіба я не сказаў? Сапраўды, трэба было, відаць, з гэтага пачынаць... Цяпер вы разумееце, што вяртанне немагчыма!..

Міхал не ведаў, што і думаць... Дакладней, ён быў не ў стане пра што-небудзь думаць: толькі адно слова неадчэпна, як авадзень, круцілася ў галаве: Германія, Германія, Германія...

— Але ж неяк я сюды трапіў...

— Вы нават не ўяўляеце, колькі самых розных людзей рызыкавалі сваім спакоем, каб вывезці вас сюды! Паверце, гэта было зусім не проста! Тым больш у вашым

стане! І калі б іх затрымалі на мяжы, ім таксама пагражала б турма! Я не ведаю ўсіх акалічнасцяў, але зусім не цяжка здагадацца, што нават пры цяперашняй блытаніне мяжа застаецца мяжою і так ці інакш ахоўваецца…

— А колькі адсюль да Легніцы?

— Думаю, не меней за сто кіламетраў… Але ж гэта глупства: мяжу не перайсці! Змірыцеся! Усё не так кепска: у Германіі дэмакратыя, у Польшчы таксама… Хто ведае, можа, хутка і Савецкі Саюз стане дэмакратычным і тады вы зможаце спакойна вярнуцца дадому… Калі не перадумаеце…

Савецкі Саюз — дэмакратычным?! Хутчэй яго зусім не стане, чым ён раптам дэмакратызуецца! Не можа імперыя быць дэмакратычнаю! А хто ведае, калі яе не стане?! Мо заўтра што-небудзь здарыцца з Гарбачовым і зноў на дзесяцігоддзі ўпадзе жалезная заслона?!

Міхал ліхаманкава шукаў якое-небудзь выйсце і не знаходзіў.

Тэарэтычна можна было б звярнуцца ў савецкае пасольства ці да нашых вайскоўцаў, якіх у Германіі яшчэ поўна, і растлумачыць, што апынуўся тут абсалютна выпадкова: эпізод з пікнікам можна прапусціць, сказаць проста, што нічога не памятаю, траўма галавы і ўсё такое... Але ж гэта не гарантуе ніякай абароны ад праследу! Наадварот: можна нарвацца на якога-небудзь ёлупня-кар'ерыста, які прыкладзе ўсе свае намаганні, каб павярнуць справу так, што гэта дзякуючы ягоным самаахвярным высілкам выведзены на чыстую ваду і дастаўлены на радзіму для справядлівага пакарання ганебны дэзерцір!..

— Доктар, вы можаце звязацца з тымі людзьмі, якія прывезлі мяне сюды?

— Не магу: я іх не ведаю… Кожны раз гэта былі розныя людзі… Гады тры таму мясцовыя палякі прывезлі

да мяне дадому першага перабежчыка з кулявым раненнем… Я было падумаў, што нейкі крымінал, хацеў ужо звярнуцца куды трэба, але яны растлумачылі, што да чаго… З таго часу перыядычна, калі неабходная медыцынская дапамога, каго-небудзь падвозяць… У вашым выпадку быў патрэбны пастаянны нагляд, таму і змясцілі сюды.

— Але вы сказалі — мясцовыя палякі?..

— Яны казалі, што знайшлі таго параненага ў лесе, калі збіралі ажыны… Значыцца, мясцовыя…

— Але ж атрымоўваецца, што той паранены здолеў тады перайсці мяжу, калі яна добра ахоўвалася?!

— Выпадковасць… Проста збег абставінаў… Неверагоднае шанцаванне, калі хочаце. Такое таксама бывае…

— Дык мо і мне пашанцуе?! Чым чорт не жартуе?! Колькі адсюль да граніцы?

— Метраў трыста…

— Метраў?! — не паверыў сваім вушам Радзевіч.

— Так, мяжа праходзіць праз горад. Толькі сорак гадоў таму яна тут пралегла і падзяліла Гёрліц на дзве часткі.

— А што яна з сябе ўяўляе: дзяржаўная граніца пасярод горада? Калючы дрот, кантрольна-следавая паласа, ці як там яе…

— Найсе.

— А што гэта?

— Рака.

— Рака?! — спалохаўся міжволі Міхал, згадаўшы нядаўнюю сустрэчу з ракой. — Вялікая?

— Ды не, зусім вузенькая, у параўнанні з Волгай — ручай.

— Я не бачыў Волгу.

— А вы адкуль?

— З Беларусі.

— З Беларусі! — чамусьціневерагодна здзівіўся доктар. — А Полацк ад вас далёка?

— Не вельмі. А што?

— Свайго земляка Францыска Скарыну ведаеце?

Міхалу карцела адказаць штосьці накшталт: на жаль, асабіста не знаёмы. Але надта ўзрушаны стан доктара стрымаў жарт, і хлопец адказаў абсалютна сур'ёзна:

— Хто ж яго не ведае? А што?

— Вы першы беларус, якога я бачу ў сваім жыцці. Рэч у тым, што прадметам асаблівага гонару Гёрліца з'яўляюцца адзінаццаць кніжак Скарыны, якія ён выдаў у Празе і якія цяпер захоўваюцца ў нашай гарадской бібліятэцы! А для нас, прадстаўнікоў славянскай меншасці ў Германіі, гэты факт мае вельмі важнае значэнне!

— Дык вы паляк?

— Чаму адразу паляк? Тут у Саксоніі ці Сілезіі спрадвеку жывуць лужыцкія сербы. Хіба вы не ведалі?

— Не. Не ведаў… Дык магчыма ўсё ж перабрацца праз тую раку? — вярнуўся да надзённага беларус.

На гэты раз, перш чым адказаць, доктар задумаўся надоўга.

— Smugglers, — нарэшце сказаў доктар і ўзняўся.

— Што? — не зразумеў Радзевіч.

— Кантрабандысты! — пераклаў Дучман і рушыў да дзвярэй.

Ужо на парозе доктар азірнуўся на Міхала:

— Я хутка вярнуся, — і знік.

Радзевіч не ведаў, што і думаць. Усё, што яму было вядома пра кантрабандыстаў, не выклікала да іх не сімпатыі, ні даверу.

А што з ім будзе, калі яго зловяць з кантрабандыстамі нямецкія ці польскія памежнікі? Яго проста перададуць савецкім уладам ці будуць судзіць па мясцовых законах?

А можа, і зусім прызнаюць прадметам кантрабанды?! Абсурд нейкі!

Што б на ягоным месцы рабілі сябры?

Прасцей за ўсё з Вацікам: гэты выконваў бы ўсё, што скажуць. Ахвяра абставінаў. Застаўся б, легалізаваўся і праз нейкі час пераўтварыўся б у звычайнага абывацеля з дзіўнаватым акцэнтам. Калі б яму не падказалі і не дапамаглі, ён, верагодна, нават і не паспрабаваў бы паведаміць сваім жанчынам, дзе ён і што з ім... Зашыўся б у які-небудзь куточак і сядзеў бы ціхенька, як дома на печцы…

Фаталіст Паша Герасімаў, мабыць, успрыняў бы сітуацыю як наканаванасць і, хоць і без асаблівага імпэту, відаць, усё ж застаўся, акунуўся б, так бы мовіць, у новую, незнаёмую стыхію…

Саня Купрыянец несумненна застаўся б: дом на цёплым моры — добрая рэч, але перспектыва атрымаць доступ да ўсяго вольнага свету таксама не пазбаўлена прывабнасці, цалкам сабе раўназначная альтэрнатыва.

Атрымоўваецца, з чатырох тры так ці інакш засталіся б! Нават калі б ведалі, што больш ніколі не вернуцца на радзіму, а магчыма, і не пабачаць родных!

Чаму ж яго, Міхала Радзевіча, ніяк не спакушаюць відавочныя перавагі і выгоды жыцця ў больш развітай, заможнай і дэмакратычнай краіне? Пражыць тут годнае, забяспечанае жыццё куды болей шанцаў, чым там…

Там ніколі не было добра, ніколі выразна не праглядалася будучыня. А цяпер і зусім, відаць, абсалютная неакрэсленасць… Якія ўжо, да д’ябла, перспектывы…

Значыцца, уся гэтая радзіма, нейкая маральная адказнасць перад ёю, роднымі і блізкімі — толькі ў маёй галаве! — думаў Радзевіч. — Насамрэч мне проста не стае здаровага, цвярозага прагматызму… Вось да чаго

прывяло ўзнёсла-рамантычнае стаўленне да гісторыі, уся гэтая мастацкая літаратура з упартым прышчэпліваннем сталага пачуцця віны…

Кім мы захапляемся?! Што гістарычныя постаці, што літаратурныя героі — спрэс ахвярнасць у імя і дзеля Бога, народа, Радзімы, будучыні… Потым партыі замест Бога… Хутка, відаць, зноў Бог вернецца на месца партыі… Але ж усе, каго ні вазьмі, людзі самі сабе псавалі жыццё ў імя нейкіх вельмі цьмяных ідэалаў…

Той жа Скарына: апошнім ахвяраваў дзеля люду паспалітага. І што атрымаў у адказ?! Хранічную галечу і неўладкаванасць, безыменную магілу на чужыне і, мабыць, ніводнай кнігі на радзіме! Чужыя людзі захавалі, нават ганарацца, што маюць фаліянты беларускага першадрукара, а на радзіме кожны другі не ведае, кім ён быў!

І трэба была яму тая навука? Мог бы, як і ўсе нармальныя людзі, пражыць доўгае і забяспечанае жыццё ў родным Полацку, не бадзяцца па свеце, як валацуга бяздомны, не даядаць рэшту з панскіх сталоў і не спаць на мулкіх чужых ложках… Людская ўдзячнасць? Памяць?.. Які практычны сэнс для нябожчыка, што пра яго памятаюць ці нехта яму за нешта ўдзячны? Ніякага…

Прагрэс? Неяк бы адбыўся… Няхай бы нехта іншы ахвяраваў сваім чалавечым шчасцем… Зрэшты, ён і быў тым іншым… А нехта спакойна жыў у Полацку…

Калі ўзважыць усе «за» і «супраць», дык, як ні круці, супраць незлічоных аргументаў на карысць таго, каб застацца, па сутнасці паўстае толькі адзін безнадзейна кволы, абсалютна эфемерны ды варты жалю: любоў… Да бацькоў, сяброў, таго маленечкага куточка ў вялізным сусвеце, дзе нарадзіўся…

«Кім я буду без усяго гэтага?.. А самае галоўнае, што я выдатна ведаю адказ на пытанне: ці змагу я без гэтага…»

Асабліва цяпер, калі адбываюцца такія грандыёзныя змены, і Беларусь, несумненна, стане самастойнаю, і з'явіцца магчымасць збудаваць свой утульны і заможны дом, у якім нарэшце сціхнуць бясконцыя галашэнні аб страчанай радзіме, дзе родная мова не будзе туліцца недзе ў далёкіх пакоях, як нялюбая падчарка, а загучыць ва ўсіх школах і ўніверсітэтах, на вуліцах і плошчах, у парламенце і на тэлеканалах...

І каб так сталася, ён мусіць вярнуцца! Каб быць хоць бы сведкам гэтых велічных пераўтварэнняў, а не чарговай здрады, акупацыі ды заняпаду. Цяпер нарэшце можа адбыцца тое, пра што марылі тысячы вядомых і мільёны зусім безыменных людзей… Ім выпала некалі жыць нават без надзеі…

Цяпер застацца ўбаку ад гэтага імклівага віру, які толькі набірае абароты, — сапраўднае вар'яцтва і дзікунства...

Вяртаюся! І ніякія межы мяне не стрымаюць!..

Праз паўгадзіны вярнуўся доктар Дучман.

— Вы нарадзіліся ў кашулі, — сказаў ён, калі прычыніў дзверы. — Яны даставяць вас у Згожалец!

— А гэта далёка ад Легніцы?

— Згожалец — гэта польская частка Гёрліца… Як дабрацца да Легніцы, трэба яшчэ падумаць…

— Як-небудзь дабяруся, — няпэўна азваўся Міхал.

— Ноччу, ды яшчэ… — доктар сумеўся, быццам шукаў патрэбнае слова, — з вашай мовай гэта не так проста, як здаецца… Ведама, удзень і на цягніку сто кіламетраў — не адлегласць, а тут трэба яшчэ падумаць… Які ў вас памер абутку?

— Сорак другі.

— А вопратка — недзе сорак восьмы?

— Так.

— Час яшчэ ёсць, таму вы пакуль адпачывайце, а я паспрабую што-небудзь прыдумаць.

Доктар пайшоў, а Міхал зноў паглыбіўся ў свае цяпер ужо больш практычныя думкі.

«Сто кіламетраў... Усяго толькі сто кіламетраў ці цэлых сто кіламетраў... Як іх пераадолець? Хаця б ужо з горада хто-небудзь дапамог выйсці і паказаў дарогу на Легніцу... За ноч не прайсці, а за содні, мабыць, магчыма... Але ж немагчыма без адпачынку ісці ўвесь час... Таму, калі пашчасціць, дык змагу дайсці толькі праз дзень... А там давядзецца дзейнічаць па абставінах: калі хлопцы прыкрылі і начальства не заўважыла маю адсутнасць, дык ніякіх праблем, а калі мяне шукаюць, дык трэба будзе выкручвацца... Але гэта потым, цяпер галоўнае — перайсці мяжу і дабрацца да часткі...»

Нечакана хутка вярнуўся доктар і запытаў:

— А ці няма ў вас у Легніцы знаёмых сярод мясцовых жыхароў?

— Няма... А каб і былі, чым бы яны маглі дапамагчы?..

— Вельмі проста: можна было б ім патэлефанаваць і папрасіць, каб яны сустрэлі вас у Згожальцы!

Ад раптоўнай надзеі Радзевіч аж сеў у ложку:

— Пётр Смык! Але ён не з Легніцы... І я не ведаю нумар ягонага тэлефона...

— Нумар — не праблема: дастаткова пазваніць у даведачную. Дзе ён жыве?

— У Яленяй-Гуры, калі я нічога не наблытаў...

На гэты раз доктар адсутнічаў значна даўжэй, і Міхал пачаў ужо хваляваццa: атрымаецца ці не звязацца з Пятром і ці зможа ён дапамагчы. Ці не забыўся ён на тое выпадковае знаёмства на лесапільні?

— Так і ёсць: у Яленяй-Гуры пражывае адзін чалавек з такім імем! — зазначыў Айбаліт адразу па вяр-

танні. — І калі ён зразумеў, ад чыйго імя я тэлефаную, то гатовы быў ехаць у Згожалец адразу ж! Нам пашчасціла, што сёння субота: у будзень ён быў бы яшчэ на працы. Вось, глядзіце сюды: гэта мапа польскай часткі Гёрліца. Вось у гэтым месцы вас будзе чакаць Пётр Смык, — доктар паказаў кропку на мапе шарыкавай ручкай, і Міхал зусім без здзіўлення прачытаў знаёмую назву вуліцы: Parkowa.

Хто б сумняваўся?!

— У яго чырвоны Фіят 126, — працягваў тлумачэнні доктар, — такі маленечкі аўтамабільчык, на іх уся Польшча ездзіць… Ён будзе стаяць недалёка ад чыгуначнага пераезда з уключанымі аварыйнымі ліхтарамі. Запомніце, як і што тут выглядае. Схему я вам дам з сабою, але раптам згубіце…

Доктар паказаў на мапе месца, дзе Міхала высадзяць кантрабандысты. Да пераезда не больш за дзвесце метраў. Іх трэба будзе прабегчы па магчымасці хутка. Нават калі здарыцца пагоня, ён павінен імчаць што ёсць моцы на пераезд, каб заскочыць у аўтамабіль Пятра, — гэта адзіная магчымасць адарвацца…

Бліжэй да вечара ў палату прыйшла медсястра з двума пакункамі: красоўкі сорак другога памеру і, натуральна, сіні спартовы касцюм. Усё новенькае. Міхалу было страшэнна няёмка за тыя турботы і выдаткі, якімі ён абцяжарвае абсалютна чужых людзей. А самае непрыемнае, што ў яго не было ніякай магчымасці ім аддзячыць. Найперш жанчына выцягнула з Радзевіча катэтары, хлопец проста жахнуўся: такія вялізныя і страшныя яны аказаліся. Калі медсястра заклеіла пластырам ранкі ад іголак, Міхал апрануў касцюм і пахадзіў туды-сюды па пакоі...

Як толькі ўключылася вулічнае асвятленне, у палату прыйшоў доктар і вывеў Радзевіча ва ўнутраны двор

бальніцы, дзе яго чакала машына хуткай дапамогі. Хлопец як мог шчыра падзякаваў свайму выратавальніку, і яны развіталіся.

Кантрабандыстамі выявіліся два мужчыны ў спецадзенні супрацоўнікаў хуткай дапамогі, Ян і Алекс, якія гаварылі з Міхалам на нейкай, здавалася, неверагоднай і немагчымай сумесі нямецкіх, польскіх і рускіх слоў, аднак усё было цалкам зразумелым. Легенда іхнай спецаперацыі на выпадак, калі іх заўважаць, была простая, як усё геніяльнае: яны прыехалі ратаваць чалавека, які ўпаў у раку, а ў тым, што тапелец уцёк ад іх у Польшчу, яны не вінаватыя. Ніякай іншай кантрабанды, акрамя Міхала, у іх няма, таму, калі іх і затрымаюць, прад'явіць ім нейкую крамолу немагчыма. Галоўнае дзейнічаць максімальна хутка! Пераплыць раку — справа трох хвілін, не болей! Калі Радзевіч апынецца на польскім баку, яму трэба імчаць у вызначаным напрамку і ўсё! Нават калі яго заўважаць польскія памежнікі, яны не паспеюць за ім: не сядзяць жа яны, урэшце, пад кожным кустом.

Міхал небеспадстаўна засумняваўся, што Ян і Алекс — сапраўдныя кантрабандысты, а не звычайныя кіроўца і фельчар хуткай дапамогі, якія, выключна з павагі да доктара Дучмана, згадзіліся дапамагчы савецкаму няўдачніку-дэзерціру.

Як толькі аўтамабіль хуткай дапамогі спыніўся, Алекс скамандаваў:

— Бістро!

У наступнае імгненне праз заднія дзверы бусіка выцягнулі ўжо надзьмутую гумавую лодку і кінулі яе на ваду, да якой ад машыны было літаральна два крокі. Міхал скочыў у лодку. Ён не паспеў здзівіцца, навошта да яе прывязана доўгая вяроўка, як следам у чоўне апынуўся Ян і сеў на вёслы.

Алекс моцна адштурхнуў лодку ад берага, а Ян пачаў імкліва грэбці. І хоць у гэтым месцы ля ракі было зусім цёмна, Радзевіч разгледзеў, што злева плынь раздзяляецца на два рукавы, якія агінаюць невялікую выспу. На фоне падсветленага гарадскога неба адразу за востравам грувасцілася велічная металічная канструкцыя чыгуначнага моста, пазначаная чырвонымі ліхтарыкамі. Дзіўным чынам памяць адразу нагадала хлопцу падобную карціну з аднаго ягонага сну-трызнення: рака, востраў, гутарка з дзіўным старым, якога ён палічыў богам... Толькі ў мроях усё адбывалася пад сінім небам, а тут пануе непраглядная цемра... Затое — вось яно, тлумачэнне польскаму ды нямецкаму арлам, як на далоні... І металічны пралёт чыгуначнага моста на фоне брудначырвонага неба вельмі падобны да абрысаў кроны вялізнага дуба...

Здаецца, не прамінула і дзвюх хвілін, як лодка стукнулася аб супрацьлеглы бераг.

— Бяжы! — шэптам гукнуў Ян.

Радзевіч скочыў на польскі бераг і азірнуўся на лодку, каб хоць бы жэстам развітацца з памагатым, але маленькі гумавы караблік з хуткасцю ракеты ўжо мінаў сярэдзіну ракі: дык вось навошта да яго была прывязаная тая вяроўка!

Міхал толькі сарваўся з месца, прадзёрся праз густы хмызняк і ледзь не сутыкнуўся са слупом, ад якога ў абодва бакі знізу да самага верху разыходзіліся лініі калючага дроту. На слупе дрот трымаўся на белых керамічных ізалятарах, якія прыцягнулі ўвагу хлопца найперш і не дазволілі з разгону ўблытацца ў правады. Наяўнасць ізалятараў магла сведчыць і аб тым, што калючка пад моцнай электрычнай напругай, і аб тым, што яна частка сігналізацыйнай сістэмы, якая спрацуе, калі абарваць хоць адзін правадок…

Вось табе і бяжы! Добра, калі гэта проста сігналка: абарваў і ляці што ёсць сілы! А калі моцная напруга?!

Што ж рабіць?!

Хлопец адчуў, што страшэнна расхваляваўся. Здавалася, што сэрца вось-вось выскачыць з грудзей ці выбухне!

Ён некалькі разоў глыбока ўздыхнуў, каб хоць крыху супакоіцца.

Ці сапраўды падзейнічала, ці толькі здалося, але Міхал пачаў разглядаць нечаканую перашкоду больш уважліва. І тут жа ўбачыў паратунак: справа дзве ніжнія лініі адсутнічалі!

Міхал не стаў цырымоніцца: лёг на зямлю ўздоўж правадоў, перакруціўся два разы са спіны на жывот і апынуўся на другім баку агароджы. Хлопец адразу ўскочыў на ногі і паімчаў далей.

А мо праважатыя — усё ж сапраўдныя кантрабандысты?

Ужо праз дзесяць секунд Радзевіч узняўся на чыгуначны насып і пабег у супрацьлеглы бок ад моста…

Вось і пераезд праз чыгунку, як на схеме, а крыху наводдаль і маленькі чырвоны фіяцік з уключанымі аварыйнымі ліхтарамі!

Міхал пацягнуўся ўжо да ручкі аўтамабільных дзвярэй, калі раптам здрыганулася зямля і навакольную цішыню працяла страшэннае, як здалося ў першае імгненне, ваўчынае выццё. Хлопец міжволі спалохана азірнуўся назад: з цемры на яго глядзелі вялізныя чырвоныя вочы пачвары, таго самага ваўка-альбіноса з іншасвету!..

Дзіўны гук паўтарыўся і стала зразумела, што гэта ўсяго толькі гудок цеплавоза, які рушыць з захаду праз мост, а страшныя чырвоныя вочы — не што іншае, як сігнальныя ліхтары на пераездзе!

Радзевіч аж плюнуў ад прыкрасці за сваю палахлівасць: падобна, да яго сціплай асобы нікому не было аніякай справы. Пераход дзяржаўнай мяжы прайшоў удала! Ён няспешна, абсалютна будзённа, бы на паркоўцы ці прыпынку таксі, сеў у машыну і прывітаўся з Пятром Смыкам...

Падарожжа да Легніцы, падчас якога Міхал падрабязна, не без гумару і кпінаў з сябе распавёў Пятру пра свае прыгоды апошніх дзён, доўжылася толькі паўтары гадзінкі: у кампаніі такога ўдзячнага слухача, як Смык, можна было б ехаць і значна даўжэй…

— Мне надзвычай няёмка, што праз мяне ў вас такія турботы! — зазначыў на развітанне Радзевіч. — І проста сорамна, што я нічым не магу аддзячыць!..

— Якія там турботы! — пасміхнуўся Пётр. — Хто ж нам дапаможа, калі мы не будзем дапамагаць адно аднаму? А твая гісторыя — больш чым дастатковая падзяка!.. Такое ў кіно не ўбачыш!.. Спадзяюся, ты ніколі не пашкадуеш, што не застаўся ў Нямеччыне, і, — мужчына моцна паціснуў Міхалаву руку на развітанне, — зычу вярнуцца дадому!..

# P. S.

Ніякіх падставаў сумнявацца ў праўдзівасці чарговага Міхалавага аповеду, якім бы неверагодным ён ні здаваўся, як і раней, у пляменнікаў не было…

Дзядзька, па завяршэнні сваёй гісторыі, быў гатовы адказаць на любыя пытанні, выслухаць хоць якія пярэчанні ды сумненні, але ніяк не чакаў таго, што адбылося!..

— Э-х! Такую краіну прасралі! — абсалютна недарэчы, але з прыкметнай роспаччу ў інтанацыі буркнуў Андрэй.

— Гэта ты пра што? — напружыўся Міхал.

— Пра СССР, пра што ж яшчэ? — у сваю чаргу здзівіўся праграміст.

— Табе шкада Савецкага Саюза?! — жахнуўся дзядзька.

— Вядома ж, шкада! А каму не?!

— Мо і ты, — Міхал звярнуўся да Алеся, — шкадуеш, гісторык?

І гісторык, які толькі нарадзіўся ў СССР, з дакладнымі лічбамі, спасылкамі ды фактамі прачытаў свайму дзядзьку, палова свядомага жыцця якога прайшла ў тым Саюзе, самую сапраўдную лекцыю пра тое, якой казачнай краінай-марай была першая ў свеце дзяржава працоўных ды сялян, якіх неверагодных поспехаў яна дасягнула ва ўсіх галінах, якія нечуваныя вышыні ёй скарыліся…

— Перамаглі фашызм!.. Першымі паляцелі ў космас! — сыпаў адборнымі прапагандысцкімі штампамі Алесь пад ухвальныя позіркі Андрэя.

Міхал паспрабаваў запярэчыць, нагадаўшы пра мільёны ні ў чым не вінаватых ахвяр, але гісторык парыраваў традыцыйным:

— Так! Былі і недахопы, перагіны! Але, калі разглядаць аб'ектыўна…

Жыцці мільёнаў людзей, іх досвед, мой уласны вопыт ды адчуванні, у рэшце рэшт, значыцца, не маюць ніякага значэння перад нейкай абстрактнай аб'ектыўнасцю!.. Ці тое ж самае, што цяпер, заспявалі б адэпты гэтай самай аб'ектыўнасці, калі б іхныя дзеці памерлі ад голаду, калі б яны самі пабывалі ў кіпцюрах ГПУ ці жыўцом назаўсёды апынуліся ў пекле ГУЛАГу?! Калі смерць — як збавенне!..

А смярдзючая падвоеная мараль ды хлусня той сістэмы — гэта аб'ектыўнасць ці недарэчны недахоп? Ці да іх можна прыстасавацца: смярдзіць, смярдзіць, ды не забівае? Жыць можна!..

Калі ўсе разбрыліся па пакоях і паклаліся спаць, Міхал доўга не мог заплюшчыць вачэй…

Па сутнасці атрымоўвалася, што пляменнікі пачулі ад яго, хай сабе і неверагодную, прыгодніцкую гісторыю, як іхны дзядзька падчас службы ў савецкім войску ў Польшчы пазнаёміўся з тамтэйшым беларусам, які потым дапамог яму ад мяжы з Германіяй дабрацца да горада, у якім Міхал служыў. І на гэтым усё!..

Такі сабе кіношны экшн, з якога на самай справе магло скласціся памылковае ўражанне пра тое, як надзвычай цікава было служыць у савецкім войску, у якія фантастычныя перыпетыі магчыма было патрапіць дзякуючы яму. Проста якіясь рэйнджараўскія прыгоды: тысячы кіламетраў ад дому, розныя краіны і народы… Цяперашняе войска такіх магчымасцяў не дае…

Самае ж галоўнае, пра што неабходна было распавесці малодшым, засталося толькі недзе ў Міхалавай галаве: ні пра якую дзедаўшчыну і гвалт ён не згадаў, нібы пляменнікі ведалі пра гэты бок службы ў савецкім войску таксама, як і дзядзька…

Звыклая гульня свядомасці: людзям звычайна ўласціва думаць, што іншыя маюць такі самы жыццёвы досвед, як і яны, шчыра здзіўляцца, калі выяўляецца іншае...

Ці пашкадаваў Міхал Радзевіч аб тым, што не застаўся тады ў Германіі, а вярнуўся дадому?..

Калі не крывіць душой — так, вядома ж, пашкадаваў, і не аднойчы! Бо тая Беларусь, якая паўстала на руінах БССР, фактычна нічым не адрозніваецца ад сваёй папярэдніцы: вярнуліся тыя ж дзяржаўныя сімвалы, тая самая, калі не горшая, занядбанасць мовы…

Ды і ўвогуле цяжка сказаць, наколькі Беларусь сталася незалежнаю…

Дзіўна, але выпадковая гутарка з пляменнікамі нанова адкрыла Міхалу Радзевічу, здавалася, даўно ўжо забыты ды неактуальны сэнс ягонай прысутнасці тут і цяпер, неспадзявана пераканала ў тым, што нельга апускаць рукі, трэба працягваць змагацца з пачварным прывідам імперыі зла за душы і сэрцы маладых і што ён зусім не памыліўся шмат гадоў таму, калі насуперак прагматычнай аб'ектыўнасці вярнуўся дадому…

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Пляскач** Сяргей

# ДМБ-91:
# зычу вярнуцца дадому

*Раман*

Адказны за выпуск *Зміцер Вішнёў*
Рэдактар *Віктар Жыбуль*
Вокладка *Маргарыта Сянькова*
Вёрстка *Дар'я Пушкар*
Карэктура *Віктар Жыбуль, Лідзія Наліўка, Алена Брава*

Падпісана да друку 01.03.2021. Фармат 60×90/16.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 19,5. Ул.-выд. арк. 11,54.
Наклад 200 асоб. Замова 164239.
18+

ПВУП «Галіяфы».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/48 ад 03.10. 2013.
Вул. Куйбышава, 22, к. 6, п. 6, 220029, Мінск, Беларусь.
E-mail: vish@bk.ru
www.halijafy.by

Акцыянернае таварыства
«Т8 Издательские технологии» АТ «Т8».
Пр-т Валгаградскі, 42, кор. 5, к. 6, 109316, Масква, Расія.

У рамане «ДМБ-91: зычу вярнуцца дадому» аўтар паказвае перыяд распаду савецкай імперыі. Галоўны герой Міхал Радзевіч трапляе ў войска, дзе сутыкаецца з поўным бяспраўем, дзедаўшчынай, крадзяжамі ды п'янствам. Неўзабаве яго асноўным клопатам становіцца праблема фізічнага выжывання.

ISBN 978-985-7209-77-4
9 789857 209774

ВЫДАВЕЦТВА
ГАЛІЯФЫ

СЯРГЕЙ ПЛЯСКАЧ

# ДМБ-91: ЗЫЧУ ВЯРНУЦЦА ДАДОМУ